Ганна
Навасельцава



# І чарам сніцца чалавек...

Ганна Навасельцава

# І ЧАРАМ СНІЦЦА ЧАЛАВЕК...

Міфалагічныя апавяданні

Віцебск
Віцебская абласная друкарня
2016

УДК 821.161.3-32
ББК 84(Беи-44)
Н15

**Навасельцава, Г.В.**
Н15 І чарам сніцца чалавек... : міфалагічныя апавяданні / Ганна Навасельцава. — Віцебск : Віцебская абласная друкарня, 2016. — 272 с.
ISBN 978-985-534-098-1.

Кніга складаецца з шэрагу міфалагічных апавяданняў, якія раскрываюць чароўны свет замоў, паданняў, казак, дзе мажлівыя незвычайныя стасункі паміж чалавекам і прыродай, дзіўныя здарэнні і чарадзейныя выпрабаванні. Галоўныя героі — міфалагічныя істоты, боствы старажытных славян, легендарныя персанажы — маюць містычнае паходжанне ці надзелены выключнымі якасцямі. Чары і каханне, схаваныя ў мінулым ці пазамінулым, таксама таямніца, прадказанне і запавет ствараюць адметную фантастычную рэчаіснасць, знаёмства з якой зацікавіць як аматараў жанру, так і шырокае кола чытачоў.

**УДК 821.161.3-32**
**ББК 84(Беи-44)**

**ISBN 978-985-534-098-1**

© Навасельцава Г.В., 2016
© Афармленне. УПП "Віцебская абласная друкарня", 2016

# ЗМЕСТ


ПРАДМОВА ........ 4

Высокая ліпіна ........ 6

Бусліч ........ 16

З бяздоннага багацця... ........ 24

Следавікі, следавікі... ........ 40

Вужыная каралеўна ........ 51

На векавечных межах... ........ 68

Бурлівая крыніца ........ 89

Папаратнікавыя каменьчыкі ........ 104

Рабінавае сонейка ........ 121

Анчутка-Анчутка ........ 129

Зюзіч ........ 146

Залатыя яблычкі ........ 158

Ягіня ........ 166

Паўночнік ........ 178

Недарэка ........ 195

Лесавік, вадзянік, палявік ........ 212

Сапраўдныя асілкі! ........ 238

# ПРАДМОВА

З творчасцю Ганны Навасельцавай знаёмы вельмі даўно. Падчас працы рэдактарам прозы часопіса "Маладосць" давялося прачытаць некалькі апавяданняў, а пазней і аповесць. Дарэчы, усе творы таленавітай віцябчанкі былі змешчаны ў названым выданні. Шматгранны казачна-легендавы, міфалагічны свет Ганны Навасельцавай не можа не звярнуць увагу аматараў роднага слова. Творы пісьменніцы адразу зачароўваюць, ахутваюць дабрынёй, удзячнасцю і павагай да роднай зямлі.

Адухоўленасць прыроды, чароўны свет замоў, паданняў, казак, дзе рэалістычнае мяжуе з містычным і дапаўняе адно другое, — усё гэта стварае ілюзорны сусвет, у які верыш, у які хочацца патрапіць хоць у снах. Легенды, паданні, казкі — гэта тая жыццядайная крыніца, без якой не можа існаваць ні адзін народ, ні адно пакаленне. Гэта духоўнасць бачання, якое зберагалася стагоддзямі, перадавалася ад бацькоў дзецям, захоўвалася на генетычным узроўні і з'яўляецца, вобразна кажучы, крэўнай "прапіскай" пэўнага чалавека на пэўнай зямлі.

Варта памятаць, што міфатворчасць — найважнейшая функцыя фантазіі, фальклору, паэзіі і іншых відаў мастацтва. Міфалагічныя вобразы і матывы багата прадстаўлены ў творчасці Ганны Навасельцавай. Каб у гэтым пераканацца, дастаткова прачытаць апавяданні "Бусліч", "З бяздоннага багацця...", "Вужыная каралеўна", "Лесавік, вадзянік, палявік". Асабліва хочацца звярнуць увагу на тое, як пісьменніца па-майстэрску, але далікатна робіць сінтэз народнага і своеасабліва рэфармуе традыцыйнае светабачанне, напаўняе яго сучаснымі рэаліямі.

Шчыра кажучы, мяне вельмі здзівіла і захапіла проза Ганны Навасельцавай. Шмат гадоў працуючы ў літаратурных выданнях краіны, я ці не ўпершыню сустрэўся з такой прафесійна-каларытнай прозай. Менавіта таму пасля першых публікацый у часопісе "Маладосць" я параіў аўтарцы звярнуцца са сваімі творамі ў рэдакцыю часопіса "Полымя", штотыднёвіка "Літаратура і мастацтва", што і было зроблена. Таму з'яўленне апавяданняў Ганны Навасельцавай у гэтых выданнях было заканамерным.

Калі чытаеш рукапіс падрыхтаванай кнігі, увесь час не пакідае адчуванне, што ты (у дадзеным выпадку я) вярнуўся ў далёкае дзяцінства, у свет блізкіх табе людзей, якія некалі распавядалі вечарамі нам, дзятве, паданні і легенды, казкі і небыліцы пра вадзянікоў, хатнікаў, чарадзеяў ды цмокаў... І яшчэ, пісьменніца таленавіта, чуйна падбірае кожнае слова ў абмалёўцы вобразаў, стыхій, характараў. Яна выкарыстоўвае шмат адметных, часам падзабытых слоў, не цураецца ўплесці ў тканіну сказа ёмкі дыялектызм, які ўпрыгожвае, насычае апавяданне.

Без перабольшвання зазначу: кніга Ганны Навасельцавай — адметная з'ява ў айчыннай літаратуры, яна зацікавіць не толькі дарослых чытачоў, але і моладзь, вучняў старэйшых класаў. Стане добрым дарадчыкам у пазнанні, спасціжэнні і асэнсаванні бязмежнага багацця беларускага фальклору.

**Анатоль Казлоў,**
**рэдактар аддзела "Замежная літаратура" ў "Нёмане",**
**празаік, сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі**

# ВЫСОКАЯ ЛІПІНА

*Апавяданне-ўспамін*

У нашым двары шумела высокая таямнічая ліпа. Была такой вялікай-вялікай, колькі я памятаю сябе.

— Ліпіна... — задумліва казала пра яе мая бабуля ды глядзела, як пад яе шырокім ценем у сонечны дзень хаваецца ледзьве не ўся хата.

— Ліпіна... — паўтарала я ўслед, адчуваючы нешта важнае, нявыказанае, але такое цікавае, чаго тады і зразумець яшчэ не магла.

Ды гэта чамусьці здавалася вельмі патрэбным — зразумець...

— Складайце сена пад ліпіну. Там яго дождж не замочыць, — нярэдка чула тады, калі не хадзіла яшчэ ў школу.

Глядзела, як бабуля, мама і тата насілі прыхапкам сена з-за блізкага саду.

— Як не замочыць? Зусім? — кожны раз сумнявалася.

Пра тое, што дажджавыя кроплі ўсё ж прабіваюцца праз густыя лісты нават самых важных дрэў, я тады ўжо ведала.

— Не замочыць. Зусім. Глядзі, якая яна вялікая...

Ліпіна сапраўды гордай верхавінай узвышалася над усім наваколлем. Мізэрна маленькімі побач з ёю рабіліся старыя яблыні, што раслі ў нашым садзе, яшчэ меншымі — калючыя грушы на ўзмежку. Стоячы тут жа, у двары, цяжка было згледзець усю зялёную каралеўскую крону, якая ледзьве ўгадвалася за першымі ад зямлі разлапістымі галінамі. І толькі адна суседская бярэзіна была з ліпай амаль упоравень. Калі ісці да вёскі з балота — ад Працукеўшчыны — і падняцца на ладны ўзгорак, праз які бяжыць дарога, то, пакуль не відаць яшчэ стрэхаў хат, сустракаюць здалёку, нібы два волаты-вартаўнікі, бярэзіна і ліпіна. Танклявая суседка выглядала сціпла, неяк па-беламу самотна побач з моцнай прысадзістай ліпай. Магутная ліпнёвая постаць адразу запыняла мой позірк і, як думалася тады, выклікала захапленне ва ўсіх і кожнага. Можа

быць, таму, што ў трывалым ліпавым ствале было дупло з пчоламі, якія злівалі свой голас з ліпнёвым пошумам у гарачы летні час, можа быць, таму, што кратала яна галінай маё акно, а можа быць, таму, што была такой вялікай адна на ўвесь свет, — але высокая ліпіна адразу паланіла маё дзіцячае ўяўленне.

— Бабуля, а колькі ліпіне гадоў?

— Унучачка, а каб я ведала, — казала мне маміна мама. І, памаўчаўшы, дадавала:

— Колькі жыву, стаіць яна такой вось, як цяпер...

Уга, такая, як цяпер... Я глядзела на моцны вузлаваты корань, што ля самага камля вытыркаўся з зямлі, на шэрую і такую шурпатую кару, што ў яе глыбокія шчыліны можна было хаваць розную цацачную драбязу. Верыла і не верыла. Такая, як цяпер!

— Хто ж яе пасадзіў?

— Ды нехта ж пасадзіў. Той, хто хаты будаваў. Хацеў ладу ды спакою.

— Гэту хату, бабуля? Тваю?

— Можа, што і маю...

Дык як жа гэта?.. Хата, абшаляваная дошкамі, з новай вялікай верандай проста не магла быць роўнай векам з ліпінай. Кожны год бацькі фарбавалі сцены, а зусім нядаўна быў перакрыты новым шыферам дах. Дагледжаная, уладкаваная, бабуліна хата выглядала такой радаснай і новай, што здавалася сама меней ліпінай праўнучкай...

— А ты ведаеш, хто будаваў тваю хату, бабуля?

— Пайшла замуж за твайго дзеда. Хата ўжо была збудаваная...

Ліпіна лагодна глядзела на хату, сузірала ўсё наваколле і была таямнічай, зразумела, не толькі з-за сваёй вышыні. Салодкім ліпавым кветам пахла дажджавая вада, калі весела бегла са стрэх.

— Глядзі, як стрэх бяжыць, — паказвала мне бабуля.

Паглядзець сапраўды было на што. Жоўтыя ліпавыя кветкі, густа ўпаўшы з дрэва на блізкі дах, паціху збягалі з вадой на зямлю. І там, дзе са страхі весела капала, усё роўна высцілала-

ся ліпнёвымі карункамі. А пакуль тыя карункі рабіліся ладнымі, так добра паціху набраць з-пад страхі ліпнёвай вады. Проста ў прыгаршчы. Салодкай, як мёд. Пэўна ж, ад ліпавага квету. Можа, ад таго мой улюбёны час — ліпень... Пара ліпіны, цёплых навальнічных дажджоў ды салодкіх пчаліных кветак...

Тады, калі спорныя дажджы ападалі на ліпіну, якая згодна цягнула галіны да хмар, аднойчы зусім нечакана прыйшло разуменне, што адкрыты свет такі вялікі-вялікі... Усяго і не згледзець. Не надзівіцца ж адразу на ўсе цуды.

А пачалося ўсё проста. Бацька пайшоў рабіць мне арэлі.

— Віця, пачапі дзяўчыне гуталку, — сказала яму бабуля.

— Гуталка, — пачула я тады незразумелае слова.

І што мне хочуць пачапіць, у мяне зусім не спытаўшы? Тут я ўжо не адстала ні на крок. Таму і ўбачыла ўсё сваімі вачыма. На самую нізкую, даўжэзную, як волатава рука, галіну нашай ліпіны была двойчы перакінута вяроўка. Знізу, ля зямлі, да вяроўкі лёгка прыладзілася невялікая дошчачка.

— Вось і гуталка гатовая...

І што далей? Усё? Я ледзьве не расплакалася ад крыўды і расчаравання. Гэтая дошчачка на вяровачках і ёсць дзівосная гуталка?..

— Ну чаго ты? Сядай пагутайся. Глядзі, як трэба... — абступілі мяне бацькі.

— Глядзі, усё проста... Штурхаешся нагамі ды нахіляешся назад, тады гуталка пайшла наперад. А калі гуталка так ідзе, тады нахіляйся сюды ж, і гуталка пойдзе назад. Рухайся такім ладам ды не пускай вяроўкі. І не бойся. Цябе ж ліпіна трымае...

Ліпіна сапраўды моцна трымала і мяне, і маю гуталку. Я адчула гэта адразу, як толькі з першага майго штуршка гуталка няпэўна тарганулася наперад. Трохі ямчэй пайшла назад — і зноў штуршок, і зноў наперад. Мне здалося, што ў такт гуталцы ціха падрыгвае зямля, і хата, і неба. Усё-ўсё побач...

Спакойна стаяла адна ліпіна, падавала, бы з некім вітаючыся, нізкую галіну-руку. А тая рука трымала маю гуталку. Трымала спакойна і проста...

Праз галіну-руку прабіваліся касыя сонечныя промні. І адсюль, з гуталкі, я паверыла ў паважны спакой, у нейкую зусім жывую, трывалую пэўнасць. Цікаўныя іскрыстыя праменьчыкі сям-там прабягалі праз ліпавае лісце, і, чарговы раз спрабуючы адштурхнуцца мацней, я неяк незразумела адчула, што недзе недасяжна высока ліпіна абдымаецца з сонцам. Цёплыя сонечныя промні цесна спляталіся з галінамі, а галіны цягнуліся ўгору, да промняў, усё вышай і вышай... Лёгка, добра, згодна. Ліпіна не баялася вышыні. Ліпіна абдымалася з сонцам.

— Глядзіце, ліпіна сябруе з сонцам!.. Праўда, сябруе.

Згодна ўсміхнуліся бацькі, а бабуля прамовіла:

— Канешне ж, сябруе. Усё жывое цягнецца да сонца. Няпроста, нялёгка, але цягнецца. На тое ж яно і сонца...

Мая ліпіна сябруе з сонцам. Сябруе... А блізкая галінарука такая моцная, трывалая. Адштурхнуцца. Паверыць. Адштурхнуцца. Гуталка ідзе ўверх. Гуталка ідзе ўніз. Уверх. Уніз. Бліжэй неба. Далей неба. Бліжэй сонца. Далей сонца. Высокая зямля. Нізкая зямля. Толькі ліпіна застаецца стаяць, як раней, моцна, трывала. Абдымаецца з сонцам... Так радасна гутацца, калі ліпіна абдымаецца з сонцам...

Я хутка ўпадабала змайстраваную бацькам гуталку. Можна ж не толькі гутацца ўволю, а і проста сядзець, прытуліўшыся спінай да такога нагрэтага сонцам ствала, што адразу рабілася цёпла. Глядзець на высокія галіны, што сплятаюцца ў адзіны свет, удаюць мройлівыя малюнкі. Прашумеў-праляцеў у вершаліне вецер, і пабачылася тады, што ўзіраецца долу нехта цікаўны, вялізны, крыху страшны... Хутка знікае ў густой кроне з новым нябачным подыхам. Чаго ж... Зноў трывожыць моцныя галіны прагны вецер. Пакажыся ж, пакажыся зноў. З'яўляецца нехта яшчэ, гэтым разам падобны да птушкі,

дзіўнай, нябачанай раней. І тая хутка знікае. Куды ж паляцела?.. Толькі зноў уздыхае вецер, нібы жаліцца, што цяжка калыхаць такое ўпартае веццe. А мая гуталка з ніжняй галіны дык нават і не скранецца.

Знікаюць ды зноў з'яўляюцца казачныя праявы. Збягаюць некуды без следу. Ды застаюцца думкі пра іх. Няўжо на такіх дужых галінах ніхто не жыве? Не можа такога быць. Хаваецца днём у густым лісці, каб не ўбачылі яго. А ноччу, калі ўсе спяць, скача з галіны на галіну... А мо і здолее спусціцца на зямлю? Верыцца і не верыцца. Але ж страшна...

— Хто жыве на нашай ліпіне? — пыталася ва ўсіх, як не надакучыла.

— Жывуць на ліпіне пчолы, бо ў іх там дупло. Ты ж ведаеш, — чула звыклы адказ.

— Птушкі ўюць гняздзечкі. Розная драбяза. Ты ж бачыла, — казалі мне зноў.

— А яшчэ хто?

— Ды ніхто...

Быць такога не можа. Хто ж тады ўвесь час на мяне пaглядае з высокіх галін?.. Але пра такія цуды і расказаць нельга... Як і спыніць няпростыя роспыты. Я ж кожны дзень бачу...

— Дык хто ж жыве на нашай ліпіне?

— Унучачка, хто ж там можа жыць?..

— Глядзі, — пераконвала я бабулю. — Ты бачыш тое, што на самым версе? Не, не бачыш. Значыць, і не бачыш таго, што там нехта хаваецца.

— А, хаваецца... Дык, можа, хто і хаваецца. А ліпіна — яго хата.

— А ты нікога не бачыла?

— Не, нікога, — ціха ўсміхнулася бабуля. — Зусім нікога...

У "зусім нікога" я не верыла. Можа быць, таму, што глядзела на мяне бабуля з хітрым прышчурам. "Зусім нікога", а рана-раненька спрытны чорны коцік сядзіць на ніжняй галіне,

звесіўшы хвост, і паглядае на мяне разумнымі вачыма. Прыжмурваецца, пацягваецца і лёгка караскаецца ўверх, пакуль не знікае ў густым лісці. Позна вечарам, трэба ж такому здарыцца, зноў пазірае на мяне з ліпіны, па-змоўніцку цепае ды збягае ўніз чорным камячком. Хуценька знікае.

— Што, каток махнуў табе лапкай і пабег?

— Ага, махнуў лапкай.

І пабег. А куды — невядома. Назаўтра доўга сяджу пад ліпінай. Ужо гуталася-загуталася, вочы прагледзела, а катка ўсё не відно.

— Дзе ж наш коцік падзеўся?

— Ды дзе ж яму быць. Папіў раненька малака ды пабег сабе...

— А куды?

— Ды хто ж яго ведае... Можа, што сядзіць на ліпіне і смяецца, як ты яго шукаеш...

— Сядзіць на ліпіне і смяецца...

Вось так і ведала. Так жа і ёсць. Кот меў прозвішча Вугалёк ды быў хітрэнны-хітрэнны. Зыркае ды сам сабе ў вусы ўсміхаецца. Гэта, пэўна, ужо марыць, як са стала што сцягнуць. Мышэй Вугалёк лавіць і не думаў.

— Ідзі хоць мышыну зладві, лайдачына, — казалі ўсе Вугальку, калі той цёрся ля ног і прасіў малака.

Пачуўшы пра сябе такое, Вугалёк з пачуццём уласнай годнасці пакрыўджана адыходзіў і знікаў на якую хвіліну. Абыходзіў раз-другі па хаце. А пасля зноў з'яўляўся, патрабавальна мяўкаў, нібы казаў: "Што, не бачыце? Усё спакойна ў маім валадарстве, мышэй няма. Дык наліце ж мне малака".

— Што тут паробіш... Уліце яму малака, — звычайна казала бабуля.

І вось гэты манюка Вугалёк не толькі не ловіць мышэй, але і жыве на ліпіне. Хаваецца ад усіх, тоіцца...

— Бабуля, а што, Вугалёк ніводнай мышыны не злавіў?

— А чорт яму дай мышэй лавіць...

Значыць, ніводнай мышыны не злавіў. А бабуля яшчэ дадае:

— Усе каты як каты, а наш жа толькі б на ліпіне сядзеў.

Так я і ведала. Не такі кот, як усе. Не ловіць мышэй, сядзіць на ліпіне. Сядзіць сабе ды штосьці варожыць сваім вурканнем...

— Ты, Вугалёк, манюка, — казала я кату, узяўшы яго, нібы за рукі, за пярэднія лапкі. — Што на ліпіне робіш? Прызнайся...

Вугалёк па-разумнаму цепаў вачыма, незадаволена вадзіў пушыстым хвастом, але нічога мне не адказваў. Не іначай як таіўся.

Пагушкваючыся на сваёй улюбёнай гуталцы, я доўга разважала, што ж дзеецца на нашай ліпіне. Ляціць уверх гуталка, і адкрываецца на імгненне жаўтлявая стужка дарогі, што збягае ў блізкую зацень дрэў. І думаецца тады, што вось бы даляцець да самых верхніх галін... З іх глянуць на пагоркі за нашай хатай, вакольныя сады, блізкі поплаў з густым балотным хмызняком. Дык, можа, і Вугалёк на ліпіну лезе, каб на гэта любавацца? Шанцуе ж яму, спрытнаму...

А можа... Жыве на нашай ліпіне Ліпнік. Бачыць яго не бачыла, але што яго не можа не быць, здагадвалася. І вось чаму...

У тым, што ў сажалцы, якая за поплавам, жыве нейкае зялёнае страшыдла, празванае Жабінам, ніхто не сумняваўся. З сажалкі цягалі ваду паліваць грады. Каб набраць вады, трэба было ісці па вытаптанай сцежцы — пругкай, як гумавы мячык, чорнай зямлі. На самой сажалцы ляжалі кладкі. Ступаючы адной нагой на кладку, нехта з дарослых нахіляўся і ўмомант чэрпаў вядро вады. Ведама ж, і мне так хацелася.

— Бабуля, дай і мне вядро. Буду ваду насіць...

— Дзетка, кладка дужа слізкая. Баюся, уляціш у сажалку...

— Не, не ўлячу. Дай вядро...

— Хай сабе, — урэшце сказала бабуля. — Чэрпай. Бачыш, якая вада зялёная?

Вада сапраўды ўдавалася зялёнай ад усюдыіснай дробненькай раскі.

— Бачу. І што?

— Дык гэта ж сквапны Жабін сваю ваду пазеляніў.

— Навошта?

— А каб не бралі. Сядзіць у сажалцы ды цікуе, каго б схапіць. Хто па ваду прыйдзе...

— Жабін? А які той Жабін?

— Зялёны. Страшны...

— Дык ты ж заўсёды з гэтай сажалкі ваду носіш. Чаму цябе Жабін не хапае?

— Бо ж я старая. А ён маленькіх цікуе...

Жабін. Зялёны. Страшны. Падыходзіць да сажалкі я доўга яшчэ баялася. Хаваецца Жабін недзе ў ціне ды толькі таго і чакае, каб хто з малых над вадой схіліўся. Не заўважыць яго таму, што выглядае, як сапраўдная жаба. Вунь іх на поплаве колькі!..

Вось чаму я была пэўная ў тым, што Жабін ёсць. Але калі ёсць Жабін, чаму ж не быць і Ліпніку? Сядзіць сабе пад самай верхавінай ці акурат там, дзе пчалінае жытло, ласуецца мядком ды цікуе, хто і дзе ходзіць, хто і што робіць... А поначы скача сабе ў галінах, весяліцца. Вось чаму ліпіна тады шуміць трывожна-трывожна, ціха-ціха...

— Бабуля, а Ліпнік ёсць?

— Які ж Ліпнік?

— Жабін ёсць. Сядзіць у сажалцы. Так?

— Так.

— А Ліпнік — на ліпіне.

— А то, можа, і так... Удзень схаваецца, каб не ўбачылі, а ноччу пасылае табе салодкія сны...

— Ліпнік? Сны? Як гэта?

— А то як жа ты думала... Чула, як ноччу ліпіна шуміць? Сонна, ціха, бы калыханку спявае. Гэта Ліпнік сон на ўсіх насылае, каб адпачылі ўдосталь...

Канешне ж, Ліпнік насылае сон... Вось чаму так спеўна шуміць ноччу ліпіна. Не так, як днём, калі на вуліцы многа іншых гукаў-зыкаў. Шэпча так пранікліва-цягуча, нібы сама сонная мроя. Там, у сне, можна разам з Вугальком залезці на ліпіну, залезці высока-высока, акурат туды, дзе пчаліная хатка-дупло. Там сустрэне цябе жоўценькі, як ліпавы цвет, рухавы і цікаўны Ліпнік. Спытаецца, куды хочаш паляцець у сне, што хочаш пабачыць... А што тут думаць, хачу пабачыць казку. "Ну, казку дык казку, — паважна мовіць у адказ Ліпнік. — Казак у мяне ой як многа". Заварушыць галінамі ліпіна і ўспомніць казку...

Я доўга верыла ў тое, што ліпіна нашэптвае мне казкі. Гэта з яе задумлівым пошумам бачыла ў сне, як вандруюць па свеце, шукаючы свайго шчасця, тры родныя браты. Мабыць, пад навальнічную ноч, калі як быццам грымела ў самай ліпавай верхавіне, біўся на калінавым мосце з цудам-юдам нехта, адзін, і прыгожы, і добры. Чамусьці заўсёды думалася, што з ліпавай галіны ўпадзе чарадзейны сіні клубочак. І пакоціцца, ведучы тонкай нітачкай да сяброўства і згоды. Да ўсяго, пра што марыла ты сама, высокая цяністая ліпіна. Ты ж так доўга расла, ты ж столькі бачыла на белым свеце... Ведала казкі пра смелых асілкаў і волатаў, пра добрага Бусліча, пра верную Вужыную каралеўну. Пра чарадзея-неўра, які вандруе па зямлі, шукаючы свой род. Можа, і не проста казкі. Тое, што бачыла-чула, пакуль стала такой. Аж пад хмары... Адно мне самой спатрэбілася вырасці, каб гэта зразумець.

Я не аднойчы спрабавала даведацца, хто цябе пасадзіў, ужо ў свядомым узросце. Не даведалася. Хтосьці хацеў ладу ды спакою, хацеў чуць твой гаманлівы шэпт і думаць мудрыя думы.

І ведаў, што гэта значыць... Не стала ўжо той, якая найлепей спазнала тваю жыццядайную сілу, адкрывала мне свет дабрыні. Бабулі... У мяне яе імя. Ты па-ранейшаму шуміш, такая ж велічна-высокая, такая ж дзівосная, як у маім дзяцінстве. Даўно ўжо няма на тваёй галіне маёй гуталкі. Не цепае хітрымі вачыма, не хаваецца ў густой зялёнай лістоце спрытны Вугалёк. Дапраўды, сябраваў з Ліпнікам...

Але для цябе не мінулася нічога. Як і раней, не баішся вятроў, стаіш пад навальніцамі. Што яны табе? А мне ўсё болей хочацца дазнацца пра тое, што ты пабачыла за свой век, пачуць тое, што давялося табе ўведаць. Ты пра гэта і кажаш сваім цягучым, як дождж асмужанай раніцай, спеўным пошумам. Шкада, так шкада, бо не магу я цябе зразумець. Але часам мне здаецца, што і ў мае, ужо дарослыя, сны прыходзіць твая памяць. Гэта здараецца, калі раптам, зусім нечакана, нібы зноў я першы раз на тваёй гуталцы, адкрываю новы далягляд. І тады, калі дзіўлюся, як не бачыла, бо не разумела, успамінаю пра цябе. Шмат гадоў тваёй мудрасці. А я да гэтага часу люблю арэлі...

Сузірала цябе восеньскую, калі паланіла ты гурбамі лісця ўвесь свет, як наш двор. Любавалася табой зімоваю, калі спавівалася ты снежна-сінімі завеямі. Слухала цябе вясновую, калі ты звінела салаўінымі песнямі аж да неба. Але назаўсёды для мяне ты будзеш летняй, ясна-выразнай у зялёна-шэрых абрысах, спеўнай, шумлівай, радаснай ад цёплых дажджоў. У тваёй густой верхавіне лётае маё шчаслівае дзяцінства. Ты ж бачыла, як я вырасла. Ты бачыла, як вырасла мая мама. Ты бачыла...

Зноў дакранаюся да тваёй шурпатай кары і зноў адчуваю, што не згублюся ў мінулым, што не стану палахлівым ценем свайго стагоддзя. Хоць ніхто мне ўжо не скажа, колькі табе гадоў, ды твой век вымяраецца жыццём, высокая, такая высокая, высокая-высокая ліпіна.

# БУСЛІЧ

## *Міфалагічнае*

Я гляджу на зямлю ў промнях сонца. Адкрываюцца таямніцы азёрнай і лясной, пра якія мне маўчаць давеку. А так хочацца хоць некаму расказаць пра асілкаў-волатаў, якія некалі хадзілі па гэтай зямлі. Будавалі гарады, засявалі нівы, журыліся і радаваліся. Даўно ўжо зніклі іх сляды, але не знікла волатава кроў. Засталася ў людзях азёрна-ляснога краю. У тых, хто любіць лясы, у тых, хто глядзіць на азёры. Робячы такое, самі не ведаюць, чаму так моцна трывожаць іх родныя краявіды... Чаму так шчымліва мрояцца ў сне недзе там, на далёкай чужыне. Доўга ім не зразумець, што не пазбыцца таго пачуцця. А я разумею, бо ведаю: кроў — не вадзіца... Ды яшчэ ведаю, чый жа гэта нашчадак той, каго няспынна вабіць таемны лясны гушчар. Усё, усё ад глухіх пушчаў... Я пабачыў гэта ў вачах таго, першага, які прабіраўся праз непраходныя лясы, шукаючы жытла сабе, свайму роду. Паляшук, ад якога пайшлі ўсе палешукі. Палешукі духу... Ішоў з ім поруч родны брат, спатыкаўся, падаў, таму не змог вытрымаць цяжкай дарогі. Змаладушнічаў, застаўся жыць на шырокіх прасторах. Палюбіў палеткі ды волю. Палевік, ад якога пайшлі ўсе палевікі.

Ды ці мала б яшчэ пра што мне хацелася расказаць?! Бачу ўсё навылёт, на тое ў мяне ўсёвідушчы позірк. Па вачах чалавека спазнаю яго душу. Азываюся яму белай надзеяй, напамінам пра ўсё слаўнае, што сталася ў жыцці ад самага пачатку. Мяне любяць, і клічуць, і берагуць, і толькі адна царэўнагадзюка па-чорнаму мяне ненавідзіць.

Бачу, бачу яе сляды ў водблісках зор. Зачаравала скарбы, спакусіла маладых, невінаватых, — і забыліся яны на дабрыню. Забыліся на праўду... Неспазнанкай пільнаваць ім ля цёмных ростаняў сваіх братоў. Выпрабоўваць чалавечую

веру... Не хачу, каб так рабілася. Злаўлю царэўну-гадзюку, спыню яе чары. Толькі... спрытна ўцякае яна ад мяне, знікае ды хаваецца немаведама дзе... Зноў збірае злых... Зноў пакідае ўчыненае на маім шляху. Кпіць з мяне. Маўляў, як тады не злавіў, то ўжо не зловіш ніколі-ніколі...

Не будзе ж так. Не будзе... Хоць гэта праўда, што тады яе не злавіў. Ды не пакіну з ёю змагацца. Адно не магу пра тое, даўнішняе, не ўспамінаць.

...Я быў шчаслівым, як можа быць шчаслівым чалавек. Спазнаваў кніжную мудрасць, сябраваў, кахаў, радаваўся свету. Здавалася тады, што ўсё магчыма, што будзе так заўсёды, іначай адкуль жа ўсё добрае на зямлі... Прыгажосцю свяціліся золкі, заўсёды неслі з сабою новы дзень, а з ім новае спадзяванне... Я спадзяваўся тады стаць гонарам слаўнай у свеце зямлі, зямлі з яе задумлівымі лясамі, сінімі ўсмешлівымі вачамі азёр. Я моцна спадзяваўся, бо ў сябе верыў. Дзіўна, але тая вера трымае мяне і цяпер, нібыта не мінуўся час, нібы я ні пра што не шкадаваў, нібы я нічога не страчваў...

Углядаўся ў чарадзейна-няўлоўную сінеч рэк, пытаўся, куды ж яны плывуць. Бег праз туманы, што цягнуліся ад сівых узгоркаў, хацеў дазнацца, якую таямніцу яны беражліва хаваюць. Шукаў позіркам у небе знічку, каб злавіць яе, каб не разбілася ясная аб зямлю, што нікому не зрабіла балюча. Дык навошта ж знічцы разбівацца? Я і цяпер думаю пра тое. Навошта яна разбіваецца, калі плытка бягуць сінія рэкі? Навошта, калі задуменна маўчаць, варожачы над сваімі таямніцамі, ведныя высокія ўзгоркі? Навошта пакуты? Навошта?.. Я толькі шкадую, што знічку мне так і не пашчасціла злавіць. Ведаў, колькі ні жыў на белым свеце, што множыць разбітая зорка чары. Тыя чары, ад якіх твораць чарадзействы ды цудныя простаму воку з'явы ўсе такія, як я.

Чары... Я імі дыхаў. Не ведаю, як бы змог жыць без іх. Але... Няхай бы зусім не было чараў, бо спараджаюцца яны праз страты. Няхай бы і я не быў чарадзеем. Няхай бы не быў...

Ніколі не злавіць мне znічкі. Ніколі не супыніць чарадзействы ды цуды гэтай зямлі. Падаць ім, разбівацца. Там жа, дзе яны разбіліся, расце мяккі верас, расце як напамін пра тое, што трывожыць. Яшчэ адзін цуд лясной ды азёрнай... Услухайцеся, як шэпчуць верасовыя сцяблінкі. І вы пачуеце нешта знаёмае, але тое, чаго не можаце ўспомніць. І зробіцца вам сумна... Нібы страцілі штосьці, а што — і самі не скажаце. І пакуль вы будзеце глядзець на верас, гэтае пачуццё ніяк не пройдзе... Не можа мінуцца памяць несмяротнай нябеснай знічкі.

Тады, калі сумаваў па знічцы, да якой, як мне здавалася, не дацягнуўся хіба што крыху, хацеў адшукаць яе разбітыя друзачкі-іскрынкі, паляцела над зямлёй навальніца. Можа, гэта ў гнеўным воклічы з-за яе, нявіннай, разбітай, ляснулі перуны, запалілі стары як свет ясень на лысым узгорку. Шуганула іскрыстае полымя, нібы нехта несмяротны зазірнуў у маю душу. Загаласіла нячыстая сіла, кінулася хавацца ў глыбокую багну. І ўсміхнуўся мне той, каго яна спалохалася, той, хто адвеку валодаў грымотамі.

— А ты, чарадзей, чаго ад мяне не ўцякаеш? Ты ж сябруеш з нячысцікамі...

Не схавацца ад праніклівага агнёвага позірку. Толькі, ратуючы мяне, нечакана бліснулі іскрынкі разбітай нябеснай знічкі. І тады я ўспомніў, што ўсе чары дае і забірае мая зямля...

— Любіш сваю зямлю, чарадзей? Глядзі мне ў вочы!

Мне і так не адвесці ад цябе вачэй. А ў тваіх вачах коціцца па ўсёй зямлі грозны нябесны агонь. Хто ты? Сам Пярун? Навошта прыйшоў у чалавечы свет? Не табе яго зразумець, не табе берагчы. Лаві мае думкі, глядзі маімі вачыма...

— Любіш сваю зямлю, чарадзей? Дык бачыць табе ўсё!

І зрабіліся мае вочы ўсёвідушчымі. Глядзець мне цяпер і бачыць, як хаваюцца ў цёмных лясных нетрах лютыя ваўкалакі, цікуюць сабе ахвяру. Доўга ісці праз жахі купальскай ночы. А людцы, самыя простыя, самыя палахлівыя, трымаюць у руках абярэгі, спадзяюцца, што нячыстая сіла — і я разам з ёю — іх не зачэпіць... Не зачэпіць той Перуновы чарадзей, які не баіцца нябеснага гневу. Не баіцца Перуна, які цаляе ў нячыстых, зводзіць іх са свету сваімі стрэламі. Тады сказаў мне ты, грымотнік:

— Прыгожая твая зямля. Толькі замнога на ёй усялякай нечысці... Збіраць яе трэба, збіраць усю чыста.

Ды пайшоў па белым свеце ў чалавечым абліччы. Збіраў у свой бяздонны мех і нячыстых, і жаб з гадзюкамі, і living рознае плюгаўства. Шмат хадзіў, магутны, несмяротны. Натаміўся, ды панеслі мне чорныя гарцукі, слугі твае верныя, загаднае слова:

— Бяры мой вялізны мех, чарадзею, кінь у чорнае багністае вока, што хаваецца ў глыбокіх балотных нетрах. Дык утопіцца ўсё цёмнае, сабранае з тваёй зямлі. Прыгожай, чыстай... Цяпер такой, якой ты бачыў. Толькі не зазірай у мех, не развязвай яго.

Няцяжкім аказаўся твой мех, Пяруне. Панёс яго лясамі-доламі, узгоркамі ды пралескамі, дарогай і бездаражжу. Праз увесь мой шлях там нешта сіпела, плакала ды прасілася адпусціць. Толькі я не зважаў на гэта...

Міналіся цёмныя лясы. Гнеўна пазіралі на мяне ваўкалачыя лютыя вочы. Абяцалі няшчасці, абяцалі пакуты. Не спалохаўся таго. Заставаліся за маёй спінай ясныя азёры. Жаліліся баламутні з русалкамі, прасілі-малілі развязаць мех. Не пашкадаваў іх. Не засумняваўся. Не адступіўся...

Знікла мая доўгая дарога ў малой сцяжынцы, а сцежка растала ў ніцай траве, калі падышоў да шэрых балотных пустэч. Тады ўпершыню непрыветным здаўся мне той абшар. Нават цяжкім, нават змрочным... Але не супыніўся я, не завагаўся. Пайшоў па топкай балаціне, што па добрай дарозе. Нібы адчуўшы гэта, заскавытаў мой мех і жаласна, і адчайна. І тады, як адкрыўся ўжо чорны балотны нерат, здалося мне, што за маёй спінай упала долу іскрыстая зорка.

Разбілася?..

Ціха паўстаў няясны прывід.

— Не, не разбілася, — зазвінеў срэбным званочкам дзіўны голас. — Ды яшчэ ўведала твае думкі, Перуновы чарадзей. Не толькі ж табе глядзець у людскія душы...

— Чаму вы падаеце? Чаму разбіваецеся? Што для вас не так на гэтай зямлі?

— Прыгожая зямля. Усё на ёй ладна, усё чынна. Я проста хацела зіхцець ярчэй за маіх сясцёр, ляцець хутчэй праз бяздонне Сусвету. Ты першым можаш мяне зразумець... А я ж, пэўна, цябе. Што, хочаш стаць найлепшым? За што так аддана служыш жорсткаму Перуну?

— Адкуль ты ўведала такое, ясная?

— Адтуль, што ўбачыла з неба, як цягнеш ты вялізны мех. Як уся зямля просіць цябе з таго меху адпусціць...

— Дзіўная, дзіўная знічка.

— Дзіўная, бо нябесная. А ты нікога не слухаеш, зацяўся. Скажы, што чыніш усё гэта па добрай згодзе. Скажы... Хіба твая зямля для цябе не прыгожая? Як любіў ты заўсёды сваю зямлю, як заўсёды бачыў яе прыгожай, дык не цягні гэты чарадзейны мех... Адступіся, адпусці...

— Чаму ты, нябесная, так адчайна просіш мяне пра гэта?

— Прашу, бо спачуваю. Бо не хачу цяпер, разбітай, амаль зніклай, амаль забытай, бачыць пакуты яшчэ некага. Паспачувай і ты... Ты ж заўсёды быў добрым...

Пішчаў і плакаў чарадзейны мех, адчуваў блізкае бяздоннае вока. Хутка здзейсніцца Перунова воля... Ды была мая зямля заўсёды і яснай, і прыгожай. Не трэба плачу, не трэба жальбы...

— Ты хоць развяжы гэты мех, ты хоць паглядзі, — зноў просіць мяне нябесная. — Ты ж не ведаеш, каго збіраешся раз і назаўсёды кінуць у багну...

Я не ведаю. А ты так просіш... Памалу развязваю мех. Змоўклі просьбы, сціхлі стогны. І радасна стала самому, што супынілася ўсё гэта.

Нядоўгім было маўчанне, а карацейшай за яго — мая радасць... З дзікім віскатам ды глухой грозьбаю сталі ўцякаць з чарадзейнага меха нячысцікі. Лясныя, азёрныя, палявыя. Загалёкалі ды здзекліва засмяяліся, маўляў, не даруем табе, чарадзей, што ледзьве нас не ўтапіў... Тады, як пусцілася ў вясёлыя скокі нячыстая сіла, убачыў сваім усёвідушчым позіркам, як вырываецца з чарадзейнага меха нешта цёмнае... Страшнае... Няшчасці. Хваробы. Людскія звады. Усё тое, што здзекуецца з людства.

— Паглядзі на лепшых сяброў маіх, — кажа мне голас нябеснай знічкі. — Хоць прывечаны ты Перуном, ды не супыніць табе іх. Паглядзі цяпер, бо апасля будзеш бачыць адно іхнія дзеі на тваёй прыгожай зямлі.

— Ты не знічка. Не зорка.

— Табе трэба было раней пра гэта здагадацца, чарадзей. Такі спагадлівы, такі шчыры...

— Хто ты, што смяешся са спагады ды шчырасці?

— Я тая, каго ты болей не ўбачыш. Царэўна-гадзюка. Даведалася, пра што табе баліць... Скінулася знічкай. Не шукай мяне, а лепей бойся хуткай кары. Я не падманула пра тое, што Пярун жорсткі...

Знік зманлівы прывід. Спалохана супыніла свой гаманлівы карагод нячыстая сіла. Глядзіць на хіжыя здані, што паплылі па купчастым балоце ўслед за царэўнай-гадзюкай.

— Хто яна? Чаму я ніколі не чуў пра яе?

І мовіць мне ў адказ аброслы мохам стары-стары пушчавік:

— Радуйся хоць гэтаму, чарадзею. Бо хто сустракае яе, той ужо не ходзіць па нашай зямлі...

Згодна суклаdensіліся астатнія нячысцікі, маўляў, калі сустракаем яе, тады не маем сілы ў сваім валадарстве.

— Як можаце вы ды не мець сілы? Дык хто ж яна, для якой няма чараў?

— Мы не ведаем. Яна старэйшая за наш свет...

А я ведаю. Нахіляюся да развязанага меха, дзе засталіся разбітыя знічкавы люстрынкі-друзачкі. І вас укінуў сюды Пярун-грамаўнік. Каб не спакушаліся людзі марнай надзеяй, каб не спадзяваліся на тое, што наўрад ці хоць некалі станецца.

— Вы разумееце, нячыстыя, што гэта жорсткасць? Пакуль адзіная, учыненая ім, якую я бачыў на свае вочы.

Не разумеюць, маўчаць нячыстыя. Бяру ў рукі ясныя люстрынкі. Цёплыя яны, нібы жывыя. Нібы таксама хочуць вызваліцца з гэтага чарадзейнага меха. Я вам дапамагу... За тое, што разбіліся на маёй зямлі, за тое, што невінаватыя. Трэба паверыць...

Нядоўга паклікаць чары, аддаць ім усю моц чалавечай душы. Хай накрые навальнічным гневам зямлю. Прыходзь пад водгулле ляскатлівых стрэлаў, Пяруне. Скажы мне грозна:

— Ганьба табе, чарадзей, што выпусціў усю гэту брыду. За гэта хадзіць табе па зямлі давеку, збіраць усё тое, пакуль дачыста не збярэш.

І кінуў мне на плечы свой чарадзейны мех. Я ж табе не змаўчаў:

— А за тое, што выпусціў спадзяванне-надзею?

— Лепей было б табе не ўспамінаць пра гэта. Але як пажадаеш... Памятаць табе ўсё, ізноў, ізноў нараджаючыся. Ніколі не страціць надзеі. Ды пакуль ходзяць па белым свеце няшчасці, хваробы, звады, пакуль хаваецца недзе мая варагіня — царэўна-гадзюка, будзе імклівае спадзяванне ад цябе ўцякаць. Разбівацца, як твая ўлюбёная зорка...

Абяцаў так ды знік у непраглядных хмарах. Мінулася навальніца, і зноўку гляджу на зямлю ў промнях сонца. Я, Бусліч, я вечны, як белы свет, як гэта зямля. Зямля ў слядах мінулага, якія адкрывае мне ўсёвідушчы позірк. Прыгожая, ясная, чыстая... Такой белай-белай вяртае яе мая людская памяць. Не сумняваюся, бо зноў і зноў перажываю гэта кожнае птушынае жыццё, калі нясуць мяне белыя крылы ў высокае неба. Адтуль жа бачна ўсё... Лясы. Палі. Азёры. Мяккі спеўны верас, які так трывожна крапаць лёгкім крылом...

Мяне любяць, і клічуць, і берагуць. Ды і сам я гарнуся да людскіх хацін, некалі ж быў чалавекам. Будую ля хат свае буслянкі ды гляджу пільным усёвідушчым позіркам, што робіцца ў людзей на сэрцах. Я разумею іх, я ж некалі быў гэтакім жа. А цяпер... Чорны мех застаўся на маіх плячах. Збіраю цёмную брыдоту, гляджу, каб не тулілася яна да людзей, не падманвала, не здзекавалася. І шукаю, шукаю царэўну-гадзюку, якая ад мяне хаваецца, якая мяне баіцца.

Я ведаю, што некалі яе знайду, што некалі яе злаўлю, як ведаю свае крылы. І тады знікнуць з белага свету няшчасці, хваробы, звады. Усё тое, што не дае людзям жыцця... Таму і слухаюцца маіх крылаў вятры, пасланцы Перуновы. А ён памятае мяне, ніколі не ўдарыць у маю буслянку... Моцна гаспадару над усімі яго вятрамі, якія лятуць па-над маёй зямлёй. Не пускаю буры, ацішаю навальніцы. Клічу лёгкія хмары з вясновымі цёплымі дажджамі. Я ж люблю яе, маю белую зямлю. Я — Бусліч. Таксама белы...

## З БЯЗДОННАГА БАГАЦЦЯ...

*Легендавае*

Пявун-звон трымцеў ціха, тужліва. Як жаліўся ды плакаў, як шкадаваў! Пра што? Я не мог яго зразумець. Хоць і бачыў тое самае, чуў тое самае, пражыў тое самае...

— Не падманвай сябе! Як ты можаш нешта пражыць? — гэта мне азываецца з бяздоннай глыбіні, угадаўшы таемную думу.

Можа стацца, што і не зусім таемную. Ды і чаго таіцца? З таго, што быць нам давеку рознымі? Часам такім паразумецца прасцей, як самым блізкім.

— І не думаў падманваць, — шапчу з верасамі ў адказ. — Толькі не жалюся, не плачу. Хопіць і табе ўжо нудзіцца. Проста падумай, пачакай.

— Не веру, не веру табе! — гнеўна трымцяць азёрныя хвалі, не хаваюць сваёй нязгоды.

І смешна робіцца тады. Так, як было ў самым пачатку...

— Бом, бом, бом! Ну і з чаго мы смяёмся? З саміх сябе?

А чаму б і не? Ты ж не засмяешся. Хоць і спеўны, хоць і гаваркі. Ды не ўмееш заходзіцца звонка...

— Умеў! Некалі... А ты ж маўклівы, ты ж пануры...

— Я не заўсёды быў такім.

— Я памятаю. Бом, бом, бом! Памятаю!

І мне таго не забыць. Толькі якое ў гэтым шчасце? Паўсталі курганы, задымелі ціхімі верасамі там, дзе я некалі прайшоў. Веліч ды ўзнёслы спакой калышуцца ветрам, як азёрныя хвалі. Там яднаюцца і радасць, і боль... Гэта я. І я б хацеў пазбавіцца гэтага. Адно ніколі не змагу, як ты не зможаш пазбыцца песні.

— Не змагу, бо не хачу! — выгукваеш мне ў адказ.

— Не веру табе!

І тады смяешся ты, звонкагалосы. Добры. Ціхмяны. Лагодны. Не такі, як я. Ды ўсё ж не з тых, якія даруюць. Мы абодва і прабачалі, і каралі. І забываліся пра тое. А ці адмо-

віліся ад гэтага? Не ведаю... Пявун кажа мне зноў, што ўжо пазбыўся летуцення і спачування. А я зноў яму не веру... Занадта доўга бачыў, занадта доўга ведаў... Ды і сам ты ці верыш, ясны?

— А што не верыць? Успомні, як з'явіўся княжы курган...

— Не забыў. Ды ці не быў гэта адзіны раз, калі на крыўду ты азваўся крыўдай?

Помню, як ты спяваў-звінеў над слаўным горадам. І сам быў жаданым, і сам стаўся слынным. Цябе слухалі, твайго голасу чакалі. Акрыляў, спавядаў, будзіў... Азываўся ў самых прарочых сэрцах. Ды і як не з таго ў самога цябе забілася сэрца... Жывое, чулае.

— Не, ніколі не займее сэрца жалезны звон...

Пярэчыш мне. А ўсё ж я думаю, што абудзілася ў табе сэрца. Іначай чаго ж ты спужаўся, як прыйшоў той грозны ваяр... Хоць не, зусім ты не баязлівец. Спудзіўшыся ад нечаканасці, не змаўчаў, а стаў клікаць абаронцаў горада. І яны пачулі цябе.

— Нядоўгай была абарона...

— Вось, чуеш сам сябе? І дагэтуль памятаеш, і дагэтуль шкадуеш... Значыць, маеш сэрца. Ці зноў мне, твайму вечнаму саперніку ды злаславу́цу, веры не дасі?

— А што верыць ці не верыць?.. Ты ж там быў, усё бачыў.

Гэта праўда. Я быў і бываю ўсюды, дзе ўспыхвае бойка. А тады звінеў і на сценах, і ў дзядзінцы. Кароткае адчайнае змаганне, яшчэ больш упартае ад таго, што прыйшлі адна да адной няроўныя сілы. Накацілася чужынская, злавесная, вынішчальная. Бясконцая, нібы азёрныя хвалі. Паўстала супраць яе нам абодвум блізкая... Узялася за зброю тая, што не ўмела нападаць, а толькі баранілася ды не хацела саступаць... Я памятаю тых, хто быў з ёю. Што ж з таго, як было іх мала? Але яны перамаглі.

— Іх перамаглі, ты хацеў сказаць...

— Не, зусім не памыліўся. Можна перамагчы, паміраючы. І можна стаць назаўжды зганьбаваным ды пераможаным, застаўшыся жыць.

Веру, што цяжка табе гэта зразумець. Вось чаму мы такія розныя. Але ж якая ўчынілася тады бойка! Тыя чужынцы былі і моцнымі, і рашучымі. І не аднойчы лёгкім наступам бралі горад. Не сумняваліся, што ды як рабіць… Але ж такога прагавітага змагання, не, зусім не чакалі. Былі здзіўлены. А я даўно ўжо ўведаў, што здзівіць — значыць перамагчы. І доўга-доўга пасля не бачыў я такой смеласці…

— Сапраўднай смеласці?

— І не пытайся. Табе ёсць чым ганарыцца. Ёсць што славіць у песні.

— Я і славіў. Не маўчаў, пакуль хоць хто заставаўся жывы. Каб чулі яны, каб спадзяваліся…

— О так! У той дзень я чуў цябе ўсюды.

Але загінуў апошні з абаронцаў, і ты замаўчаў. Ціха. Жалобна. Скрушна. Так, як цяпер плачаш… Ты не вытрываў. Ды што я кажу? Зможаш-здолееш усё, вечны, жалезны… Не змагло ў той дзень тваё жывое сэрца…

— Не змагло…

Той злавесны волат пачуў цябе. Пазнаў у тваім голасе выклік, зразумеў непакору. Не мог адчуваць сябе пераможцам, пакуль ты быў… Проста быў па-над сваім светам. І таму загадаў скінуць цябе са званіцы, утапіць у глыбокім возеры. Каб назаўжды пазбавіць голасу зваяваны горад…

— Толькі ці можа ўтапіцца жалезны?

Ты не ўтапіўся. Салёнай зрабілася вада ад слёз. Ці гэта яны трымалі цябе? І не магло паглынуць твой звон вялікае возера. Не змагло выпіць твой голас… Адчайна разліваў ты свой гнеўны неспакой, калі ў непрагляднай глыбі хавалася сонца. Клікаў чары, адкрытыя толькі табе… Уцякалі ад скаргі-звону ў пушчанскія нетры ўсе жывыя… Як адчулі тое, што здарыцца…

— Здагадаліся пра мой намер...

Толькі яны, злавесныя, не маглі здагадацца. Ці былі яны жывымі? Зусім не былі... Дыхалі, хадзілі, рабавалі... Шукалі золата-срэбра... І знайшлі, каб застацца з ім навечна...

— Бом, бом, бом! Багаты горад. Нямала ўсяго...

Ды ўдаўся багаты яшчэ і помслівым. Чорным шарам лётала апоўначы па спустошаным горадзе чума. Не шукала багаццяў. Не глядзела на іх, нежывых... Адно рабіла так, каб сталася ўсё правільна. Не ўтрымае жыцця той, хто нішчыць жыццё... Толькі дагэтуль цяжка мне даўмецца, як ты, добры, спагадлівы, адданы Сварогаву вітанню жыцця, змог даклікацца Чарнабогаву служку. Бо скажу па шчырасці: я баюся яе. І не аднаму мне страшна глядзець на тыя доўгія кашчавыя рукі...

— І я баюся яе. Не цярплю. Не выношу. Таму і чую яе крокі за многія вёрсты.

— Мог бы мне і прызнацца...

— Няма ў чым. Павер.

— Не, зноў не веру.

— Значыць, не пакінеш зласлівіць.

— Не, і не падумаю ўганараваць цябе спакоем... Не будзе спакою табе!

Азываецца звонам самае пявучае возера. І тады ад вясёлых перазоваў прачынаюцца сінія вочы зямлі. Глядзяць табе ў душу. Як быццам кажуць, што не забудуцца на твае шляхі-падарожжы ля іх, вечных. Што ніколі не забудуць цябе, колькі б часу не мінулася... Не хочуць цябе забыцца, не хочуць цябе пакінуць. Навошта ім спакой? Радыя ўсім песням, якія зможа стварыць чалавечае сэрца...

Не забывайцеся, не трэба. Што мне вам сказаць? Як не жадаў, так і не жадаю спакою. Звоняць сінія званы. Звоняць-будзяць... І тады зноў пытаецца ў мяне самы чарадзейны з усіх:

— Той злавесны ваяр, які ўцёк, кінуўшы ўсе нарабаваныя багацці, ён баяўся ў сваю астатнюю хвіліну?

Што мне сказаць… Уцёк, кінуўшы ўсё золата-срэбра, дзеля якога прыйшоў. Пабег, страціўшы ўсіх, з кім хацеў падзяліцца. Ці былі ў яго чалавечыя пачуцці? Пэўна ж, былі. Сябры, з якімі ён хадзіў у паходы, ваяваў гарады, — ягоная сіла ды вера… Якая? У што? Я б мог расказаць, ды не хачу дадаваць большай скрухі…

— Яму было страшна як ніколі. Ён шкадаваў пра кожнае забранае жыццё… Званіце пра гэта, званы. Кажыце свету праўду…

Яму было страшна. Але ж бег-уцякаў далей і далей… Не, зусім не хацеў схавацца. Проста зразумеў, хто за ім ідзе. Думаў сустрэць як роўны Чарнабогаву служку. Там, дзе вырашыць сам… Звыкся вырашаць усё па-свойму, моцна звыкся. Некалі я прывячаў такіх, моцных, самастойных. Але не цяпер, не цяпер…

Я трымаў яго за руку, трымаў увесь нядоўгі час. Ведаў, пра што ён думаў. Не шкадаваў пра знішчаны горад, не сумаваў па сябрах, якія памерлі за яго. І ўжо, спазнаўшы, што ў сваёй астатняй бітве не зможа перамагчы, не баяўся, не нудзіўся. Я б мог амаль ганарыцца ім… А тады проста сказаў:

— Памятаеш мяне? Ты выбраў мой шлях… Але я ў табе памыліўся.

— Навошта ж дараваў мне перамогі? Навошта рабіў моцным? — мовіў хоць і здзіўлена, але спакойна.

— Не дараваў… Перамогу забірае варты.

— Значыць, ты нічога не зможаш без мяне.

— Не змагу. Ды прыйдзе іншы. Я буду доўга яго чакаць.

— Ты не хочаш. Ты не любіш чакаць. Ты прагнеш бітвы болей, чым я…

— Не люблю. Не хачу. Але я прагну бітвы, а не крыві…

— Кроў ліецца ў бітве. Бітва — гэта кроў. У чым жа розніцца?

— У табе. У такіх, як ты. Ва ўсіх тых, хто прыходзіць змагацца і хто застаецца пасля.

— З абаронцаў горада нікога не засталося. Якая ім розніца? Не разумею цябе. Я адчуў, што гэта незвычайны горад, з першага позірку. Таму і захапіў. Таму і забіў усіх. Ты сам ад іх адступіўся. Ты сам убачыў, што яны нявартыя.

— Я б хацеў падараваць ім жыццё. Але я змог падараваць толькі перамогу.

— Перамогу? Я разрабаваў твой горад. Я знішчыў яго голас.

— А чаму, пераможца, уцякаеш ты, страціўшы ўсіх, каго прывёў з сабою? І дзе твае нарабаваныя скарбы? А голас... голас трэба чуць.

— Я страціў усіх і ўцякаю, таму што ідзе за мной нешта, з чым не можа змагацца смяротны. Я б не збаяўся змагацца з цэлым войскам.

— Я памятаю. Ты некалі гэта рабіў.

— Дык падаруй мне варты скон. Ты ж ніколі не пакідаў мяне.

— Я і цяпер цябе не пакіну. Адно што я табе ўжо не патрэбны.

— Гэта твая адплата? За што?

— За ўсе забраныя табой жыцці. А як жа ты думаў? Вечна перамагаць і забіваць?

— Не, вечна змагацца, як і цяпер. Не баяцца. Не маліць. Годна сустракаць скон... Мне спадабалася гэта ў абаронцах твайго ўлюбёнага горада. Ды ты сам усё бачыў.

— Бачыў. Я ж быў усюды.

— Ды ў іх не мелася шанцу. Няшчасныя няўмекі! Што табе да іх? Ты ж ніколі не быў жаласлівым.

— Не быў жаласлівым. І не буду. Да цябе.

— Не падманвайся. Ты ж такі самы, як і я...

І шмат казаў яшчэ. Хацеў слаўна памерці. Даказваў, што варты доўгай памяці. Пашаны за справы свае. Высокага пачэснага кургана ў шырокім зялёным полі. Будзе табе курган... Не, зусім не высокі, не пачэсны. Зарасце ён хвоямі ў

цёмных лясах. А табе векаваць пры ім ценем, палохаць ды здзіўляць, адно не пазбавіць жыцця анікога... І ўсё гэта я паспеў прадбачыць, перш чым з астатнім водбліскам сонца цябе дагнаў чорны шар. Выпусціў свае прагавітыя страшныя рукі... Ты не плакаў, не маліў. Адно кінуў мне на развітанне:

— Я памыліўся ў табе. Думаў, што ты даеш майстэрства... А ты даў толькі пакаранне за мой выбар... Ты нават горшы за мяне.

Горшы. Я ўпэўніўся ў гэтым, слухаючы бясконцы плач твайго ценю. З'яўляешся ты на захадзе сонца, ляціш па-над цёмнымі ляснымі шатамі. Крадзешся звярынымі сцежкамі, дзе не з'явіцца чалавечаму следу. Кажаш, што хочаш мяне знайсці. Кажаш, што хочаш мяне забіць. Я смяюся табе ў адказ, кажу, каб лепей шукаў, бо я да цябе бліжэй, чым здаецца. Адзіны ва ўсім свеце, хто цябе ўчуе. Хто гаворыць з табой, зноў і зноў паўтараючы, што кожны выбар мае адкупленне. А ты гнеўна крычыш, каб не казаў табе ні пра выбар, ні пра адкупленне. Іх няма для мяне, і чаму ж тады нешта такое павінна быць для цябе. Смяюся, зноў і зноў не згаджаюся... Ты ж не разумееш нічога.

— Бом, бом, бом! А ці ты на мяне забыўся?

— На цябе забудзешся, пявун! Не дасі ні імгнення спакою.

— І не падумаю! Не будзе спакою табе!

— Я і не спадзяваўся... Ведаеш, мы абодва супыніліся ў чаканні на самай літасцівай зямлі... Дзе б яшчэ такое ўчынілася?! Дзе б яшчэ ўсё так учынілася?!

Гэта той княжы курган, які яшчэ не зусім забыты. Пазбавілася памяць самага цяжкага — імя таго волата, але не знікла яго апошняя дзея... Не паўстаў разбураны горад. Ды аніхто не паквапіўся на пакінутае недзе там золата-срэбра. Заносіць яго вецер сухім пяском. Азёрная ж вада ля той паўвыспы, дзе некалі жылі людзі, дагэтуль салёная. Вада ўсё памятае. І зямля памятае. Там агортваюцца тужлівымі ценямі промні вечаровага сонца. Там не пяюць птушкі. Не славяць жыццё. Ды не паглынуць вада з зямлёю зарослы лесам курган, дзе спачы-

вае злавесны. Які хацеў багаццяў. Які ўсё пакінуў. Хіба гэта не літасць? Не прабачэнне? Я ведаю, у цябе ёсць што сказаць пра гэта, звонкагалосы. Можа, некалі і скажаш...

— А ведаеш, у чым я ўпэўніўся, бом, бом, бом? Што і ў табе б'ецца жывое сэрца... Яшчэ мацней, чым у ва мне...

— Не смяшы мяне, звонкі. Ты ж сам казаў.

— Бом, бом, бом! Казаў, што ты ніколі не паспагадаеш. Казаў. Але і вяшчунныя званы памыляюцца.

— Не веру табе!

Падняўся зарослы лесам курган, а ты яшчэ доўга адчайна трызніў. Вінаваціў мяне, наракаў на белы свет. І праўда была ў тваіх словах-скаргах. Я хутка пайшоў далей. Множыць роспач, дадаваць слёзы да слёз. Я заўсёды хадзіў з людскім гневам, з цёмнымі наваламі. А ты заўсёды гучаў у сэрцах песняроў, заставаўся ў іхніх жывых словах. Мы сустрэліся зноў хутчэй, чым можа здацца. І тады я цябе зразумеў...

— Бом, бом, бом! Ты заўсёды разумеў мудрых. Памятаеш мудрага?

— Не забыў. Але не ён, князь, падаўся мне такім.

Мудрэйшым за князя быў і шчыры, і просты.

Мусіў і служыць, і бараніць. Ісці першым пакручастымі шляхамі. Але заўсёды вяртаўся да сваёй зямлі, самай блізкай, самай важнай. Не шанаваў свайго ўладара, хоць быў адданым яму. Што і казаць, я раней нячаста бачыў такое. "Чаму ж тады верна служыш?" — пранік у чалавечыя думкі. І не заўважыў той, як адказаў, прызнаўся не мне, а сабе: "Не яму служу, свайму краю". Магло быць і горай. Я ж не забываў пра таго, злавеснага... Цяжка мне забыць.

А небяспечнае чакае нас усіх бліжэй, чым здаецца. Хадзілі чорнымі наваламі адданыя князю, многія не вярталіся. Тыя, хто здабываў перамогу, станавіліся гордымі і няўважлівымі. Але і на сваёй зямлі можа адбыцца страта... Пра гэта пыхлівыя забываюць так часта. Уганараваным быў і мудры ўла-

дар. Іхнімі перамогамі, іхняй самаўпэўненасцю. І што з таго, як годна трымаў тураўскі пасад? Здарыцца ж такое, што на паляванні застаўся без анікога. І тады да яго, тураўскага, выйшаў вялізны раз'юшаны тур. Не выйшаў — напаў. Не пабачыў у чалавеку сваёй іскрынкі. Але была тая маленькая ў простым, адданым. Бо зразумеў адразу, што трэба ўчыніць...

— Бом, бом, бом! Не бараніў — заступіў. Проста стаў перад турам, які ад таго і не схацеў біцца. Хутка знік без следу ў непраходных лясных нетрах. Мне спадабалася гэта...

— І мне спадабалася гэта... Вось чаму той просты, мудры хутчэй твой, чым мой.

— Наш. Ён наш, бом-бом!

— Няхай будзе нашым.

— Пярэчыш мне?

— Цяжка з табою, гаваркі, спрачацца. Таму спрачацца не буду.

У тую часіну моцна здзівіўся мудры князь, раней не бачыўшы такога. Спытаў пра ўзнагароду, але найболей хацеў паказаць сваю вучонасць. Маўляў, паглядзі, колькі золата маю, але жыццё даражэй за ўсё, дык бяры, сколькі зможаш падняць. Не ўразіўся княжай вучонасці просты. Не пакваліўся на дабытае ў цёмных навалах золата. Ды і ліслівіць не схацеў...

— Не, зусім не схацеў... Не ўмеў ён таго.

Не жадаў таго... Памятаю, як весела разляцеліся бліскучыя грошы, быццам непатрэбная драбяза. Гнеўна ўскінуўся ўладарны, але запыніў яго просты сваім словам. Пачуўшы яго, сумеўся князь, бо дзе ж яму ды знайсці вечнае багацце. Лёгка знікае яно, хуткаплыннае, і ў самых багатых княжых сховах не так і доўга шукаці дна. А ён, просты, не сумняваўся. Быў і цвёрдым, і пэўным. І слухаў яго ўладны, прагавіта думаючы пра незлічоныя скарбы, схаваныя глыбока-глыбока. Прадчуваў бязмежную радасць валодання ўсім гэтым.

— Не завалодаў надзвычайным скарбам... Бом, бом, бом!

— Не кожны здолее такі скарб адшукаць. Утрымаць. Спазнаць...

— Не кожны скарб можна ў скрынях жалезных схаваць. Гэта я зразумеў яшчэ тады, як падаваў голас са званіцы.

І я зразумеў гэта даўно... А скарб той чарадзейны. Не ў кожныя рукі і дасца. Ды ведаў мудры князь, што ўсялякай справе свой чалавек патрэбны. А хто ж налепей такое ўчыніць, як не сэрцам чысты, душой просты? Не думаў сам, звыкнуўшы загадваць, што нехта на княжую волю не зважыць, што не збаіцца пагроз. Маўляў, не служыў бы табе, ясны княжа, каб ведаў, што падзяка твая ды адзавецца пагрозным загадам.

— Пагрозным загадам знайсці чарадзейны калодзеж, у якім першае дно ды медна-мядзянае, другое ж срэбна-срэбранае, а трэцяе залатое. Тры дны, бом-бом-бом! І з кожнага ўхапіць...

О, той пагрозны загад! Прыгадай, просты, людскую паказку... Зрабіў той калодзеж сам Тур, які горад заснаваў, чары моцна ведаў, ды схаваў таемным словам у цёмнай лясной глушэчы. З тых пракавечных часоў вартуе Тураў калодзеж звярыная лютасць, не дазваляе наблізіцца анікому. Можа быць, на ловах тых выпадкам наблізіўся да чарадзейнай сховы, дык і перастрэў мяне раз'ятраны, мабыць, самім Турам закляты. Ой, не так сабе ты, шчыры, апынуўся паміж намі. Ведаеш, хаваеш. Лепей схову тую ды па-добраму пакажы. А то, бач, разгаварыўся пра вечныя скарбы...

— Не мог не паказаць чарадзейнай сховы шчыры, а просты...

— Не мог не паказаць... Але застаўся верным сваёй зямлі.

Быў і застанецца. Ляціць з верасовым шэптам яго чалавечая радасць па-над зямлёю, па-над светам. Што ёй гняўлівая княжацкая воля... Цэлую вечнасць быць той радасці, не знікнуць, не мінуцца. Знайшоў чалавеча найвялікшы скарб, і аніхто таго скарбу ў яго не адбярэ, не адніме. І няхай сабе няўцямна чакае князь. І з чаго толькі яго празвалі мудрым?

— Глянь, княжа, вось яно, вечнае багацце... Ніхто яго не скрадзе. Ніхто не прап'е, не прагуляе.

А я трымаю яго, простага, за руку. Гляджу ва ўсе вочы на бяскрайні абшар палёў і зубчатых лясоў, якія просяць на-

заўжды з імі застацца. Мяккая лёгкая зямля пад нагамі. І ведаю, пэўна ж, толькі я адзін, што калісьці тут пралілася злая чорная кроў. Некалі прыйшлі многія, з раскосымі вачамі, з жорсткімі сэрцамі. Здабывалі палоннікаў, множылі попел, пакідалі смерць. Я так узлаваўся на іх за гэта. Яны засталіся тут назаўсёды. Ніколі не дараваў пажадным... А цяпер проста бачаны-перабачаны мною абшар. І табе, просты, наканаваны...

— Добра князю адказаў, добра людзей павесяліў! А як большага багацця-скарбу не просіш, то атрымай сабе гэты, вечны. Міласцю сваёй княжацкай дарую!

І загадаў князь закапаць простага ды дзёрзкага ў дол. Ды насыпаць курган на цвёрды напамін ды навуку... Любіў вучонасць, не быў бы мудрым. Мабыць, спадзяваўся, што ходзіць мудрасць там, дзе адкрываюць свае пашчы пагарда і помста. Хацеў слабыя чалавечыя сэрцы зваяваць. Каб аніхто болей не насмеліўся сказаць нязгоднага слова...

Мне заўсёды падабаліся дзёрзкія. Толькі гэты, шчыры, а просты, хоць і хацеў удацца, але такім не быў. Абяцаў вярнуцца да князя, прыйсці зноў да яго дзяцей, да яго ўнукаў.

— Чакай мяне і вер, што нічога не мінецца. Будзе пакутаваць род твой. Не мая помста, але твая да цябе вернецца. Чакай, не спадзявайся на выкупленне.

Засмяяўся пагардліва князь. І споўнілі верныя ягоны загад... А я ўсё трымаў таго, простага, за руку, ведаў апошнія думкі. І спытаў яго многа часу апасля, як забылася ў народзе князева імя, як мінулася слава мудрага роду:

— Што ж не выканаў ты свайго абяцання? Ты ж мог тое зрабіць.

— Мог. Стацца такім жа, як уладарны. І калі б гэта здарылася, я б па-сапраўднаму памёр. А хто ж пажадае сабе смерці?

— А калодзеж чарадзейны ты навошта паказаў?

— Паказаў. І цяпер паказваю ў глыбокі-глыбокі дол. Яму ды і ўсім такім. Ён жа марыў пра вечнае багацце... Неабсяж-

нае, найвялікшае. Хто ж я, ціхі, малы, каб пазбаўляць князя ягонай мары?

Паказваеш. У глыбокі-глыбокі дол, дзе табе назаўжды застацца. Блізка-блізенька ад цябе меднае дно, дзе хаваюцца ўсе чары тваёй і маёй зямлі. Жывуць, дыхаюць, твораць. Мацуюцца кожным учынкам нашчадкаў. Блізка ад цябе, просты, і сярэбранае дно. Хавае яно ўсё, што мінулася. Усіх тых, якія не маглі мінуцца. Не маглі знікнуць у небыццё. Чакаюць свайго вяртання ў свет. Блізютка ад цябе, шчыры, залатое дно. Нічога там няма. Не было. Не будзе. Плёхаюць бязмежныя воды, вялікія, як само чалавечае цярпенне. Чакаюць, пакуль перапоўніцца мера людскіх пакут, пакуль выбухне самы страшны гнеў, пакуль спляжыць усё самая лютая нянавісць. Тады парвецца залатое дно, выпусціць сваю сілу. І паглыне вада ўвесь чыста свет, зальe, як не было яго ніколі.

— Паказваеш, паказваў чарадзейны калодзеж. Хіба ты вінаваты, што не ўбачыў яго князь? Хіба ты вінаваты за тых, прагавітых?

Чую над светам толькі тваю радасць... І трошкі шкадавання. Твайго і майго. Я б лёгка яшчэ пахадзіў з табой па зямлі. Без крыўды. Без страты. Адно баронячы тое, што належыць бараніць. А ты, просты, лёгка паціскаеш мне руку. Гаворыш, што хапіла падарожжаў на тваю долю. І мне хапіла. Толькі... Шкада...

— Не шкадуй, гартаваны.

Гэта ты, просты, а шчыры, азываешся мне. Ды я і не шкадую. З пашанай побач не ходзіць шкадаванне. Мы зразумелі гэта даўно...

— Праўда, звонкагалосы?

— Бом, бом, бом! Пярэчыш нямала... Не веру табе!

— Ды я сам сабе ўжо не веру.

— Не падманвай мяне, галасістага, ты, гартаваны. Мы абодва ніколі не страцім ні пэўнасці, ні зацятасці. Для гэтага занадта доўга на белым свеце.

Цябе не падманеш. Звонкі, разумны. Ведаеш мяне навылёт. Як і я цябе. Спрачаліся мы з табою і змагаліся. Многа-многа...

— Бом, бом! Многа-многа...

— І аніяк не здолее адзін з нас перамагчы другога.

— А гэта трэба, перамагчы?

— Вось і я думаю. Але навошта ж тады зноў ідзём адзін на адзін?

— Не ведаю, бом!

— І я не ведаю.

Мабыць, мы абодва павінны тое ведаць. Быць пэўнымі, не сумнявацца ані кроплі. Бо паўставалі, як непахісныя ратныя. Бо зноў паўстаём у свеце, не дорым яму спакою. Але мы не ведаем. І не хаваем таго...

Я, гартаваны, першым пайшоў па-над светам. І доўга быў адзін. Толькі як з'явіўся ты, звонкі, галасісты, зразумеў, што цяжка трываць адзіноту. І быў рады табе. Апекаваў твайго стваральніка. Памятаеш яго?

— Бом, бом, бом! Ён — гэта я!

І мне так думаецца. Толькі дагэтуль дзіўлюся, як магло вяшчуннае слова ўдацца ў чалавечае аблічча, як магла стацца жывой праніклівая думка. Але што ж! Поўніцца дзівамі свет. З таго толькі неспадзяванкі...

І ніколі апасля не бачыў я, каб нараджала зямля такі талент. Пясняр, прарок, званар. Сэрца роднага краю, яго надзея, яго голас. Мне спадабалася, што мог ён ісці дарогай і бездаражжу, сустракаць і прывячаць. І ўсюды, дзе б ён ні крочыў, знаходзіў і пакліканне, і чаканне. І я ведаў, што ён павінен быць. Проста быць з маім светам...

— І таму адводзіў ад яго самых лютых. Бараніў, шануючы яго, іншага, бом-бом. Схаваўшыся, бярог песню ў нашым свеце.

Ён не заўважаў, што часам я дапамагаю яму. Крыху. Зусім трошкі. Я рады быў так чыніць, рады хоць бы таму, што ўпершыню свет падараваў роўнага мне. З ім было нясумна. І я ўспомніў, што такое горыч страты, калі скончыўся адпушчаны яму век...

— Кароткі век, наканаваны лёс... Бом, бом, бом! Не сумуй! Нам з табою няма расстання!

І я нібы зноў вярнуўся, калі пачуў ягоны голас з высокіх званіц. Многа-многа званіц. Твой голас, звонкі. Кожны раз, як учую цябе, нібы птушкай узлятаю над абшарамі палёў і лясоў. І лёгка мне далёка-далёка ляцець, і проста мне пранізліва бачыць... Верыць. Чакаць. Прызыўна азываецца пакінутай песняй самая мілая мне зямля.

— А ты, галасісты, чакаеш?

— Павер, што чакаю. І я падарожнічаў па самай мілай зямлі. Глядзеў, як проста ты ломіш крывую шаблю, хіліш долу крыжацкія кіпцюры. Зайздросціў табе, бо сам я так не магу. Але ведаеш, што...

— Што, звонкі?

— Гэта я вёў цябе. Клікаў песняй далей і далей. І часам нават не ведаў, дзе пачынаешся ты, дзе знікаю я... Ці я не знікаю зусім? Ці ты ёсць усюды?

— Мы ёсць побач, галасісты. Блізка, блізка...

— Не веру табе. Можа, як кажаш, ёсць мы і блізка. Але ж чаму тады і я, і ты чулі не раз, што песня праганяе вайну? Што там, дзе ёсць песня, не ўспыхне бойкі? І супыняецца бойка, калі загучыць песня... Гэта ж мы спрачаемся, як заўсёды.

— Таму што мы розныя. Але ў нас блізкі лёс.

— Раскажы пра свой лёс, гартаваны. Колькі ж табе спатрэбілася часу, каб стаць такім... такім халодным...

Не так ужо і многа. Як ні дзіўна... Ты не маўчыш, бо ты не зняверыўся. Я зайздрошчу табе. Зайздрошчу твайму таленту — спадзявацца і верыць. Сам я так не магу. Гартаваны, не выношу жаль. Не люблю чуласці. Гэта ўсё тваё... Калісьці я палічыў тое за слабасць і адмовіўся раз і назаўжды. Але вось жа цудоўная праява: я ніколі не лічыў слабым цябе, звонкагалосы. Што ж тут зробіш...

Ты некалі быў чалавекам, я быў. Зведаў і майстэрства, і душу зброі. Так, не спрачайся, і ў зброі ёсць душа. Цёмная,

трывожная, спавядальная. Моцна памятлівая. Яна ніколі не забывае тых, хто трымае гартаваную. Збірае па драбніцы іхні гнеў. Збірае, тоіць, каб аднойчы ўлеўна абрынуцца. "На каго?" – спытаеш ты, галасісты. А на саміх гнеўных, неміласэрных, недаравальных. Можа быць, што і смелых, адважных. Але жорсткіх. За гэта і прыходзіць адплата...

– І табе прыйшла? – ціха пытаешся, галасісты. Смешна гучыць твой шэпт...

– І мне. А чым я лепшы?

– Чаму ж не стаў ты жахлівым ценем, як той ваяр? Не знік за гады і стагоддзі?

– Ведаеш пра яго? Усё?

– Здагадаўся. Не паверыў у тое, што ён баяўся. Ты ніколі не важдаўся з палахліўцамі, бом, бом, бом! А мне ж гэта падабаецца ў табе.

– Славіш песняй смелых? Нават такіх? Ды чаго я дзіўлюся! Памятае людское сэрца пра волата, які ўчыніў нешта злое. Памятае, не можа забыць. Часам называе яго і Княжам... Дык ці мала што зрабіў? Але ж волат... Але Княжа...

– Не пагарджай смеласцю. Нават такою. Не зневажай літасць. Нават да такіх... Ты нічога не сказаў пра сваю адплату.

– А мая адплата – не знікаць у гадах і стагоддзях. Можа, і вельмі б хацеў, але не магу. Не супыняюцца звады і кроў. Зноў і зноў цягнуцца да гартаваных. Да такіх, як я. І зноўку шукаю самае страшнае ў бяздонні чалавечай душы.

– І што знаходзіш, бом?

– Нічога не знаходжу. Там усё, што я бачыў шмат разоў. Ад чаго даўно стаміўся. І мне зусім не здаецца страшным тое, што жахае іншых... А ты, што ты, звонкі, знаходзіш у чалавечым бяздонні?

– Новую надзею. Больш моцную, чым азывалася раней. Новую палымяную веру! Стакроць мацнее раней ледзьве чутная песня... І люба мне разганяць цемру гучным звонам... Не смейся, чуеш!

— А я і не смяюся. Проста надакучыла ўжо казаць, чакаць... Нават не верыць табе, самы літасцівы.

— Бом! А ты не жалься, не плач, не нудзіся. Проста падумай, пачакай.

— А я і думаю...

Пра тое, што заўсёды зайздросціў трыпутніку. Таму, хто вядзе да маіх курганоў, да тваіх азёр. Трывушчы, гаючы. Прайшоў трыма шляхамі-пуцявінамі, поўнымі варажнечы і гневу, але не страціў сваёй дабрыні, і надзеі, і веры. Лёгка і проста знаходзіць тых, каму патрэбны. Дапамагае. Лекуе. Не памыляецца ў нявартых.

Я ведаю гэта так добра, як і цёмную душу бразгатлівага жалеззя, прагнага да бітвы... Лячыў параненых, што вярталіся героямі да свайго народа. Акрыляў надзеяй знявечаныя душы. Спапяляўся ад чужога болю і адраджаўся зноў. Цяжка. Але ж трывушчы. І моцны. І праніклівы. Пазнае, пазнае нявінных...

І ты пазнаеш лепшых, звонкагалосы. Не хочаш адно пра гэта казаць... Ды няўжо думаеш, што гартаваны, пануры не здагадаўся? Я ж не заўсёды такім быў. І ніколі не быў маўклівым. Не спяваў, як ты, звонаў-песень, але ж не, зусім не маўчаў. У гэтым ты, мой вечны сябра, мой верны сапернік, памыляешся...

Чакацьмем лепшага. Самага-самага. Аддадзім яму песню, падаруем сілу, каб аніколі болей не ўшчынілася боек на белым свеце. Будзе і літасцівым, і моцным. Будзе абраным. Каб адно дарогу да патопленых у азёрах званоў, да верасовых курганоў знайшоў... Ды не, не баюся за гэта. Бо не памыліцца трыпутнік. Сам, шляхі спазнаўшы, прывядзе яго, прывядзе...

— Проста падумаем, пачакаем. Не будзем жаліцца на цёмную памяць. Не будзем плакаць пра страчаных. Не будзем нудзіцца пра саміх сябе. Не будзем...

— Бом, бом, бом! Веру табе! Бом, бом, бом!

# СЛЕДАВІКІ, СЛЕДАВІКІ...

*Легендавае*

Мы — моцныя... Нас — многа... Мы сонна глядзім на зямлю. Не трывожым яе кароткімі летамі, калі ўсе імгненныя так радуюцца жыццю. Маўчым дажджлівымі лістападамі, калі такімі блізкімі робяцца нашы нябесныя сёстры. Вялікія шэрыя хмары. Цяжкія, здаецца, вось-вось упадуць долу. Анічога не кажам завейнымі сцюжамі, калі кружыць ды гуляе ў белым халодным балі ўвесь свет... І чаму тады найболей сумуюць тыя, імгненныя, кволыя? Гэта ж весела — падпяваць гуллівай мяцеліцы. Ані зрушымся цёплымі вёснамі, калі адчуваем радасць вакол сябе. Вялікую радасць. Спадзяванні. Хіба ж можна тады патрывожыць, адабраць хоць каліва шчаслівых чаканняў у тых, якія мільгаюць каля нас яркімі зямнымі зоркамі?.. Імклівымі. Імгненнымі. Часам нам робіцца за іх крыўдна. Мы ж трывалыя... Мы ж вечныя... І мы сталі жывымі, бо нас пабудзілі маленькія зямныя зоркі.

Яны чуйныя, слабыя. Цягнуцца да святла і баяцца цемры. І вечнасць, глыбокая сіняя вечнасць палохае іх. Яны баяцца, што не здолеюць пакінуць слядоў на гэтай зямлі. Што іншыя, мацнейшыя і лепшыя, забудуць пра іх і ніколі не ўспомняць. Нам смешны такі страх. Але ж якое прагавітае жаданне памяці. Якое адчайнае імкненне яе пакінуць... Імгненне. Памяць... Яны вартыя ўспамінаў хоць бы за гэтую смеласць. Яны, адчайныя, ганарлівыя, самаўпэўненыя ды невінаватыя ў тым. Ім жа не хапіла часу зразумець, што памятаць значыць пакутаваць. Многа памяці — нямала пакут. Але мы трымаемся. Мы ж — дужыя. Мы ж — магутныя. Мы ж — справядлівыя... Да іх, яркіх, трывожных, але смелых зямных зор.

Мы не адразу зразумелі іх палымянае гарэнне. Здаецца, не разумелі і тады, як пабудзілі наш вечны сон нябесныя агніскі. Агніскі. Агніскі...

— Колькі ж вас? — у захапленні спыталіся мы. — Колькі ўжо мінулася вашых пакаленняў?

Нам важна было дазнацца, што мы не адны такія. Вечныя... Пра што ведалі ад самага пачатку. І шмат пыталіся ў нябесных агнісак. Але не пачулі яны нашых слоў. І дагэтуль нічога нам не адказалі. Ды мы ж вечныя... У нас ёсць час пачакаць. Ёсць час падумаць, што падобныя зямныя зоркі да агнісак. І зноў хочацца спытаць у іх, імгненных:

— Як трываеце вы такое зыркае мігценне?

Такое моцнае, амаль знішчальнае... Але гэтага мы не пыталіся. Не запытаемся ніколі. Не хочам пакрыўдзіць. Не хочам зашкодзіць. Мы самі зразумеем. Мы ж мудрыя... Нам аддаў сваю мудрасць час. Халодны, нялітасцівы. Пакутлівы. Тужлівы. І векапомны, і даравальны, і справядлівы. Час пакідае легенды ў нашых сэрцах. Каб зрабіць іх мацней? Каб зрабіць іх слабей? У гэтым мы яшчэ не разабраліся...

Пра тыя легенды мы думаем і летамі, і вёснамі, калі глядзім на радасных, летуценных. Яны нават і не паверацъ, што некалі самі могуць стацца легендай. Можа, узрадаваліся б таму? Але дарма. Дарма. Нам так шкада, што вялікі час дарэшты спляжыць іхнюю радасць... Мы навучыліся яе бачыць і пазнаваць за безліч стагоддзяў. Як жа мы хочам пра ўсё гэта расказаць! Ды не маем змогі падысці да іх, імгненных, не маем змогі мовіць слова. А хто падыдзе да нас? Мы ж амаль незаўважныя. У азёрах ды рэках, у лясах, на ўзгорках... У вялікім мінулым, якое ўсё чыста бачылі, якое ўсё чыста чулі...

Мы зноў і зноў успамінаем усё, што бачылі-чулі, дажджамі і завеямі. Каб яшчэ раз перажыць тое, з чаго ўсё пачалося. Каб нанова адчуць радасць і боль... Мы ж тады не ведалі пачуццяў, мы тады яшчэ не навучыліся спачуванню і гневу. Але пэўныя цяпер, што толькі тады былі па-свойму раднымі

ды летуценнымі. Яшчэ не спазналі нічога з таго, што нам трэба было спазнаць. Але ўжо былі вечнымі. Ужо пачувалі сябе мудрымі. І веднымі, як аніхто на зямлі. Можа, як на сталы одум, дык не моцна мы і памыляліся... З усёй жа зямлі была толькі неабсяжная белая прастора. Халодна-марозлівая. Але тады мы не ведалі пра холад, бо ніколі не адчувалі цяпла. Мы нарадзіліся і жылі, колькі памяталі сябе, на вялізных гордых вяршынях. Ад таго і самі былі гордымі. Пагардліва глядзелі долу, на тое далёкае, цмянае, нявартае нашай высокай увагі.

Іншая справа — недасяжная вышыня. Сіняя, то цямнейшая, то святлейшая. Але тады заўсёды халодная. Пахмурная. Мы не хутка, зусім не хутка назвалі яе небам...

— Глядзіце, глядзіце! Якія бліскучыя мільгатлівыя іскрынкі! Што ж гэта такое? Што?

Так мы першы раз убачылі агнісак. Не ведалі яшчэ, што яны амаль такія ж, як і мы. Але памяталі іх столькі, колькі памяталі сябе:

— Яны... яны вечныя. Ды яшчэ сягаюць вышэй за нас. Давайце пазнаёмімся...

Але пазнаёміцца з высокімі, загадкавымі нам тады не ўдалося. Здарылася непрадказальнае. Нечуванае. Здрыгануліся нашыя гордыя вяршыні, здрыганулася з імі сляпуча-непраглядная бель. Здрыгануўся ўвесь свет, які яшчэ не стаўся светам. Затрымцеў, спалохаўся. Але мы не спалохаліся. Нечаканая, непрадказальная забаўка? Дык хто ж адмовіцца ад такога...

І паплылі мы з белым мроівам далёка ад гордых вяршынь. Нас вабіла неаглядная белая далеч. Нам не верылася, што яна бяскрайняя, што за ёю нічога няма. Так спакушалі новыя падарожжы! Паціху аддаляліся ад нашых стромкіх вяршынь, шукалі сабе новы свет, не такі белы, не такі аднастайны. Мы тады яшчэ не ведалі, што новы свет нікога не чакае,

нікога не прывячае... Аддаляліся, як знікалі. Шукалі, не знаходзілі. Паўсюль адна сляпучая бель... І тады ўпершыню за сваё вечнае жыццё мы адчулі нешта, такое падобнае да смутку... Узгадалі пра такія знаёмыя, такія мілыя вяршыні. З гэтым як найвялікшае адкрыццё прыйшло спазнанне свайго, роднага... Не, пакуль не радзімы. Мы яшчэ не называлі тую старонку радзімай, а толькі адчувалі лучнасць з ёю, які б час, якая б прастора не паўсталі між намі. Мы яшчэ не ведалі, што такое пачуццё — першае і лепшае, чаму пакуль што навучыў свет.

Але мы ўсё ж знайшлі новую радзіму. Так, радзіма можа быць і новай... Тады прыгрэла жаўтлявае сонца, і зрабілася так невыносна горача, як не было ніколі. Пачала таяць халодная снежная бель, якая несла нас некуды наперад. Мы супыніліся. Мы даўно хацелі спыніцца, бо ўжо стаміліся ад бязмэтных вандраванняў. І тады нам адкрыўся новы свет...

— Глядзіце, як прыгожа навокал! — сказалі мы тады, яшчэ не прадчуваючы, што безліч разоў вернуцца да нас нашы словы.

Мы ж не можам усяго прадбачыць. Ды і не думалася тады пра гэта. Мы проста радаваліся, што знайшлі новы свет, які, адчулі ўжо, зробіцца і блізкім, і важным. Як глядзеліся ў саміх сябе... А тады любаваліся на іскрыстыя агніскі і маўчалі. Хоць нам хацелася сказаць:

— Усё тыя ж самыя і ўжо іншыя. Скажыце, што ж так непапраўна ў вас змянілася?

Але мы не спыталі. Няварта было парушаць тое велічнае імгненне. Мы ўжо зразумелі, што яго не заўсёды можна вярнуць. Глядзелі. Маўчалі. Захапляліся. Іх многа... Яны мудрыя... Яны вечныя... Зусім як мы. Ды не паспелі як след на іх наглядзіцца.

Нас пабудзілі. Нечакана. Раптоўна. Мы не ведалі, хто яны былі. Мы не разумелі, чаго яны ад нас чакалі. Яны плакалі, пакутавалі, прасілі... І хутка-хутка знікалі. Змяняліся, пры-

ходзілі новыя. І зноў новыя... І зноў... Пакуль не ўцямілі мы, што яны нам маліліся, што жадалі абароны ды спагады. І ці мала чаго яшчэ... Мы доўга не маглі да ўсяго дайсці. Але яны нас здзівілі. Мы былі і моцнымі, і трывалымі, ды толькі даць сваёй сілы іншым, слабым ды кволым, не маглі.

А яны прасілі. Хадзілі вакол нас спеўнымі карагодамі. Прыносілі тое, што самі называлі дарункамі. Станавіліся на калені, утрапёна цягнулі рукі... Яны спадзяваліся. Яны чакалі. А мы... А мы не адразу здагадаліся, як так учыніць, каб падзяліцца сваёй веднасцю. У веднасці ж сіла... І цяпер нам шкада толькі аднаго. Шкада, што нам не толькі маліліся, шкада, што нам прыносілі кроў...

— Навошта, навошта яны гэта робяць, калі самі жывуць усяго імгненне? — нам хацелася заплакаць з крыўды, каб яны пачулі нашы галасы.

Але занадта кароткімі былі іхнія імгненні, каб нас пачуць. Нас і цяпер цяжка пачуць, на вялікі жаль... Мы ж не мовім... Але лятуць, лятуць нашыя думкі па-над светам. Нашыя ўспаміны. Жаданні. Жаданні...

— Не шукайце каля нас заклятых скарбаў. Не спадзявайцеся намарна. Схавалі мы іх глыбока-глыбока... Маеце ўжо найдаражэйшы скарб. Шануйце яго!

А яны, яны забываліся. Тады, як зырка ўспыхнуўшы, падалі долу нябесныя агніскі, яны марнавалі дарэшты дарагія імгненні, вынаходзячы новую зброю. Камяні хутка змяніліся мячамі. На мячах пачалі біцца. За лепшую зямлю, як быццам малы белы свет. За гонар і славу, як быццам патрабуюць яны крыві. За мяккае жалеза колеру сляпучага сонца...

— А яно ж тут пры чым? — не маглі мы зразумець, хоць і вельмі хацелі.

Мы сталіся халоднымі межамі, пазначаючы шляхі варажнечы. Шляхі здабытку сонечнага жалеза. Шляхі роспачы і пакут. Шляхі страт такіх каштоўных імгненняў... Падалі ня-

бесныя агніскі, стаміўшыся глядзець на ўсё гэта. І мы чулі, як нават самыя жорсткія называлі агнісак зоркамі ды знічкамі. Верылі, што суладныя яны з нейкім кароткім імгненнем. Верылі, хацелі дакрануцца да вечнасці... Толькі не ведалі, што пазбаўляе вечнасці пралітая кроў. Таму паўсталі мы на высокіх курганах, рукатворных, нават прыгожых. Паўсталі не сваёй воляй. Яны хацелі, каб мы, вечныя, пазначалі курганы, сталі напамінам пра тых, хто дарэмна страціў сваё каштоўнае імгненне. Хто павінен знайсці ў тых курганах вечны спачын... Яны падманваліся. Яны непапраўна памыляліся. Мы так гневаліся на іх за гэта...

Моцна. Адчайна... Хоць і хацелі гэта змяніць. Не ведалі, не ведалі, як учыніць такое. Навучыліся іх разумець. Навучыліся думаць, як яны... Але не ведалі. Ды зусім нечакана нам дапамог адзін з іх, імгненных. Ясных, нібы сапраўдная агніска. Можа, ён і стаўся нашай зоркай. З'явіўся раптоўна, якляскатлівы Пярун, што цаляе ў нас сваімі стрэламі. Не, зусім не Пярун. Гэта проста азываецца нам вітаннем высокае неба.

Мы не прадказвалі яго нараджэння. Мы яго не чакалі. Хоць апасля яго мы здолелі навучыцца і прадказанню, і чаканню... А ён прыйшоў да нас на зломе часоў, калі яшчэ было шмат тых, якія нам спявалі, якія нам маліліся. І калі ўжо прыходзілі іншыя... Схіляліся перад крыжам. Пакутавалі. Здзекаваліся. Думалі пра сваё кароткае імгненне, але берaглі яго яшчэ меней, чым нашыя першыя. Але ён не быў ні першым, ні другім...

Заснаваў горад, назваўшы сваім імем, сын чарадзея. А імя яго азначала барацьбу. Але няшмат і змагаўся, хоць меў нёспатольную прагу да жыцця. Спрабаваў вынішчаць старое, але яму ж самому мізэрнымі здаліся тыя справы. А калі зразумеў гэта, прыйшоў да нас. Убачыў. Знайшоў. Мы адчулі дотык прагных рук і біццё халоднага сэрца...

Чамусьці тады здалася-згадалася халодная бель нашай снежнай радзімы, непаўторнай, першай. І доўгае падарожжа, якое аніяк не магло скончыцца. І шчырая чуласць да першай пачутай малітвы. Як быццам можа быць меней чуласці да ўсіх астатніх малітваў. Як быццам не новае падарожжа адкрывае новы свет, такі важны, такі патрэбны. Як быццам першыя снягі даражэй нам за пабачаныя тут імгненні. Як быццам... Мы ўспомнілі яго прадзеда, вясёлага, маладога. І яго самога малым... А цяпер ён выбіў проста на нас, што просіць дапамогі. Не, ён ніколі не ўмеў прасіць. Назваўся рабом. Назваўся адным з тых, якія пакланіліся крыжу. Не, ён не ведаў, што такое пакора. Прабачэнне. Літасць... І не хацеў ведаць ніколі. Нам не было балюча. Мы ж моцныя...

Мінулася ягонае імгненне. А мы панеслі сказаныя ім словы. Абдуманыя, узважаныя. Няхай яго памятаюць. Ён жа так баяўся забыцця. Назваў горад сваім імем... І доўга-доўга апасля маладыя, наіўныя ды чыстыя сэрцам іх чыталі, супыняліся, скалананаліся ад роспачы... Адкуль прычакаць дапамогі? Што зрабіць за сваё кароткае імгненне? Дакраналіся да нас рукамі. І тады чулі нашыя галасы. А мы падказвалі, суцяшалі. Мы памятаем іх, памятаем усіх. Нам цяжка, але ж мы — памятаем...

Апасля мы сустракалі нямала такіх, як ён... Не рабоў. Уладарных. Праніклівых. Каменных. Здольных скамяніць... Гэта лягчэй, чым здаецца. Прыходзілі і сыходзілі імклівыя, імгненныя зямныя зоркі. Самыя ясныя, зыркія... Мы хацелі, каб яны даўжэй затрымаліся побач з намі. Але каб камянець... Мы не жадалі гэтага для іх. Мы б не пагадзіліся пусціць у іхні свет нашую сілу.

— За справы свае застанься стаяць тут, пакуль не буду вяртацца назад, — сказала тая, якую мы не маглі не пачуць.

Па праву любові. Раней намі ніколі не бачанай. Незвычайнай... Яна выправілася ў далёкае падарожжа. Мы ўжо ведалі, што яна не вернецца. Яна ведала, што не вернецца, хоць і марыла вярнуцца болей за ўсё... Яе прысуд таму, хціваму, быў справядлівым. А можа, за гэта трымалася яе надзея...

— А ты будзеш стаяць тут, у прыдзвінскіх хвалях, ды чакаць яе. Тады атрымаеш сваё сонечнае жалеза. Тады зноў зможаш цягнуць рукі да таго, што не тваё. Зможаш хадзіць па цёмных дарогах... Адбіраць у іншых імгненні... А пакуль што пабудзь з намі, — сказалі мы таму.

Заплакаў. Загаласіў. Папрасіў літасці — забраць яго імгненне. Але не былі мы літасцівымі... Тады, як пайшла наша сіла ў свет, мы пабачылі, што і той, хто стаўся каменем, усё ж можа спачуваць. Асабліва, калі спадзяецца на ратаванне... А яшчэ мы зразумелі, што можам будзіць... Можам стаць жывым голасам зямных зор, які гучыць праз час. Які гучыць у часе. Той, хто пачуе яго, будзе мудрым, моцным, вечным...

— Вечным?

— Такім... У вечнасць прабіваюцца зямныя зоркі...

Адзін прабіўся. Быў гонарам цэлага краю. Хоць чаму быў? І будзе. Ганарлівейшы за таго, не раба... Мы стаміліся ад здрадніцтва, ад падманаў. Здаецца, мы чакалі толькі яго. Мы не так сабе прадказалі нараджэнне:

— Вітаем цябе, вітаем!

Ён пачуў наш голас. Нездарма ж меў вітальнае імя. Вітаўт. Прывечаны. Абраны. І супыніў час па-над сваёй зямлёй. Пакінуў яго ў песнях, у сказах, у кнігах. Прыходзіў да нас. Хацеў застацца з намі. А хто ж мы такія, каб адмовіць у такім простым?

Калі скончылася ягонае кароткае імгненне, мы спыталі ў нябесных агнісак:

— Усё тыя ж самыя, ды ўжо іншыя. Што, што змянілася? Змянілася назаўсёды... Змянілася непапраўна...

І тады падалося нам, што яны адказалі. Адказалі так ціха, ледзьве чутна, як угадалі нашыя думкі... А можа, гэта і было схаванае, нявыказанае... Нічога не змянілася, але змяніліся мы самі. Ці не ўпершыню мы смяяліся да самазабыцця. Мы ж вечныя. Мы ж моцныя. Нас жа многа. Стаім на зямлі зімы і леты. Хаваем сляды імклівых зямных зор. І не мяняемся, не зменімся аніколі, як бы не пляжылі нас імклівыя зямныя зоры...

Пазначаем месца, дзе праваліласяпад зямлю царква. За іх гора, за іх страты... Камянім тых, хто здзекаваўся, хто пагарджаў. Імі, яснымі. Меней усё тых, уладарных і годных. Болей усё тых, уладарных і гнеўных. Астатнія ж не шукаюць каля нас скарбаў. Не водзяць каля нас спеўных карагодаў. Адно спрабуюць на злом, кажучы:

— Паночак, пашый мне хоць якую адзежыну...

Як жа мы стаміліся быць шаўцамі ды краўцамі. Не заўважылі таго. Просяць саламяныя стрэхі. Адзежу. Абутак. Бедныя, бедныя... Туляцца да зямлі. І мы хаваемся ў зямлю. Абутак, адзежа...

Ледзьве-ледзьве здзіўляемся нечаканым галасам:

— А ёсць жа недзе на зямлі залаты алень шчасця...

— Ды не мані. Дзе ж тое шчасце падзелася?

— Ёсць. Ёсць! Чуў мой прадзед ад свайго прадзеда, а той — ад свайго, што некалі, як былі маладымі вось гэтыя каменныя волаты, бегаў па зямлі залатарогі алень. Там, дзе ён прабягаў, цяплела ад радасці зямля, берагла яго сляды. А людзі, якія іх знаходзілі, рабіліся веднымі, моцнымі. Можа, і не ад таго, але станавіліся шчаслівымі...

— Мані болей. Як гэта чалавек можа ўзяць ды зрабіцца раптам і ведным, і моцным?

— А ты далей паслухай. Многім людзям падараваў алень і веднасць, і моц... Доўга, нябачаны людскім вокам, скакаў па-над зямлёй. Але знайшоўся такі цёмны, такі злы чалавек, які забіў залатарогага аленя...

— Значыць, не ўсе хацелі веднасці ды моцы. Не ўсе хацелі шчасця...

— Значыць, не ўсе. Але кажуць, што той злы чалавек не хацеў шчасця іншым. А цудадзейны алень ведаў пра сваю смерць. Доўга шукаў сабе памятку. Незнішчальную. Незабыўную. І знайшоў. Пакінуў след свайго капытка на валуне-волаце, уклаўшы ў той слядок усю чарадзейную сілу.

— І што далей? Шукалі, знайшлі гэты след?

— А далей нічога. Згубіўся чарадзейны аленеў слядок у безлічы іншых, і светлых, і цёмных... Аніхто яго, кажуць, пакуль не знаходзіў. Але ж ёсць недзе, ёсць... І, мабыць, гэтыя вечныя волаты ведаюць, дзе яго шукаць. Дык хіба ж нам скажуць?

След залатарогага аленя. Ты і нам падараваў шчасце... Хоць мы — вечныя — сумняваемся, што нешта такое ёсць. Але хіба ж не шчасце тыя сляды, сляды... Яркія. Добрыя. Прамяністыя. Не былі ўладарнымі, ды сталі нечым большым... А мы, мы ніколі так моцна не спадзяваліся. Ніколі за ўсе стагоддзі.

Мы збіраліся разам. Казалі, што любілі навуку, шанавалі дабрачыннасць. Глядзелі ў мінулае, слухалі галасы легендаў. Хацелі вярнуць даўнюю славу, хацелі ўшанаваць памяць. У нас было слова. І слова было нашай зброяй. І зброя была словам... Мы нібыта зноў сталі маладымі, такімі, якія толькі што глядзелі на талую сляпучую бель. І мы зноў вярнулі нашыя стагоддзі, калі яны зведалі выгнанні. Выгнанні як забыццё. Доўгае. Доўгае. Але не зніклі прамяністыя сляды, як і сляды залатарогага аленя. Аленя шчасця. Мы памятаем пра цябе...

Ты паспеў прыбегчы да нас, адчуўшы хуткую страту. Сваю страту.

— Ратуйце, ратуйце мяне, я хачу жыць...

І мы адказалі табе, як адказалі б заўсёды:

— Ратуем, дапаможам. Мы, вечныя, магутныя, можам так учыніць. Ты не памрэш...

І прыйшоў за табой нехта... Можа, і цёмны, можа, і злы. Яму невыносна было глядзець на шчасце. Спакойна ўзяўся за зброю:

— Я прыйшоў забіць цябе, залаты... Я не магу цябе бачыць...

І паляцела атрутная страла. Паляцела. Вярнулася. Забіла таго, цёмнага.

Толькі і цудадзейны алень упаў на пярэднія ногі. Стукнуў аб нас капытком, выбіў іскры. Прасіў берагчы ягоную славу, ягоныя чары...

— Мы зберажом... Мы ж моцныя... Мы ж мудрыя... Мы ж вечныя... І ты не памрэш. Хадзем з намі ў вечнасць...

Знік залатарогі алень. Але не зніклі яго сляды. Як не могуць так проста знікнуць імклівыя з гэтага свету. Успыхваюць ярка, асвятляюць шлях, клічуць за сабой іншых... Палымнеюць, палымнеюць. Не мінаюцца без следу. Пакідаюць сляды. Сляды. Сляды. Многа слядоў. Так многа...

Мы — следавікі... Хто сказаў вам, што мы каменныя? Мы — трывалыя ды магутныя. Мы — мудрыя. Мы — вечныя. Нас так многа. Як зімаў і летаў, што праляцелі па-над зямлёй. Як высокіх нябесных агнісак. Але ўсё ж меней, чым імклівых зямных зор. Адчайных, смелых, добрых. Мы памятаем усіх, яны ж праляцелі так блізка ад нас. Доўгае імгненне. Кароткая вечнасць. Ды сказалі яны, зыркія, а мы паспелі пачуць:

— Свет не пракінецца бядою, як след не згасне скрозь вякі. Да зор імкнёмся мы з табою, сляды ж слядзяць следавікі... Што радасць з новаю журбою? Наш час такі, наш лёс такі. На стрэмцы з вечнасцю самою сляды слядзяць следавікі. Хай не жадаю, хай не мрою, знікае след негаваркі. Ды па-над светлаю зямлёю сляды слядзяць следавікі...

# ВУЖЫНАЯ КАРАЛЕЎНА

*Міфалагічна-легендавае*

Высока ляціць начная бліскавіца, абрынецца дзесьці цяжкім пажарам. Вялікім, спапяляльным, гнеўным. Страшным для ўсяго жывога. І толькі я, Вужыная каралеўна, ведаю, што панёс той злы нябесны агонь імклівы цмок-лятавец. Не, ён не жорсткі, не хцівы. Ні золата, ні срэбра не трэба яму, а шукае цмок нешта больш дарагое. Шукае ды не можа знайсці. Каму як не мне, Вужынай каралеўне, пра гэта ведаць…

Абрываецца долу начная бліскавіца, б'ецца ў зямлю. Ты не страшны мне, водгалас нябеснага гневу. Лёгка схавацца ў топкіх балотах, высокіх трыснягах, мяккіх імхах. Лёгка схавацца, ды нялёгка забыцца… Падае цмок-лятавец долу каменем. Трымае адплату за тое, што абрынуў на зямлю пажар. Боль ды роспач. Шкадаванне, шкадаванне. І яшчэ адзін валун на зямлі, на якой іх і так многа… Абраная, ведная зямля. Прыгожая і самотная. Пра гэта ведаю я, Вужыная каралеўна.

Ды і як мне не ведаць, калі шэпчуць знаёмае вітанне цёмныя балоты, шэрыя, бліскучыя. Іх столькі ж многа, колькі і лясоў, высокіх ды цяністых. І лясы, і балоты, і палеткі, і азёры гэтай зямлі — жывыя… Лесуны, балотнікі, палевікі, вадзянікі… Лесавічкі, балацянкі, палявічкі, русалкі-азярніцы… Гэту зямлю любяць чары. Не крыўдзіць яе ўсюдыісны Сварог. Па гэтай зямлі ходзіць Бялун-Белабог, жадае доўгага веку ўсім годным. І не было б аніводнага няшчасця, калі б не страчаная залатая карона.

Я памятаю пра тую карону кожную гадзіну новага дня і кожную хвіліну новай ночы. Што і казаць, магла тая карона ператвараць ноч у дзень, а зіму ў лета. Магла дапамагаць тады, калі далёкім станавілася міласэрнае Сонейка.

Толькі спрачалася карона з самім высокім Сонцам. Зайздросціла яснае, ды не магло саперніцу сваю знайсці. Схавана яна была, і ніхто пра таемную схову не ведаў. Але спрадвеку любілі чары азёрна-лясны край, любілі, як дзень любіць Сонца...

Мне, Вужынай каралеўне, нялюбае Сонца, нежаданы дзень. Я жыву пад зорным небам, красуюся ўночы, дзіўлю свет на змярканні. І заўсёды з нецярпеннем чакаю, пакуль знікне гарачае ды агністае за небакрай. Пад святлом месіка насустрач выходзіць той, дзеля каго я б даравала Сонцу яго пякучыя промні. Патанаю ў ягоных вачах, як у начным лесе патанае цень. Мой любы, мой каралевіч... Не магу не думаць пра залатую карону, калі гляджу на яго. Гэтая карона – твой лёс, мой абраны...

І чаму мне, Вужынай каралеўне, чуецца тады незразумелым чарадзейным водгуллем: *"Заранка-Зараніца, люблю цябе, мая ясная. Прасвятлі бяззорную ноч, пабудзі яснае Сонейка, дай мне надзею... Бегчы мне далёка-далёка, шэрымі балатамі, колкімі імхамі, бегчы мне ад зямлі прыгожай, як ты, яснай. Бегчы наўздагон за родным братам сваім, прасіць у яго даравання. Толькі ты, Заранка-Зараніца, пра мяне памятаеш. Толькі ты мяне прабачыш. Прасвятлі маю доўгую ноч, спагадлівая... Заранка-Зараніца..."*. Усміхаецца мне мой каралевіч, і мінае трывога.

– Люблю цябе. Ты ж ясная мая зараніца.

Я ведаю. Не бачу свету без цябе, мой чарадзейны каралевіч. Ты яго мудрасць і спагада, яго веднасць і цярпенне. Раскажы мне зноў пра двух родных братоў. Раскажы пра таго, малодшага, ціхмянага ды лагоднага, што цягнуўся да ўсяго незвычайнага, як цягнуцца чары да гэтай зямлі. Успомні і пра старэйшага, моцнага духам ды слаўнага, гатовага дапамагчы кожнаму, хто пра гэта папросіць... Самыя лепшыя браты. Добрыя сябры.

Маўчыш, мой любы каралевіч, хаваеш ціхі смутак. Я ж цябе ведаю. Не хочаш мне адкрыць сваё расчараванне. Толькі я не магу проста памятаць. Трымаў ты за рукі двух слаўных хлопчыкаў, вёў іх у даросласць і сталасць. Вучыў дабрыні, вучыў любові да сваёй зямлі, дарыў ім магутныя чары. Як жа так зрабілася, што сталі яны ворагамі? Як жа так учынілася, што ты стаў для іх чужым?

Маўчыш, каралевіч, як закляты маўчаць. Іду за табою няроўным шляхам туды, дзе чараў многа. Бяжыць балатамі-імхамі рака, лагодная, чуллівая, цікаўная да ўсяго новага на сваім шляху. Бяжыць далёка-далёка, нібы спяшаецца за некім наўздагон. Толькі не спыняешся тут доўга. Ідзеш узгоркамі ды палеткамі туды, дзе многа чалавечых мар і жаданняў. Бяжыць між хат ды жытоў магутная шырокая рака. І славяць яе людзі за дапамогу...

І здаецца мне, што чую такое блізкае: *"Заранка-Зараніца, ясная Сонцава сястрыца, бегчы мне ў сіняе-сіняе мора, бегчы і ніколі не вярнуцца назад... Шукаць свайго роднага брата, прасіць у яго даравання. Пачуй мяне, любая. Дапамажы вярнуцца да роднай зямлі, да бацькоўскага пасада. Не пакінь мяне, Заранка-Зараніца, люблю цябе, мая ясная..."*

— Ратуй іх, ратуй мяне, мая каралеўна.

— Заўсёды, мой каралевіч.

Я ж бачу, як нясе цмок злы нябесны агонь. Нясе буры, маланкі ды навальніцы. Карае яго Пярун, гневаецца зямля. Гневаецца на яго, асуджанага прынесці пажар, працятага Перуновым стрэлам, заклятага скамянець. Гневаецца, не спачувае. Толькі хіба мае віну закляты? За што яму пракляцце? За што яму небыццё? За што яму няпамяць? Я, Вужыная каралеўна, ведаю, што хоць і знікла залатая карона, але засталіся чары. Няўладныя над сабою, асуджаныя шукаць страчанае. Асуджаныя пакутаваць, зноў і зноў праходзячы зачараванае кола.

Лёгка паймаць Перуноў гнеў, і перастаць быць сабой, і забыць ўсё, што было... Адбірае нябесны гнеў памяць. І навошта тады ідзе насустрач той, каго ніколі б не хацела бачыць? Той, хто вечна ходзіць над зямлёй высокімі промнямі. Пякучыя промні, праніклівы позірк, неміласэрная пагарда:

— Нарэшце ты вярнулася, сястра мая Заранка-Заранiца. Доўга ж ты хадзіла па зямлі.

Я ведаю... Але не даўжэй за вечнасць, а Сонца вечна ходзіць над зямлёй.

Яно, Сонца, саграваe ды лашчыць свет. Ад Сонцавай дабрыні цвітуць краскі-кветкі, ад Сонцавай сілы вызваляюцца з ледзянога палону сінія рэкі. І славяць людзі яго і мяне, Заранку-Заранiцу, малодшую Сонцаву сястру. Сястру, якая ідзе наперадзе Сонца, але ніколі не будзе роўнай яму. Гэта я першай усміхаюся зямлі. Але так нядоўга. Сонца ж доўга-доўга глядзіць на зямлю. І няма нічога, што б схавалася ад высокіх усюдыісных промняў. І толькі Сонца ведае ўсю праўду пра двух родных братоў...

— Раскажу табе, сястра, што зрабіў з тымі братамі твой любы, твой абраны, Вужыны каралевіч.

Правальваюся ў нетры Сонцавай памяці, іскрыстай і выразнай да самай маленькай драбніцы. І бачу пранікліўымі Сонцавымі вачыма, як знікаюць парамоaжаныя вужы ў багнах ды балотах. Яны паўсталі супраць яго, Сонца, і яны пакараныя. Скамянелі на зямлі цмокі-волаты, забіты спапяляльным Перуновым гневам Вужыны кароль, і толькі таямнічы каралевіч вужоў паспеў некуды схавацца. Не знаходзяць яго пасланыя наўздагон маланкі-бліскавіцы, дарма падае на зямлю Перуновы гнеў, доўга няма ані слыху, ані следу. Толькі не зніклі зусім вужыныя чары...

— Цяпер ты ведаеш, сястра, як усё пачыналася. І як усё хутка скончылася, не паспеўшы пачацца.

І не толькі Сонцава памяць, з якой не згубілася яшчэ нічога, расказвае мне, што ж адбылося далей. Павялі над зямлёй зоркі ясны карагод і ўбачылі, як падараваў Вужыны каралевіч свае чары двум маленькім хлопчыкам, сынам старога сівавалосага Рыдана, уладара вялікай і слаўнай зямлі. І не магло болей Сонца пакараць каралевіча вужоў. Сталі падрастаць хлопчыкі-абраннікі, у ладзе і згодзе квітнела самая прыгожая зямля… І тады ўбачыў празрысты месік, падслухалі шэрыя хмурынкі, пра што шэпчуцца простыя людзі. Маўляў, ёсць у Рыдана-валадара старэйшы ад малодшых сыноў. Каралевіч-чарадзей. Думае ён пра тое, як заняць бацькоўскі пасад, і не шануе ані роднага бацькі, ані клапоціцца пра малодшых братоў. Хаваецца з чорнымі думкамі няведама дзе. Нездарма ж ніхто яго не бачыць. Ні зоркі, ні месік, ні хмаркі тады напраўду не бачылі майго каралевіча…

Цягне да мяне рукі сястра мая Вячэрніца, старэйшая за Сонца. Што ж, мы ніколі не маглі дацягнуцца адна да адной, хоць вельмі хацелі. Гаворыць мне, каб не слухала Сонца, каб не баялася яго нялітасці. І яшчэ гаворыць мне, што добры і слаўны мой Вужыны каралевіч. У той час, калі змярканне ахінала зямлю, калі Сонца ўжо хавалася, але не наступала яшчэ цемрадзь ночы, нібы ў чаканні некага з'яўляўся ён на ростанях дарог. Гналі трывожныя вятры лёгкія хмары, шапталі свае замовы чараўнікі, шукалі пярэваратні сабе новае аблічча, а ён цярпліва чакаў некага аж да самай ночы. Ці дачакаўся толькі…

Ходзіш ты на змярканні, сястра мая Вячэрніца. Любіш хадзіці па зямлі. І я памятаю, што ты аднойчы сказала мне:

— Лёгка ты ляціш, сястра, наперадзе Сонца. Але ці паспець табе за тую кароткую хвіліну наглядзецца на такую прыгожую зямлю? Доўга я хаджу па зямлі ды пакутліва саступаю месца ночы. Зноў і зноў перамагае мяне ноч, смяецца, што слабая сястра ў вялікага Сонца, толькі кожнае імгненне тых пакут вартае…

І я памятаю, сястра, што захацела пабачыць-пахадзіць па такой прыгожай зямлі. Доўга прасіла Сонца-брата адпусціць мяне, доўга не хацеў ён таго ўчыніць, але ж хіба можна было ўтрымаць імклівую Заранку-Зараніцу... "Ляці, сястра, што ж мне з табою рабіць", – прагучалі братавы словы, і я пайшла за табою...

Што ж, пабачыла ростань вячэрніх дарог. Пабачыла яго, каралевіча чарадзейнага вужынага народа. Чарадзея-пярэваратня. Ці ж сапраўдным толькі было яго чалавечае аблічча?

Ці гэта мне прыснілася-прымроілася, ці гэта некалі было? Няма ж у чараў памяці...

Знікаюць ростані дарог у празрыстай смузе. Высокае, нязвыкла высокае неба. Спавівае вялікі свет сваімі цягуча-сінімі чарамі сястра мая Вячэрніца. Толькі не адны яе чары разлітыя па-над светам... Кліча і заваблівае такая прыгожая зямля.

На змярканні выходзіш мне насустрач, Вужыны каралевіч. Закрываеш сабой такія зазыўныя ростані дарог. Ад чаго мяне засланяеш, як засланяюць людзей ад чорных закляццяў мудрыя вужы? Што ад мяне хаваеш?

Ты назваў мяне светлай Сонцавай сястрою. І нічога не хацеў ад мяне хаваць. Ні таго, што шукае цябе мой брат ды адшукаці не можа, ні таго, што ніколі не забудзецца вужыны народ пра страшную Сонцаву кару. І яшчэ ты спытаў, калі ж паклічу я свайго брата, паклічу вялікае Сонца...

– Не буду Сонца клікаць, Вужыны каралевіч. Не хачу цябе караць, а хачу табе верыць...

А што сталася, калі б спаліў цябе мой брат? Не хацела я, Зараніца, рабіцца нечым змярканнем. Ведаць бы, што і ты быў шчырым... Толькі стала я Вужынай каралеўнай. Стала Зараніца цямнейшай за Вячэрніцу.

– І дзе ж карона, сястра? – пытаецца Сонца. – Дзе ж залатая карона, роўная мне?

— Я не адкажу табе, брат. Хопіць ужо гневу, хопіць скамянелых сэрцаў. Няхай бы і ты забыўся пра тое, што паліць цябе...

Але Сонца заўсёды было агнём. Агонь жа не мог забыцца...

А я ніколі не змагу забыцца пра твой вялікі давер, Вужыны каралевіч, чарадзейнае спадзяванне гэтай зямлі...

І што ж такое сталася, што Сонца сказала мне:

— Зменіць свет гнеў на літасць, сястра. Вяртайся да свайго Вужынага каралевіча.

І яшчэ пачула я апошнія словы, моўленыя адвечным Сонцам:

— Не перастану я шукаць самую чарадзейную залатую карону...

Што ж, брат, хто б смяротны ці несмяротны табе не паверыў... Не пераставай яе шукаці. Прыветна ахінаюць мяне вужыныя чары, самыя надзейныя чары прыгожай зямлі. Яны могуць вярнуць мінулае, могуць прадказаць будучае. Трэба толькі адно — пажадаць...

І я вяртаю нашае мінулае. Толькі нашае з табою, Вужыны каралевіч, каб зноў яго перажыць. Я хачу зразумець, што павінна змяніць, каб адвесці бяду... Хачу ратаваць тваіх хлопчыкаў, хачу ратаваць цябе, гонар вужынага народа.

Бачу, як беражэш ты двух братоў. Становяцца дарослымі хлопчыкі, якія шануюць звычаі сваёй зямлі. Ты можаш ганарыцца, мой каралевіч. Яны чуйныя да ўсяго, што адбываецца на свеце. Цябе ж нішто так не акрыляе, як спагада. І зноў чую, як дзівяцца простыя людзі з каралевіча-чарадзея. Перастаў ты хавацца немаведама дзе і часта з'яўляешся побач з ужо вялікімі Рыданавымі сынамі. І тыя, хто памятаюць, што насіў ты іх некалі на руках, не заўважаюць ані сівых валасоў, ані зморшчынкі на тваім чале. Выраслі браты, але ты не пастарэў ані кроплі. Не ведаюць яны, са-

мыя простыя, што такое вужыная кроў. Зайздросцяць. Баяцца. Але я ведаю, што даражэй ты Рыдану за родных сыноў. Можа, з гэтага ўсё пачалося...

— Вужыч, — чую тваё чалавечае імя з вуснаў братоў. — Раскажы нам пра свайго бацьку...

— Якім быў кароль твайго народа? — пытаецца старэйшы.

— Якія чарадзействы ён мог тварыць? — не маўчыць і малодшы.

— Ён быў слаўным? — гэта старэйшы.

— Ведаў усё пра чары і чарадзеяў? — гэта малодшы.

Хочуць быць падобнымі да цябе, і смяецца з сыноў стары Рыдан:

— Хтосьці жадае браць з цябе прыклад, Вужыч. Ці здолее толькі?

А ты, мой каралевіч, не быў бы тым, хто мне спадабаўся, калі б не адказваў:

— Здолеюць. І будуць слаўнымі валадарамі, і будуць спагадлівымі чарадзеямі. І будуць любіць свой народ, сваю зямлю.

Але нічога не расказваў ты пра свайго бацьку, пра вялікага Вужынага караля, каму проста было пахіліць майго брата — трысветлае Сонца. Нічога не расказваў, але ж хіба не думаў, не ўспамінаў пра яго, кроўнага, кожны раз, калі глядзеў ва ўсмешлівыя Рыданавы вочы...

Кароткія мае імгненні перад узыходам Сонца, але здолела я ўбачыць, як бясконцы смутак поўніць чалавечае Рыданава сэрца. Поўніць кожны раз, як ён глядзіць на цябе, Вужыч... Пра што ж ты смуткуеш, бацька добрых сыноў? Не ведаю пра тое. І чамусьці маруджу паклікаць чары.

— Вужыч, раскажы... Вужыч, навучы... — не адпускаюць цябе тыя, кім ты болей за ўсіх ганарышся.

Я хачу дазнацца пра таямніцу, якую хавае стары Рыдан. Хто ж стане глядзець табе ў вочы, праніклівы чалавеча, калі

не могуць людзі надзівіцца з каралевіча вужынага народа... Угадае ён запаветныя мары і жаданні, слаўна парадзіць ды падкажа. І людзі болей вераць яму, Вужычу, чым самому Рыдану. Але і яны, каму не дадзены чары, нібыта ўведалі, што слухаюць яго слова азёры і крыніцы, палеткі і лясы. І почасту ты знікаеш, Вужыч, у цёмных балотах... Куды? Навошта?

Што ж, заўсёды вужы збіралі па драбніцах веды цэлага свету. Мабыць, ад таго і слухаюцца іх чары, і жывуць яны доўга-доўга, і будзе шчаслівым абраны імі народ. Мігціць жа недзе схаваная залатая карона, множыць сілы азёрна-ляснога краю. І здарыцца такая часіна, калі засвеціцца залатая карона ясна-ясна... Не тое важна, што ноч стане днём, а зіма — летам. Будуць чары ў людскіх хацінах, будуць сябраваць мудрыя вужы з імі, самымі простымі. Трэба толькі дачакацца, але бясконца доўжыцца вужынае цярпенне. Вужы ўмеюць чакаць, пакуль вырастуць тыя, каму наканавана насіць залатую карону. Вужы разумеюць, што яна цяжэй, чым здаецца...

Я чакаю гэтага поруч з табою, Вужыны каралевіч. Захінаю заранкавым святлом Рыданавых сыноў. Неператварыцца ім у рэкі. Разарвуць веднасць і цярпенне зачараванае кола, і не скамянее ад гора аніводнае сэрца...

Толькі за тое, што з'яўляюся я побач з табою, усё часцей называюць мяне Вужынай каралеўнай. Тады, калі не ўстаў яшчэ мой брат, гляджу я на азёрна-лясную зямлю. Не крануць яе буры, маланкі ды навальніцы. Вялікая сіла ў маіх чарах. Ты ж мяне так лёгка носіш, зямля майго каралевіча. Абраная, ласкавая, вартая залатых карон з усімі цудамі свету.

— Хлопчыкі, — кліча Вужыч за сабою Рыданавых сыноў.

— Мы не хлопчыкі, — адказваюць у адзін голас браты. — Мы дарослыя і табе роўныя.

Цешыцца стары Рыдан з сыноў, пазірае на Вужыча, сціскае трывога маё сэрца. Вядзе трывога за сабою прымройлівы сон, дзе з'яўляецца мне сам Светавіт — ясны дзень. Гаворыць мне, каб не большыла моцы чараў, бо не змяніць прызначанага лёсу... Кліча мяне дзень, кліча мяне святло, а Рыданавы сыны называюць мяне Вужынаю каралеўнаю. У захапленні ловяць кожны мой позірк.

— Усміхніся нам, каралеўна. Твая ўсмешка — ясная зараніца, — ходзяць за мной родныя браты.

А я ўсміхаюся аднаму Вужычу. Яму, які шэпчацца з зямлёй, прыходзіць са змрокам, знікае на золку. Што ж, хутка надыдзе час, калі найярчэй заіскрыцца самая чарадзейная карона.

Мне падалося, што зніклі з белага свету ўсе чары, што парвалася безупыннае кола часу, калі ты нарэшце сказаў Рыдану:

— Назаві імя годнага сына. Будзе яму залатая карона, будзе яму бацькоўскі пасад.

— А што будзе другому? — не змаўчалі браты.

— Другому будуць чары. Ад іх спазнае ён веднасць і харaство. І прымуць яго зямля і неба, і стане ўвесь вялікі свет яго домам...

Заспрачаліся браты, бо кожны хацеў атрымаць залатую карону. Зажурыўся стары Рыдан.

Але ты, Вужыч, не быў бы тым, з кім я стала поруч, каб не мовіў:

— Не сварыцеся, браты, не смуткуй, бацька. Не страціш ты другога сына, якому наканавана пайсці ў свет, а будзеш горды за абодвух. Не мною і не табою, а толькі выпрабаваннем няхай будзе абраны годны...

— Што гэта будзе за выпрабаванне? — спытаў стары Рыдан.

І ты, Вужыны каралевіч, замовіў чалавечым сынам выпрабаванне:

— Той, хто прынясе залатую карону да слаўнага бацькоўскага пасада, і атрымае з ёю ў валадарства азёрна-лясны край...

Навыперадкі кінуліся бегчы Рыданавы сыны, зноў засмуціўшы свайго старога бацьку. І тады спытаў стары Рыдан цябе, каралевіч:

— Чаму адмовіўся ты ад таго, што было ад нараджэння тваім?

Я не забуду тваіх загадкавых слоў:

— Не магу адмовіцца ад таго, што маё ад нараджэння, але і не магу ўладаць тым, што мне ўжо не належыць. Пайду за тваімі сынамі, Рыдане, стану іх надзеяй і пакараннем. Буду глядзець, каб не абмінулі яны кароны. Буду слухаць іх крокі. Буду спадзяваннем твайго краю. Памятай пра мяне, калі стане зусім цяжка...

Толькі стары Рыдан, пачуўшы такія словы, яшчэ болей зажурыўся. Які бацька мог выхаваць такога сына? Якім жа быў ты, Вужыны кароль, што не пабаяўся кінуць выклік самому Сонцу? Стаўся каралём лепшы з вужынага народа. Народа заступнікаў, народа абаронцаў... Але гэта вужы ценямі ідуць за тымі, хто задумаў учыніць нядобрае. За тымі, якія павінны стаць героямі і абраннікамі, ды воляй лёсу становяцца ўсяго толькі здраднікамі. Вужы — іхні боль і пакуты, апошняя кропля сумлення, апошні дарунак лёсу вярнуцца і вярнуць... Відушчыя, відушчыя нават болей, чым неўры-чарадзеі, якія таксама не абмінулі азёрна-ляснoй зямлі. Замірае ў ціхім прадчуванні сэрца. Чакае не чараў, не таямніц, нават не радасных сноў. Чакае нечага большага...

А ты, мой каралевіч, знік у раняшняй смузе. Сказаў мне:

— Не забывай мяне, мая каралеўна. Я ніколі не пакіну цябе... Прашу, не перастань мяне чакаць.

Сказаў так, ды доўга-доўга няма цябе, доўга-доўга няма братоў. Ані слыху, ані следу. Ужо не вераць людзі, што вернуцца жывымі Рыданавы сыны. А яны ж абаронцы краю, нашы

абаронцы... Уведаўшы пра тое, прыйшоў бязлітасны вораг. Нішчыць ды рабуе зямлю. Смуткам ды галашэннем пацягнуліся раней вясёлыя песні. Дзе ж ты, Вужыны каралевіч? Няўжо не вернешся, няўжо не прагоніш ворагаў?

Калі зараніцамі пылаюць пажары, сняцца трывожныя сны. Нібыта разліваюцца з гора тры вялікія ракі, якія нясуць у далёкія землі ўсю прыгажосць і магутнасць азёрна-ляснога краю. Сніцца яшчэ, што як быццам бягуць тыя рэкі з бацькоўскага гора ды сыноўняй віны, з горкіх людскіх слёз ад кроўнай здрады... І мовіць мне ў тых снах прагневаны Светавіт, што не толькі слабыя чалавечыя сэрцы, але і мае чары таму віною: "Глядзі цяпер на тыя рэкі, Заранка-Зараніца. Забралі яны ўсе чары тваёй улюбёнай зямлі, і ўжо ніхто нічога не верне". Толькі не збывайцеся, сны... Вярніся, Вужыны каралевіч, знайдзі шлях да паратунку. Ты адзін можаш зрабіць такое дзіва...

Цябе няма, Вужыны каралевіч. Нясцерпнымі робяцца страты. Не аддамо самай белай на свеце зямлі. Дзе вы, лесуны, балотнікі, палевікі, вадзянікі, русалкі? Давайце будзем бараніцца разам... Зашумелі лясы-бары, праганяючы чужынцаў, топкімі сталі для іх балоты, пацягнулі іх у непраходныя нетры русалкі. Стала для іх разлівацца зараніца чырвонай-чырвонай крывёю... Толькі мала ўсяго гэтага, каб ратаваць цэлы край.

Сплываюць сілы азёрна-ляснога краю ў няроўным змаганні, прыходзіць адчай у самыя мужныя сэрцы. І ўжо тады, калі няма надзеі некага чакаць, з'яўляецеся вы, сыны Рыдана, нашыя нясправуджаныя абаронцы. Ды каб жа з радасцю...

Жорсткасць і ўладалюбства ў такіх некалі прыгожых вачах таго, старэйшага. Бязмежная апантанасць чарамі і нецярплівасць у позірку малодшага. Доўга ж вандравалі вы на чужыне, мілыя браты... Ой не ласкава азваліся вам тыя шляхі-падарожжы!

І мовіць старэйшы брат роднаму бацьку:

— Прабач, што доўга нас не было. Не ведалі мы, што трэба хутчэй вярнуцца. Але мусім дадаць жаль да жалю і смутак да смутку твайго. Хоць і знайшлі мы залатую карону, але скралі яе ў нас твае злыя ворагі. Тыя, што цяпер ваююць наш край. Скралі ды панеслі за скалістыя горы.

І мовіў сыну ў адказ сівавалосы валадар:

— Што ж, дарагі сыне, відаць, лёсам мне наканавана смуткаваць ды журыцца... Бяры хутчэй меч сталёвы, зброю гартаваную. Бяжы да скалістых гор за ворагамі нашымі наўздагон. Можа, і дагоніш іх, цікунцоў з каронай.

Якім не быў уладалюбным старэйшы Рыданаў сын, але мусіў паслухацца бацьку. Пабег наўздагон за тымі, хто скраў такую доўгачаканую залатую карону. Стаіўшы дыханне, глядзеў увесь край, як скончыцца тая пагоня. Але не вяртаецца старэйшы сын, і зноў ліецца многа слёз. І мовіць тады Рыдан свайму малодшаму сыну:

— Пакліч свае чары, сыне. Даведайся, што з тваім братам. Ці не трэба яму падмога?

Прыклаў малодшы сын вуха да зямлі, паслухаў ды адказаў:

— Лёгка бяжыць мой брат за цікунцамі з каронай. Хутка мінае чужыя землі. Не выбіўся яшчэ з сіл...

Уздыхнуў стары Рыдан, усё яшчэ спадзеючыся прычакаць сына. І толькі я, Вужыная каралеўна, толькі я адна здагадалася, што ўсё непапраўна змянілася. Ведаю, што не дапамогуць болей чары. Ізноў мовіць стары Рыдан малодшаму:

— Пакліч свае чары, мой сыне. Даведайся пра свайго брата. Ці не трэба пасланць яму падмогу?

Прыкладае малодшы сын вуха да зямлі, пільна слухае ды ціха гаворыць:

— Лёгка бегчы брату майму. Не крануцца яго сэрца чужыя землі... І хоць не выбіўся ён яшчэ з сіл, усё далей і далей ад яго цікунцы з каронай.

Нічога не адказаў стары валадар малодшаму сыну. Адно загадаў клікаць людзей з усіх куткоў зямлі. Хутка паляцелі ганцы, панеслі загаднае Рыданава слова. Не замінулі людзі з'явіцца перад высокім Рыданавым пасадам, і мовіў ім, самым простым, сівавалосы валадар:

— Доўга трымаў я ўладны пасад над гэтым краем. Зазналі вы славу і радасць, але зазналі і гора. Цешыць мяне тое, што радасці было болей. І адчуваю сваю віну за вашыя слёзы і кроў. Думаў я, што займе мой пасад лепшы з сыноў, толькі не суджана таму адбыцца. Хопіць мне глядзець на цяжкія пакуты, аддамо свой пасад не старэйшаму сыну, не малодшаму сыну, а Вужынаму каралевічу...

І яны, самыя простыя, паверылі ў Рыданаву мудрасць. Спакутаваныя, яны ўбачылі ў ім, дзіўным каралевічы, сваё ратаванне. Яны ўсё яшчэ памяталі яго. Яны не маглі паверыць, што цуду ўжо не будзе, што ніколі не вернецца каралевіч вужоў...

Не змаўчаў малодшы сын на бацькавы словы. Крыкнуў гнеўна:

— А дзе ён, дзе ён цяпер, ваш чаканы Вужыны каралевіч? Чаму не спяшаецца вас ратаваць? Чаму з тае часіны, як пайшлі мы з братам па залатую карону, ніхто не бачыў яго? Я лепшы з Рыданавых сыноў. Мне наканавана трымаць пасад. Я варты, бо валодаю чарамі. Я дазнаюся, што з маім братам.

З гэтымі словамі прыклаў малодшы брат вуха да зямлі, пільна-пільна слухаў ды прамовіў:

— Цяжка бегчы майму брату. Точыць ягоныя сілы чужына, шум зямлёю ідзе. Усё далей ад яго цікунцы з каронай...

І мовіў Рыдан малодшаму сыну:

— Што ж, сыне, бяжы наўздагон за братам. Дапамажы яму, бо не праб'ецца ён адзін праз скалістыя горы...

І памчаў малодшы брат наўздагон за старэйшым. Паляцеў, толькі яго і бачылі. Няўжо ж так прагнеш залатой кароны,

малодшы? Ці гэтаму вучыў цябе Вужыч? Дзе ж ты сам, мой каралевіч? І чаму я болей не веру ў тваю дабрыню і мудрасць? Зноў нягоды апанавалі самы прыгожы край, і я болей не чакаю цябе. Ізноў шле мне Светавіт самы трывожны вяшчунны сон...

Сплываюць слязьмі тры вялікія ракі. І чамусьці я ўпэўнена, што б'юцца ў іх тры вялікія чалавечыя сэрцы. Гаворыць мне чалавечым голасам першае з сэрцаў:

— Ён хацеў, каб стаў я вялікім валадаром. Я толькі здзейсніў тое, чаму ён мяне вучыў.

— Што ж ты зрабіў?

— Я забіў Вужынага каралевіча.

Гаворыць мне чалавечым голасам другое з сэрцаў:

— Ён хацеў, каб стаў я вялікім чарадзеем. Я толькі здзейсніў тое, чаму ён мяне вучыў.

— Што ж ты зрабіў?

— Я забіў Вужынага каралевіча.

Заплакала трэцяе сэрца:

— Каб жа вы ведалі, каго вы забілі. Бадай нам, дзеткі, слязамі разліцца... Я хацеў, каб ён заўсёды быў побач. Але не суджана лёсам трымаць за руку ад маленства і да юнацтва... Няўжо ён ніколі не падаруе мне?

Бурляць вялікія рэкі. Мовіць мне Светавіт, што вужы заўсёды помсцілі за здраду. А я гляджу ў мінулае, дзе мяне няма. Бачу маладым таго, хто даўно ўжо сівавалосы. Ён абуджае чары, якімі нікому не заўладаць. З нетраў зямлі падымаецца той, каго ўсім нам трэба баяцца.

Пытаецца ў Рыдана Вужыны кароль, несмяротны кароль цмокаў:

— Чаго ты прагнеш, чалавеча?

— Каб заўсёды быў слаўным мой край...

— Што ж, аддай мне свайго першароднага сына...

І ты, Рыдане, не спытаў пра славу месіяў, не спытаў пра славу адкупіцеляў, але аддаў свайго першынца Вужынаму ка-

ралю. Так стаў твой сын Вужыным каралевічам... Каралевічам, які вярнуўся да свайго народа. Вужыным каралевічам з чалавечым сэрцам.

— За што ж вы забілі яго? — пытаюся ў іх, у каго, спадзяюся, некалі былі чалавечыя сэрцы.

— За тое, што ведаў, дзе залатая карона, але нам не сказаў. А мы не маглі знайсці тую карону без яго, Вужыча...

Бурляць слязьмі вялікія рэкі. Гнеўна ўсміхаецца мне Сонца. Не даруе і Светавіт, што не пакінула я чарадзеіць. Толькі цябе няма, мой каралевіч. Зоркі, месік і хмаркі даўно згубілі твае сляды. Не азваўся ты мне, Вужыч. Не азавешся мне ніколі. Не стае змогі цябе клікаць, не стае волі чакаць...

Глянуў мне ў вочы вялікі Светавіт. Мне, ужо не светлай, мне, яшчэ не цёмнай. І спраўдзіўся вяшчунны сон.

Пабеглі далёка-далёка тры вялікія ракі. Пабеглі сінія-сінія, спадзеючыся сплысці туды, дзе меней пакут і адчаю. Толькі хіба можна збегчы ад свайго сумлення, ад братняй здрады? Не хачу і я пазбаўляцца памяці... Хочацца пайсці ўслед за вамі, сінія-сінія. Але не пайду. Каб і магла вярнуцца ў вечна паўтаральнае кола часу, каб і магла знайсці цябе, мой каралевіч, каб і магла быць з табою... Вяртае кола расчараванні і страты. Вяртае кола нас саміх да пачатку. Вяртае, але нам не можа вярнуць.

Першым пабег магутны Дняпро. Пабег у сіняе мора, далёка ад бацькоўскага пасада. Ты ж хацеў быць валадаром. Можа, чужыя землі будуць табе мілейшымі, можа, здабудзеш там сабе чаканую карону...

Другім пабег цікаўны Сож. Ты заўсёды хацеў уладарыць чарамі. Што ж, шукай іх балотамі, шукай імхамі. Балоты хаваюць многа таямніц. Можа, падораць літасць схаваць тваё чорнае сэрца...

За імі павольна паплыла сцішна-самотная Дзвіна. Плысці табе шукаць сына. Плакаў ты, Рыдане, усё жыццё, плакаць

табе і цяпер, пакуль не знойдзеш яго, першароднага... Не мінецца слава твайго і майго краю. Не змагчы мне волю Вужынага караля, не зрабіць нясказанымі яго словы. Ніколі не пакіну самай прыгожай белай зямлі. Тут маё наканаванне. Зачарую азёрна-лясны край я, Вужыная каралеўна, каб ніколі не мінулася яго надзея. Як ніколі не мінешся ты, Вужыч, маё зямное каханне, мая нябесная радасць.

З таго імгнення, як мовіў памятаць і чакаць, не бачыла цябе. Ты бясследна знік у сваім народзе. То здасца мне, мільгнеш сярод абаронцаў горада, калі той бяруць прыступам чужынскія раці. Той горад застанецца няскораным... То суцешыш пакінутае дзіця, калі яно не можа дачакацца маці. І па тым, што дзіця вырастае спагадным і цярплівым, я здагадаюся, што гэта твой след. І гэта ты, Вужыч, ідзеш залатой восенню ў свой вырай. Скідаеш залаты ражок на белы абрус, калі ўкленчыць перад табою ён, самы просты. Даруеш яму цуды залатой вужынай кароны, як дараваў і мне. Нездарма ж шануюць вужоў людзі азёрна-лясной зямлі, шануюць тых, хто цябе выхаваў. Толькі шкадую я пра тое, што не дазнаешся ты, як спяваюць слаўныя песні пра магутны Дняпро. Як ласкава шэпчуць замовы імкліваму Сожу, як клянуцца роднай зямлі ў сыноўняй вернасці самым дарагім – Рубонам – шырокай Дзвіной... А цябе памятаць толькі мне адной, мне, Вужынай каралеўне.

Ляціць зараніца над азёрна-лясным краем. Успыхвае імгненна і ясна сярод глухіх пушчаў, цёмных бароў. Змяняе ноч на дзень, змяняе зіму на лета. Але што мне да гэтага? Ведама ж мне, што спяць у лясных нетрах скамянелыя ў валунах цмоківолаты. Водзяць карагоды русалкі-азярніцы, смяюцца зманлівым рэхам лесуны. У вячэрняй тоні, у начной смузе сярод топкіх балот, можа быць, хаваецца яшчэ іскрынка святла. Хаваецца маё скамянелае сэрца, сэрца цёмнай Вужынай каралеўны.

# НА ВЕКАВЕЧНЫХ МЕЖАХ...

*Міфалагічна-легендавае*

Знаёмы ясень крануў за плечы доўгімі галінамі, калі апошні водбліск сонца знікаў у начным змроку. І табе маё вітанне, высокі. Сем стагоддзяў стаіш тут, мудры, на ўзгорку, куды зладжана падступаюцца лясы і палі, балоты і азёры. Адно не зважаеш на іх, вартуеш крыніцу з жывою вадою. Цячэ яна праз сенажаці ды яловыя пушчы, і няма ў яе пачатку, як і няма ёй канца. Твая вечнасць — маё імгненне. Вартуеш жыццё, як і я не хачу адкрыць шлях смерці...

Не, зусім не выпадае мне кранаць крыніцу, не мая яна. Хачу табе сказаць, што паважаю цябе за тое, што стаіш на шляху ўсіх вятроў. Навошта зноў сюды прыйшоў, парушыў твой узнёслы спакой? Не, гэтым разам не прывёў за сабой цёмных навальніц. І не прагневаліся на мяне ані Белабог, лёгкіх яму шляхоў, ані Чарнабог, хай заблукае ў сваім вечным змроку... Пытаешся, ці буду замаўляць? Не буду, мудры, высокі. Шмат я замовіў скарбаў, шмат закляў курганоў. І шмат людзей, якія нягожа чынілі, пусціў па белу свету ваўкалакамі... Толькі досыць ужо ўсяго гэтага. Дапамажы мне, ясны, блаславіць чалавека... Што, ты здзіўлены? Не чакаў ад мяне такога? Я рады, што яшчэ магу цябе здзівіць. Павер у яго, высокі, не пакінь без мудрай парады. Так, я ведаю, што і ты ў мяне папросіш. Не знікне крыніца з жывою вадою. Я, ведны чарадзей, табе слова даю. Я ж разумею, што такое вечнасць...

Зацікаўлена ўзіраешся, ясны. Што, лёгка згадзіўся? На бясконцы жаль, не магу вас абодвух адчараваць, не пераўзысці мне бацькоўскай волі. Так, любое пакаранне мае межы, любая віна мае выкупленне. Усё мае свой пачатак, усё мае свой канец... Вось і брат твой, разгалісты дуб, што мог ператвараць у найпрыгажэйшы бурштын чалавечыя слёзы, пашчапаны на дробныя трэсачкі... Ведама, злы ты з-за гэтага на людзей. Але зрабілі тое людзі з вялікага гора... Табе не зразумець яго, ты

занадта даўно быў чалавекам. Пытаешся, якое гора можа быць большым, чым сем вечнасцяў цягнуцца да сваёй каханай, чым сем вечнасцяў бачыць яе слёзы? Можа быць, убачыць, як закопваюць людзі крыніцу з жывою вадою? А можа быць, глядзець, як высыхае яна, як знікае яе гаючая сіла? Што злуеш? Хочаш дачакацца, калі з цябе зробяць сані? Так? Тады дазволь мне ўчыніць, каб жа наш жыццёвы скон ды стаў пачаткам... Я, ведны, усё прадбачу. Усё табе раскажу...

У самую чарадзейную ноч прыйдзе да цябе залатакосая дзяўчына. Ад нараджэння разумее яна галасы зямлі. Але мовіў я звярам ды птушкам, каб звялі яе да цябе, і не парушыць лясун маёй волі... Што мне да яе? Да яе нічога, але закаханы ў залатакосую хлопец, над лёсам якога варажылі зоркі. Яму прадказалі зашмат. Яго і хачу блаславіці чарамі, яму і прашу тваёй дапамогі. Якой дапамогі? А ўсё проста... Ты сам ведаеш, што значыць страціць каханую, ясны. Ведаеш найлепей. А ў тую чарадзейную ноч гойдаецца на тваіх галінах усялякая нечысць... Хай сабе, збірай такіх сяброў у сваім вялікім горы. Дык няхай твае сябрукі і зацягнуць золатавалосую ў ясную крону. Хоча яна чарадзеіць, няхай здзейсніцца тое. У мяне ж іншы клопат. Я хачу, каб ён быў гатовы на ўсё. Ты ж сам такое перажыў, ясны. Я хачу, каб стала яму балюча. Толькі ты можаш такое ўчыніць...

Гаворыш, што горшы я за роднага брата. Мы яшчэ памерымся сіламі. Не раўнай нас, мы розныя. Гаворыш, што горшы я нават за бацьку... Што ж, табе лепей ведаць. Мой бацька замовіў вас у крыніцу і ясень, таму што быў закаханы, таму што помсціў за здраду. Не плач, высокі ясень, я не ведаю такога пачуцця. Каханне... Але я скарыстаю яго вялікую сілу. Гэта проста. Як і ўладаць чарамі. Як і бараніць тое, што мне належыць. Дык ты са мною? Са мною. Я і не чакаў іншага. Ты яшчэ парадуешся за сваю вечнасць, за маё імгненне на гэтай зямлі... Што? Я таксама доўга жыву? Не зайздросці. Няма чаму. Дык памятай, у чарадзейную ноч...

…Удалася яна пагоднай, самая чарадзейная ноч, тая ноч, пра якую складуць легенды. Ды што мне легенды! У іх жа ўсё прыхарошана так, што і цяжка дазнацца праўды. Але я быў сведкам таго, як усё рабілася. Скінуўшыся кажаном, незаўважаны нікім, акрамя самой ночы, кружляў я над закаханымі, над шляхам іх расстання, над высокім ясенем. Шмат я смяяўся, але не толькі смешна мне было…

Ім не проста застацца разам. Зразумеў гэта з першага позірку я, ведны чарадзей, які шмат чытаў у людскіх вачах, у людскіх сэрцах. Крыўдна прызнацца, але тая залатакосая была лепшай за яго, хлопца з абраным лёсам… Яна хоць бы ведала, да чаго імкнулася. А ён, небарака, ён зусім яе не разумеў. На нейкае імгненне зрабілася яго шкада. Мабыць, я сапраўды горшы за брата, як задумаў учыніць з ім такое… Але не, не адмоўлюся ад сваёй задумы. Таму што ўчуў сказаныя словы:

— Навошта табе нейкія чары? Забудзься на іх. Проста пакінь, як незразумелы сон. Не вядуць яны да добрага…

— Адкуль ты ведаеш? Ты што, чараваў?

— Не. І не збіраюся. І табе не дазволю…

— А хто ты мне, каб не дазваляць?

— Паслухай, я хачу табе лепшага.

— Што можа быць лепей за чары? Няўжо ты?

— Хіба я такі дрэнны?

— Не хачу цябе слухаць…

Вось і ўсё. Абвостраным кажановым зрокам я ўгледзеў нясцерпны боль у вачах таго, хто сам быў вінаваты. Так лёгка страціць, так балюча гэта зразумець. І данеслі мне чары палыновую горыч палёў і лясоў, якія бачылі іх шчаслівымі. Разбіліся водбліскі зор у азёрных люстэрках, якіх яны дакраналіся рукамі. І паляцеў над светам расчараваны ўздых засмучанага Лады. Гэтым разам не выйшла ў цябе, сінявокі. Што ж, не яны апошнія.

Усё яшчэ нікім не заўважаны, я лунаў над іх ростанямі. Плакала залатакосая, зразумеўшы, што гэта расстанне. Што ў кожнага з іх свая дарога. А ў хвіліну горычы мы ўсе такія слабыя... Упершыню здаліся ёй зусім зразумелымі галасы начнога лесу, якія зваблівалі за сабой. Яны клікалі, абяцаючы таямніцы. А таямніцы ды нязведаныя шляхі лепей, чым боль адзіноты. Ідзі, праніклівая чарадзейка, тваё наканаванне чакае цябе. Што ж, хлапеча, затрымай ты яе, скажы тое, што адчуваў у тую хвіліну, і яна б не пайшла. І нічога б не адбылося. Але ты не быў гатовы... Цяжка мне з табой будзе. Ты стаяў і глядзеў, як яна ідзе ад цябе прэч, і нічога не думаў рабіць. Я налічыў больш за трох соцень удараў твайго сэрца, я ўжо думаў, што памыліўся ў табе, калі ты нарэшце пабег за ёю.

Яе вёў начны лес напрасткі да ясеня, цябе ж крыху пабадзіў заўсёды шкодны лясун. Усё ж узбіўшыся на след залатакосай, ты ўбачыў, што спазніўся... І табе адкрылася, чалавеча, што размаўляе твая каханая з ясенем, як з роўным сабе, што бярэцца за яго галіны-рукі і знікае ў густой кроне. Ты дарма кінуўся бегчы, дарма спрабаваў зноў і зноў узлезці туды, дзе некалькі імгненняў назад была залатавалосая.

— Позна, позна, яна сама згадзілася пайсці да нас, — здзекліва галосіць табе нечысць з ясеневай вершаліны.

— Знайду яе, адшукаю, вярну, — упарта мовіў ты, і мне спадабалася тады твая ўпартасць.

— Не, не знойдзеш, не адшукаеш, не вернеш, — рэхам азываўся табе высокі ясень ды паказваў свае пустыя галіны. — Глядзі, няма яе...

— За што вы так з ёю? — ты хацеў, ты імкнуўся зразумець.

І ты не ведаў, што яшчэ прыйдзе час твайго разумення чараў і ўсяго, што звязана з чарамі. Я цябе навучу, колькі б часу нам ні спатрэбілася. Таму што гэта галоўнае, што я павінен зрабіць.

— Ні за што! Ні за што! Ні за што!.. — здзеклівым рэхам адказвала з ясеня, і ты ўскіпеў гневам...

— Пашчапаць цябе, ясень, на дробныя трэсачкі!.. — у тваім голасе прагучала сапраўдная прага здзейсніць пагрозу.

І твая рашучасць мне спадабалася яшчэ болей. З гэтага можна было пачынаць. Ясень не зважыў на тваю пагрозу. Адно махнуў мне галінай, маўляў, споўніў, пра што казалі, далей сам рабі. Той, хто сем соцень сонцаваротаў бачыў радасці і страты белага свету, ведаў, што ты сам яшчэ не спазнаў сваёй сілы. Сваёй незвычайнай сілы. Сілы, што пакіне тваё імя ў легендзе, якую я, ведны чарадзей, складаць пачынаю...

Падаю на зямлю і паўстаю перад здзіўленым табою ў чалавечым абліччы. Што ж, я ўмею здзіўляць. А ты зусім не рады мяне бачыць. Пытаешся злосна:

— Як знішчыць чары, што яе схавалі? Толькі ў каго я прашу дапамогі?! Ты ж таксама з гэтага кодла. Не дапаможаш, не скажаш.

— Дапамагу. Скажу, — моўлю ў адказ. Гэта праўда, што я ўмею здзіўляць.

— Як? — ты ўвесь ператварыўся ў слых.

— Гэта прасцей, чым табе здаецца, але не так хутка, як табе карціць.

— Не злуй мяне, чараўнік. Кажы...

— Добра, раз ты сам просіш.

Вось так проста пачынаюцца легенды. Пачынаюцца з кахання і прабачэння, з рашучасці ўсё зрабіць... Не, трасе лістамі ясень, думаючы пра тое ж, пра што і я. Пачынаюцца са страты і гневу, і прагі адпомсціць... Не хаваеш сваіх пачуццяў, ясны. Не хавай, не трэба. Толькі не быць легендзе без кахання, без надзеі, без веры. Мне лепей ведаць. Гэта я гляджу табе ў вочы, хлапеча. І кажу табе праўду, толькі праўду. Вялікую праўду...

Кажу, што было ў свеце двое закаханых. У чарадзейную ноч, калі ўсе спалохана хаваліся па хатах, толькі яны не збаяліся і пайшлі на спатканне. Ці доўга, ці мала гулялі, не зважаючы на дзікія спевы вадзянікоў, лесуноў, палевікоў, але ўпадабала дзяўчына высокі ясень. Дакранулася да яго, і з ясеня пацягнулася да яе белая, нібы снег, рука… Пацягнулася, і нехта салодкім голасам паклікаў ісці да іх. Узяла дзяўчына белую руку, толькі не разгубіўся яе каханы. Ухапіў яе і трымае, не дае падняцца на дрэва. А зверху нехта рагоча-заліваецца, гаворыць, што позна ўжо, што прыгажуня сама пагадзілася. Узлаваўся хлопец і зрабіўся ў сем разоў дужэйшы. Пацягнуў ды не толькі вызваліў сваю каханую, але і ўсё кодла з ясеня скінуў…

— Ды што я расказваю, не ведаючы таго, ці да душы прыходзіцца мая гамонка? — перапыняю я свой аповед.

— Годна баеш, чарадзей. Добра сказаў мне, што сам я вінаваты. Не спрачаюся з тым. Толькі хлопец той быў, відаць, сапраўдны асілак… Не ўсім такое ад нараджэння дадзена.

— У кожнага ёсць свая сіла. А калі няма, то прызначана знайсці сілу яшчэ большую. Толькі не кожны пра сваё прызначэнне ўведае…

— Гаворыш, што ёсць у мяне прызначэнне. Чарадзей, з чаго мне табе верыць?

— З таго, што хочаш ты ўбачыць яе. Хоць і ведаеш, што не быць вам разам, але не адступішся. А мне заўсёды такое даспадобы.

— Скажаш, як знайсці мне вялікую сілу?

— Падкажу…

— Падкажаш? Ізноў таямніцы.

— Што ж, кожны лёс — таямніца. Не магу табе твайго лёсу прадказаць. Не магу прадбачыць усё тое, пра што будзеш шкадаваць. Магу толькі згледзіць яго ахутаны смугою след. Павер, што і гэта многа…

— Дык кажы пра мой засмужаны след, чарадзею. Кажы, пакуль я табе веру...

І я сказаў табе, чалавеча. З таго, што наваражылі зоркі, мовіў жаданае, што цепліць у сэрцы многія спадзяванні. І ты мне шчыра паверыў... Высокі ясень згодна схіліў вершаліну.

Ты пайшоў у вялікі свет шукаць сваю сілу, пайшоў здзяйсняць свой лёс. Прыходзіў да гаючых камянёў, да светлых крыніц. Слухаў пераліўную гамонку адвечных лясоў. Думаў пра тое, што былі яны да твайго нараджэння і застануцца пасля тваёй смерці. Задуменна стаяў ля ўзножжа сівых валатовак, слаўных у сказах ды песнях. Шмат пра што хацеў запытацца ў тых, якія знайшлі там свой вечны спачын. І я мог бы адкрыць табе іх адказы. Але бліжэй да цябе апынуўся твой лёс, бліжэй, чым ты чакаў. Сталі баяцца цябе лесуны, вадзянікі, палевікі. Сталі хавацца тыя, хто спрадвеку быў на гэтай зямлі. Былі яе славай, яе сілай. Не мог ты забыць сваю каханую, а тая, хоць і ведала, што ты яе шукаеш, не спяшалася пабачыць цябе. Да душы прыйшлося ёй чараўніцтва...

Усюды, куды б ты ні пайшоў, шукаў тых, хто быў скрыўджаны на таямнічае ды неспазнанае. Сябраваў з тымі, хто аднойчы і назаўсёды ўзненавідзеў чары, неўзлюбіў чарадзеяў. Ты хацеў зразумець, ці ёсць у іх праўда. А ў праўдзе ты бачыў сваю сілу...

Шле мне з ветрам горкі папрок высокі ясень. Наракаюць яны, валадары лясоў, палёў, азёр, балот, ні ў чым не вінаватыя перад табою. Гавораць мне, што пусціў я ў свет злое, пусціў таго, у каго няма ні сэрца, ні душы. Пэўныя яны, што не маглі зоркі варажыць над лёсам такога... Крыўдуюць, што мала я берагу іхнюю волю, хоць мне прызначана люляць спакой пявучых бароў з сінімі азёрнымі вачыма, непрадказальных бяздонных багнаў і палёў са спелымі жытамі. Слухаць песні самых звонкіх крыніц, каб не змоўклі яны, лавіць навальнічныя хмары, якія

нясуць з сабой нечы гнеў... Прадбачыць злое, бо на тое я і ведны. І мовяць яшчэ, што бацька мой і бацька майго бацькі рабілі тое за мяне лепей.

І яшчэ болей змяніўся ты. Зразумеўшы, што не толькі простым смяротным сынам, але і такім, добрым, незвычайным, вядомы страх, ні на хвіліну ты на гэта не забываўся. Упадабаў чыніць паляванне. Смешным табе здавалася тое, што ў іншых абуджала толькі смутак. Сталі прасіць яны, якія спрадвеку стваралі чары майго роду, каб суняў я цябе.

І здарылася так, што ў доўгіх сваіх падарожжах сустрэўся ты з ваўкалакам-людажэрам.

Ён адымаў жыцці. Зманьваў са шляху, зводзіў у багну, дзе і хаваўся, назаўсёды пазбаўлены мною свабоды. І яшчэ ён мог лёгка прыняць любое аблічча, каб падмануць таго, каго нагледзеў сабе ахвярай. Як мовіў мне той багнік, які не выпускаў яго са свайго валадарства, занадта не любіў свет людскі... Я ж сумняваўся ў тым, што любіў ён хоць бы і свет чарадзейны, таму і забраў у яго самае дарагое — поўню неабсяжных лясоў... Ён ніколі таго мне не даруе, бо не ўмее дараваць. А ты, чалавечы сын, ці ўмееш?

Я не бачыў сам, як вы знайшлі адзін другога. Той, хто не цярпеў чараў, знайшоў таго, хто не выносіў людскі дух. Але мне расказалі заўсёды цікаўныя балацянкі.

Ваўкалак, пачуўшы твае крокі, скінуўся старым падарожным, што збіўся са шляху ды не можа выйсці з дрыгвы.

— Дапамажы, чалавеча, узбіцца на якую дарогу, — ласкава папрасіў цябе.

Толькі ты не паддаўся на такія хітрыкі. Зразумеў, хто перад табою. Запытаў яго:

— Адкуль жа ты прыйшоў, вандроўнік?

— Здалёку, сынку, здалёку.

— А куды крочыш па такой багне?

— Туды, куды ты так хочаш дайсці, але ніяк не дойдзеш...

Ды прагна глянуў табе ў вочы. Падгледзеў твае прыхаваныя жаданні, у якіх ты сам сабе прызнацца не хацеў. Глянуў ды мовіць салодкім голасам:

— Ідзі да сваёй чараўніцы, хлапеча. Ідзі, а я падкажу.

— Што падкажаш? Да якой чараўніцы? — не адразу зразумеў ты.

— Той, якую пад высокім ясенем ты не ўтрымаў... Усё яшчэ кахаеш яе?

— А як жа.

— Мабыць, хочаш ведаць, дзе яе знайсці?

— А як жа.

— То хадзем са мною.

— А як жа.

Пайшоў ваўкалак, сочачы адным вокам, ці ідзеш ты за ім следам. А ты прайшоў колькі крокаў, спыніўся ды зноў пытаешся:

— А скуль ты ведаеш, чалавеча, дзе цяпер мая каханая?

— Вятры жыцця падказалі.

— То, мабыць, ты не просты вандроўнік?

— Мабыць, не просты...

І зноў трошкі ідзяце. Толькі не рушыш ты за ім проста ў багну. Зноўку мовіш, як быццам вагаючыся, як быццам спадзеючыся:

— І шмат каму твае вятры жыцця дапамаглі?

— О, усім, хто меў ласку шукаць у мяне дапамогі, — упэўнена засмяяўся ваўкалак. — Большай дапамогі шукаці не будуць...

Ён многа людзей зводзіў з дарогі і ўжо адчуў, што ты ад яго не ўцячэш. Вось такія, якія сваімі нагамі ішлі да яго, весялілі людажэра найболей. Яны не мелі сілы змагацца... І ён ахвотна адказваў табе, пакуль не пачуў:

— Кажуць, што адзін балотны ваўкалак памрэ ад рукі таго, на каго ніколі не падумае... Твае вятры жыцця нічога пра тое не данеслі?

Сказаў так ды пхнуў ваўкалака ў дрыгвяністае акно, куды той даў нырца з галавою.

Толькі не доўга табе давялося радавацца сваёй хітрасці.

Не выйшаў ты яшчэ з балота, як раптоўна з-за купін выскачыў проста насустрач той самы людажэр. Ды ў сваім сапраўдным абліччы...

Блізка-блізенька падбег да цябе ваўкалак, ціха-ціха прашаптаў:

— Не табе, слабы сын смяротны, здабыць мне смерць...

— А чаму так? — не спалохаўся ты.

— А таму, што знайшоў я вялікую сілу.

— І дзе ж яна? Пакажы сваю сілу, забі мяне.

— Там, дзе табе не пабачыць. Хадзем пакажу. Уведай тое перад смерцю...

Гэтым разам ты крочыў за ім след у след. Ішлі вы доўга, аж пакуль не дапалі да празрыстай крыніцы, што хавалася — дзіва дзіўнае — у самай непраходнай багне. І ноччу, і ў самы ясны дзень адбіваліся ў крынічнай вадзе іскрыстыя зоркі. Плавалі, як сапраўдныя, жывыя, нібы гэта перакулілася ў тую крыніцу само высокае неба. І ты не мог схаваць свайго захаплення, пабачыўшы такое...

— Глядзі, гэта зорніца, — мовіць табе ваўкалак. — Напіўся я халоднай вады і стаў дужым-дужым. Глынуў зорку, і ніхто цяпер не можа мяне перамагчы. Таму што нельга перамагчы крынічную прагу жыцця і зорную вечнасць змагання. У іх — веліч ляснога шолаху і замова палёў... У іх — бясконцае мноства мінулых і будучых жыццяў. Але ў гэта трэба паверыць, на гэта трэба спадзявацца... Ты ж страціў спадзяванне разам з каханай, якую б ніколі не змог утрымаць. Ні ля ясеня, ні ў жыцці... Мне нават не шкада цябе, чалавеча.

І яшчэ сказаў, каб глянуў ты ў крыніцу апошні раз ды зрыхтаваўся памерці...

Глянуў ты ў крыніцу-зорніцу ды скочыў проста ў яе нерат. Ваўкалак жа за табою...

Мабыць, глынуў-такі той зорнай халоднай-халоднай вады. Можа быць, што і праглынуў нейкую люстраную зорку. Хто ж ведае, можа, і знайшоў моцы паверыць... у сілу зямлі і сілу вады, якія цябе вырасцілі. Сілу паветра і сілу агню, праз якія табе яшчэ трэба будзе прайсці. Цяжка мне пра тое казаць. Але пэўна ведаю, што з той зорніцы вярнуўся, вылезшы на дрыгвяністы бераг — на белы свет — толькі ты адзін. Ваўкалак застаўся ў крыніцы...

І яшчэ ведаю, бо казалі са шчырым здзіўленнем балацянкі, што ўсё ж не памёр ваўкалак. Калі ты ўжо хацеў ісці, адбілася сярод зорак у роўнядзі вады яго крыважэрная пашча. Гукнуў ён цябе, і ты на колькі імгненняў спыніўся:

— Хлопча, мудры, паслухай мяне, каб не шкадаваць табе апасля...

— Чаго табе яшчэ?

— Не ўсё сказаў табе той чарадзей...

— Што ж ён не сказаў з таго, што ты скажаш?

— А ты паслухай. Чары адкрылі ўсім вартым тое вяшчуннае прадказанне...

І мовіў табе з крыніцы ваўкалак, што ратаваў хлопец сваю каханую... Калі ўзяла яна белую ясеневу руку, то ўзлаваўся хлопец і зрабіўся ў сем разоў дужэйшым. Пацягнуў ды не толькі вызваліў сваю дзяўчыну, але і ўсё кодла нечысці з ясеня скінуў. Лесуноў, палевікоў, вадзянікоў, балотнікаў ды ці мала яшчэ каго... Сціх рогат, пачуўся жалобны плач. Сталі тыя, якія хацелі забраць прыгажуню, прасіці-маліці, каб ускінуў іх хлопец назад на ясень. Пагардліва глянуў на іх асілак ды пацягнуў да багністай прорвы, што ад ясеня была не так далёка. Заплакалі тыя ясеневы сябрукі яшчэ гарчэй, скарбы вялікія хлопцу абяцаюць, абы не кінуў іх у бяздоннае балотнае вока...

— Навошта мне вашы скарбы? — мовіў хлопец у адказ. — Грошы буду здабываць працай рук сваіх, а большага мне і не трэба.

— Мы не грошы прапануем табе. Гэта больш вартае...

— Што ж для вас, нячысцікаў, больш вартае за грошы?

— Тое, што і для цябе, чалавеча... Пашана. Слава. І памяць, памяць бясконца доўгая за тое, што ты зробіш.

Зацікавіўся малады асілак:

— Што ж гэта такое? Кажыце.

— Дай спачатку слова, што пасадзіш нас назад на ясень.

— Так і быць, пасаджу. То кажыце, але калі падманіце, то кіну вас у прорву.

— Не, не будзем табе маніці. То слухай...

Зладжана загаманілі лесуны ды вадзянікі пра тое, што настане хутка час, калі трэба будзе ратаваць людзей. Здарыцца вялікая бяда. Абудзяцца варожыя чарадзействы чужой зямлі. І тады прыляціць з чужыны цуда-юда, прынясе з сабою смерць і няволю... Цяжка будзе з ім, моцным, крылатым, змагацца. І тады той, хто зможа гэтае цуда-юда перамагчы, будзе абраны князем. І атрымае пашану, славу, памяць. А пра нялічаныя багацці не трэба і казаць. Але каб выйсці з той бойкі жывым, трэба слаўнаму асілку разгадаць таямніцы таго страшыдлы. Тыя таямніцы схаваныя ў скарбах, якіх яшчэ ніхто не здабыў. Адно валадары лясоў і вод падказаць шлях да тых скарбаў могуць...

Распавёў гэта табе ваўкалак ды змоўк, чакаючы твайго слова.

— І як жа тыя скарбы здабыць? — вярнуўся ты да крыніцы-зорніцы.

— Гэтага я табе не скажу, — мовіў табе з крыніцы. — Табе і чарадзею твайму помсцячы, толькі адно навяшчую... Хутка настане час, калі паўторыцца вялікая людская бяда. Вернецца цуда-юда, прынясе з сабою няволю, гора і слёзы. Людскія слёзы... Табе, сын чалавечы, на іх глядзець. А паратунку не ведаць.

— Не табе аднаму вядома, як перамог той асілак чужынскага цуду-юду.

— Не мне аднаму, — задаволена ўсміхнуўся ваўкалак. — Стаяў ты на самым вялікім кургане, насыпаным на вечны спачын. Хто, ці ведаеш, спіць у ім?

— Даведаюся, калі ты мне скажаш…

— Той самы асілак, які здабыў перамогу сваёй смерцю. Не суджана яму было стацца князем. Пасмяротнай была яму і пашана, і слава.

— А пра цябе, людажэра, ніхто ніколі і не ўспомніць, — ты нахіліўся над крыніцай і скалануў люстраны адбітак ваўкалакавай пашчы.

— Ты зноў памыляешся, хлопча, — яшчэ паспела мовіць тая. — Я буду памятаць пра ўсё, стаўшы вадою, стаўшы травою. Буду ў цяжкую хвіліну перабягаць табе шлях. Азывацца ў ваўчыным выцці з самай глушэчы, калі ты будзеш крочыць праз лес адзін у зімовую ноч. Глядзець у вочы з ваўчыным сонейкам, калі будзеш успамінаць пра страчаную каханую. Павер мне, што гэтага досыць…

Знік ваўкалак у зорнай крыніцы, і зноў толькі нябесныя халодныя адбіткі замігцелі ў ёй. Празрыстыя, глыбокія… Як чалавечая душа, што знайшла свой найдаражэйшы скарб. Як быццам дзіўная крыніца мела сваю волю, мовілі мне пра яе праніклівыя да ўсяго незвычайнага балацянкі. А яшчэ дадалі пра тое, што пакрочыў ты ад іх балота сумным-сумным. Нібы страціў некага, пра каго палоніць душу жальба.

А ты ж, хлапеча, хоць і годна сказаў ваўкалаку, але пра змаганне сваё з цудам-юдам не думаць не мог. Вяртаўся зноў і зноў на самы высокі курган, дзе спачываў слаўны волат… Ён перамог, але не застаўся жыць, хоць быў лепшым за цябе. Ты думаў так хоць бы таму, што ён здолеў ратаваць сваю каханую. Здолеў тое, чаго не здолеў ты. Глядзеў на курган — вечны спачын героя — і быў упэўнены, што я не так сабе з'явіўся пад высокім ясенем. І я быў рады, што ты пачынаў пакрыху разумець…

Мы сустрэліся з табою зноў, калі залівалі зямлю восеньскія дажджы. Яны апавядалі свету пра тое, што было ў мяне на душы. Гайдалі палыны горыч на кургане несмяротнасці, калыхалі пякучыя слёзы і вечнае захапленне... Мне заўсёды балюча тут быць. Хочацца плакаць, але думка пра подзвіг, які вышэй ад слёз, не дае праліць ані кроплі. Ты адчуваў тое ж, што і я. Хацеў заплакаць — і не мог. Ты думаў пра яго, пахаванага ў гэтым кургане...

Не азірнуўся на мяне, калі я стаў поруч з табою. Я сказаў табе, што ты здолееш перамагчы. Сказаў табе пра тое, чаго не здзейсніць ты болей за ўсё баяўся...

— Якім ён быў, чарадзей? Ты ж ведаў яго.

— Ведаў. Ён нібыта твой родны брат. Такі ж слаўны, такі ж смелы.

— Ён хацеў жыць...

— Ён і цяпер гэтага хоча. Глядзі, як цягнецца да сонца трава на яго кургане. Нават пажухлая, яна змагаецца за кожную хвіліну жыцця. А калі пільна ўслухаешся, то пачуеш, як ён вітаецца з табою. І я, чарадзей, бачу, што цяпер не толькі мы на кургане, але і ён стаіць побач. Не пайшоў ад сваёй зямлі, не можа яго душа расстацца з ёю.

— Мабыць, ты можаш з ім пагаварыць?

— Магу. Пра што ты хочаш спытаць?

— Чаго болей за ўсё той цуда-юда баіцца?

— Болей за ўсё баіцца чалавечнасці... Не можа яе зразумець гэтае цікаўнае да ўсяго новага стварэнне.

— Ізноў твае чарадзейныя таямніцы.

— Зусім не. Дазволь і мне спытацца. Дзе скончыцца сіла і пачнецца ахвярнасць?

— Хіба я ведаю...

— А павінен ведаць, сын чалавечы.

— Адкажы мне і ты, чарадзею. Чаму з усіх ты выбраў мяне? Не лепшы ж выбар.

— Спытай у зорак, з чаго варажылі яны над тваім лёсам.

— Гэта ты можаш у іх спытаць.

— У іх — не магу. Яны вечныя, халодныя да чарадзейнага слова... Што ж, сын чалавечы, абяцаю ніколі цябе не пакінуць...

І ты згодна прамаўчаў. А я не ўзляцеў кажаном, не знік з кургана чорнай віхурай. Я б абразіў яго памяць, так учыніўшы. Я б знявечыў той апошні раз, калі ты, слабы чалавеча, можаш паглядзець мне ў вочы, можаш спытаць... Ціхай хадою пакінуў за спінаю курган... І што табе ведаць пра апошняе расстанне, хлапеча. Нічога. І я не ваўкалак, каб табе пагражаць.

Ужо мінулі яловыя лясы, што, нібы вечныя стражнікі, абступалі курган, калі ты дагнаў мяне. Што ж, будзеш так пастаянна рабіць, то аднойчы спознішся назаўсёды...

— Пачакай, чарадзею. Скажы мне, яна там, з усімі вамі, з чарамі сваімі, шчаслівая?

— Яна шчаслівая. І яна аднойчы знойдзе цябе...

Ты паглядзеў мне ў вочы. Шмат сілы, шмат спадзявання... Добры позірк.

— Пра што яшчэ спытаеш, хлапеча?

Толькі дарма я думаў, што ты нічога не зразумеў:

— Ты абяцаў ніколі мяне не пакінуць... Ніколі — гэта занадта доўга. Але я рады, што трохі часу адбярома ў вечнасці. Люляй белы свет, ведны чарадзею...

— І белы, і цёмны, сын чалавечы.

Ісці ад белага свету да цёмнага і вяртацца назад — гэта мой лёс. Хто ведае, мажа, таксама наварожаны зоркамі. Хоць гэтых вечных, абыякавых я не люблю. Але ніколі не мог прадказаць іх, ясных. Ніколі не мог дазнацца свайго лёсу. І казаў мне высокі ясень, што ў гэтым і толькі ў гэтым кажуць мне і белы, і цёмны свет сваю спагаду. Я быў не згодны з ім. Тым, што ты ведаеш, можна ўладаць. На што мне ясень заўжды

адказваў, што міласэрнасць — у невядомасці, міласэрнасць — у спадзяванні. Што ж, ён некалі быў слабым чалавекам. Не маўчаў у адказ ясны. Казаў, што хацеў бы ім і застацца...

Я люблю ўсё прадбачыць. Толькі трэба ж такому здарыцца, што прынёс мой чарадзейны лёс неспадзяванку. Палыхнулі гневам чары чужынскай зямлі, учынілі тое, чаго я аніяк не чакаў. І не змог я абараніцца-чарадзеіць, не змог сплесці чары ад устрывожаных лясоў, азёр, балот. Ідзі ж да мяне, мой вораг, з нецярпеннем чакаю цябе...

І ён прыйшоў... Закрылі злыя крылы паўнеба, а чорны дым з пашчы заслаў сонца ад белага свету. Полымя спапяляльнага гневу шуганула па зямлі. Задрыжэлі курганы-валатоўкі ад яго смеху. У сполаху ўцякалі людзі, думалі, што гэта так выглядае смерць... Яны бадай не памыляліся. Цмок, празваны цудам-юдам, нёс толькі смерць. Але пакуль што ён не спяшаўся забіваць. Шукаў, прагна шукаў са мною сустрэчы. Лётаў, але і па зямлі хадзіў, нырaў у глыбокія азёры. Думаў, што я хаваюся там. Але не трэба было мне хавацца...

— І навошта табе такое відовішча? — я ўсміхнуўся яму, выходзячы насустрач. Нібыта ласкава прывітаўся. Ён прыглядаўся да пакінутай людзьмі вёскі. Ад няма чаго рабіць збіраўся яе падпаліць.

— Чарадзею, я хачу есці. Ты прыйшоў мяне накарміць? — як і я, ён хацеў выглядаць шчырым.

— Я прыйшоў цябе прагнаць. Няхай корміць цябе твой гаспадар, — нібы таргануў цмока за вусы. Весела і небяспечна.

— Мой гаспадар паслаў мяне карміцца ад іншых зямель, — глянуў ён нявіннымі вачыма. — Мо дамовімся, чарадзею?.. Давай мне горшых — здраднікаў і забойцаў, няхай буду пакутаваць, жуючы іх горкія косці. Але чаго не зробіш для сябра...

— Ці паверыш, сябра, але няма на маёй зямлі здраднікаў, няма і забойцаў. Няма каго табе аддаць.

— Вой-вой! Як жа так? Няўжо ты ўсіх-усіх выхаваў? Стагоддзя не прайшло, як патрапіў я ў няволю з тваёй чарадзейнай ласкі. А твая зямля стала такая белая-белая... Аж прыемна сюды прыляцець.

— Вяртайся назад, Крагавей, — я наўмысна назваў яго сапраўднае імя, вядомае нямногім. — Тут няма анікога, радага цябе бачыць...

— Мо прагоніш?

— А і прагано.

— Чаго ж ты марудзіш?

— Табе апошнюю ласку зрабіці хачу. Як надзейнаму быламу сябру...

Захлынуўся цмок ад смеху, успыхнула полымем пакінутая вёска.

— Ты заўсёды ўмеў смяшыць, чарадзею. Дык і я цябе павесялю. Ідзі сюды...

Паплылі прэч ад мяне зямля і неба, як ні моцна я быў з імі звязаны, як ні трымаўся за іх. І праз колькі імгненняў, падхоплены Крагавеевымі чарамі, устаў я на калінавым мосце. Вечным памежжы жыцця і смерці. Ні скрануцца з яго, ні сысці...

— Зробіш крок наперад — памрэш, як памірае смяротны. Зробіш крок назад — таксама памрэш, — заліваецца ад смеху цуда-юда. — Ну як, ці добра я жартую, чарадзею? Але табе як сябру зраблю ласку. Глядзець і чуць ад гэтага калінавага моста, як паядаю і пабіваю тваю зямлю...

Калыхаўся ад яго смеху калінавы мост. Цяжка стаяць на ім, не робячы аніводнага кроку. Але адно я павінен зрабіць...

— Не табе прыдумаць сапраўднай пакуты, Крагавею. Не можа гэта зрабіці той, хто не хоча ведаць анічога пра людскасць...

— Ты гэта пра каго? — радасна пыхнуў Крагавей. — Пра таго хлопчыка, які не любіць чараў? Спадзяюся, ён добры... на смак... Га?

– Пра яго, Крагавейка. Ты зноў будзеш пераможаны. Я ведаю гэта, як зоркі ведаюць чалавечы лёс. І весела мне будзе пабачыць тое ад калінавага моста.

– Няўжо? – зацікаўлена зіркнуў Крагавей чорнымі бліскучымі вачыма. – Дзе падвох, чарадзею?

– Я проста сказаў табе праўду. Ідзі хутчэй насустрач сваёй смерці, бо стаміўся я ўжо цябе забаўляць...

– Не клапаціся, чарадзею, твая зямля чакае мяне...

– Крагавей... – я глянуў цмоку ў вочы, рызыкуючы страціць волю і памяць. – Табе нядоўга па ёй хадзіць...

І цуда-юда паімчаў. Зацікаўлены, прагны да людскіх пакут. Гатовы сцвярджаць сваю сілу смерцю і знішчэннем. Гатовы да вялікай крыві. І гатовы ўсумніцца ў сабе. Занадта ўпэўненым я быў на калінавым мосце. Занадта пагардлівым для таго, каму анічога не засталося. Ты ўжо быў пераможаны, Крагавей. Я проста веру, што ўсё паўторыцца. Дзеля цябе, добры сын чалавечы...

Ты застаўся адзін, слаўны хлопчык. А гэты цмок быў страшным. Ты шукаў мяне ля высокага ясеня, шукаў у квітнеючых палях і непраходных пушчах, калі надарылася бяда. Я не змог табе дапамагчы, як стаў лютаваць змей Крагавей. Прыйдзе з чужой зямлі, людзей паядае, а якіх не з'есць – пабівае... Мала хто насмеліцца з ім змагацца, а гэтых, нямногіх смелых, хутка напаткае жахлівая смерць ад цмокавых кіпцюроў. Доўга думаў ты, як цуды-юды пазбыцца, і нарэшце прыдумаў чары ад чалавечай душы, ад простай працы, што спарадзілі маё нямое здзіўленне...

Сабраў такіх, як і сам, адчайных ды смелых, і сталі вы рабіць вялізную-вялізную саху. Дубы векавыя для яе валілі, жалеза з усяго краю збіралі. Зрабілі акурат такую, што толькі Крагавея ў яе і запрэгчы. І схавалі яе. Навошта? Я глядзеў на тое ад калінавага моста і не ведаў...

Толькі не спыніўся ты. Стаў дзеля чагосьці з дружынай камяні цягаць, з іх вежу высокую мураваць. Якраз там змураваў, дзе цмок найчасцей з'яўляўся. Змуравалі вы тую вежу, як

ляльку, прыгожую, белую, ды схаваліся ў ёй. Няўжо будзеце да скону там хавацца?

Нядоўга і пабыў ты з хаўруснікамі ў каменнай схове. Ляціць Крагавейка, пнецца, аж пыл перад ім курыць. Убачыў белую вежу, зацікавіўся, спыніўся. Заўсёды быў такім цікаўным. Ды пытаецца:

— Хто ж у новай каменнай хатцы жыве?

А ты, хлопча, яму ў адказ мовіш:

— Я жыву... Асілак, які будзе з табою біцца.

— Дык выходзь, устань перада мною, пабарукаемся.

— Боязна мне... Шмат ты слаўных воінаў забіў. Так жыць хочацца...

— Дык чаго ты, пудзіла, увесь свет смяшыш? Разнясу твой каменны дом ды цябе глыну!

— Пачакай, цмок, не губі людзей. Калі ты праліжаш трое жалезных дзвярэй, я сам табе ў пашчу скочу.

— Хай сабе так...

Лізнуў цуда-юда раз — з'еў першыя дзверы, лізнуў другі — і прадыхнуў другія дзверы, лізнуў трэці — і праглынуў трэція. Ды бубеніць прама ў вежу:

— Дык дзе ты там, слаўны асілак? Рабі, пра што казаў. Праверу, які ты на смак...

Я не паверыў, калі ты ўхапіў цмокаў язык жалезнымі кляшчамі ды ўзяўся паганага малаціць па галаве чым папала. Зняметь ад спуду Крагавейка, дрыжыць увесь, слова мовіць баіцца. А дружына твая тым часам давай яго ў саху запрагаць...

Тарганууся Крагавей раз, тарганууся другі — ні туды ні сюды. Моцнай аказалася дубовая саха. Ды і вежу так сабе разбурыць не ўдаецца... А ты ў яго пытаешся:

— Ну што, пудзіла паганае, будзем мірыцца ці будзем далей біцца?

— Замірымся, слаўны асілак, — просіць літасці цмок.

— А не будзеш болей да зямлі маёй лятаць?

— Не ведаю...

— Ах, не ведаеш!

І ўзяўся ты на Крагавейку баразну гнаць. Першы дзень аралі вы поле, на другі аралі лес, аж пакуль на трэці не дааралiся да вялікай ракі. Знямогся паганы саху валачы, пыхі болей не кажа. І зноў ты маеш яму сказаць:

— Ну што, пудзіла паганае, будзем мірыцца ці будзем далей працаваць, зямлю ўрабляць?

— Мірыцца, мірыцца, — адразу згаджаецца цмок. — Ніколі не буду болей у твой край лятаць, за мяжу заступаць...

— Дык глядзі ж! Будзеш памятаць, дзе мяжа, чужынец, сам яе прааpаўшы...

Адно не змог цуда-юда пазбыцца паганай прагнасці:

— Шкада, не лётаць мне болей над белай зямлёй... Толькі і твой паважаны чарадзей не будзе болей па ёй хадзіці. Пакінуў яго на калінавым мосце, адкуль ні вяртання, ні ратавання няма і не будзе...

І ўсміхнуўся я тут, на калінавым мосце, таму што дарма ён так сказаў...

— Гайда! Бух! — загадаў ты цмоку. Маўляў, скачы ў раку.

Няма чаго Крагавейку рабіць. Скочыў у самую строму. Сахі пазбыўся, ледзьве не ўтапіўся. Але ўсё ж здолеў вынырнуць ды паляцеў хавацца ў сваю нару. Прыляцеў ды кажа свайму гаспадару, дзе мяжа прайшла... Ды яшчэ мовіць, што не будзе болей ніколі лётаць да белай зямлі. Другі ўжо раз пераможаны яе асілкамі.

Далятае цмокаў спалох да калінавага моста. Звініць калінавы мост. Ён не любіць слабых. П'е чалавечы смутак, сілкуецца чалавечай жальбай. Таму няма такой сілы, якая б пераўзышла яго чары. І няма такіх чараў, якія б перашкодзілі мне, веднаму чарадзею, вярнуцца да роднай зямлі...

Доўга я вызваляўся з калінавай пасткі. Доўга чакаў. Доўга спадзяваўся... Але адпусціў мяне калінавы мост. Я перака-

наў яго, разумнага, жывога, што не прыйшоў яшчэ мой час перайсці на той бок. Вызваліўся адтуль, адкуль яшчэ нікому не ўдавалася, вярнуўся да роднай зямлі. Я так хацеў сустрэцца з табою, чалавеча з наканаваным зорным лёсам. Але я спазніўся...

Так непапраўна спазніўся.

Стаіць твая высокая белая вежа, цягне да сябе позірк. Буяюць вакол яе зялёныя лясы. Яны вясёлыя, як і людзі, што любяць іх прыгажосць. І ўсе яны на свой лад пяюць шчаслівыя песні, баюць цікавыя казкі, апавядаюць слаўныя легенды. Легенду пра цябе, смелы хлопчык. Легенду пра тое, як праклаў ты векавечную мяжу, з-за якой ніколі болей не адважыўся паганы цуда-юда прыляцець у наш белы край. Ніколі болей не зазналі гора людзі... Бароніць мяжа зямлю і людзей...

Шэпча мне высокі ясень, што не спадзяваўся болей мяне ўбачыць. Маўляў, што ж, што цяпер, чарадзею? Гаворыць, што трымаюць чары маёй зямлі тую мяжу, бо я так хацеў... Гэта праўда, я так хацеў абараніць цябе, стоячы на калінавым мосце, што пажадаў немагчымага. Я так хацеў, каб ты жыў...

І яшчэ шуміць мне высокі ясень... Пра твой курган у яловай гушчэчы. Паўстаў ён на месцы той багны, дзе перамог ты ваўкалака. Вартая была перамога. Але не магу я ісці туды, не магу падняцца на твой курган. Не магу табе сказаць. Кратае ясны мяне за плечы, нагадвае, што чакае мяне твая душа, чакае, не хоча пайсці ад сваёй зямлі...

А я не магу... Хоць і ведаю, што быў ты абраны князем і слаўна княжыў. Хоць і бачыў ты шчаслівыя дні пад высокім ясенем, бо знайшла цябе твая чараўніца. Хоць і славіць цябе легенда, называючы ўмелым кавалём, адораным незвычайнай сілай, які за подзвіг свой займеў пашану. Я не магу...

Кажа мне ясень, каб тварыў я новую легенду. Апекаваў новага чалавека... Не хачу таго болей. Не змагу таго болей. Паўсталі векавечныя межы на зямлі, дзе спрадвеку ўжываліся свет людскі ды свет чарадзейны. Не пераўзысці векавечных межаў...

# БУРЛІВАЯ КРЫНІЦА

*Міфалагічна-легендавае*

Я бягу ў далёкі нязведаны свет. Хачу збегчы адсюль, збегчы ад пакут, пазбыцца гора... Мінаю квяцістыя берагі, поўныя радасці, поўныя пацехі. Гэта няпраўда, што я некалі там была. Смяшлівая, бесклапотная. Ці даўно? Не ўспомню. Адбіваюцца ў плыткай вадзе лёгкія аблокі. Узіраюцца ў празрыстую плынь. І толькі я адна ведаю, толькі я адна бачу, што хаваюцца за аблачынкамі і прагныя, і страшныя... Не глядзіцеся, красуні, у празрыстыя люстэркі. Не вы адны любуецеся сваёй прыгажосцю. Лёгка схіліцца над крынічнай вадою, толькі нялёгка расстацца... Струменю ваду, збіваю люстраныя адбіткі шчаслівых твараў. Не хачу, каб іх пабачылі тыя, прагныя...

— Сама не хочаш бачыць, — шэпчуць мне аблокі, якія плывуць-бягуць за мною ўслед. — Балючы табе гэты напамін. Табе, злой бурлівай крыніцы...

Ускіпаю хвалямі ад такіх слоў. Бурлівая, гэта праўда. Але адкуль вам уведаць, ад чаго мне балюча. Як дазнацца вам, чаго дапраўды мне зусім не хочацца бачыць? Не ўгадаеце маіх дум, не зведаеце маіх мар, не спазнаеце майго гора. Маё яно, толькі маё...

— І наша, — смяюцца зноў аблокі. — Бо мы ж яго ўчынілі. Навошта нам твае думы-мары? І так ведаем пра цябе ўсё...

Зноў ускіпаю бруістай хваляй. Не зведаць вам пра мяне ўсяго. А я ўцяку ад возера, збягу далёка-далёка... Вы не ўтрымаеце мяне, журлівыя аблачынкі. Плывіце, ляціце за мною. Успамінайце. Карайце...

Не, яны проста абрываюцца дажджамі на мае радасныя берагі. Пояць вадою зямлю. Ды выглядаюць-высочваюць, можа,

нейкая маладая шчыра ўсміхнецца дажджу. Яны, прыгожыя, часам так робяць. Я і сама некалі тое рабіла.

Ніхто не ўбачыць, як тады злятаюць з белых аблокаў імклівыя цені. Адбіваюцца на імгненне ў маёй плыткай вадзе. Прагныя. Здагадлівыя. Праніклівыя. Уладарныя над дажджамі. Цікаўныя да людзей. Да маладых журбот. Да чыстых спадзяванняў...

— Не, не збяжыш ад нас... Навечна табе, прыгожая, смяшлівая, быць у нашым палоне... Мы цябе не адпусцім, не адпусцім аніколі.

Не змаўкаю, не слухаю, не згаджаюся. Б'юся ў спеўныя шчаслівыя берагі. Няхай пачуюць, пазнаюць, дапамогуць...

— Ніхто цябе не пачуе. Ніхто цябе не пазнае. Ніхто табе не дапаможа, — лянотна пацягваюцца дажджавыя хмары. — Ты ж злая. Злая бурлівая крыніца.

Я не заліваю берагоў. Я не плыву туды, дзе жывуць людзі. Я толькі хачу збегчы... Збягаю ўжо цяпер. Усё далей ад возера. Далей, далей... Бягу, іду, выбіваюся з сіл. Мне б вады. Зусім нямнога вады. Тады б прабілася, уцякла, уцякла...

Падаюць дажджавыя кроплі з пявучым плёскатам. Падаюць, множаць паціху маю сілу. Зліваюцца з маёй вадою, кажуць свае шчаслівыя сны. Падалі гэтыя кроплі на зямлю і бачылі радасныя ўсмешкі. Купаліся ў белай квецені пахучых чаромхаў. Паілі зялёную рунь на лепшы плён... І ў мяне тое будзе, калі я збягу. Я зноў хачу збегчы.

— Ты сапраўды хочаш збегчы? — пытаюцца кроплі, спаўняючы наказ тых, прагных. — Няўжо і ад гэтага хочаш збегчы?

А кроплі ведалі... Як звінелі без мяне высокія жыты. Нетаропка ўбіраліся, не верачы раннім вёснам, шумлівай лістотай векавыя ліпы. Тыя ліпы... І жыла без мяне, і радавалася жыццю вялікая прыгожая зямля, тая зямля, якая мяне чакае.

Будзе чакаць заўсёды. Толькі кроплі падалі на зямлю і вярталіся да аблокаў. Кроплі ведалі пра ўсё...

— Што ж, бяжы, а мы паглядзім. Мы ж дадалі табе сілы.

Гнеўна, шырока ўскіпаю хвалямі. Вы не здолееце мяне, не змусіце. Бягу, бягу хутчэй, шпарчэй ды чую ў азёрным плёскаце, у подыху вятроў, у песні ўсёй зямлі такое знаёмае:

— Брат слаўны... Брат наш слаўны...

Спатыкаюся ад чутых-перачутых слоў. Спыняюся. Аглядаюся назад. Не, я зусім не вагаюся. Я па-ранейшаму гневаюся, яшчэ болей злуюся, б'юся хвалямі. Ускіпаю ды ападаю, пакуль чую:

— Ідзі да нас на аблачынку, смяшлівая. Панясём цябе над зямлёй. Можа, і пабачыш якога слаўнага...

Мне ж не патрэбны які слаўны. Не трэба іншага... Не трэба. Паўтараю гэта зноў і тады нарэшце спыняюся. Куды ж мне збегчы без яго? Няма куды... І вяртаецца, непазбежна даганяе тое, ад чаго мне хацелася ўцячы. Калі змаўкаюць прагныя, то зноў гучыць і жаданае, і радаснае:

— Брат наш... Брат наш слаўны...

Я пачула гэта першы раз, калі ў захапленні спыніліся-пакланіліся трое. Незнаёмыя, нечаканыя. Не ад нашай зямлі. Чужы-чужаніцы.

— Вітаем, князёўна чароўнага краю. Цябе пабачыць, што на зорачку ясную зірнуць. Чулі мы пра тваю прыгажосць, ды не верылі, пакуль самі не пабачылі. Нас трое братоў. А гэта старэйшы, Брас. Брат наш слаўны.

Яны прыйшлі, калі позняя вясна атуляла зямлю сваёй лагодай. Звыкла буяла пахучая чаромха. Як і многімі ранейшымі вёснамі, лёгка марылася, нечага чакалася. Ды толькі ў гэтую вясну наймацней хацелася змяніцца і змяніць... У чым? Як? Не ведаю... Мабыць, проста жадалася трывожнай вясны.

Трое каралевічаў з далёкай зямлі, трое маладых прыгожых братоў. Дзівіліся з нябачанага раней краю ды завіталі на бацькаў замчысты двор. Казалі, што нямала пахадзілі па свеце, але такога прыўкраснага кутка яшчэ не сустракалі. Не хавалі, што многа бачылі людзей, якія не хапаліся за зброю, якія дзяліліся хлебам, адно такіх добрых і гасцінных нідзе не напаткалі. І яшчэ дадалі, што замнога спазналі чарадзейных таямніц, і радасных, і самотных, але дагэтуль анідзе не бачылі краю, дзе б хавалася столькі нязведанага...

— Неспазнаная твая зямля, князь Дзвін. Чарадзейная... Заўсёды марылі пра такую.

Змоўклі хутка, пабачыўшы, як хмурыцца бацька. Адкуль ім ведаць было, што не церпіць князь чараў, чарадзействаў, чарадзеяў... Тады сказалі яшчэ, што лёгка ім усё чарадзейнае пазнаваць. І што вандруюць па свеце, каб знішчаць чары, чыняць пераследы тым, хто чарамі валодае. Пэўна, я адна пачула ў іхніх словах няшчырасць. Чаго вы не сказалі, прыгожыя браты? Але ж ім прамовіла:

— Шмат на свеце прыгожых земляў з добрымі людзьмі. Ёсць у кожнай свае таямніцы. Не шкодныя, не злыя. Навошта ж іх вынішчаць?

Усміхнуўся мне бацька ў сівыя вусы, і змоўклі нашы нечаканыя госці, як быццам сумеўшыся.

— Князёўна нашай зямлі, — махнуў рукой родны. — Як бачыце, і смелая, і прыгожая...

— Праўда твая, князь, — тут жа падхапілі браты. — Столькі зямель пабачылі, а такой смелай князёўны нідзе не сустрэлі.

І першымі засмяяліся, лёгка, прывабна. Можа, ад гэтай бесклапотнай жартаўлівасці ўпадабаў князь Дзвін незнаёмых вандроўнікаў, дазволіў застацца, колькі пажадаюць. Мне і самой заўсёды падабаліся вясёлыя ды кемлівыя, адно гэтых братоў-каралевічаў не ўзлюбіла.

— За што, князёўна ясная, паглядаеш на нас так пахмурна? Чым жа мы табе не даспадобы?

А пра іх пацiху сталі казаць, што сочаць яны за чарамі ды чарадзействамі. Што нядобрыя яны. Мабыць, таемна размаўляў з імі князь ды ўзяў слова, што чарадзейныя таямніцы госці-каралевічы будуць знаходзіць, будуць разгадваць. А створаныя чары караюцца па княжацкаму слову! Чарадзеі ж заўсёды былі гнанымі. Лепей было б не з'яўляцца тут каралевічам, учыняць яны бяду...

— І разумныя вы, і вясёлыя, і бачылі дзівосаў нямала. Толькі з чужой зямлі вы прыйшлі, туды і вяртайцеся...

— За што, князёўна добрая, гэтак з намі? Чым жа мы цябе пакрыўдзілі?

— Не вам мяне пакрыўдзіць. Толькі і не гонар мне чужынцам усміхацца...

— Ведаем цуды, ведаем чарадзействы. Табе ж падабаецца ўсё незвычайнае.

І адкуль толькі дазналіся... Хоць бацька мне заўсёды казаў, каб чараў не рушыла, не цягнулася да іх, нават не думала пра такое, не пакідала я сваёй мары. Як быццам клікалі да сябе таямніцы. Як быццам чакала мяне ўсё дзівоснае...

— Ведаеце цуды, каб лягчэй вызнаваць, каб хутчэй іх зводзіць, — не хавала сваёй прыкрасці.

— Не толькі ведаем, самі тварыць іх умеем, — усміхаецца мне Брас.

— А што князь на гэта скажа?

— Давярае нам твой бацька, князёўна. Давярай і ты, — падаюць голас малодшыя.

— Хоць паглядзі... Хоць падзівіся... — ходзяць за мной следам.

— Добра, здзівіце мяне.

— Не бойся, князёўна.

Махнуў рукою старэйшы брат. Адразу, хоць не было на небе ніводнай аблачынкі, стала хутка расці, напаўзаць на нас чорнае хмарнае мроіва. Закрыла і княжацкі двор, і навакольныя лясы, і як кінуць вокам знаёмыя абшары-разлогі. Заслала змрокам паўнеба...

— А скажы ж мне, князёўна, — лагодна пытаецца Брас, — што на той хмарцы? Хто на той хмарцы? Як угадаеш, то мы з братамі выканаем тры любыя жаданні...

— А як не ўгадаю?

— Тады пашкадуеш... Моцна. Лепей угадай.

Смяюцца малодшыя браты, кажуць, каб добра падумала. Цяжка валюхаецца злавесная чорная хмара, як жывая. Галодна пазірае на сінія зубчатыя лясы, на схаваныя пад ляснымі шатамі вёскі...

— Не бойся, князёўна. Мы з табою. Не зачэпіць навальніца твой двор.

А я і не баюся. Я веру, што нясе чорная хмара цёмны летні дождж. Не заляскочуць знішчальныя перуны, не ападуць на саламяныя стрэхі. Чуеш мяне, чужынскае чарадзейства? За цёмнай хмарай, якая нахілілася нізка-нізенька, мне здаліся сіняе неба і яснае сонца. Спалі маё сэрца, сонейка. Разгані чорную хмару...

Не спаліла майго сэрца высокае сонца. Грымнулі далёкім пошчыкам перуны, грымнулі ды замоўклі. Зямлю агарнула моцнай улевай. Доўгай, не страшнай. Кожны цуд павінен быць добрым. На тое ж ён і цуд.

— Кожны цуд павінен быць добрым, князёўна, — здзіўлена паглядае на мяне Брас. — Хоць часам цуды палохаюць...

— На тое яны і цуды, — адказваю ды нават не гляджу ў яго бок.

— На тое і цуды, — лёгка пагаджаецца Брас. — Але шчасце тваё, ганарыстая, што маеш добрае сэрца...

Прыходзілі і сыходзілі хмары, пакліканыя чарамі. Лілі цёплыя дажджы, паілі ўдосталь зямлю. А браты-каралевічы смяшылі і бацьку, і нямала людзей, глядзелі мне ў вочы, нібы выпрабоўваючы. Ганілі чары, абяцалі зжыць-звесці іх з усяго свету, а самі зноў чаравалі. Ведала пра тое я адна. І хацела, хацела расказаць, ды не магла...

— Князёўна, прыгожая, ганарыстая, калі ж загадаеш нам свае жаданні? Чакаем, чакаем, каб зрабіці...

— Князёўна, добрая, чаму ж не глядзішся ў люстэркі? Не скачаш у карагодах з красунямі? Досыць ужо сумаваць.

— Князёўна, — проста кліча мяне Брас. — Не трывож бацьку. Жорсткі князь Дзвін, дык многіх выгнаннем пакараў. Як уведае, што не чужыя табе чары, не пашкадуе роднай дачкі...

Так засталіся браты-чарадзеі на маёй зямлі, у маім княстве, у замчыстым княжацкім хораме. Упадабалі ўсё гэта, значыць... Ужо шчыра вітаюць іх людзі, болей не чакаюць бяды. А чаго яе чакаць, калі ўбіраецца ў поўную сілу звонкае лета? Стары князь палагаднеў, паласкавеў... З каралевічамі падоўгу размаўляе. З імі так і хочацца перакінуцца слоўцам. Лёгка тады на сэрцы, спакойна. І з чаго яны, маладыя, сталіся ўжо такімі мудрымі?

— Хочам тут, князёўна, назаўсёды застацца. Мілы нам твой край.

— Усміхніся нам, прыгожая, мы ж радыя цябе бачыць.

А бацька, мой добры бацька аднойчы мовіў рашуча, цвёрда:

— Скончыцца мой род на мне, бо няма ў мяне сына. Няхай будуць праклятымі тыя чары, якія так учынілі! Выбірай, дачка, сабе каго з трох братоў. Кожны з іх будзе слаўным князем, мудрым, паважаным... Будуць у нас моцныя прыязныя суседзі, бо госці нашыя — каралевічы. Дык выбірай жа...

Не кажы так мне! Не рабі такое! А ты не слухаеш мяне. Зусім не чуеш. І зразумела я тады, што не магу, як раней, волі тваёй запярэчыць. Не магу не пагадзіцца. Што ж тут зробіш, раскажу. Як уведаеш, што тыя каралевічы ды чараўнікі, прагоніш іх з краю…

— Князёўна, ганарыстая, хочаш, зробім цуд?

— Буду мудрым, паважаным, выбірай мяне…

— А мне загадай жаданні. Ну, акрамя таго, каб пад зямлю я праваліўся…

Не зважаю на гэтыя кпіны малодшых братоў. Трэба, трэба мне расказаць, і тады ўсё скончыцца. А старэйшы брат тут як тут:

— Князёўна, не трывож бацьку. Навошта яму напамін пра чарадзейнае. Радасна яму глядзець на цябе, адно не абуджай старое, забытае…

— Хочаш здзівіць мяне, Брас? Не той гэта цуд. Прыдумай што іншае.

— Не цуд, праўда. Што сказала б ты, каб уведала, што не Дзвінавай ты крыві? Не любіць і не любіў яго род чараў, не церпіць і не цярпеў чараўнікоў. У табе ж чары жывуць і чакаюць…

— Сказала б, што не веру табе, чарадзею, не веру табе, чужынцу… Няміла мне слухаць пра тое, што не бацькавай я крыві.

— Не вер мне, князёўна. Запытай у чыстых крыніц. Паслухай, што звіняць яны, звіняць табе адной… Мне з братамі не зразумець іхняй песні, не раскрыць таямніцы вады. Можа, гэта адзінае, чаго мы не здолеем.

А што іх пытацца, плыткіх… Іскрацца яны ды бесклапотна булькочуць пра цёмныя хмары, пранізлівыя вятры, халодныя снягі, якіх даўно чакаюць-чакаюць… Глядзяцца ў бяздоннае неба, чыстае, гожае, мілае. Кажуць, каб ішла я да сіняга кало-

дзежа, там даведаюся праўду. Каб не вагалася, не марудзіла. Верыла сіняй вадзе... І зноў па-ранейшаму мараць бегчы-цячы ў высокае неба.

Прыспешвае мяне бацька, пытаецца, каго ж з трох братоў я выбрала. Злуецца, як кажу, што яшчэ нікога. Пайду да сіняй вады. Што ж з таго, як забаронены туды шлях строгім княжацкім наказам. Толькі, як схіляюся нізка да глыбокага вока, усё роўна цяжка мне паверыць, што не родная дачка. Як жа так магло стацца?..

Вось і першы раз схілілася, і другі, але як уцякае ад мяне, хаваецца ў зямлю сіняя вада. Што ж гэта такое? Але як схілілася трэцім разам, шуганула ўгору сіняя-прасіняя, падхапіла ды панесла мяне з сабою. Як у мінулае, хаваецца глыбокі калодзеж...

Упала. Утапілася... Але чаму тады вярнуліся і неба, і зямля? Чаму ж не бачу знаёмых лясоў-палёў? І дзе бацькоўскі замчысты двор? Людзі, багатыя ці простыя? Нікога няма ні здалёк, ні зблізку...

— Шукаеш такіх, як сама, князёўна? Чаго прыйшла сюды, парушыўшы бацькаў наказ?

Забурліла гнеўна сіняя вада, не жадала мяне тут бачыць. Заплёскала хвалямі, усхадзілася ды разлілася. Як сапраўдная рака, далёка, шырока... Паднялася імкліва з вады сіняя прыгажуня, іскрыстая, як тая крынічная сляза. Высокая, як валатоўна з напаўзабытых сказаў. Гаспадыня сіняга калодзежа. Не пачула майго адказу. Засмяялася глуха, горка. І скаланула мяне ад такога пакутнага смеху...

— Даўно чакаю цябе, Вярнігорава халодная кроў. Стагоддзі мінуліся, а ты не змянілася. Ды хіба ж магло стацца іначай...

— Чаму назвала ты мяне Вярнігоравай кроўю?

— Таму што адрадзілася ў табе Вярнігорава надзея. Мацнейшая за род і кроў...

І адбіла раўнюткае сіняе люстэрка. Паказала далёкае, людзьмі забытае...

Адвечныя лясныя абшары паўсталі на зямлі. Ходзяць па лясах волаты, самі ці не ўпоравень з дрэвамі. Але хоць і вялікія яны, ды не злыя, не страшныя. Б'ецца ў іхніх грудзях чалавечае сэрца. Могуць яны і спадзявацца, і кахаць, як людзі. А вось гэтыя дык ужо і закаханыя...

Дзяўчына-багатырка зусім такая, як гаспадыня сіняга калодзежа. Сумная, нібы маленькая чуллівая крынічка ў восеньскі дзень. Толькі жывая, сапраўдная. Гаворыць русяваму, як сама, сінявокаму:

— Быў і будзеш ты ў маім сэрцы. Толькі заляцаецца да мяне Вярнігор. Мушу даць вам абодвум выпрабаванне. Хто пераможа ў ім, з тым і застануся...

І далей люструе крынічная вада, як паляцелі па-над ляснымі разлогамі два валуны. Адзін, як ладная печ, а другі, меншы, лягчэйшы... Валатоўна падала іх хлопцам ды сказала, што той, хто кіне валун як далей, і стане яе абраннікам. Адно нялюбаму Вярнігору дастаўся валун большы...

Паляцелі валуны, кінутыя далёка-далёка. Абодва багатыры і смелыя, і вартыя, ды толькі Вярнігор дужэйшы... Упаў яго камень далей на некалькі крокаў. Заплакала з жалю дзяўчына, глянула абодвум волатам у вочы, прызналася, што не хоча абяцання свайго выканаць. Не застанецца ні з адным, ні з другім...

— Абярніся крыніцай, ідзі па зямлі вадою, — гнеўна ўспыхнуў Вярнігор. — За падман доўга чакаць табе, пакуль не прыйдзе апошняя з майго роду. Дадасі ёй сілы, падаруеш ёй чары, якія табе берагчы-вартаваць ды не дакрануцца... А тады, калі схочаш, зноўку станеш людскай. Будзе часу табе падумаць, як гэта — чыніць нягожа...

Стаўся першым князем Вярнігор, распачаў слаўны род, які шмат мацаваў уладны пасад. Толькі не мінулася без

следу помслівае чарадзейства. За тое, што стаўся князем нялітасцівы, сталі драбнець волаты, пакуль не ўдаліся людзьмі... Ды не згасла ў іх волатава кроў. Як і сказаў Вярнігор, чакала сваёй часіны. Люструе-адбівае крынічная вада, што зноў унукі становяцца дзядамі. Што прыходзіць з-за мора Дзвін, шукае мячом сабе шляху. Зваяваў сабе княства, як заўсёды хацеў, адно не займеў ніводнага сына... Паклікаў найведшых чарадзеяў, паабяцаў золата-срэбра, калі ўчыняць яны цуд...

— І абудзіліся тады схаваныя Вярнігорам чары... Не ад заваёўніка Дзвіна, ад волатавай крыві з'явілася на свет немаўля. Гэта ж ты, князёўна... Пазнаю, пазнаю цябе адразу. Не можаш забываць. Не ўмееш прабачаць. Забірай свае чары. Вяшчую, вяшчую, прадказваю, што хадзіці па зямлі сіняй вадзе, няхутка ёй здабыць людское аблічча. Памятай моцна: як учыніш крыўду ды боль — стацца табе крыніцай. Уцякаць-вырывацца з таго палону, але ніколі не ўцячы...

Абяцала так ды знікла пад зямлёю сіняя крыніца. Вярнула мяне ў людскі свет. Не такі мілы, не такі прыгожы... Цяжкі, непрыветны. Калаціліся-прасіліся на волю чары зямлі, казалі мне, што не жадаюць болей таіцца. Не прасіцеся, рабіце лад, а не ляда... Гневаліся чары агню, патрабавалі сабе ежы-спажывы. Нялёгка загадаць ім маўчаць... Цяжка дыхалі чары паветра. Не, вы не збяжыце знішчальнымі віхурамі. Плакалі чары вады, глядзелі ў душу празрыстымі азёрнымі вачамі. Ды ўведаць іх жалю не ставала моцы. І чаго вы такія цяжкія? Чаму высах сіні калодзеж? Куды ж ты збегла, сіняя крыніца? Веру, што надакучыла табе зберагаць-вартаваць. Адно баюся, што анідзе не акажашся ты болей зямлі ратавальнай вадою...

Баюся і глядзець у вочы князю-бацьку. Уведалі ўжо людзі, што знік калодзеж, што нехта туды хадзіў. Дазнацца хочуць, як ды хто... Не хачу, каб знайшлі невінаватага. Суровы ж

князеў загад. Толькі не стае смеласці прызнацца. Як раней змаўчала, то цяпер ужо расказаць не магу... І не прысніцца, не прымроіцца мне, што магу стацца выгнанніцай...

— Паедзем, князёўна, з намі. Далёкі наш край, толькі там не будзем гнанымі...

Уцякаць з вамі, браты-каралевічы? Куды ж? Не спраўдзіла я пакуль Вярнігоравай надзеі. Як жа мне знікаць без гэтага? Для нечага ж чакалі мяне не адзін людскі век яго чары... Я адчуваю кожнай крывінкай, як уздыхае імі зямля, пырскае агонь, па-кацінаму пацягваючыся ў гарачай печы. Дыхае імі паветра на поўныя грудзі, струменіцца глыбокая сцюдзёная вада. Мацнеюць чары, дужэе белы свет, збірае вялікую сілу... Збірае, аддае людзям. Дзівяцца яны і радуюцца нечаканаму дарунку. А я думаю, думаю-спадзяюся: няўжо вернуцца, няўжо зноў будуць хадзіці па маёй зямлі волаты?.. Б'ецца волатава кроў. Не магла яна знікнуць, не магла мінуцца.

— Уцякайма з намі, князёўна. Абудзіліся чары тваёй зямлі, множаць яны і нашыя сілы. Толькі не зможам дапамагчы, як здагадаецца-знойдзе цябе князь Дзвін. А ён хутка ўжо знойдзе...

Не зможаце. Вы ж каралевічы... Не ведаю, чаму волатавы чары адгукаюцца вам, чужынцам... Яны ж чуюць родную кроў. Але не паеду я з вамі. Куды ж мне ўцякаць, як вяртаюцца на маю зямлю волаты. І таму кажу ім зноў:

— Што халадней за снег? Што пранізлівей за вецер?

А тады як малодшыя, закрыўдаваўшы, ідуць ад мяне прэч, пытаюся ў каралевіча Браса:

— А што цямней за самую цёмную хмару на свеце?

І ўсміхаюся лёгка, згледзеўшы, як цямнеюць ад пранізлівага болю глыбокія вочы. Усміхаюся, каб не здагадаўся, што і мне трывожна-трывожна... Мяне ўжо знайшоў князь Дзвін.

Чакала расчаравання і гневу. І цяжкай размовы... Не, зусім не гэтага дачакалася.

Не паглядзеў у мой бок, калі абвясціў чорным раннем:

— Гонар сваёй зямлі шануючы, славу сваёй зямлі шануючы, выбіраю будучага князя за адвагу, за спрыт, за мужнасць. Няхай жа ў бойцы выпрабуюць сябе каралевічы. За таго, хто пераможа астатніх братоў, пойдзе замуж князёўна. Ён і атрымае княжацкі пасад...

Сукланіліся мне браты-каралевічы. І кінуліся малодшыя біцца. Аж сярод лета нечакана сказалася зіма... Наляцеў пранізлівы вецер, закружыўся з халодным снегам. Заслалі ўвесь свет сваім змаганнем. Уецца вецер, перыць снег, рассыпаецца той мяккай порхаўкай. Але і снег ветру не саступае, спавіў яго белымі стужкамі, як вецер не кідаецца, а снег яго трымае. Завыў, застагнаў вецер. Зарыпеў ад натугі снег. Загуло, закалацілася... Ды раптоўна знікла. Аціх вецер. У імгненне растаў снег. Хутка вярнулася на зямлю цёплае лета. Толькі не пабачыў болей аніхто малодшых каралевічаў... Шукалі-клікалі — не знайшлі. Можа, схавала іх сіняя вада, якая прабіваецца на гэты свет...

Сумныя сляды пакінулі тыя чары. Зчэзлі, пачарнелі палеткі з садамі. Напалохаўся люд — цяжка яму зразумець, цяжка прыняць такое. І за ўчыненае яго братамі загадвае князь схапіць каралевіча Браса.

— Думаў, я не пазнаю цябе, каралевіч? Прыкрай была ваша ліслівасць... Звёў я ўжо са свету тваіх братоў і цябе звяду. Робіце толькі злое, чараўнікі. Не хадзіць вам па маёй зямлі аніколі!..

— Хто сказаў табе, князь Дзвін, што гэта твая зямля? — прамовіў каралевіч Брас.

Прамовіў і абярнуўся цёмнай хмарай, такой, як некалі мною адчараваная. Ідзеш страхам лясамі-палямі. Не супыніць цябе

самым вялікім войскам. Ані слязой, ані сілай. Заслалася хмарамі ўсё неба, знікла яснае сонца. Што хочаш ты ад маёй зямлі? Невінаватая ж яна ў тваёй страце...

— Князёўна, з-за цябе загінулі мае браты...

Загінулі. Загінулі... З-за мяне. Як паўсвету знікла разам з імі. Заплачу крынічнай слязой, толькі перайду табе шлях. Чары і зямлі, і вады слухаюць слова майго. Ты забыўся, што чужы-чужаніца, каралевіч... Не хадзіці табе цёмнай хмарай над маім краем. Клічу, клічу чары.

— Вяртайся туды, адкуль прыйшоў, князь Дзвін. Бяжы, уцякай. Як не быў добрым, так і сам не чакай спагады, — і сказаў Брас моцнае чарадзейнае слова.

Пабег Дзвін. Уцякаў, уцякаў...

— Няма Дзвіна, — казалі людзі. — Дзвіна. Дзвіна.

Шырокая суровая Дзвіна. Пабегла туды, адкуль прыйшоў князь. А людзі не верылі, што гэта чары яго навечна зрабілі ракою...

Толькі і мае чары напаткалі цябе, каралевіч. Ледзь не захлынуліся, як у змаганні з блізкімі-роднымі... Пабялела цёмная хмара, глынуўшы сілу і зямлі, і вады... Сталася лёгкай маленькай аблачынкай. Я знямела ад прадчування бяды, але паспела, паспела. Паўсталі чары волатавай крыві. Не было і не будзе анічога мацней за іх веру, за іх памяць...

— Князёўна, прыгожая, што ж ты нарабіла? Я так спадзяваўся на тваё добрае сэрца. Не, я не знікну, я не памру, адно не змагу табе дапамагчы. Не слухаецца мяне вада, не слухаецца мяне крынічная сіла...

Гэта добра, што не слухаецца... Збягу, збягу ад цябе, каралевіч Брас. Збягу ад таго, што адкрываюць мне цяпер ціхія слухмяныя чары вады, люструюць схаванае скрыўджанай на Вярнігораў род сіняй крыніцай. Ад волатавай крыві з'явілася на свет не адно немаўля. Хочучы схаваць, панесла вада ў

далёкія землі трох хлопчыкаў, трох братоў. Панесла ды абяцала вярнуць... Снег. Вецер. Хмару.

Як учыню крыўду ды боль, стацца мне крыніцай. Лавіць снег. Слухаць вецер. Абяцаюць яны ніколі не выпусціць мяне з палону. Як знайшлі, то баяцца страціць-згубіць. Хаваюцца за аблокамі. Прагныя да жыцця. Таго, якога не мелі. Не, не мінуцца аніколі снягі з вятрамі. Будуць шукаць сабе прыгажунь. А мне тое бачыць, а мне глядзець-глядзець...

Б'юся хвалямі. Клічу-плачу:

— Спраўдзі маё жаданне, каралевіч Брас. Спраўдзі, ты ж абяцаў. Не пакінь маю зямлю. Не пакінь мяне. Не пакінь...

І ты зрабіў-спраўдзіў. Браты твае верныя ганарацца табой, славяць твой горад, шэпчуць мне з-пад аблокаў:

— А брат наш слаўны. Брат слаўны... Бра... слаў... Бра... слаў... Браслаў...

Мінаю яго, збягаючы далёка-далёка... Б'юся хвалямі. Не радуюся вясёлым берагам. Хачу пазбыцца гора, забыць пра страту. Адбіваю ў плыткай вадзе лёгкія аблокі. Узіраюцца яны ў маю празрыстую плынь. І толькі я адна ведаю, што хаваюцца за аблачынкамі і прагныя, і страшныя... Як успаміны злой ды бурлівай... Як забытыя абліччы снягоў з вятрамі... Як тая белая хмара між празрыстых ды лёгкіх, што зноў і зноў растае над слаўным горадам летуценным туманам...

Лагаднеюць прагныя, гледзячы ў мае бруістыя хвалі.

— Стань добрай, крыніца. Добрай. Забудзь пра ўсё. Змірыся, прабач. Тады збяжыш, а мы цябе не зловім...

Я злая князёўна. Упартая. Халодная. Не забуду. Не зміруся. І не ўведаць вам, што паспела я ўчыніць, астатні раз паклікаўшы чары. Буду чакаць Вярнігораву кроў, каб аддаць ёй крынічную сілу... Буду чакаць неспадзяванага ратавання для іх, ятроў, снягоў ды хмар. Бо сярдзітая. Злая... Чарадзейка, якая скінулася сіняй вадою, сіняй, як неба, бурлівай крыніцай.

# ПАПАРАТНІКАВЫЯ КАМЕНЬЧЫКІ

*Міфалагічна-легендавае*

Я знайшоў яго на тым самым месцы, дзе апошні раз пабачыў. Некалі. Даўно-даўно... Зямля дацягнулася да кален магутнага каменнага волата. А ён тачыў слёзы. Не плакаў, як застыўшы навечна з горда ўскінутай галавою. Не сумаваў. Не шкадаваў. Не было пра што... Я ўбачыў гэта і зразумеў, што нічога не змянілася. Ударыўся аб зямлю, стаміўшыся так доўга ляцець. Блізка, дзе цяклі слёзы, зліваліся ў гаючую крыніцу. Каўтнуў той вады, стаўся ў чалавечым абліччы.

— Воран Варановіч! Ізноў ты прыляцеў, чорны... — зазвінелі мне празрыстыя кроплі. І быццам зварухнуўся камень. Як жывы... Не магло гэта проста прымроіцца-падацца. Я ж вяшчунны, мудры, відушчы.

— Неўміручшы, — засмяяўся скамянелы. А кроплі цяклі, беглі ў свет імклівымі ручаінамі. Светлыя. Чыстыя. Салёныя. Я толькі што зноў нагадаў сабе пра гэта, глынуўшы ад іх.

— Ізноў будзеш прадказваць... І мне, і ўсяму краю. А сабе калі ды што навяшчуеш?

Маўчу ў адказ. Хочацца паказаць, што рады цябе бачыць. Рады тваім кпінам. Калі я з табою, то ўжо не зусім адзін... Але маўчу, бо ты гэта ведаеш. Цяжкім сказалася маё падарожжа з далёкай зямлі. А табе цяжка было тут? Проста быць, трымаць цяжар, які аднойчы прыняў? Быць... Часам я думаю, што ты — гэта быццё... Яму даўно не пякучыя слёзы. А табе?

— А табе не мроіцца твой неразгаданы лёс? — паўтараеш з трывожным чаканнем, як і я некалі тым, хто быў ля пачатку...

Маўчу. Углядаюся ў шызыя аблокі, яшчэ цёмныя, яшчэ начныя. Гоніць вецер лёгка-імкліва шэрыя ды нізкія. Мне радасна праз іх ляцець, кратаючы чорным крылом. Маю ж воранаў відушчы позірк. Лясы. Абшары. Свет. Да яго спя-

шаўся. З-за мора-акіяна... Не зважаю на моры, не баюся акіянаў, баюся толькі страціць тое, што бачу цяпер. Разліваецца зара-заранiца, на якія імгненні агартае ўвесь свет. Шчыра-зырка, цесна-блізка. Прабіваюцца ясныя промні. Ужо бачна, што сонечна-пякучыя. Я даўно не ўспамінаў халоднымі золкамі пра цябе, агнёвая кветка... Ці сказала б мне, чаму цяпер ты прыгадалася?

— Прадкажу, што ты болей не будзеш адзін, — гэта каменны. І жывы, і ведны. Даўні мой сябра. Чуйны, як і я...

Аблокі. Чырвань. Промні. Сонная зямля. Не буду адзін, ніколі не буду... Булькоча крыніца, задуменна шэпчуцца лясы, а за імі балоты ды багны. Дзесьці там, далёка-таемна, хаваецца самая чарадзейная кветка, на якой зіхцяць маленькія жывыя каменьчыкі. Проста ведаю, як разаб'ецца такі, прыходзіць у свет наканаванае табе. Як? Хаваю тую таямніцу ад людзей я, Варановіч. Кожны з тых каменьчыкаў палымяна-агнёвы, так цяжка яго разбіці. Гарыць, пляжыць сэрца, але не згарае. Кожнаму прызначаны. Кожнаму абяцаны. Балюча яго кранацца. Ды я вяшчунны, і мне даўно не баліць. Часам здаецца, гэта мой лёс — разбіваць, а не згараць. Сустракаць новыя золкі, калі асабліва вабныя тонкія стужкі шляхоў-дарог. Калі па-чалавечы проста марыцца пра будучыню. Вось і цяпер усё так, як і раней. Але ж штосьці мне, вяшчуннаму, трывожна... Аблокі. Хмарныя. Вецер. Моцны, не разганяе іх, а збірае.

— Што скажаш мне, чорны? Ці давеку будзеш маўчаць?

— Скажу, што маўчаннем не сурочыш нікога ў свеце. А найменей я б хацеў сурочыць цябе...

— Не зможаш таго. Што бачыць твой пранiклiвы позiрк?

— Шэрую смугу чалавечай удзячнасці табе, каменны. Гэта шчыра, бо я ўжо стаміўся прыносіць на крылах няшчасці. А яшчэ... Яшчэ бачу, як лятуць-гудуць над табою буры-навальніцы.

— Кажаш, буры-навальніцы. Ведаеш, колькі іх было, пакуль ты дзесьці лётаў?

Ведаю. Табе не трэба перада мною ўдавацца смелым. Памаўчы пра іншае, згадай пра навальніцы. І не сумнявайся, што яны будуць насланыя цёмнымі чарамі. Пакліканыя ўсімі пакінутай душою, якая ніколі не зведае супакаення. Не буду казаць, не хачу сурочыць. Я вяшчунны, я гэтага нямала баюся. Хіба ж дарма быў на тым свеце...

— Крум! Крум! Крум!

Яшчэ вады... Так хочацца піць. Адчуваю, расквітнее жарынка-кветка, гарачая, як сам агонь. Зыркая. На яе балюча нават глядзець. А ўжо чакаць, шукаць, жыць... Згараць у вогнішчы спапяляльнай надзеі на шчасце. Занадта многа слёз. Хто прыдумаў, што яны некуды сыходзяць? Я, Варановіч, часам радуюся, што мудры, вяшчунны. Вечны. Не зраблю смяротных памылак. Не трываю смяротных пакут... І не люблю агню. Нават самага чарадзейнага.

Мацнее вецер. Мне трэба табе сказаць... І не магу сказаць. Палячу хутка, імклівa. Палячу, ці ж паспею. Праз вецер, праз шызыя хмары. Я не хачу прынесці бяду. Я хачу прагнаць яе чорны цень. Хоць і сам чорны, але не такі... Булькоча крыніца, заспакоена, ціха. Не здагадваецца раніца пра цяжкі дзень... Памаўчу, прадкажу. Навяшчую, што знікнуць хмары. Аціхне вецер. Я, ведны, гэтага хачу. Не развучыўся пакуль што здзіўляць...

Абганяю вецер. Мне даў моцныя крылы той, хто адданы ціхмянасці, лагодзе, спакою. Не толькі ціхмянасці, але і моцы. Не толькі лагодзе, але і пранікліваcці. Не аднаму спакою. Клятве і міру. Ён не любіць бойкі, але не баіцца яе. Наказаў мне праганяць злую-крывавую, як толькі ўбачу тонкі адбітак чорнага ценю. І гэта я зраблю, зраблю цяпер... Я рабіў такое заўсёды. Памятаю, як аказаліся тонкія ланцужкі слядоў на

шляхах. Мною прадбачаных, азначаных, пакінутых. Дарогі, стужкі лёсаў. Тыя, хто на іх, мне толькі выпадковыя сустрэчныя. Няшмат і ведаў іх, а цяпер усіх не ўспомню. Адно лячу далей і далей, прамінаючы і роўныя, і пакручастыя. Яны аднолькавыя... Цмяныя, шэрыя.

Наперадзе зырка ўспыхвае цень. Прагны, чорны. Мой адвечны вораг, яшчэ ніколі дарэшты не пераможаны, мною назаўжды не прагнаны. Марыў перамагчы-прагнаць. Але вось і цяпер смяецца, дражніцца, уцякае... Што ж мне зрабіць, як ён хутчэй за мае крылы?

Падае цень на зямлю, знікае ў невыразных абрысах зацішных абшараў. Зноў мне хочацца заплакаць з крыўды. Не здолеў, не паспеў... Але не заплачу. Адно крыкну праз неба і зямлю:

— Крум! Крум! Крум! Пачуй мяне, скамянелы! Здарыцца чорная бяда! Я над ёю не ўладны...

І я ведаю, што ты пачуеш мяне. Мне болей нічога не трэба. Буду лётаць, глядзець, маўчаць. На тое ж я чорны. Страшны. Воран Варановіч. З-за сваіх вяшчунстваў-пракляццяў сам пракляты. Цяжка-цяжка. Але ўдосталь напіўся салёнай вады, доўга пратрымаюся высока-высока...

Сачу ціха, паважна, у які ж бок папаўзе па зямлі... Пасунуўся да пышных прыгожых палацаў. Якая ж там можа здарыцца бяда? Моцна ўсё ды чынна. А цень споўз, схаваўся, прычакаў... Выбраў час, калі сышліся як не ўсе ваганні-сумненні, ды атруціў чорнай задумай слабае чалавечае сэрца...

Я зразумеў гэта па тым, як сцяліся ў чаканні вятры, заходзілі па-над белым краем хмары. Быццам задумалі зламаць мне крылы... Няўдача вас чакае! Толькі адчуў стому смяротную, жывую і вечную. Як самому захацелася ўчыніць такое... Што? А склікаць баярскую раду ды загадаць. Мудрасць-уладнасць... Часам мне здаецца, што я па-чалавечы пэўны, але ж, бывае, губляю гэтае пачуццё.

І вось я зноў разгубіўся...

Малазаўважны каля вокнаў людскога жытла, запамінаў гамонкі-словы:

— Жорстка князь учыніў. Не стаць жа цяпер князёўнам замужнімі.

— Маўчы, каб ты што разумеў! Не будуць цяпер скоса пазіраць на землі нашыя князі-суседзі.

— Сам ты маўчы! Не гэтая, дык іншая крыўда знойдзецца!

Шапталіся-сумняваліся, шукалі сабе шляхоў, а перада мною яснелі шэрыя шляхі-лёсы. Крум, не так усё і цмяна... Яшчэ палётаю, паслухаю, павіжую. Далей ад багатых харамаў. Напаткаў след, чысты, прывабны. Памкнуў за ім у лясную глушэчу. Як паглядзеўся ў люстэркі маленькіх акон...

— Прэч ляці! Някліканы, нечаканы, — засварылася тая, што пакінула гэты след.

— Я вось палячу, — крумкнуў у адказ, — а ты свайго кліканага не прычакаеш.

— Чаму гэта? Ведаю-вяшчую, што ён недзе ёсць. Зачаравала яго прыляцець да мяне.

— Прыляцеў!

— Не здзекуйся, чорны. Не хачу цябе крыўдзіць, сам прэч ляці!

— Ды палячу! Але згубіўся твой кліканы за далёкімі морамі-акіянамі. Дапамажы мне, і я да цябе яго прывяду.

— Кажы... Адно не пакінь яго ў далёкай дарозе.

— Крум, крум, крум! Споўні ўсё!

— Споўню...

І не сумняваўся. А мне пакінуць князёвен не выпадае. Абудзіліся ў іх чары нашай зямлі. Як каляровыя іскрыстыя вясёлкі-весялухі, спагадлівыя, ратавальныя... Паўсталі яны над азёрамі-пералескамі, над узгоркамі-палеткамі, над усім нашым

краем. Так будзе, а ёсць? Узлятаю высока, гляджу навокал. Бачу, што ясныя промні бегаюць-гуляюць у квяцістых лугах. Калі б змог, то нават усміхнуўся... Бавяцца-цешацца князёўны, нічога не ведаючы пра суровую княжую волю. Спакойныя, шчаслівыя...

— Вой, гляньце, крумкач! Кажуць, ён прыносіць на крылах шэрыя хмары...

— Сапраўды, вяшчуе бяду, пра што б не крычаў!

— Чорны які, страшны! Каб жа не сурочыў!

— Гнаць яго прэч! Гнаць, гнаць!

— Глядзі ты! Збаяўся, паляцеў...

Гэта праўда, што я не люблю вясёлых-бесклапотных. Не выносіў іх лёгкадумнага смеху, колькі працінаў неба. І за гэты бясконцы час ужо звыкся быць гнаным. Адно б хацелася сказаць ім, вясёлым, што не я ва ўсім вінаваты. Вяшчунствы не мною наканаваны. Лёс не мною вызначаны.

Ты, скамянелы, нямала смяяўся, калі гэта першы раз пачуў. А цяпер я доўга кружляў-лётаў, ды не змог таго сказаць. Шкада...

Уцякалі князёўны ад пышных палацаў, ад несправядлівага прысуду. Уночы пераплылі бруістую раку ды пайшлі праз сцішаныя вёскі, праз лясы-палі, праз цёмныя балоты. Зайшлі ў такую багну, дзе яшчэ не ступала нага чалавечая. Там гады паўзучыя малако з балотных гарлачыкаў п'юць, русалкі рагочуць несціхана, багнік зялёнай барадою дрыгву калыша. Заплакалі князёўны, спужаўшыся такога, але няма чаго рабіці — трэба далей ісці...

— Скуль вы такія, жывыя? — булькоча багняны.

І русалкі паціху грозяцца-падбіраюцца:

— Заказычам-зацягнем, сёстры нашыя. Будзеце разам з намі чакаць-чараваць...

Ласкава просяць русалак князёўны:

— Ой вы, русалкі-спакусніцы! Не казычыце, не цягніце. Не было нам шчасця чалавечага, то мы выправіліся шукаць папараць-кветку.

— Можа, яна нам падорыць-навяшчуе.

— За тое, як загадаў родны бацька ў сценах манастырскіх век заставацца.

— Каб не сварыліся за нас князі, не засылалі сватоў, не ішлі на землі нашыя вайною.

— Уцяклі мы ад княжага загаду... Не пакіньце нас!

І многа яшчэ гаварылі. Скардзіліся на чорнага крумкача, які наклікаў гора. Плакалі. Абяцалі. Прасілі. Выпрасілі...

— Дайце ім кветку, — зарагатаў багнік ды знік.

Прыціхлі князёўны, супакоіліся. Чакаюць дарунка. Шкада. Мне замінае прагны цень. То пасунецца за мною, то абгоніць, не пакідаючы свайго: "Глядзі, чорны! Засталося княства тром сынам. Ці бачыш, як ідуць браты адзін на аднаго вайною? Тояць крыўды, ліюць кроў. Занепадае вялікая слава. І здзейсніцца само тое, што некалі, як памятаеш, не так даўно, я зрабіці не змог..."

Памятаю. Мне гэтага не забыць. Тады чорнымі хмарамі ўзвіліся стрэлы. Заслалі сонца. І прыйшлі злосныя, з раскосымі вачыма, з чорнымі сэрцамі... Дзеля палонных. Дзеля золата-срэбра. Іх вёў ці не самы хціўы на ўсім чыста свеце... Тады я перамог яго.

— Не радуйся, чорны, гэта было даўно, — азываецца маім думкам цень. — Я спазнаў чары, а з імі — мудрасць... Ты не пераможаш мяне цяпер. Шукаў цябе доўга. На тым свеце. На гэтым... Як бачыш, знайшоў.

Я бачу хісткую мяжу. Холад вечнай красы ў каменных тварах, якіх не кране вясёлкавы промень. Каменныя скляпенні, імёны князёвен. На іх не зважаюць родныя браты, сварацца за бацькоўскую волю. Кожны хоча галоўны пасад. А ты, цень, заходзішся ад смеху. Хоць не, бачу цябе зусім не

празрыста-кволым. Як раней, уладарны позірк раскосых вачэй, як тады, пагарда да ўсіх, хто ніжэй за цябе... Некалі я паказаў, што гэта ты самы нікчэмны.

— Тады абсмяяў мяне. Зразумелі нават тыя, хто са мною, што не маю ні гонару, ні годнасці... Які салодкі смак у помсты! А ты глядзі, як паглыне багна вясёлкавых. Я зраблю чарамі тое, чаго не ўдалося дабіцца сілай.

Гляджу. Ідуць князёўны дрыгвою падманнаю, кветкі папараці ў руках трымаюць. У цемрыве балотным гараць, як сапраўдныя агні, на кветках іскрыстыя каменьчыкі. Шлях асвятляюць-падказваюць... Ці доўга, ці мала ішлі, але сталі вясёлкавыя з хісткіх купін зрывацца, у твань падаць. Але рукі падаюць ды ратуюць адна адну. І ўсё далей шыюцца ў балотную непрахадзь. Такія ўпартыя...

— Мне нават іх не шкада, — заходзіцца цень. — Ведаеш, чорны, я цябе паважаў. Ненавідзеў, але паважаў. Як вартага, як лепшага. Прызнаю гэта толькі цяпер, а болей не скажу ніколі... Якія ж яны абраныя? Ці не павінен вясёлкавы промень прагнаць балотны змрок? Яны ж самі ад змроку знікнуць-загінуць.

Можа, і знікнуць. А можа, як застануцца... Гляджу і бачу, як успыхвае ярка папаратнікавы каменьчык у руках малодшай князёўны. Прасвятляе балотнае цемрыва, праганяе хіжы цень. Велічна паўстае перад намі вялікая гара, якой тут адвеку не было ніколі...

І тады мне, відушчаму-неўмірушчаму, становіцца шчымліва-трывожна. Як было ўсяго аднойчы за бясконца доўгае жыццё. Кратаю свет воранавым крылом, але не азываецца маўклівае мінулае. Гляджу, як адкрываецца гара. І радасна ідуць да яе князёўны, неспадзеўкі прычакаўшы такое шчаслівае выратаванне.

— Крум, крум, крум! Не хадзіце! Уцякайце!

Але яны не чуюць. Ідуць. Вітаюць іх прыгожыя волаты. Грае летуценна-лёгкая музыка, як у чароўным палацы. А навокал убранства такое багатае, што і княжацкім пакоям з ім не зраўняцца. За сталамі ж госці балююць, за князёвен кубкі падымаюць. І такое хараство ўсюды ад агнёў каляровых — адно б яму здзіўляцца...

Я не здзіўляюся. А князёўны спыніліся ў зняменні. Прыгадалі і багну чорную, і бацькоўскія харамы мілыя. Вырашылі тут застацца... Радыя ім усе. Мёду салодкага выпіць ды разам паспяваць-паскакаць просяць. Як кветка балотная абяцанае шчасце падарыла...

Мёду салодкага выпілі. Песні звонкім голасам адспявалі ды скачуць з маладымі воямі. Хараша, ладна. Стомы не чуюць, нічога не бачаць, адно хутчэй і хутчэй за музыкай паспяваюць. Заіскрыліся, як сапраўдныя вясёлкі на летнім золку, люба ім тут...

Скінуўся чорным госцем. Іду між хмяльных-заліхвацкіх. На ўсё зважаю. Прыкмячаю старадаўнюю зброю, пакінутую на лаўках воямі. Даўно не сустракаў такой. Пітво ліецца ракой. Віно чырвонае, нібы кроў. Ад ежы сталы як не зломяцца... Толькі ці ежа гэта? Раз-другі ўглядаюся ды разумею, што золата ды срэбра ляжыць на талерках. Народу процьма, як на гучным княжацкім застоллі. Чарыцы заздароўныя звоняць. А чамусьці ніводны страў тых не кранаецца...

І далей уважна гляджу. Як зніклі ў хораме і дзверы, і вокны. Здаецца ж, былі... Неяк і я сюды ўвайшоў. А звонку, чуваць, скрыгочуць зубамі драпежныя звяры. Шалеюць, нібыта моцна хочуць сюды прабрацца. Учулі тое гаспадары-волаты ды іх госці. Заазіраліся скоса. Але баляванне па-ранейшаму доўжыцца. Весела, гаманліва, тлумліва. Заплюшчыўшы вочы, лёгка скачуць маладыя князёўны. Не баяцца. Ані зважаюць на тое, што дзеецца вакол.

Прагучаў мілосны звон. Паклікаў хвіліну апоўначы. Апошні раз прыгубілі кубкі ды застылі ў зняменні госці. І волаты нечага чакаюць. Кажуць маім князёўнам рашуча:

— Добра вы з намі весяліліся! А цяпер пойдзем разам туды, дзе час няўладны. Дзе не знікне ніколі ні маладосць, ні прыгажосць... Там вас ніхто не пакрыўдзіць, шчасця наканаванага не адбярэ.

— Адкуль ведаеце, што нас крыўдзілі? Што сабе шчасця шукаем?

— А мы, вясёлкавыя, ведаем пра вас усё... Нямала вас чакалі.

Зніякавелі князёўны, бачачы, што іхняй згоды не пытаюцца. Толькі цяпер адчуваюць кальчужны холад, што сыходзіць ад вояў. Ды слова непрыхільнага мовяць не рашаюцца. А на іх ніхто болей і не глядзіць. Усе гадзіны незваротнай чакаюць...

Чакаюць. Нічога не здараецца. Не апускаецца вялізная палац-гара пад зямлю, як тое быць павінна. Ані зрушыцца з месца. Адно звяр'ё балотнае вые-раве на розныя галасы. Ужо тое не аднаму мне, але ж як не ўсім добра чуваць... І скаланаюцца ад лютага гневу волаты.

— Хто ёсць між нас жывы-непакорны? Азавіся-акажыся, бо ўсё роўна мы цябе знойдзем. І тады назаўжды з намі застанешся!

Спалохаліся князёўны, пачуўшы такое. Злосна ўтаропіліся адзін у аднаго ўжо не такія вясёлыя госці. А я маўчу, не азываюся, хоць і ведаю, што гэта мяне шукаюць. Не так сабе глядзеў-дзівіўся на цуды падгорныя. Чары моцныя паспеў паклікаць. Яны павінны ратаваць. Адно трэба — каб мне паверылі тыя, якім невыносныя суроклівыя крумкачы.

У мёртвай цішы ўладна бразгае волатава зброя. Дзідымячы пагрозна цэляць кожнаму ў сэрца. А смелыя ў вочы пільна глядзяць. Ідуць па крузе, смяюцца гучна. Маўляў, не вой, баішся... Аж калоціць цябе, беднага, ад пoстраху. Ад таго,

як вастрыё цябе кранае, ці адчуваеш сябе жывым? Не ведаеш? Навошта нам гэтакі баязлівец? Ідзём жа далей.

І так усіх выпрабоўваюць, але не знаходзяць патрэбнага. А я то з'яўлюся, то знікну ў вялікіх залах. Адчуваю, як моцна жадаюць князёўны збегчы і адсюль… Маладыя-слаўныя, вечна вам уцякаць з багатых пакояў. Пакуль не кінуліся вы ў роспачы шукаці паратунку, я вам дапамагу…

Паўстаю перад смелымі волатамі. Волас у волас, голас у голас, як родныя браты. Можа, ім сустрэцца з князёўнамі і было наканавана. Толькі я не баюся іх зброі. І ўжо ведаю, што яны пабачаць у маіх вачах…

Ападае пад маімі крыламі агонь лютай сечы. Я прыляцеў. Занясу ў слаўны шчымлівы вырай душы тых, хто быў сёння смелым. Адважным, адчайным, няўрымслівым. Мне зусім не шкада. Я забяру ўсіх… Падаю на зямлю. Гэта не балюча, яна стала мяккай ад пралітай крыві. Яна змякчэе ад яшчэ не пралітых слёз. Я прычакаў, я шукаю. І знаходжу нямала, шмат, вельмі многа…

— Крум! Крум! Крум!

Яны ўсе будуць маімі!

— Воран Варановіч! — пазнаюць мяне браты. — Велесавы вочы ў людскім свеце. Ці не бачыў ты нашага наймалодшага брата? Так доўга яго чакаем…

Бачыў самага смелага. Самага адчайнага. Ганарлівага. Неадступнага. Ён маркоціцца без вас. Але што ж, як нявычарпаны дарэшты яго лёс у людскім свеце…

— Ты ратавальны, добры. Дапамажы і нам… Пазбыліся мы свайго лёсу за тое, што не абаранілі брата найменшага, абранага. Дык ці не сустракаў ты сінявокага бялявага хлопчыка?

— Прыляцеў за князёўнамі, браты-волаты. Ім няскора прыйдзе час з'явіцца тут. Адпусціце іх…

— Не адпусцім! — рашуча пярэчаць тыя. — Не крыўдуй, Воран Варановіч. Моцныя чары тут нас трымаюць, стаміліся ўжо чакаць. Ды багнік з русалкамі, якія кветку агнёвую хаваюць-берагуць, абяцалі нам збавенне.

Калі кветка сама да вас прыйдзе. Удасца дзявочым абліччам. Чары вялікія... Нездарма ж блішчаць у руках прыгожых князёвен папаратнікавыя каменьчыкі. Не згубілі іх у зманлівай дрыгве. І толькі я адзін ведаю, што не збыліся яшчэ ўсе цуды. Пакуль не ўсе...

Незаўважна шапчу князёўнам, каб замовілі чарам сваё жаданне... Адкрыйце яго кветцы. Раскажыце пра яго свету. Няхай скаланецца цёмная багна!

Пыхкаюць агнёвыя каменьчыкі. І бачу я дзверы ў вечным хораме. Выйсце. Адно для ўсіх. Падхапіць князёвен і знікнуць-паляцець... Гэта проста. Моцныя чары. Так проста...

Я лячу над морамі-акіянамі. Спяшаюся, баюся не паспець. Доўгі шлях, а я стаміўся прыносіць няшчасці.

— А сабе калі ды што навяшчуеш? Не мроіцца твой неразгаданы лёс? — усміхаецца мне сінявокі бялявы хлопчык.

Першы раз мною ўбачаны, неспадзявана сустрэты. Я не змагу сказаць табе зноў, што гэта ты павінен выбавіць край. Як? Адбудзецца цуд, чакай яго. Расцеш і чакаеш, сталееш і чакаеш. Сівееш. Мінае час.

Цуд не мінаецца. Хто ж абяцаў, што з ім будзе лёгка? Ты ў прадчуванні яго становішся відушчым, як і я. Неўмірушчым? Мабыць... Прыходзяць чорныя хмары, нясуць пажары і дым. Ты чакаеш, ты ведаеш сваю гадзіну. Адзін за адным гінуць, скараюцца непакорныя. Ты ведаеш гэта і зноў чакаеш, і глядзіш. Калі пацягнуцца ў чужыя землі палонныя. Калі застануцца пакінутыя папялішчы. Не, ты прычакаў. Ты ведаеш, як спаткаць таго, чыёй воляй гэта ўчынілася:

— Батый-хан. Хацеў слаўнай песні за справы свае. Я ведаў, што будзе яму адно пагарда. Ён не выпадкова знайшоў мой

скіт. Убачыў мяне ды спыніўся. Загадаў заклад: адпушчу столькі нявольнікаў, колькі змесціцца сюды... Прайграўшы, хацеў мяне забіць, ды не змог. Я не ператварыўся ў камень. Я не ператварыўся ў слёзы...

Выбавіў усіх людзей. Белымі лебедзямі вярнуліся яны да разораных гняздоўяў. Я, адзіны чорны, хто гэта бачыў. І цяпер знаходжу цябе скамянелым, хоць для мяне ты заўсёды будзеш простым, жывым...

— А я і не паміраў. Нельга таго зрабіці, чакаючы сваіх братоў. Яны вернуцца, яны выбавяць... У мяне яшчэ будзе чалавечы лёс. Як і ў цябе, Варановіч!

А што мой лёс? Вярну князёвен беламу свету, беламу краю. Як тады, з табою, хачу абараніць. Прагнаць чорны цень. А ён зноў вяртаецца, а ён зноў прыходзіць... Ды і што ж мне яшчэ рабіці, як сам увесь чорны?

Пыхкаюць маленькія каменьчыкі агнёвай кветкі. Бачу вялізны камень. Цябе, добры, жывы, спавядальны... Беражэш мой свет. А я так стаміўся ляцець... Правальваецца гара ў зямное скрозьдонне.

Азавуся шчымліва-радасна:

— Крум, крум, крум!

І апынуся ў людскім свеце. Прынясу яму жывых, спалоханых, прыгожых, якіх чакаюць доўгія вандраванні. Ростані, спатканні. Надзеі-расчараванні. І я не скажу цяпер, чаго вам будзе болей. Не хочаце мяне адпусціць. Сталі шчыльным колам ды здзіўляецеся-пытаецеся. Пра свой нязведаны лёс, пра неўміручую волю прыгожай зямлі, якая аддала вам моцныя чары. Не ведаеце таго, баіцеся...

— Крум, крум, крум! Схаваецца кветка ў вашых сэрцах!

Вы ўсё яшчэ не разумееце мяне. Шкада. А вось не трэба гладзіць мне пер'е. Я гэтага не люблю. Бачу, бачу, што вы ўдзячныя.

— Крум!

Што, страшна? Напалохаў, вырваўся, паляцеў. Жахлівы-жахлівы… Бойцеся, паважайце. А я буду ўсё ведаць пра вас. Адно стаміўся ўжо ад клопату заўсёды быць побач… Палячу да скамянелага, усё яму раскажу. Той мяне чакае.

Заўсёды. Ударыцца аб зямлю. І сустрэць твой пранізлівы позірк:

— Ці наўмысна ты гэтым разам спаткаў Велесаў гнеў, чорны? Ты спадзяваўся, як разаб'еш усе папаратнікавыя каменьчыкі, тады зноў стану я чалавекам?

Чуў звярынае выццё. Сустракаў тваіх братоў. Не спадзяваўся. Крумкачы не спадзяюцца. Няма на што… Трымаюць Велесавы чары ў вечным палоне волатаў. Ці ўтрымаюць? Зноў загрыміць зброя. Ты папракаеш мяне, што пайшоў супраць таго, хто падарыў мне крылы. Пайшоў супраць згоды і міру…

Трэба выпіць болей салёнай вады. Болей слёз… Гэта праўда, што яны мяне робяць відушчым. Як спазнаю праліты боль. Можа, мне назаўжды абярнуцца чалавекам? Жывым, смяротным… Зайграю на гуслях, раскажу ўсім, што будзе. А мы з табою заўсёды будзем…

* * *

— Гэта было даўно. Прыйшлі да нашай прыгожай зямлі тыя, хто хацеў здабываць золата ды праліваць кроў. Іх вёў такі, які не ведаў чалавечых пачуццяў, ужо тады быў падобны да чорнага ценю. Звінелі іх злыя крывыя шаблі, неслі адно смерць ды палон… Але паўстаў на іх шляху адзін, які не спалохаўся, які перамог, не кранаючы зброі…

— Як гэта, каб перамагчы без аніякай зброі? — зацікаўлена пытаюцца ў маладога гусляра састарэлыя ў бітвах паважныя воі. — Ці не жартуеш ты, Варановіч?

Той доўга маўчыць у адказ, перабіраючы звонкія струны. Ды ніхто не прыспешвае… Здарожаныя, адпачываюць ля вог-

нішча людзі ў кальчугах ды з мячамі. Сотня, якая вартуе мяжу. Самая надзейная ў княжай дружыне. Не адстае ад іншых слаўны музыка, які лёгка выбівае на гуслях, які цвёрда трымае меч. Пра яго кажуць яшчэ, што верны дарадца князю. Можа быць, гэта таму, што прадбачлівы, праніклівы. Нездарма ж празваны сябрамі Варановічам!

Ён шчымліва глядзіць на дзіўны валун. Як быццам волат раптоўна скамянеў, па калена апусціўшыся ў зямлю. Але, мабыць, пра нешта шкадаваў ды і цяпер шкадуе, бо коцяцца з-пад каменя крынічныя кроплі, нібы сапраўдныя слёзы. Ды і салёная вада ў гэтай крыніцы...

— Пра што плача волат? Раскажы нам, Варановіч, — проста пытаецца юначы, лёгкадумны. — Можа, гэта ён ніколі не браў у рукі зброю ды ад таго пакутуе цяпер?

Нехта ціхенька засмяяўся. Ды ў момант змоўк пад калючым позіркам Варановіча.

— Баюся цябе, гусляр. Зірнеш, як душу ўсю навылёт працінаеш...

Не забавіўся болей з такім несамавітым блазнам. Крануў рукою струны. Спеўна азваліся гуслі. Але як зрыхтаваліся цікаўныя слухаць вяшчунную гамонку пад зыркае агнёвае пыхканне, нібы прызнаўся Варановіч:

— Ён не плача. Не сумуе. І не шкадуе. Няма пра што.

— А ты адкуль гэта ведаеш?

— Я бачыў. Недалёка адсюль стаяў бедны скіт. Быў тут, блізка ад памежжа, адзін, сам-насам... Аднойчы прыйшлі да яго чорныя хмары. Заслалі сонца, і думаў я, што не праб'ецца ніводзін промень. Не выратуе нашу зямлю.

— Прабіўся? Выратаваў?

— Як самы чаканы цуд! Падобны да чорнага ценю пайшоў на заклад, які не змог выйграць. Сталі ўваходзіць у скіт людзі ды ўзлятаць з яго белымі лебедзямі. Вяртацца туды, куды

вяло іх сэрца. А той, хто гэта ўчыніў, стаў каменным волатам, прыняўшы ўвесь боль зямлі. Усе яе слёзы...

— Значыць, перамог без зброі.

Уражаныя, доўга маўчаць Варановічавы спадарожнікі. Мабыць, мроіцца ім, як даўно-даўно жывы ды падобны на іх зрабіў цуд... Вераць і не вераць яны гусляру.

— Скажы, Варановіч, а можа так стацца, што меў ён агнёвую папараць-кветку?

— Чулі ўсе, што такая цудадзейная кветка ёсць, але ж даўно-даўно ніхто яе не знаходзіў... Шукалі многія. Чакалі. Не прычакалі. Дык можа, аддала яна ўсе чары гэтаму каменнаму волату?

— А ты ведаеш, дзе ды як можна кветку гэтую знайсці?

Не маўчыць у адказ, сумна ўсміхаецца гусляр Варановіч:

— Ёсць гэтая кветка. Шукаць яе ў непраходных балотах, у цёмных лясах, дзе вартуе вялікая сіла. А найболей — на цмяных пакручастых дарогах-шляхах. І абавязкова знойдзе той, хто адолее сябе. Як? Таго не ведаю. Я шукаю яе, шукаў усё жыццё...

— І не знайшоў?

— Пакуль што не. Але ж я веру...

І доўга яшчэ паміж збройнымі ідзе гамонка пра тое, што верыць — гэта пачэсна. Але ж як відушчы Варановіч той кветкі не знайшоў, ці варта патыкацца іншым? Засыпаюць цікаўныя, задуменныя, усе размораныя цяпельцам. Не, зусім не баяцца яны ні доўгіх пошукаў, ні цяжкага змагання. Але як не ўсім у вяшчунных снах мроіцца, што нечакана і радасна знайшлі яны самую агнёвую ў свеце...

Сняць з таго шчаслівыя выявы. Не спіць толькі адзін Варановіч. Глядзіць у неба, дзе збіраюцца шэрыя хмары. Пазірае на трывожную постаць каменнага волата. Нібы разважляе, нібы ўспамінае... Як быццам не можа ўспомніць. Як быццам знікаюць непрамоўленыя словы, пакідаючы толькі адзінокае маўчанне...

Ідзе прэч ад зыркага вогнішча, ад сонных заспакоеных людзей. У начной цемры падыходзіць да вялікай мяжы, дзе яго хутка будуць чакаць... Прылятае белая птушка, б'ецца аб зямлю. Устае прыгожай дзяўчынай. І папракае яна веднага Варановіча:

— Што, чалавеча, абяцанага не зрабіў? Чакала ж я, доўга чакала...

— Так чакала-клікала, што зрабілася служкаю самотнай Жэлі?

— Агартае жаль. Мне прадказаў мудры-вяшчунны, што спраўдзіцца маё шчасце... Не сталася таго. Ды няхай не адной мне будзе скрушна. Ідзе да тых людзей, якіх беражэш і любіш, жальба вялікая.

— Пачакай, белая, не кліч бяды. Знойдзем суджанага, чаканага. Ён бліжэй да цябе, чым здаецца. Толькі меў зашмат клопатаў, таму і не азваўся.

— Не зважу болей на слова твае. Мілей за пакутлівае шуканне адзінота.

— І мне мілей... Ды глядзі, як чакае цуду чалавечага каменны волат. Ці гэта скамянеў ён ад болю за іх усе, здзейсненыя і пакуль няздзейсненыя? Ці чуеш, аб чым ён просіць цябе?

— Чую, як слёзы точаць камень аж да самага жывога сэрца... А можа, гэта ты, спрытны-дасціпны, знайшоў, як зноў і зноў мяняць чалавечы лёс? Толькі ніякімі чарамі не змагу я Жэлю прагнаць. І Карну, і Жэлю...

— Не прагонім зусім. Але ж зблытаем, адвядзём. Спаткаем трывожны золак. Моцна клічу шэрыя хмары. Я хачу...

— Шукаць... Чакаць... Жыць...

— Дагнаць. Вярнуць. Быць.

Узлятаюць ад скамянелага волата дзве птушкі. Праз цмяныя шляхі спяшаюцца наўздагон. А дзесьці далёка падае, разбіваючыся, долу маленькі папаратнікавы каменьчык.

## РАБІНАВАЕ СОНЕЙКА

*Легендава-казачнае*

Расквітнела ў небе перуновай кветкай ды лёгка скінулася на зямлю. Пакарала нейкіх шкодных ды злых, якім ніхто не радаваўся, якіх ніхто не вітаў. Раўлі-гулі вятры, засцілі ўсё наўкол хмары. Над вялікім светам неба шчыльна злівалася з шэрай зямлёю... Не зважаю на тое. Не баюся, не дзіўлюся, не чакаю. Гэта ж мая гадзіна. Кароткі час, калі даспявае спакуслівая чырвоная рабіна. Мая вечная краса.

Пайшла нячутным крокам сцежкамі-дарожкамі. Цёмна-маркотна. Грымяць грамы, дождж залівае вочы. Не зважае на непагадзь, хвацка едзе па дарозе на жорнах з сямі камянёў нехта, які збірае і дужых, і адчайных.

— Навошта яны табе? — запыталася строга, каб адразу ўведаў чарадзей, каго перад сабою бачыць.

— Малання... — спужаўся-сумеўся. — А ты навошта зноў і зноў вяртаешся? Чакаеш, калі адвернецца ў чалавека камень па-над імклівай ракою? Ці рака зноўку стане дзяўчынай... Ведаеш, я б забраў іх з сабою. Іх абодвух!

— А ты не ўдавайся смелым, чарадзею! Досыць табе на белым свеце нечысць разводзіць...

— Досыць! Не буду ўцякаць ад цябе! Але ведай... Ведай, як вядзеш жорсткую Перунову волю ў гэты свет. Плача імклівая рака. Не пазбыўся чалавечага сэрца той камень. Яны спадзяюцца на цябе...

І нешта яшчэ хацеў казаць... Толькі пошчыкам пракаціліся перуны. Бліснула над чарадзеем сваёй сапраўднай сілай. Будзе стаяць млын на сямі вірах, малоць жытное, збіраць людзей. Мабыць, што і шчырых, працавітых. Найлепшых... Не валацужнічаць ім, не гайдамачыць, не чараваць. Не мроіць да самазабыцця, не сузіраць далёкія далечы. Не песціць надзеі...

А пакуль... упалі мае гарачыя іскрынкі ў рачную плынь. Ускіпела хваля, ударылася аб камень. Здрыгануўся той, як быццам жывы... І ад яго паскакаў па-над зямлёю прывідны белы вершнік. Не мой. Не да мяне. Шкадаваннем шумяць заліўныя дажджы. А вершнік сочыць мае сляды. Ідзе за мною. Усё яшчэ спадзяецца?

Я знікну раней, чым ты дагоніш мяне. Так было заўсёды... Булькоча млын на сямі вірах. Бяжыць звілістая рака, хоча знесці з сабою камень. Скача белы вершнік, вяшчуе бяду і гора... Не ведае пра гэта, ходзіць па зямлі такі падобны да белага вершніка чалавек. Чыніць сваё.

— Што гэта, пане, бяроза ці лаза? — вяртае крыўду таму, хто цяпер баіцца. І пярэсціць балючай хварасцінай, каб уведаў, як жа соладка гэта. — Будзеш здзекавацца? Будзеш зневажаць?

— Ой, не буду, не буду! Пусці жывога толькі.

— Адпушчу! Адно ведай, што я побач, што сачу за табою. Памятай пра сваё абяцанне!

І адпускае пана. Ледзьве выбраўся шаноўны з лесу, людзей напаткаў ды крычыць, злуецца, як не лопне:

— Хапайце яго! Гэта ж злодзей! Кароў ды валоў забраных сялянам аддаў, самога пана адлупцаваў так, што той цяпер штонебудзь учыніць баіцца!

— А ты адкуль ведаеш? — пытаюцца людзі. — Ці не будзеш тым самым панам?

— Не, не буду болей так, не буду! А хай вас балесь... Не буду тым самым панам. Гэта зусім не я! Я чужы, іншы... Вы толькі злодзея таго даганіце-схапіце!

Ды злодзея ўжо і след прастыў, дзе ж яго схопіш... Ведае лясы, любіць лясы, як і ты, белы вершнік. Як і сваю зямлю, як і ўвесь край. Падобны да цябе. Ідзе праз гнеўную ўлеву, праз самую чарадзейную ноч. Азываюцца блізкія грымоты, і я з'яўляюся побач. Гляджу, гляджу. Такі падобны да цябе, белы вершнік. А да мяне падобны?

Плачуць дажджы, шалеюць вятры, даспяваюць ягады на гонкай рабіне. Горкія, нібы чалавечая крыўда, ясныя, нібы зыркі нябесны агонь. Яшчэ пасаладзеюць няблізкімі маразамі. Я не буду хадзіць тады па зямлі. І я б хацела застацца. Побач з каменем, побач з ракою. А пакуль... з асмужаных узгоркаў, з цёмных лясных межаў таямніча сузіраю свет. І я ведаю, што гэты свет мяне любіць. Чаго ж іначай азіраецца-дзівіцца, як шугану полымем, пыхну так прызыўна...

Стаўшы посвістам вятроў, лятуць, гоняць ведзьмаў чорныя гарцукі. Верныя, жорсткія. Толькі аднаму Перуну і радыя. Гоняць, злуюцца, не могуць нічога ўчыніць. А тыя смяюцца, здзекуюцца, пужаюць...

— Была ты да нас падобнаю. Чары тварыла, па зямлі хадзіла!

— Перуна пакахала, нябесным агнём стала.

— З-пад рабіны рака бяжыць, а на рабіне сонечная птушка сядзіць.

Чый гэта шэпт ляціць праз ноч? Не сячы рабіны — заплача, адпомсціць... Стала рабінай чарадзейка заклятая. Рабіна маркотная, нешчаслівая. Праганяе нячыстую сілу, кліча сонца пасля рабінавай ночы. І зноўку застаецца адна...

Праз цемрыва хмар праглядае белая поўня. Ціхая, шчымлівая. А на ёй відаць, як стаіць брат над братам, кажа сурова:

— Праганяй нас, праганяй! У свет пайшлі рознымі дарогамі. Я ці мала ішоў, а стаў служыць князю. Верна, аддана. Брат мой ці мала ішоў, а стаў баламуціць людзей, падгаворваць, каб не слухаліся князевага слова... Уведаў міласэрны князю... Схапіў я брата, пакараў. Хоць і ведаў, што няма ды не будзе мне супакаення... Не змог адзін хадзіць па зямлі. Доўга чакаў ды ўчыніў, каб на паляванні застаўся князь без ратунку, уцякаў ад раз'юшанага звера, уцякаў ды загінуў... Не загінуў, ты яго ратавала. Па лясах хадзіла, кахання чакала. Чаравала-шчыравала. Ці ведала тады, што жорсткі князь цябе пакіне? І застанешся адна...

Залівае вада агонь, знікае агонь у зямлі, і я ведаю, што толькі ён застанецца са мною заўсёды... Травою шаўковаю зямля сцеліцца. Пошчык лясамі ідзе. Гэта бяжыць да мяне мядзяны воўк:

— Дай пакалыхаць дзіцятка тваё!

Бліскучай просінню неба свеціцца. Белай аблачынкаю зямлю спавіла. Гэта прылятае да мяне лёгкакрылы бацян:

— Дай пакалыхаць дзіцятка тваё!

Косы шаўковыя, вочы сінія. Па лясах ходзіць, аблокам смяецца. Чары цябе любяць... Толькі не сустракайся, мілая, з жорсткай князевай раднёю. Княжыць ён слаўна, гадуе сыноў. Шкада, як не маіх. Замаўляю пра тое, замаўляю неба і зямлю.

Цёмнай непрахаддзю бягуць да мяне ваўкалакі, уцякаюць ад агнёвых водбліскаў:

— Былі мы княжатамі, сталі ваўчанятамі! Толькі адзін наш брат ад цябе ўцёк... Ці навечна закляцце тваё нас такімі зрабіла? Каб жа і не думалі да тваёй прыгожай дачкі заляцацца. Адчаруй нас!

— Не адчарую! Літасці не ведалі, з пачуццяў смяяліся, то бегайце цяпер з хвастамі.

— А мы будзем рабіну грызці! Парабілі бацькавы кавалі нам жалезныя зубы. А князь наш, бацька, памятае цябе добраю...

І грызуць маё дрэва. Падаюць на зямлю недаспелыя горкія ягады. Падаюць дажджамі даравальныя слёзы. Не мае! Мабыць, што і добрыя... Сонцавы, якога цяпер няма. Даўно яго не бачыла. Тады апошні раз пыхнула мне грозна:

— Адзін смелы і шчыры да мяне прыходзіў, пра дачку тваю, пра каханую сваю пытаўся. Хацеў ведаць, як дапамагчы вам... Ды ўсім, каго па дарозе сустрэў. Стане яшчэ і мудрым, будзе князем слаўным! Выбаві яго з чараў заклятых...

Пыхнула сонейка, так сказаўшы. Промні гарачыя-пякучыя. І стала маё сэрца халодным-халодным... Халаднейшым за самы стылы камень. А чаго да сонца ішла? Пра князева сына пытацца. Мост над вадою стаіць. Ты ідзеш, а ён за табою знікае.

Як плыве, ды не гайдаецца. Сонцаў масток. Будзе слаўным адзін... Прыйшоў да цябе з-за мораў, з-за гораў, з-за шырокіх долаў. Ды не будзе шчаслівым. І з чараў кахання яго выбавіць не змагу... Скрыўдзілася на мяне трысветлае. Адно кожны раз, як даспявае такой грамаўнічнай ноччу гарачая рабіна, здаецца мне, што гэта ты ўзыходзіш над светам. Маё рабінавае сонейка...

Мая вясёлая дзяўчынка. Вецер косы табе заплятае, удаецца ласкавым ды прыгожым, чалавекам у вочы глядзіць. Магла б у ім абудзіць чалавечае сэрца. Не скаланалі б тады віхуры зямлю. Не скардзіліся, не плакалі... А табе патрэбны толькі адзін князеў сын, чыё сэрца згарыць у сонцавай мудрасці назаўсёды. Не хочаш пра тое слухаць.

Дождж твар табе мые, робіцца ціхім ды маладым, чалавекам у вочы глядзіць. Магла б у ім абудзіць чалавечае сэрца. Не кранулі б тады знішчальныя ўлевы зямлю. Не скардзіліся, не плакалі... Але табе патрэбны толькі адзін князеў сын, у чыім сэрцы не будзе людской спагады. Не хочаш пра тое слухаць.

Просішся ў свет пайсці, каб вандраваць-чарадзеіць... Ідзі ды будзь шчасліваю! Адно пра княжыча забудзься...

Ці многа часу мінулася, ды едзе карэта шасцерыком, сядзяць там панічы ды паненкі. Убраныя-размаляваныя, падпітыя-вясёлыя. Цемру ў вачах хаваюць. Кажуць мне так міла:

— Прыслаў княжыч карэту па сваю князёўну, а тваю дачку. Пажадай, маці, ёй светлай долі. У няблізкую дарогу благаславі.

Кланяюцца мне так нізка. А я ім не кланяюся. Не адказваю. Узгараю гневам, нібыта агнём. Бліскаю на тую карэту ды коней, тых паненак ды панічоў. З дзікім рогатам разбягаюцца хто куды... А найболей у балоты-багны. Капыты ва ўсіх ды поўсць чорная. Рогі. Хвасты. Карэта пнём трухлявым ляжыць, а коні лятуць-уцякаюць кажанамі. Ужо не ліслівяць панічы — праклінаюць-грозяцца... З балот сваіх лычы вытыркаюць:

— Не будзе вам, чарадзейкам, шчасця!

— Блукаць тваёй дачцэ між лясоў-палёў, а нідзе не спыніцца!

— Быць зяцю твайму нежаданаму з ёю побач, а з месца не скрануцца!

— Буду цябе, нечысць, агнём паліць. У балоты праганяць, каб не паскудзілася зямля...

Толькі так сказала, як загалёкала ўсё, закружылася. Падумала тады, што гэта нячысцікі спалохаліся майго слова... Кінуліся ж уцякаць. Кінуліся хавацца. А цяпер у начным небе квітнею рабінавай кветкай і ведаю, што не мае гэта чары. Не спадзяюся перамагчы адна...

— Не спадзявайся перамагчы адна, — з першым промнем сонца з'яўляецца мне як увесь абліты золатам. — Баіцца нечысць нябеснага агню. Яго табе падарую, бо чуў слова твае. Абяцай, што не спынішся, што заўжды тое спраўдзіш...

Сонцаў сын. Гнеўны, грозны, недаравальны. Па небе грукаціць. Перыць, перыць усіх, хто з чорным мроівам у вачах. З цемрай у сэрцы... А тваё сэрца ясна-агнёвае. А маё?

Усміхаешся зырка-сляпуча, што глядзець цяжка. Аж бегаюць у вачах чорныя плямы... Кажаш сурова, каб ведала, каго перад сабою бачу:

— Стань агнём, спраўдзі слова свае. І абяцай, што будзеш маёй воляй на зямлі!

Стану агнём. Не сцепліць ён халоднага сэрца. Па зямлі пайду, пра задумы-справы нячыстыя ўсё дазнаюся. Паклічу шчыра:

— Пачуй мяне, сонцаў сын! Нечысць цёмная сонейка цікуе. Хоча яго злавіць ды ў балота пасадзіць... Моцна таго жадае!

Як разальецца яснае слабенькай заранкай, як толькі выгляне з-за краю зямлі нясмелымі вочкамі, пыхнуць яго чырвоныя слёзкі. Тое не дзіва — цяжка ж глядзець у змрок... Пакоцяцца лясамі-палямі, дарогамі-разлогамі, знойдуць асмужаныя ўзгоркі, зоймуць лясныя межы. Будуць адтуль таямніча сузіраць свет...

Маладое сонейка ціхмянае, лагоднае. Нясмела паказваецца з-за балот-лясоў. Нялёгка яму кожны дзень узбірацца на такое высокае неба... Дык тае хвіліны нечысць і пільнуе. Каб у сетку трысветлае ўблытаць і ў багну зацягнуць. Не жадае добрага дня, хоча вечнай ночы. Рогату, здзеку, пагроз...

Гневаецца сонцаў сын. Творацца з яго дыхання такія бліскучыя... Загадвае ім сонейка вартаваць. А яны радуюцца, а яны скачуць-гарцуюць. Лётаюць над палеткамі, лётаюць над узгоркамі. Няма ім спакою цалюткі дзень. Толькі слабыя яны сіня-шэрай раніцай.

Слабыя, кволыя, а я мацнею з кожнай хвіляй. Не зважаю на прымройлівы змрок. Удаецца жоравам, ходзіць па балотах, лопае крыламі. Абяцае прынесці мне самыя чароўныя на свеце чаравічкі. Абы толькі я волі жорсткай нябеснай на зямлі не дзейсніла.

— Ты, жораўка, высока лятаеш. З грымотамі сябруеш. Не можаш мяне прасіць пра тое. Перакінулася ў цябе нечысць зманлівая...

Не баюся лютага мядзведзя. Ноччу цёмнай грукае мне ў дзверы, песню пяе грозную. Абяцае следам за мною хадзіць, у дрэва назаўсёды зачараваць, гарачыя ягады лапамі рваць. Абы толькі я волі жорсткай на зямлі не чыніла.

— Ты, мядзведзя, з нечысцю знаешся. Не можаш мне загадаць пра тое.

Не дзіўлюся, як паўсюль бачу кветку прыгажосці нечуванай. Лагодную, мілую. Кажа мне, што любіць сваю зямлю. Хоча вечна да сонейка цягнуцца... Між палёў-лясоў расці, не спатольвацца, не спыняцца. Не маю чаго ёй адказаць. Як пазнаю некага. Каго ж? Кветка сіняя, пялёсткі шаўковыя. Не спіць ноччу. Кратае сваімі жывымі чарамі людзей. Кліча адчайных, смелых. Мроіць пра светлую долю, углядаецца ў далі-далечы, верыць у добры свет...

Не чакаю чарадзейнага выбаўлення. Толькі на сябе спадзяюся. Глядзіць неба высокае, пахмурнае. Начным ды змрочным застаецца... Дапільнавалі нячысцікі, скралі яснае сонейка. Жыць нам у вечнай цемрадзі... Маркотна-самотна...

— Выбаві мяне, выбаві... — шэпчуць балоты ды лясы, нібы ўся зямля голас падае. — Да твайго нараджэння такое прадбачыла. Цябе ў гэтым свеце чакала... Чары ў табе смяротныя, абраныя... Самыя моцныя!

Пачуў той голас белы вершнік, сабраў бацькава войска, пайшоў з нечысцю прагнай змагацца... Самы лепшы з князевых сыноў. Засіпелі на яго дрыгвяністыя багны:

— За тое, што пайшоў супраць нас, быць табе ценем. Вяшчуй бяду ды гора!

Не спалохаўся, не адступіўся. Быў жа воем і застаўся ім. Ды не вытрымала чарадзейнага праклёну ягонае халоднае сэрца, ператварылася ў камень...

Тады знікла самая прыгожая кветка, як не было яе ніколі... Адно рака сіняя журботная па зямлі пабегла, плачам галасным заспявала, між лясоў-палёў закружылася. Мяне да сябе паклікала... Я схілілася над вадою, схілілася і пазнала...

Ноччу цёмнай загараецца рабіна. Грымяць грамы, дождж ліе, а полымя шугае. Па-над лясамі-разлогамі, пушчамі-дрымушчамі, у якіх толькі лясун гукае рэха. Ля вокнаў ціхіх хат, дзе спяць у калысках маленькія красуні. На ўзмежжы шляхоў, на ростані дарог, па якіх пайсці за сваім лёсам самым смелым... Гараць рабіны, сягаюць хмар. Не згараюць. Цепляць зямлю. Абуджаюць чулае сэрца, дзівяць яснай красою.

Нечысць зацятая не спыняецца, творыць сваё... Панамі ды панямі вычвараецца, у багатых пакоях скача, крыўдзіць невінаватых, простых. Адно баіцца маёй рабінавай ночы, калі ляціць па-над зямлёю белы вершнік. Па слядах яго ідуць тыя, каму прыкрая несправядлівасць. А мне ж прыкрае нячыстае галашэнне-выццё. Узгараюся зырка, праганяю лёгка. Пыхкае рабінавае сонейка. Сонца чыстай радасці трывожнага краю...

# АНЧУТКА-АНЧУТКА

*Міфалагічна-легендавае*

Калі Бог ствараў вялікі свет, запаліў у небе гарачае сонца, загадаўшы яму свяціць і на добрых, і на злых. Запылала агністае ды хутка стала скардзіцца, што цяжка яму трымацца без супынку. А яшчэ не схацела саграваць усіх роўна... І тады, разважыўшы, дазволіў Бог сонейку іскрыцца толькі ўдзень, а ноччу адпачываць. Так узніклі дзень і ноч. Так з'явілася свая гадзіна для ціхмяных і ліхіх. Так знайшоўся свой час для такіх, як я, для ўсіх тых, хто са мною.

Лёгка хаджу па свеце ўночы. Лясным шолахам крадуся па-над зямлёю, удаюся сонным прымройлівым дажджом. Бягу трывожным ветрам у шырокім полі, даскочу да сядзіб, пастукаю ў вокны зялёнымі галінкамі. Магу скінуцца тым ясным сокалам, якога і клічуць, і чакаюць. Магу ператварыцца ў кожнага. Не толькі ноччу. Нямала праяў маіх і днём, хай загорнецца ў хмары трысветлае... Ці хай не робіць таго. Мне ўсё роўна.

Проста ўдацца іншым. Завабіць і спакусіць. Цешыцца з пакут і вялікіх, і шчырых. А хіба яшчэ з чаго смяротныя бываюць шчырымі? Ды мне ўсё роўна. Надакучыла здзекавацца з ліхіх. Хіба ж яны не людзі? А я ўсё ж не такі жорсткі, як гарачае сонца. Проста за хцівасць і пагарду прыходзіць адплата. Проста за пагарду прыходзіць адплата. Няхутка, але ж у сваю часіну.

Я ніколі не прыносіў яе на сваіх руках. Гэта было б сумна. А мне самому не раз хацелася чыстых летуценняў і думак. Але ў свеце ёсць цёмная ноч. Цямнейшая за самыя патаемныя людскія жаданні. І яны чакаюць, прагавіта рвуцца на волю, жаласна просяць ратунку. Тады я спачуваю. Спачуваю заўсёды. Я ж не жорсткі, як тое трысветлае. Просты, літасцівы. Адзінае, што ад свайго ніколі не адступаюся.

Як і ад цудаў, да якіх заўсёды быў цікаўным. Хто не ведае, той не паверыць, што яны і жывыя, і сапраўдныя. Нехта ж некалі аддаў сваю несмяротную душу, каб так і было. А несмяротная душа не знікае, не прападае, не мінаецца. Я пэўны ў гэтым, як аніхто, спазнаўшы вялікую праўду. І толькі адзінадзіны цуд не зведаны мною дагэтуль.

Іду да яго, як адкрываецца таемны шлях. Аднойчы на бясконца доўгі сонцаварот. І тады здараецца незвычайная ноч, калі пяе ды гуляе мая сіла. Палохае слабых, абуджае зайздрасць у прагавітых, выпрабоўвае адчайных, здзекуецца з усіх смелых. Але мала зважаю на тое. Здаецца, што ўсе чалавечыя пачуцці мною даўно-даўно пераҗытыя. Стаміўся ад іх. Надакучыла, надакучыла... А цуд заўсёды завабіць. Хоць і на кароткі час. А на доўгі? Я не сустрэў яшчэ такіх цудаў. Падарожнічаў, рызыкаваў, разгадваў іх таямніцы. Трэба ж неяк весяліць сябе ў смутку. Трэба ж неяк не памерці з нудоты. І толькі адзін цуд мне ўсё ж не паддаецца.

Няхай сабе... Гэта нават цікава. Калі смяецца ды галёкае, дражніцца мая ноч, думаю пра тое, хто ж яго зчарадзеіў-стварыў. Не магу даўмецца таго. А каб дазнаўся, то б хуценька перастаў быць цуд такім таямнічым. А так вартую-хаваю, ды аніяк спазнаць не магу. Прыходжу да яго праз людскія карагоды, праз цёмныя чары, праз пошчыкавае бліскание вечнага ворага майго. Набліжаюся, але ніяк не магу раскрыць... Крыўдна...

Зусім крыху. Я развучыўся крыўдзіцца, бо развучыўся захапляцца і здзіўляцца. Ды той жывы цуд зусім не зважае на такую драбязу і кожны раз здзіўляе мяне. Вось і цяпер мовіць спагадліва, зычліва:

— Ну, прывітанне табе, Анчутка!

І заходзіцца залівістым смехам, убачыўшы, як злосна я ўсхапіўся. Што і казаць, угадаў таемнае імя маё. Як вярнуў не-

звычайнае імгненне, калі не было ў мяне яшчэ ночы. Калі я сам проста быў… І чаканым, і бесклапотным. Лёгка сустракаў сонца. Але ўчынілася так, што сталася гэтае імя балючым і нежаданым. Пакуль не суняўся боль, не аціхла нежаданне. Даўно і гэта было.

— Ты не мог быць простым, Анчутка. Заўсёды быў невыносным сонцу… І ніхто ніколі цябе не чакаў!

Свет не памятае таго. Ты не памятаеш таго. І я не памятаю… Але ж хіба страціцца ад гэтага сапраўднасць? Яна раўнадушная, як і я сам. Столькі часу мінулася, ды не мінуліся спраўджаныя дзеі. Проста пасля іх забыцця прыходзіць абыякавасць. І мне давялося ўведаць, што абыякавасць — гэта добра… Я ж добры. Люблю трохі пакпіць-пажартаваць… Толькі таму, каб не стала зусім ужо маркотна. А з табой, цуд-цудоўны, не засумуеш. Павесялі мяне, павесялі.

І цвіце цуд агністай кветкай, пра якую марылі, якую шукалі многія. Ліхія, але і ціхмяныя. Спагадлівыя, але болей зайздросныя. Падманвалі ды і самі спакушаліся. І зноўку згаралі новыя надзеі, якім не суджана было збыцца. Абуджалася ў пакрыўджаных сэрцах ноч. І колькіх жа ты прывёў да мяне? Цяжка злічыць… Я б не змог падманваць так упарта. Ды на абяцанае шчасце хто ж не адгукнецца… Цуд, цуд, умееш прыўлашчваць, умееш чараваць.

— Умею адкрываць новыя шляхі. Пакручастыя, цяжкія. Каб ішлі імі, каб станавіліся лепшымі… Гэта ты зводзіш іх з майго шляху! — не хаваеш сваёй пагарды.

Раздражняйся, злуйся. Казаў жа, з табою весела. Хоць бы з таго, што ведаеш мяне навылёт. Я не сам-адзін у вялікім свеце, пакуль ты цікуеш, варожыш, прадбачыш… Мяне. І зноўку памыляешся. Ды не кідаеш сваіх намаганняў. Не пакінеш іх. І каму ж гэта нявесела падмануць самога манюку? А мяне

цяжка прадказаць. Калі б я зведаў самога сябе, калі б пэўна да нечага імкнуўся... Аднак даўно нічога не жадаю. Мне ўсё роўна.

— А вось мне зусім не ўсё роўна. Я сам жадаю зрабіцца лепшым... Не паверу, што не зможаш мяне зразумець. Ты не быў раўнадушным, калі я назваў цябе Анчуткам.

Хочаш сказаць, што схаваў цябе сваімі чарамі ад свету з-за таго, што клапачуся? Адзін раз на доўгі сонцаварот здараецца твая ноч. Адзіны раз на год ты прачынаешся. Адкрываецца прывідная мажлівасць. І кожны раз ад цябе ўцякае. І ўвесь кароткі час, як бачыш ты свет, вартуе цябе мая вялікая сіла. Не дазваляе так проста наблізіцца анікому... Хочаш сказаць, што ў гэтым найлепшае?

— Хачу сказаць, што лепшага трэба дачакацца. Прыйдзе некалі той, які адмовіцца ад усіх цудаў, адно прызнаўшы праўду. І тады з цемры падзямелляў я выйду на свет. Не будзе засціць шляху твая сіла. І тады знікне...

Усё, чым жывуць людзі. Падман, здзек, пагарда, зайздрасць. Не сумуй, не здарыцца таго. Ты ніколі не прычакаеш справядлівага, які б дзеля іншых адмовіўся ад свайго шчасця. А значыць, я ніколі не адпушчу цябе. Бачымся раз на год? Няхай сабе. У нас жа цэлая вечнасць. Некалі ж я разгадаю тваю таямніцу. І тады скончацца пакуты твае. Усё ж мае скон... Называй маё таемнае імя. Выпрабоўвай маю волю. Добра вартую цябе, дык ніколі ты не збяжыш!

І не зважаю, як, адчуўшы мой гнеў, падае долу грымотны Пярун. Амаль трапна кінуў свой стрэл адвечны вораг. Ды ніяк не навучыцца пацэліць.

— А гэта ён? — пытаешся і з трывогай, і з хваляваннем.

За мяне. Казаў жа, умееш дзівіць. А што ён? Усё да абрыдласці звыкла. Выглядае мяне з неба, плешча стрэламі.

Хоча спапяліць. Ды не можа ўчыніць жаданае Грамаўнічны, як хаваюся ў сваіх балотах.

— Што ж не верны ён свайму слову? — гучыць у тваім голасе крыўда.

Гэта ж ты пра тое... Я некалі сказаў яму, магутнаму, што схаваюся за чалавека. І абяцаў тады міласэрны чалавека забіць, грэх яму адпусціць, а мяне проста са свету звесці. І яшчэ я ўзгадаў, за кім магу схавацца. І зноў адкрыў даравальны сваю жорсткую волю. Што ж, давялося і мне прызнацца, што буду хавацца ў карчах на балотах.

— Вось там і будзь! — пачуў я тады, ды яшчэ не было нічога сказана пра пякучыя стрэлы.

Але стрэлы з'явіліся. Сам бачыш. Так, гэта крыўдна, што ён падманвае мяне. Ды і я шмат падманваў яго. Таму не будзьма чапаць справядлівасці, не будзьма нічога казаць пра абяцанні-словы. Я ж прызнаўся: усё да абрыдласці звыкла. І ты не плач мне пра тое, чаго не разумееш, цуд цудадзейны. Разумееш? Цешся сабе...

А ты чаго гэта так расхваляваўся? Патрапіць у мяне нябесны агонь — і знікну я са свету. І не затрымаюць цябе болей чары мае. Будзеш і свабодным, і шчаслівым. Хіба не пра такое марыш? Дык што ж ты клапоцішся-сумуеш? Табе не да твару спагада... Так, і ў цудадзейнага ёсць твар. Няхай схаваў ты яго ў квяцістых абрысах, ды некалі ж я цябе пазнаю. Дзіва не можа таіцца вечна.

А пакуль усё да стомы тое самае. Ізноў ідзе да цябе, цуд мой, цуд, спяшаецца ўтрапёны смяротны. Малады, смелы. Не збаяўся карагодаў нечысці. Чую гучныя нецярплівыя крокі. Які ён? Той, што жадае сабе шчаслівага доўгага веку. Гатовы дзеля гэтага на ўсё... Дык спрачайся з ім, вядзі да праўды якім сабе хочаш шляхам. Спадзявайся, расчароўвайся. А я пакіну цябе з такой важнай справай сам-насам ды пайду. Ужо прабач, што гэтым разам не забавіў доўга.

Пайду. Не ты адзін называеш мяне Анчуткам...

Іду. Кажуць мне чары пра далёкі мядзвежы роў. Ды самы чуйны чарадзей не спазнае ў ім адчайнага чалавечага плачу. Плачу-галашэння... Не пачуе, як хтосьці не сваім голасам кліча мяне. Гэта той адзіны, у якога ёсць права называць мяне даўно забытым імем.

— Анчутка! Анчутка! Анчутка!

— І табе прывітанне, брат! Ці засумаваў ты без мяне хоць трошкі?

Бачу-бачу, ты мне зусім не рады. Нават не ўсміхнешся? І не адказваеш. І гневаешся. І ненавідзіш. За што? Гэта не я зрабіў цябе мядзведзем. Я толькі збярог тваю памяць у звярыным аблічччы. Проста не змог расстацца з табою. Ты мне ўсё ж такі брат... І вось ты памятаеш, пазнаеш, хочаш вярнуцца. Назад у чалавечы свет, дзе некалі былі мы абодва. Толькі не можаш...

— Вярнуся! Вярнуся! Вярнуся!

— Ды куды ж ты вернешся? Паглядзі на сваю ліпавую нагу.

Гневаешся яшчэ болей. Але і тут я невінаваты. Не я ж вырашыў проста пакінуць усё як сабе ёсць і з'явіцца ў вёсцы. А там не пазналі. Не паспагадалі. І трэба ж, хацелі забіць... Ледзьве ўцёк на трох лапах. Вось цяпер і хадзі на чацвёртай ліпавай назе. Раві ад болю, ласкі не чакай. А ты ўпарты, мой старэйшы брат. Такі ўпарты...

А я паціху закрыў чарамі вёску. Схаваў ад цябе шлях у той свет, які цяпер не мой і не твой. Не руш гэтага ладу... Пойдзем да ліпіны, пагамонім з ёю. Памятаеш, як сказаў ты, што хочаш стаць самым страшным? Каб усе баяліся цябе... І ператварыла ліпіна такога вось у мядзведзя. Дрэва людскога свету выканала тваё жаданне.

За што праклінаеш мяне? Кажаш, выканала ліпіна маё жаданне? Не маё, а тваё. Я проста абяцаў, што споўніць мудрае дрэва тваю волю. Адкуль мне ведаць, што ты яшчэ нечага пажадаеш, акрамя мёду? Хоць мёд ты любіш і цяпер.

Просіш, каб я не мучыў цябе? Не буду, брат мой. Твой спакой мне даражэй за ўсё. Але і даравацъ не змагу. За тое, што хацеў спалохаць Грамаўнічнага. Чым папракаеш? Чаго заступаюся за таго, хто б'е мяне сваімі стрэламі? Пытаешся, ці брат я табе?

— Таму і заступаюся за яго, гнеўнага, што ты мне брат...

Не разумееш мяне. Што ж... Я сам з сабою не мог дамовіцца. Вельмі доўга. Чараваў, жадаў. Падманваў, шукаў. І не быў тым, кім хацеў. Не мог выйсці з балот, а цяпер магу. Зноў папракаеш мяне. Упэўнены, што за цябе я многа горшы... І нагадваеш мне пра чорных лебедзяў. Памыляешся: мне ўжо не балюча. Мне ўсё роўна. Абыякава. Абыякава...

Не ўшчынай мне пра каханне. Я не ведаю, што гэта такое. Не ведаў ніколі. Што маўчыш? Забыўся на сваю ліпавую нагу? Баліць яшчэ? Ужо не баліць... А я добра зрабіў, што цвяліўся з цябе тады, як удаўся ты касматым. І ты захваляваўся, пабег да вёскі. Спужаўся назаўжды такім застацца. Жорстка? Зусім не. Толькі бачу, што са сваёй пасткі не можаш вырвацца дагэтуль...

Кажаш, не змог бы я, Анчутка, не зважыць на такое... Спазнаўшы цэлы свет, на самае важнае забыцца... Смешна. Што ты называеш важным? І ты смяешся з мяне? Дарма. Ты не ведаеш, як доўга я спазнаваў свет...

Стаяў белы замак за чорнымі балотамі. З нетраў самай чорнай, самай спагадлівай зямлі паднялася, пацягнулася да сонца светлая надзея. Я не хадзіў тады па свеце, ды ён не быў мне патрэбным. У мяне ж былі балоты, мае балоты. Па іх

заўжды цяжка ісці. Падсцеражэ неасцярожнага твань. Стаіцца мая нечысць ля азярыны ці выжарыны, каб напалохаць, каб пакараць. Я толькі думаў тады пра ўчынак і адплату, пра дараванне-прабачэнне для ліхіх. Кожны, хто пасварыўся з Грамаўнічным, пойдзе па балоце. І рана ці позна сустрэнецца са мною. Я ж стварыў балоты... Не памятаю, як і калі, толькі быў пэўны ў гэтым, бо пазнаваў у іх сябе... І тады я пажадаў, каб стала ў балотах болей літасці.

— Хто ты? — нечаканая сустрэча як ускалыхнула нешта забытае. Хацеў тое ўспомніць, ды не змог.

— Хто ты? — ізноў той жа голас. Тая ж цікаўная, настойлівая. Светлая. З белага замка.

— У мяне шмат імёнаў... — сказаў праўду. Толькі не ведаў, якое ж лепей назваць...

— Назаві хоць адно... Я зусім не шмат прашу, — яна нібы пачула мае думкі.

— Шат... — і гэта зноў была праўда. Я так хацеў, каб яна ўсё зразумела, каб яна пра ўсё здагадалася.

Яна не зразумела. Не магла здагадацца. Яна ж была ад белага замка. Невінаватая, добрая. Нібы з'явілі балоты светлы цуд вялікаму свету... Сказалі, што не чорныя ж яны, не страшныя. І я зразумеў тады, што магу не толькі караць. Шчыра ўсумніўся ў сваім даўнейшым праклядцці:

— Будзеш адно караць, адно зневажаць, і за гэты боль людскі знойдзе цябе знішчальны нябесны агонь...

Я быў рады, што яна цешыцца з балот, што хоча спазнаць вялікі свет. І спадзяваўся пайсці ў далёкія падарожжы разам з ёю. І адкрыць таямніцы цёмных балот... Як і свайго закаханага сэрца. Чуеш, брат мой, я не мінуў самага важнага. Ніколі не быў няўважлівым. Ніколі не быў раўнадушным...

Смяешся зноў? А мне вось не смешна. Няхай боль нагадае, што я сам яшчэ не зусім знябыўся. Але так хочацца вярнуцца да яе... Мы выходзілі з топкай багны, калі нас дагнала Грамаўнікова пакаранне. "Не быць вам разам", — паждадаў той, хто мог дазволіць сонцу не свяціць уночы. Павінна ж быць справядлівасць для ціхмяных і ліхіх. Для яе справядлівасці не было... Я толькі змог ператварыць яе ў чорную лебедзь.

Чорныя лебедзі — наш пачатак. Яны адкрывалі вялікі свет. Спазнавалі, вандравалі, чаравалі... Я тады вырашыў, што для яе павінна ўсё быць. Што не можа так заўчасна скончыцца каханне. Што не можа так заўчасна скончыцца жыццё... Чорныя лебедзі — надзея белага свету. Апошняе азванне дабрыні. Я хаваю яго дзесьці далёка-далёка. Прыйдзе час, калі яно спатрэбіцца. Як вось табе, касматы. Памятаеш пра сваю ліпавую нагу?

— Не забуду, як і цябе, Анчутка, ці хай сабе, Шат. Як і пра тую ліпу...

— Здзекаваўся з мяне, кпіў, пагарджаў. Лёгка крыўдзіць малодшага за сябе...

— І ты абяцаў мне цудадзейнае дрэва, якое зможа зрабіць самае жаданае. Абяцаў, каб я ад цябе адчапіўся.

— Абяцаў і знайшоў. Я ж заўсёды быў цікаўным да цудаў.

— Я так узрадаваўся, што забыўся пра цябе, Анчутка. Навошта ж ты мне, калі ёсць чароўная ліпіна.

— І вырашыў напалохаць Грамаўнічнага. Адчуў сябе магутным, беспакараным...

— І мне гэта амаль удалося.

— І табе гэтага не ўдалося. Сонцаў валадар зрыхтаваў жорсткую кару дзёрзкаму. Адно я абяцаў яму, што сам пакараю свайго брата. І сам ахвяраваў дзеля таго нямалым. Але няхай цябе ж тое не турбуе.

— А ты, Анчутка, быў рады старацца. Заўсёды самы старанны. Ты б мог падмануць, як робіш і рабіў тое.

— Я б мог падмануць…

Я заўсёды мог падмануць. А хто табе сказаў, брат, што тады абышлося без падману? Толькі карысці табе… Казаў жа, не можаш вырвацца з тае пасткі. А я вось вырваўся са сваёй. Спазнаў свет.

— Ты заўсёды падманваў толькі дзеля сябе, Анчутка. Ты скарыстаў каханне, каб выйсці з балот. Думаеш, я не ведаю? Думаеш, я не бачу?

Ведаеш, бачыш. Я і сам не хаваю таго…

— Ці памятаеш хоць яе? Ты ніколі не ведаў кахання. Ты не можаш кахаць, Шат. Як і сябраваць, як і проста верыць. Не кажы, што спачуваеш мне. Я толькі спадзяюся, што некалі той Грамаўнічны агонь, той невыносны сонечны гнеў усё ж зловіць цябе, брат.

І я люблю цябе, брат. Ідзі прэч ад мяне, пакрыўджаны, раззлаваны. Сустрэнемся ў наступны сонцаварот. І пагаворым пра тое ж, блізкае нам абодвум. Я не памятаю яе… Хаваюцца чорныя лебедзі ў непраходных балотах. Лятуць туды, дзе чакаюць спагады. Зносяць на крылах апошнюю надзею. Зносяць ад некага… Гэта ж ім, лёгкакрылым, пакаранне. За пачуццё яе адзінай да мяне. Светлае, чыстае. Іначай я б не выйшаў з багны. Стаяў белы замак за чорнымі балотамі. Праваліўся ў падманную твань. Усё правільна, іначай і быць не магло. Ды што я турбуюся, мне ж ўсё роўна.

А лебедзі такія чорныя, як самыя глыбокія балотныя нетры. Адзінокія. Сумныя-сумныя. Я невінаваты ў тым. Чуеш, брат?.. Лятуць ад мяне чорныя, нібы Грамаўнічны гнеў, чароды далёка-далёка. Я б хацеў іх паклікаць. Я б хацеў іх спыніць… Не магу. Гэта проста трэба прыняць.

— Я знайду цябе, Шат! — б'е ў камень Грамаўнічны, каторы раз абяцае ў мяне пацэліць.

Шукай, мой вечны. Ты мне самы блізкі, самы дарагі. Што б я рабіў, каб не было цябе? А так уцякаю, хаваюся. Удаюся некім іншым. Я спазнаў чары. Я спазнаў свет. Зведаў чорнае-чорнае сонца. І я б не хацеў вярнуцца да свайго пачатку. Не пажадаў бы нічога змяніць. Таму што вельмі доўга, вельмі пакутліва ішоў. Некуды... У які ж бок? Я не ведаю. Я стаміўся. Моцна стаміўся.

— Я спапялю цябе, Шат! — коціцца грымотны голас, ападае на зямлю, толькі мне пасланы, толькі мне і зразумелы.

За хцівыя здрады мае, за хітры падман, за прыкры здзек... І шмат за што яшчэ, чаго нават не ўспомню. За тое, што плачуць чорныя лебедзі. Цяжка кульгае касматы. Не можа адбыцца самы вялікі цуд, які б ашчаслівіў свет. Мне ж не самотна, не цяжка, не раскайна. Я спазнаў, што не можа быць вечнага шчасця.

— Чуеш мяне, Грамаўнічны? — азываюся гнеўнаму, суроваму. — З-за кароткага імгнення пакутуе ў жыцці чалавек. Ідзе да цябе. Ідзе да мяне. Што б мы без гэтага рабілі?

Сумавалі б, плакалі. Ты ведаеш гэта, як і я. І таму згодна грыміш аб зямлю сваімі агнёвымі стрэламі. З ляскатам пляжыш валуны. Думаеш, што я там, што дрыжу ад страху. А я тут, побач, і я не хаваюся. Не дзівіся, я ж зусім не такі палахлівы. Здзіўляешся. Супыняешся. Вагаешся. Навошта, калі нарэшце бачыш мяне? Ты ж так доўга мяне шукаў. Вось яна, мара-сустрэча.

— За справы свае станеш ты адно тлом! — ізноў хочаш мяне напалохаць.

— Не губляй часу марна!

Я не паслухаю цябе. Не спынюся. Ты ведаеш гэта, Грамаўнічны, як ведаеш сонечнае святло. Застанешся ты адзін, касматы. А ты, таемны цуд, так і будзеш неразгаданым. Лёгка лятуць зыркія перуны. Лёгка лятуць над светам чорныя лебедзі.

Гляджу трывожна, доўга. Чорныя... Лятуць, не спыняюцца. Імкліва, як чалавечыя думы-мроі. І тады пытаюся ў іх, лёгкакрылых, якіх жа дарог-шляхоў яны сабе шукаюць. Навошта пытаюся? Я ж добра ведаю гэта. Навошта чакаю адказу? Мне ж сумна. Нецікава. Скажуць, што даўно шукаюць і надзеі-спагады, і добрага сэрца, і лепшага свету. І ці мала чаго яшчэ... Смешна. І я засмяюся, і я ім прамоўлю, што няма такіх дарог, дзе б гэта ўсё-ўсё знайшлося. Навошта ж той, адзінай, намарна спадзявацца? Чакаць мяне, шукаць. Няхай забудзе хутчэй. Не засталося ўжо слёз. Не буду іх множыць. Не ляціце ўдалеч, чорныя лебедзі. Не шукайце, не чакайце. Лятуць-плывуць нада мною, трубна плачуць ды ціха адказваюць чорныя лебедзі:

— Шукаем дарог-шляхоў да помсты за падман, за чорную здраду... Хочам, хочам знайсці, каб пакараць. Ты ж ўсё пра гэта ведаеш. Раскажы, раскажы...

Я ўсё пра гэта зведаў. Чаго ж маўчаць, раскажу. І пачну з таго, што не трэба вам болей ляцець-шукаць. Знайшлі. Я ж той, хто падмануў, хто здрадзіў. Абяцаў ёй і спагаду, і сваё шчырае сэрца, і лепшы свет, дзе не балесна жыць. А прынёс адно расчараванне. Вечнае выпрабаванне нязведанымі шляхамі. Знік белы замак на чорных балотах. Знік, не паўстане ніколі. Дык не ляцець вам далёка, чорныя лебедзі...

Слухаюць мяне паважна, слухаюць ды смяюцца лёгкакрылыя. Заходзяцца з рогату, як быццам я нішто. І тады мне здаецца, што няма болей права на раскайнасць. Няма болей даравання. І нізавошта не будзе літасці. Некалі я ўжо вычарпаў усё гэта дарэшты. Свет смяецца з мяне. А ў мяне даўно не было такой няпэўнасці...

Плешчуць крыламі чорныя лебедзі. Адказваюць мне паважна, знікаючы ў далёкіх далях:

— Вой, развесяліў, вой, насмяшыў. Ты не можаш быць тым. Ты ж толькі маленькая іскрынка вялікага свету. Кволая, слабая. Той, каго мы шукаем, не ведае ваганняў-сумненняў. Ён памятае першае тварэнне, ён бачыў пачатак... Але мы знойдзем, знойдзем яго. Усю зямлю абляцім, але ж знойдзем.

— І што тады?

— Пакараем, пакараем. Вернем памяць пра ўвесь боль, пра ўвесь гнеў, што былі ад самага пачатку... Не будзе яму літасці, не будзе даравання. Ён наш, наш...

— Чаму ваш?

— Таму што ён чорны лебедзь...

Зніклі. Адляцелі. Абяцалі мяне знайсці. І не будзе мне самотна вас чакаць, гнеўныя лебедзі. Шчырыя лебедзі. Некалі даўно-даўно тая, з белага замка, сказала, што ратуе мяне, што знойдзе, дзе б я ні быў... Не паверыў тады, не падумаў, што можа такое стацца. Я пачакаю, калі ты мяне знойдзеш. Пачакаю, хоць і адляцелі імклівыя лебедзі, засталіся толькі грымлівыя перуны.

— Не зразумеў яе, не разгадаў! А яна зразумела, хто ж ты, Анчутка. Што ты... — азываецца мне ракатліва з-пад нябёсаў.

— З чаго мовіце так? Няўжо бачыце мяне?

— Ты здзівішся, але і мы ўрэшце знаходзім. І цяпер ты наш, чорны лебедзь, наш!

Успыхвае ноччу трысветлае сонца. Знікае ад мяне свет...

Але я не магу знікнуць з белага свету. Я бачыў першае тварэнне, я бачыў пачатак. Не адпусціць мяне вялікі. І даравальны, і міласэрны. Яму трэба мая ўпартасць. І здзек? І падман? Знекуль ведаю гэта, як самога сябе... Адкуль? І што далей?..

Вітаецца са мной Грамаўнічны. Ціха. Проста. Няўжо? Чаму ж не грыміш, як заўсёды?

— А навошта ж мне грымець на свайго старога сябра?

— Мы не сябры. І не былі імі ніколі.

— Былі-былі. Ты не памятаеш гэтага, Анчутка.

— Думаеш, я б змог такое забыць?

— Змог. Калі я цаляў у цябе агнёвымі стрэламі, то забіраў памяць...

Успомню. Ты лёгка дазваляеш тое зрабіць... Свет быў нашым. Прыгожым, добрым. Пакуль аднойчы мы не сустрэліся і я не сказаў табе:

— Глядзі! Вось маё войска ідзе!

Ты нядоўга чакаў. Нешта загрукатала, бліснула ўдалячы...

— А гэта маё войска ідзе.

А далей гром ды бліскавіца скінулі мяне з неба. Я падаў у ваду, у багну, на шырокае поле. Там і застаўся. Хавацца, уцякаць, цікаваць твае перуны. І цяжка было ад іх схавацца...

— Мы не заўсёды варагавалі, Анчутка...

— Спадзяюся, мы былі вартымі сябрамі.

— Самымі лепшымі...

Ізноў адкрываецца забытае... У ім я бачу цябе сумным, Грамаўнічны, разгубленым, якім, здаецца, ты не можаш быць ніколі. Ды ці Грамаўнічны ты? Дзе ж тваё міласэрнае яснае сонца? Не ведаю. А ты маўкліва сузіраеш бязмежную роўнядзь вады, дзе няма нікога. Дзе няма нічога. Моцна прагнеш, каб нарадзілася зямля. Ласкава просіш мяне памагчы...

Я чорны. Я прыгожы. Плаваю па вадзе, і мне досыць таго. Любуюся сабою ў іскрыстым люстэрку. Анічога мне болей не трэба. Але ты кажаш, што зямля жаданая табе. Што не зможаш іначай...

— Нырні. Дастань з прадоння цвердзі...

Я рады табе дапамагчы. Ты добры, ты шчыры. І няхай навокал толькі вада. Няхай з вадою зліваецца свет. Ускіпайце, хвалі, трымціце ў нямым здзіўленні. Я прайду праз вас. Дзе б яна ні была далёка, але дападу да глеістай цемры. Мне патрэб-

ная зямля... Бязмежныя воды ціснуць крылы. Чым далей ад роўнядзі, тым радзей тахкае сэрца. Я не спынюся. Я трывушчы. Я ўпарты. Ты чакаеш цвердзі з прадоння. Здабуду яе!

І гавораць мне глыбокія воды:

— Дарма стараешся. Ён не падаруе табе...

Я не ведаю, што гэта такое. Я стараюся, я плыву. Кранаюся нябачанага раней нечага. Вадкага, але і цвёрдага. Дзіўнага, незвычайнага. Вялікі цуд... Ухаплю як болей у дзюбу. І гаворыць мне шэрая зямля:

— Дарма стараешся. Ён не прабачыць цябе...

Я не ведаю, што гэта такое. Я стараюся. Я плыву. Падымаюся з глыбокіх тоняў. Задыхаюся. І ціха сустракае маё вяртанне свет.

— Прынёс? Дастаў? — пытаешся нецярпліва.

— Там... цяжка. Трывожна, — я хачу табе сказаць самае галоўнае.

— Як прынёс, то аддавай хутчэй, — ты не чуеш мяне.

— Трымай...

Адно не ўсё табе аддаю, трохі і сабе хаваю. Не ведаю, навошта так зрабіў. З'явілася на цябе нейкая незразумелая крыўда. Але зусім не падаю выгляду. Проста ўсміхаюся. Такі вось я, такі... Хутка вучуся ўсяму новаму.

Чарадзееш, мой сябра, нешта дзіўнае-прыгожае, а мне хочацца заплакаць. І я ж хачу ствараць. Вунь стаміўся, спыніўся, прыснуў. Я пакуль пагуляю, пахаджу па роўна-раўнюткай зямлі. Чысценькай, гладзенькай. Чынна, міла, сумна. І не магу не зрабіць чаго-небудзь... Хачу незвычайнага. Каб весялей усім было...

Плюнуў раз-другі. Колькі ж можна хаваць тую цвердзь? Нешта павінна ўчыніцца... Адкрылася цёмнае, таемнае, выпрабавальнае. Паміж зямлёю і вадою. Паміж вадою і зямлёю. Дрыгвяністае, купчастае. Зманлівае, хітрае. Упартае-ўпартае. Амаль такое ж, як і я...

— Зусім такое ж, як і ты, — а я і не заўважыў, як ты прачнуўся. Што ж, тым лепей. Будзе чым цябе здзівіць.

Але ты ніколькі не здзіўлены. Пакрыўджаны. Злосны.

— Навошта радуешся цёмнай твані? — пытаешся ў мяне. І чую ў тваім голасе: “Навошта апаганіў маю прыгожую зямлю?”

Што ж, я адкажу. Якраз заўважыў на зямлі кволае, цікаўнае да ўсяго новага стварэнне. Ты мог бы ганарыцца ім. Ідзе сабе, марыць, цешыцца, шукае. Амаль як і я. Адно яшчэ не спазнаў, дзе шукаць лепей.

— Паглядзі на гэтага кволага, сябра, добра паглядзі. Нечакана паторкнецца ў маю твань, так і мяне ўспомніць. А выберацца — табе пашану аддасць... Дык нам абодвум весела.

Я заўсёды лёгка жартаваў-кпіў, смяшыў цябе. Толькі цяпер ты нават не ўсміхнуўся. Такі абураны, такі страшны.

— Навошта гэтак учыніў?! — не пытаешся, а гневаешся.

Ды таму, што і я хацеў ствараць. Мабыць, таксама нешта магу...

— А ты хто такі, каб ствараць? Ты, Анчутка!

Анчутка. Твая першая цацка. Ёй прызначана сябраваць, дапамагаць...

— Я той, без каго б ты ўсяго гэтага не зрабіў.

Хоць, прызнаю, ты зчарадзеіў годна, ладна.

— Ідзі прэч! Руш у сваё балота! Брыдкае, злое! І не паказвайся на вочы болей.

— Маё балота не брыдкае, не злое.

— Брыдкае, злое, паганае. Як і ты сам!

— Дык чаго ж ты са мной сябраваў?

— А хто з табой сябраваў?

Ніхто... Я так і ведаў. Прадбачыў гэта. І хачу думаць, што мне ж не крыўдна, не горка... Хачу спадзявацца, што ты мой сябра. І разумею: у мяне болей яго няма. Ёсць гнеўны, грымотны. Гра-

маўнічны. Адкуль жа, адкуль у цябе ўзяліся бліскуча-жоўтыя, што і глядзець на іх прыкра, знішчальныя стрэлы-перуны?

Падаюць яны. Абдымае мяне балота. Знікаюць успаміны, і я не ведаю гэтага...

Падаюць перуны. Ветліва, разважліва, зацята мовіць мне Грамаўнічны:

— Ізноў прывітанне табе, Анчутка! Ты застаўся такім жа ўпартым. Усё хутчэй праходзіш кола, грозіш мне, выпрабоўваеш свет. Ідзі ў яго цёмным, балотным, без памяці... Пакідай усё здраджаным цудам, праданым братам, забытым каханым. Зноў будзь нічым...

Бліснулі. Грымнулі. Упалі перуны. Мне лёгка іх трымаць. Я ж цуд. Ясны, агністы. Удаўся кветкай, нікім не бачанай, не разгаданай. Я хаваюся ад свету. Я хаваюся ад людзей. Я хаваюся ад самога сябе, і гэта самае трывожнае! Самотнае, але і страшнае... Бо ён мяне спрабуе на злом. Я спрабую сябе на злом. Не магу супакоіцца. Не магу перамагчы.

Аднойчы на бясконца доўгі сонцаварот пяе ды гуляе мая сіла. Тады я пешчу надзею, кволую, як прывід, чаканую, нібы сонца. І кожны раз ідзе да мяне той, хто кпіць, здзекуецца, пагарджае. І адбірае ў мяне самае лепшае. Я нічога не магу зрабіць, бо адчуваю сваю правіну. Што ж учыніць, калі сам вінаваты?

Здзіўляю яго, застаю знянацку, трымаюся, трываю ліхое... І адчуваю, як абуджаюся. Ціха, пакутліва. І гэтак марудна, што губляю веру вырвацца з навечна зачараванага кола. Мне дапамагае брат. Мяне кліча каханая. І перуны, цёмныя перуны зноў чакаюць мяне.

Як жа моцна прагну іх пазбыцца... Але, мабыць, яны патрэбныя. Каб годна перамагчы Грамаўнічнага, каб стаць самім сабой. Тым, хто адмовіцца ад усіх цудаў, прызнаўшы адно праўду. І пойдзе па свеце новымі шляхамі. Чуеш?

— Прывітанне табе, Анчутка!

Я ведаю тваё таемнае імя, таму што ты — гэта ж я сам...

# ЗЮЗІЧ

## *Міфалагічна-легендавае*

— Як замятуць завеі белы свет, скуюць маразы імклівыя рэкі, запалоняць іскрыстыя снежкі людскія вочы, тады з'яўляецца на шляхах-вандроўках адзін. Нехта. Падобны і да цябе, і да мяне. Нямоцна сур'ёзны. Няшмат і вясёлы. Просты, сціплы. Уважлівы, відушчы. Ходзіць побач, няўбачаны, незаўважаны. Але сам усё ўгледзіць. Усіх пабачыць.

У яго прыгожая ўсмешка. Шчырыя глыбокія вочы. Ён зычліва, спагадліва прывячае людзей. Шукае сабе сяброў. Але глянь яму ў твар адкрыта — і пабачыш вечнае мроіва бясконцых снягоў. Бель завірух, холад доўгай ночы. Ды хутка пасля таго, як зімовыя маразы схопяць тваё дыханне. Глядзіш — і баішся зварухнуцца. Глядзіш. Маўчыш... І так сябры верныя застаюцца з ім назаўсёды. Баяцца пайсці, баяцца пакінуць.

Хто гэта? Зюзіч. Сын траскучага марозу, унук сівой зімы. Ідзе па белым свеце, з'яўляецца сярод людзей. Хаваецца лёгка, увішна. Ці не надта і хаваецца... Вядзе за сабою пранізлівыя вятры-віхуры, называючы іх роднымі братамі. Падказвае мяцеліцам, калі ім лепей усхадзіцца. Не рыпіць у яго пад нагамі снег, не чапае сваім сцюдзёным дыханнем. І толькі табе ды мне, толькі людзям ён страшны. І тым, хто ў прыгожых палацах, і тым, хто ў малых нізкіх хацінах.

Чым жа? Чым? Непрадказальнасцю. Будзе побач з табою доўга, а ты не здагадаешся пра гэта. Будзе шукаць тваю слабіну. А як знойдзе? Хто ж ведае... Ніхто пра такое нам з табою не раскажа.

— А калі раптам узяў ды знайшоўся такі, хто б пра Зюзіча нямала парасказаў? Што ж схацелі б дазнацца? Можа, чаму такі халодны, марозлівы? А можа, як зіму стылую, людзям страшную, перачакаць?

— Ды хіба ж нехта пра такое раскажа?! А ён, Зюзіч, будзе марозіць, кпіць-халадзіць, пакуль з нас усіх не выцягне дух. Што ўсміхаешся загадкава-летуценна?.. Не верыш мне, старому?

— Не верыць такой згоднай ды ладнай паказцы нам, маладым, няможна. Ды толькі з чаго ж стаўся марозаў сын такім нядобрым? Доўга ж быў сярод людзей. Мог навучыцца ў іх спагадаць...

— Ён не здолее таго. Мае халодны кавалак лёду замест сэрца. І, мабыць, калі ўчыніць нешта добрае, растане-згарыць марозлівае сэрца. Ад цеплыні чалавечай удзячнасці.

— Хіба ж можа быць такое?.. А калі людзі акажуцца няўдзячнымі?

— Дзівіся. Няўцямна ты слухаў. Не толькі варагуе марозаў сын з цяплом ды сонейкам. Не церпіць усіх шчырых...

— А як мала знаходзіць шчырых?

— Ды што я табе кажу... Не верыш, не зважаеш. Глядзі, сустрэнецца табе далёка ад дому, дык і ніколі ты не вернешся... Гуляе ў сэрцах яго сяброў халодны пранізлівы вецер. Зюзічам пакліканы, Зюзічам насланы. Іх даўно ўжо не чакаюць. Дык праўду табе кажу: асцерагайся марозава сына. Лепей было б аніколі не сыходзіцца з ім...

— Чаму ж думаеш, што некалі сыдуся?

— Уважлівы... Ды таму, што ты дасціпны, кемлівы. І ўсё нечага шукаеш. Вось і цяпер, бачу, на месцы табе ўжо не сядзіцца. Спяшаешся... Куды?

— Пайду. Скароціць мой шлях твая паказка.

— Не ідзі! Сам жа гэты прытулак знайшоў. Чым тут дрэнна?

І доўга не зводзіць вачэй з мяне, мабыць, што і дасціпнага, быць можа, што і кемлівага. Болей не пытаюся, не спрачаюся. Як можна... З такой праніклівай верай. Бачу, як віхурацца белыя чмялі за нізкім акном. Пякуча-халодныя. Сцюдзёныя. Іскрыстыя, прыгожыя. Колькі буду на іх глядзець, столькі буду з іх дзівіцца.

— Глядзі ты, як моцна ўсхадзіўся вецер, — для нечага гаворыць мне той, хто толькі што праніклівa распавёў паказку.

— Але нядоўга яму злавацца, — мне ўжо прыкра заставацца сярод выпадковых спадарожнікаў.

— Адкуль ты ведаеш гэта?

— Проста ведаю.

— Проста?

Не адказваю. Навошта? Яны мяне не зразумеюць. Стары з лірай. Пры ім хлопчык-падлетак. Жвавы, рухавы, на месцы яму не сядзіцца. І на мяне, незнаёмага, чужога, пазірае з цікаўнасцю. Мабыць, унук таго лірніка-казачніка. Яшчэ адзін сівавусы. Але досыць мажны і, напэўна, дужы. На гэтакіх нас, дакучлівых размоўцаў, не зважаў ні кроплі. Як схаваўся пры цёмнай покуці ды — шах-шах-шах — войстрыць меч. Відаць, майстар-збройнік. А меч у яго гартаваны, сапраўдны. Такіх шмат пабачыў, добра ведаю.

Мы з лірнікам перастрэліся яшчэ ў дарозе ды пад вечар дабрылі сюды, у лясную зацішную хацінку, дзе быў збройнік ды сам гаспадар. Гэты трохі ліслівы, трохі сквапны. Адразу не спадабаўся. Параскідаў нечага на падваконнях недароблены гліняны посуд. З уцекачоў, якім ёсць што хаваць. Але сёння зусім не ахвочы я да чужых таямніц. У няблізкай дарозе прытаміўся. Ды трэба ж, зноў яна мяне кліча. Пайду ўжо, пайду.

— А пойдзеш ужо? — недарэчна перапытвае гаспадар, як сам не верыць, што я адважыўся выйсці з цёплага жытла ў такую замець.

Ён не зразумее, што вабная мне зімовая ноч. Яна чыстая, халодная. Сцюдзёніць ад прыкрых думак, дарэмных перажыванняў. Вось выйду зараз ды забуду пра марную цікаўнасць гэтага ліслівага. І што ён у мяне так утаропіўся? Не буду глядзець на зняважлівую ўсмешку збройніка. Што ж, я не толькі яму здаваўся занадта летуценным. Не зводзіць з мяне вачэй і мой знаёмы лірнік, як не давярае, як выпрабоўвае. Запомніў, што не надта ж пагадзіўся з яго показкай. І толькі хлопчык адчуў нейкую незразумелую трывогу, стаіўся, заціх. Пільна сочыць за мной спуджаным зайчыкам.

Дзякую гаспадару за кароткі прытулак. Кратаю дзверы. Зачыненыя. І вострa адчуваю сябе лішнім тут, сярод людзей, якія стаміліся ў сваіх вандраваннях. Хочуць адно сагрэцца, адпачыць. Нямала злуюцца, што доўгая дарога ніяк не скончыцца. І гатовыя пасварыцца з кожным, хто сваёй дарозе радуецца.

— Адчыні дзверы, — гэта я гаспадару.

Ніжэй угінае спіну ды ніяк не азываецца. Хацеў бы ад мяне схавацца ў пуставатай хаце, але не можа. Не хочучы болей са мною знацца, зацята маўчаць іншыя. Нібыта не чуюць і не бачаць анікога, апроч саміх сябе.

Не глядзіць на мяне лірнік, паклаўшы перад сабой худыя рукі. Сумны, як і тады, на заснежанай дарозе, калі я пабачыў шчырага чалавека. “Куды ідзеш?” — пачуў ад яго. “Далёка”, — быў мой адказ, бо не люблю выпадковых сустрэчных. “І я няблізка. Падкажы шлях, заблукаў у глыбокіх снягах”. Адкрытае сэрца... “Што ж, гэта я магу. Ідзі за мною”. Ідзі са мною... Хутка апасля нам сустрэлася гэтая лясная хатка.

Варожа зіркае збройнік. Не чакае ад мяне нічога добрага. Відаць, гатовы схапіцца за тое, што робіць-шануе. Бо я хто яму? Чужы, небяспечны. А з такімі ніяк іначай...

І толькі спалоханы хлопчык мне спагадае. Ён не гатовы для таго, каб тыя, цікавыя, прыязныя, хто выпадкам побач з ім, але ўжо спадабаліся, сталі як свае, раптам учынілі нешта нелітасцівае. Не хоча быць разам з гэтым. І таму глядзіць на мяне з надзеяй: ну зрабі ты ці скажы нешта, каб стала, як раней, ціха, утульна. Добра. Ён не можа паверыць, што я магу стацца нядобрым...

— Выходзіш за парог ці як? — павышае голас збройнік. Але сам цвёрды, стрыманы, спакойны.

А чаго ж яму хваляваца? Куды я ад яго падзенуся?

Нікуды. Адкажу, што хачу пайсці, дык не здолею зрабіці таго. А падману, што буду заставацца, то ён жа гэтага мне і не дазволіць. Не падмануць — застацца. Хоць і падмануць — таксама... Трэба ж, які чуйны да чужых слоў.

— Чаго маўчыш, завейны, марозны?

— Чакаю, пакуль ты ўхопіш зброю.

— А трэба?

— Ты па-іншаму не зможаш.

— Не змагу. Як і ты не пакінеш халадзіць-студзіць белы свет. Вось і звяду ягоную крыўду.

— А ці здолееш?

— Лёгка. Ты не вой. Ты дарма выйшаў са сваіх снягоў, якія даюць табе сілу. Тут жа ты будзеш нічым...

— Праўда?

Усміхаюся кпліваму, калючаму. Не вой. Не ліў гарачай крыві на снег. Не ведаў смеласці. Змагання са смелымі. Адчайнымі. Жорсткімі. Якія яны? Чаго ж чакаць? Як прадбачыць? Зразумей і будзь наперадзе. І ты ўпэўнены, што я на гэтае няздольны.

Віхуры. Паходні. Паходы... Я так стаміўся гэтаму вучыцца. Белай радасцю агартаюць снягі. Яны чыстыя. Я проста хацеў бы праз іх ісці. Не спыняцца.

— Што? Заледзяніш маю зброю? Чакаю, чакаю, пакуль заінее...

— Ён не можа таго, — гэта ліслівы. — Не можа цяпер паклікаць ані вятроў, ані снягоў. Не здолее замарозіць! Не патрапіць выхаладзіць! Чуеш? Ты не пакрыўдзіш нас!

Крычыць. Злуецца. Заходзіцца. Апусціў вочы долу зніякавелы лірнік. Здзіўлена ўтаропіўся ў мяне яго хлопчык. Думае, як гэта я магу замарозіць, схаладзіць. Заініць...

— Не магу паклікаць сцюжу. Не магу загадаць вятрам. Я такі ж самы чалавек, як і вы ўсе.

— Бач ты яго, як загаварыў! — не сунімаецца ліслівы.

І зноў папракае. Лае і зіму, і мароз. І мяне, іх кроўнага сваяка. Праклінае-пагарджае...

— Аціхні! — мне надакучыла такая гаворка.

Змоўк. Імгненна, як пракаўтнуўшы злыя словы. Як папаўзлі чорныя гадзюкі страху-спуду. А лірнік не змаўчаў:

— Чаму ж ты хацеў пайсці ў завею? Холадна там…

— А тут цёпла. Зычліва, спагадна. Так назаўжды і застаўся б…

— Застанься! Будзь з намі. Я не веру, не веру, што ты злы! — у нязгоднай цішы звініць ясны голас.

Добры хлопчык. Не зважае на дакоры. Не просіць. Не баіцца. Заўсёды сябраваў з такімі.

— Ты — Зюзіч, — пераканана ўздыхае лірнік. — Я проста ведаю гэта, як свае струны…

— Спазнае лірнік струны душы. Сузіраеш іх?

— А як жа! Не так сабе глядзеў табе ў вочы.

— І што ўбачыў там?

— А вось што… — лірнік пацягнуў струны. Нешта хацеў сказаць, ды змаўчаў.

Замест яго збройнік мовіў усім рашуча, зацята, але звяртаўся толькі да мяне:

— Ты з'явіўся на свет даўно-даўно. Чакаў вайны, замаўляў зброю. Прыходзіў туды, дзе агнём успыхвала варажнеча. Глядзеў, як змагаюцца-б'юцца. І забіраў вартых. Рабіў іх сваімі сябрамі. Што ўсміхаешся? Скажаш, як жа мог такое рабіць? Ты марозаў сын. Насылаеш чары і страху, і смеласці.

— Няма на свеце такіх чараў. Ёсць толькі чалавечая няўрымслівасць, гатовая да подзвігу, гатовая да здрады. Ты мог бы ў гэтым не сумнявацца… Памятаеш адну далёкую ноч?

— А што ты можаш пра яе ведаць?

— Тое ж, што і ўсе. Смелыя юнакі вясёлым гуртам пайшлі па скарб. Ноч выдалася пагодная ды ацішная, таму хлопцам здавалася, што ўсё ў іх атрымаецца… Гаманілі-смяяліся ды таемнай сцежкай з'явіліся да парослага травою кургана. Без аніякай азнакі… Спахапіліся, пачалі капаць. Найшлі хмары, ляснуў пярун, паўстаў волат у жалезным панцыры.

— Досыць!

— Я і не настойваю. Ты хочаш спытаць, чаму ж столькі гадоў не знаходзіў цябе марозаў сын? Быў жа ты і смелым, і

рашучым, а ён жа шукае і адчайных, і вартых. Ты ж заўсёды ў бойцы-варажнечы ды кожны раз са слаўнай перамогай! Усялякай вартасці пазбылася ўласнае жыццё. Дык што ж можна казаць пра іншыя? Пра тыя, якія на вастрыі мяча...

— Боль... Забяры яго, прашу. Кожны раз як паміраю сам. Спадзяваўся, што прыйдзе вой, лепшы за мяне. А такі ўсё не прыходзіць... Але я адшукаў цябе. Сёння, Зюзіч, ты не зможаш мяне пакінуць. Я сапраўды схаплюся за зброю. Так доўга гэтага чакаў...

— Я не Зюзіч! Казаў жа...

— Скажы, што не ведаеш пра тую страшную ноч... Усяго. Скажы, і тады я паверу, што ты не Зюзіч!

— Гнаўся за вамі волат з узнятым мячом! За знявагу, за няпамяць! Гнаўся, гразіўся забіць. Змаглі падняцца па-над сваім спалохам твае сябры. Спыніліся, прычакалі. І даравау ім герой за іх смеласць... Толькі ты адзін не спыніўся. Бег, падаў, зноў бег. Да знямогі. Да слёз. І цябе аднаго волат не прабачыў. Ударыў моцна мячом. Маўляў, як не маеш ты сваёй смеласці, вазьмі хоць маю. Падзялюся, не шкада.

— Усё маё жыццё, такое доўгае, гэта не я. Ён! Вызвалі мяне ад яго, чуеш! Я не хачу болей быць такім! Я не змагу болей быць такім!

— Нават не спадзявайся. І не прасі, — я рашучы ў сваіх абяцаннях. — І не дзівіся: пра тую ноч ведаюць усе... Ты сам адкрыўся.

— Цябе нішто не выяўляе так, як жорсткасць, — нагадвае пра сябе лірнік. — Ты Зюзіч. Канешне ж, ты...

— А ты на што так упарта спадзяешся? — вяртаю зацікаўлены позірк.

— На гуслі-самагуды, — адразу ж падае голас яго маленькі спадарожнік. — Што сустрэнеш, назавеш вартым і падорыш тыя чарадзейныя гуслі. Ты ж добры з сябрамі. Шчыры. Шчодры.

— Гуслі-самагуды. Дзе ж яны ёсць? — мне становіцца трошкі смешна, трошкі сумна.

— У сівой зімы, — зацята глядзіць на мяне стары лірнік. — Хаваюць іх за трыма маразамі-замкамі.

— Ды хто ж хавае?

— А ты і хаваеш! Сабраныя ў тых гуслях вясёлыя перазовы ды сумы-галашэнні, якія не спыняюцца, ніколі не спыняцца ў свеце. Кожны голас, што азавецца бязмежнай радасцю або нясцерпным горам па-над заснежанымі абшарамі, да іх трапляе. З імі застаецца... А маразы-халады тыя гуслі трымаюць. Каб не запаланіць свет радасцю, каб не засмуціць яго горам...

— Навошта ж табе такія гуслі? Ведаеш, не простыя яны...

— Не клапаціся, Зюзіч. Зайграю на струнах радасці, не крану струн гора. Будуць радавацца людзі і я разам з імі...

— А што ж з табой такое здарылася, як гэтак аб радасці просіш?

— Нічога...

— Зусім? Як сабе хочаш. Мабыць, спытаю ў твайго сябра. Таго, юнацкага. Ён добра пылаў, пакуль ты цміў. Хадзілі вы па свеце, весялілі людзей. Клікалі да святла. Ігралі разам, толькі яго аднаго чулі. Ад яго песень сэрцы мацней біліся, на твае ледзьве азываліся...

— Як жа ты спытаеш? Няма яго даўно...

— Яго няма... А песні, ім складзеныя, засталіся. Давай у іх спытаем. Ад чаго сэрца чалавечае, чарамі азначанае, так рана згарэла? Ад чаго ён пайшоў, а ты застаўся? Ад чаго ты і цяпер не можаш супакоіцца? Шукаеш, як жа перавысіць... І не знаходзіш!

— Пашкадуй, Зюзіч...

— Шкадую. Шкадую, як не маю такіх чарадзейных гусляў. І не называй мяне болей Зюзічам!

Расчаравана ўздыхае лірнік. Ды хутка падае голас гаспадар хаткі:

— А як цябе называць?

І зноў усе чакальна пазіраюць на мяне.

— Ты не хочаш быць тым, кім мы цябе бачым. А кім жа ты хочаш быць? Падкажы нам, назавём цябе так, як сам скажаш...

— Я ніхто для вас і буду нікім! Не змагу падараваць спраўджанне чароўных мар. І чаму вы думаеце, як нешта вам павінен? Вы ж не церпіце зімовы холад. Ненавідзіце Зюзіча.

— Ты халадзіў! Ты караў! — зноўку ўсчынае ліслівы. — А цяпер ты павінен нам дапамагчы. Сам жа казаў, што навучыўся ў людзей спагадаць. Як вясновае сонца...

— І якой жа дапамогі ты чакаеш?

Варушыць у адказ недаробленыя гліняныя рэчы. Посуд тут розны, але болей — маленькія злепкі людзей ды жывёл. Скамечаных, як знявечаных. Застылых у навечнай пакуце.

— Паглядзі, ты, які не хоча называцца Зюзічам. Я так хачу, каб усе гэтыя і звяры, і людзі сталі прыгожымі, задаволенымі, спакойнымі... Але не магу. Маразы казку чарадзейную на вокнах малююць, уборам дзівосным зямлю ахінаюць. У тваёй крыві вялікае майстэрства. Падаруй мне яго!

І далей толькі напружаная ціш агартае маленькую хатку. Маўчу ж у адказ. Думаю, што ўсё болей стамляюся ад вечных просьбаў братоў па нядолі. Мабыць, што і маіх. Іх чаканняў дармавога шчасця. У мяне ж яго няма.

— Не магу падараваць таго, што мне зусім не належыць!

Вось і кароткі прысуд таму, хто не ўмее нават зляпіць гліннай цацкі. Урэшце выйду ў завейную бель. Каб ахаладзіцца, супакоіцца, адпачыць. Люблю маразы, яны знішчаюць дарэшты прагу-спакусу. Люблю адну аснежаную далеч...

— Не хадзі!

І гучыць у звонкім голасе непадробная трывога. Не за каго іншага, за мяне. І ты кажаш, бачачы, што я не разумею:

— Яны дацікуюць цябе. Дацікуюць і заб'юць. За тое, што ты — гэта не ты. За тое, што не выканаў іх жаданняў. Не хадзі.

Што ж, быць і мне з табою шчырым, спагадлівы хлопчык:

— Не пакіну цябе. Падкажу шлях у завейнай ночы. Дапамагу адшукаці скарб. Падарую і талент, і сілу. Толькі стань маім сябрам. То як?

Аніяк. Крывёй гневу наліваецца твар збройніка. Вечным праклёнам азываецца голас лірніка. Глыбокая крыўда ў прыгорбленай постаці няўдалага ганчара. Маўчанне ў вачах хлопчыка. І жаданне пайсці са мною, і боязь гэтых трох. Што ж, я пачакаю. Буду верыць, як верыў заўсёды. У чысты снег сцюдзёнай зімовай раніцай. І я не развітваюся з табою...

— Стой! — нарэшце бразгае меч.

Але я не спыняюся. Што мне твае пагрозы. Усхопішся ды кінешся біцца? Зноў не — так я і думаў. Не прывячаю цябе, не прывячаў. Глядзіш на лірніка, як просіш у яго дапамогі. Дарма... Не знойдзе моцнага слова слаўны наш музыка. Сам б'ецца ў роспачы, шкадуе пра даўно пройдзеныя шляхі. Чаго пра іх плакаць... Не ігралі, не зайграюць самі гуслі-самагуды. Нічога не скажаш і ты, няспраўджаны майстар глінянай цацкі. Быў цацкай і застанешся ёю. Нават не плачаш, не жалішся. Цацкі не плачуць. Маўкліва ляжаць, закінутыя нечай рукою ў куток. Не маёй, павер. Хоць і мне цікава: ці можна табе зрабіць настолькі балюча, каб ты стаў бараніцца? Не ведаю.

Не ўведаў, як выйсці з гэтай хаты. Дыхнуць свежым марозным паветрам, прагнаць дарэшты стому. Я так гэтага хачу. Мне стаў невыносны людскі дух. Прыкры, сляпучы. Мне горача тут. Мне горка. Не ведаю, ці павінна так быць. У мяне ж халоднае сэрца. Мне патрэбны мароз. Усіх замаражу!

— Глядзі-ткі! Усё ж у яго нічога няма. Такі ж, як і мы! — сумна ўздыхае лірнік.

— Дык навошта ён... — пазірае збройнік.

І трэці адказвае згодным маўчаннем. Раз такі непатрэбны, то навошта ён зусім? Быццам чую, як мацней ды мацней снуюць такія думкі... А яшчэ... ўстаньма разам. Як не Зюзіч, то што ён нам зробіць? Не зрабіў жа дагэтуль нічога.

Горача. Млосна. А я нічога не магу зрабіць. У людской жа хаце... Паціху сунуцца да мяне расчараваныя-пакрыўджаныя. Пакуль што самі баяцца. Пакуль... Рашаюцца астатні раз, пакутліва, доўга. Так доўга... Чыстым струменем марознага паветра бяжыць да мяне хлопчык. Не забаяўся, не сцярпеў.

— Уцякай!

— Навошта?

І ты бачыш у маіх вачах сінія замерзлыя зоркі, якія снежкамі падаюць долу. Праўдзівыя, смелыя. Не знікаюць, удаюцца ў людскіх абліччах, жывуць сярод людзей. Яны не просяць, не баяцца. І ты навучышся не баяцца... У мяне.

Глядзі, як падаюць раней моцна зачыненыя дзверы. Гэта зімовыя віхуры сарвалі іх, грукнулі аб падлогу, пазначыўшы выхад. І мне, і табе. Пойдзем са мною, не будзем акідваць развітальным позіркам усіх тых, хто застаецца. Назаўжды застанецца ў цёмнай нізкай хаце. Будзе дыхаць, хадзіць, але не жыць. Мароз студзіць кроў. Прымушае спяшацца, шукаць. Ісці...

— Пойдзем разам? — пытаюся ў цябе.

— А далёка? — у тваіх вачах загараецца цікавасць.

— Далёка і высока...

І нясуць мяне завеі далёка-высока. Пакідаюць цябе аднаго. Але ты не губляешся ў мяцелістых гадах, праходзіш праз ростані шляхоў, пэўна знайшоўшы свой. І робіш спраўна ўсё, што толькі пажадаеш. А я сачу за табою, азываюся ў зімовых прымройлівых начах траскучым марозам. Ты клічаш мяне, чакаеш, шукаеш са мною сустрэчы. І ты ідзеш. Не да мяне — да сваёй мары. Такі цяжкі пухлаты снег. Засціць вочы сляпучая бель, але я ведаю, што ты дойдзеш. Прычакаю цябе. Памятаю сваё абяцанне. Ніколі не пакідаў сваіх сяброў... Адзінае, што так і не ўсіх дачакаўся.

А пакуль... Замятаюць завеі белы свет. Ужо спавілі маразы-снягі імклівыя рэкі. А я запарушыў сняжком людскія вочы. Можа, пабачу ў іх волю, упартасць, сілу... Буду рады чуйнасці, весялосці, спагадзе. Не прайду паўз вартае ды прыгожае. Я ж

шукаў, шукаю сабе сяброў. Халодна-марозлівы, хачу, каб не зусім зледзянела маё сэрца. Я — Зюзіч. Сын траскучага марозу, унук сівой зімы. І я знікаю з белага свету кожную вясну. З кожнымі новымі снягамі нараджаюся.

...Людна ды тлумна ў вялікай карчме. Гаманліва:

— А ведаеш, такі можа прыдарыцца ўсюды... Ты нават не здагадаешся, што гэта ён!

— Ды хіба ж можна не пазнаць самыя сцюдзёныя вочы?!

— Твая праўда...

— Ды не! Вочы самыя звычайныя. Толькі вельмі прыгожыя. Яго ж маці была самой вясною...

— А ты бачыў? Адкуль табе ведаць?!

— Ды кажуць гэтак. Я проста ўспомніў.

— З ім нічога не будзе проста! — павышае голас завадатар.

І, спахапіўшыся, аглядаецца. Дарэмная перасцярога. Ніхто не зважае, як у самым цёмным кутку атабарыўся невялікі гурт дрэнна апранутых людзей. Нікога не хвалююць іхнія размовы. І той, на якога астатнія глядзяць з павагай, кажа далей, хоць і прыцішыўшы голас:

— Калі хочам знайсці дыяментавыя скарбы, што ў ільдзістых сутарэннях хавае сівая зіма, мы павінны быць самымі абачлівымі.

Слухаю. Падыходжу. Змаўкае гамонка.

Простыя словы, з якіх заўсёды пачынаю:

— Вазьміце і мяне ў справу.

Прыкрыя, хцівыя ўсмешкі. Так усміхаюцца тыя, якія шукаюць моманту скарыстаць...

— Якую справу? — гаворыць само здзіўленне.

— Ды мне ўсё роўна, — кажу з гатоўнасцю. — Бачу, што хвацкая, а вы — зухі.

З недаверам глядзяць хаўруснікі, хаваюць свае думкі. Адно завадатар рашаецца нядоўга:

— Добра было б займець новага сябра...

— Можа быць, стану вашым сябрам. Заўсёды шукаў сяброўства...

# ЗАЛАТЫЯ ЯБЛЫЧКІ

*Міфалагічнае*

— На высокай на залатой горцы расце дзівосная залатая яблынька. Не падабрацца да яе блізка... Паўстане Дунай глыбокі, вадою неагляднай разальецца, але цябе не пусціць. Не пераплысці яго, не перайсці. А далей лес цёмны, як тын высокі, злосна выскаляецца. Пракляты, страшны... Ды толькі і гэта яшчэ не ўсё. Скруціўся ў яблыньчыных каранях, нібы кот, вуркоча, вачыма цепае, змей падманлівы. Нікому не дазволіць крануцца маладзільнага яблычка. Ані знесці, ані скрасці. Не прабачае, карае. І скажа кожнаму, што зямля яблыкамі пахне... Яблыкамі пахне зямля.

— З чаго б яму так казаць? — нецярпліва азываецца адзін малады, чуйны. Як быццам не пытаецца ў сталага пасівелага вандроўніка, як быццам сам разважае. — Тут, мабыць, нешта не тое...

І неадабральна глядзяць на яго ўсе цікаўныя, якія сабраліся паслухаць пра дзівы дзіўныя. Маўляў, памаўчы ты, самы разумны.

— Не тое, саколе мой ясны, не тое, — гучыць паспешлівая згода. — Ды ці мала што можна наплесці? Болей зважай на маю гамонку...

— А я не надта і зважаю! — як прымае выклік самы дасціпны. — Толькі скажы, вандроўнік... У словах тваіх як быццам паўстае сам герой, які зрабіў усё немажлівае: пераплыў Дунай, прайшоў праз цёмны лес. Ці не ведаеш ты яго?

— Ён не герой. І я не ведаю яго. Не страчаў ніколі.

— Шкада... — расчаравана ўздыхае дапытлівы.

— І не кажы, ясны саколе! — мякка ўсміхаецца вандроўнік, але вядзе няспешную гамонку далей: — Быў адзін. Не герой,

не чараўнік. Не жадаў ані багацця, ані славы. Чаго ж пайшоў у далёкі няпросты шлях? Не спалохаўся, не спыніўся... Снілася яму дзяўчына прыгожая, прасіла дапамогі-вызвалення. Змеева паланянка.

Чарамі снуецца вандроўнікаў аповед, і як бачаць усе на свае вочы...

Мабыць, паланянка. Да яблынькі залатой моцнай замовай прывязаная. Толькі не скарылася злой няволі. Шукала збавенне і знайшла, сама чарадзействам не чужая, вадою-зямлёю благаславёная. Хто ж яна? Чаму змей цёмны гэтак яе вартуе? Не дазваляе нізка схіліцца да вады, каб сама не ўдалася крыніцай ды не збегла прэч з імклівымі хвалямі. Не дазваляе ўсміхнуцца вятрам, каб не ўхапілі, не знеслі. Не дазваляе скінуцца каляровай вясёлкаю. Як быццам і радасць простая забаронена. Толькі яблыкі залатыя ўсе ёй аддае. Весяліцьцешыць...

Не ўсцешна дзяўчыне. Думна-маркотна. Хочацца птушкай паляцець з высокай залатой горкі. Сны чарадзейныя снуе, у свет пасылае ды кліча, каб назад вярнуліся. Прывялі да яе героя. Які Дунай-раку пераплыве, лесу цёмнага не збаіцца ды змея адужае. Пераплыў. Не збаяўся. Мабыць, што і адужаў. Збег далёка з палонніцай. Не каханай і не сястрою...

— Толькі паўстаў зноўку змей. Не было яму смерці. Узняўся, як страшны праклён. Як страта, як гора...— не хавае смутку вандроўнік. — Нельга яго пазбыцца...

— Праклён? Гора? — зноў падае голас дапытлівы. — Хіба не скраў ён самае вялікае шчасце, якое толькі можа быць у свеце?.. Гэта ж яно дзяўчынай каля залатой яблынькі сядзела, чарамі вялікімі гуляла, спакою не хацела. Яго ж змей бярог-вартаваў. Дык чаго таму герою болей?

— А не бывае скрадзенага шчасця... — асцярожна азываецца нехта.

— Дык таму і не бывае, што скрадзена даўно! Зніклі яго сляды ў вялікім свеце... Нам усім — пакутаваць ды зняверыцца, але шчасцем не заўладаць. Вось што зрабіў той самы герой. Лепшы з лепшых...

— Ён не лепшы! — пераканана ўздыхае вандроўнік. — Ніколі не быў лепшым-абраным...

— А якім быў? — нясмела пазірае яшчэ адзін дапытлівы.

— А хто быў лепшым ды абраным? — ізноў нехта не змаўчаў.

— Ды што вы ўсё?! Як было далей, калі вярнуўся змей? Ад яго ж нельга збегчы.

Уважна сочыць за самым цікаўным вандроўнік ды мовіць нібы яму аднаму:

— Нельга... Далёка яны схаваліся, але дагнала іх пасланае змеем гора-ліха. Удалося яно беднасцю-нястачай ды пагрукала ў дзверы... А змей тае гадзіны прычакаў ды літасцівым-спагадлівым скінуўся...

— *Далёка лётаеш, ясны саколе, забіраеш тое, што не тваё. Ды ўцякаеш-хаваешся... Хіба ж так трэба чыніць герою? Смеламу. Сумленнаму. Толькі што ж старое памінаць... Ляжаць у пячорах маіх скарбы вялікія. Як лепшаму сябру табе дапамагу. Бяры золата-срэбра колькі схочаш.*

— *Нічога не рабіў, нічога не зробіш ты дарма... Чаго табе за гэта? Хочаш заўладаць маёй душою...*

— *Няшмат і папрашу. Навошта ж табе душа, як маеш залатое шчасцейка? Прыходзь да мяне ў госці.*

— *У пячоры цёмныя, глыбокія?*

— *Сюды. А дзе ж яшчэ багацці незлічоныя хаваюцца? Слова даю, што са свету цябе не зведу, без жыцця не пакіну...*

— І тады герой пайшоў да змея? Не збаяўся цёмных падземных лёхаў? — як усміхаецца вандроўніку самы цікаўны.

— Ты ж ведаеш. Не пайшоў, не...

— Адкуль? Уведаю толькі тое, што сам раскажаш.

— Раскажу, як было... Ляцеў змей пагоднай ноччу, нёс багацці вялікія. Каму? Не герою. Не сумленнаму. Не смеламу. Прынёс-прыляцеў...

*— Як не прыйшоў ты да мяне, то я прыйду да цябе... Мары твае таемныя спраўджу. Шчасцейка жаданае ўтрымаць дапамагу. Як скраў залатое, то чаго ж не беражэш? Для яго бяры грошы-скарбы вялікія, не бойся...*

*І спытаў у змея герой:*

*— Будзеш і далей за мной лётаць, спакою не даваць? Як ёсць усюды мой след знаходзіць? Спакушаць-усміхацца?..*

*І адказаў змей герою:*

*— Забраў ты ў мяне самае лепшае. Не забудуся пра цябе... Не пакіну. Знайду...*

— Не паспеў сказаць, для чаго... Ляснуў нябесны перуновы агонь — і спарахнеў змей. Не так сабе чакаў навальніцы, не так сабе выйшаў герой на высокі пагорак! — пераможна глядзіць на самага дапытлівага вандроўнік.

— Не спарахнеў. Стаў каменем ад зыркага агню, — пэўна адказвае дапытлівы-цікаўны. — А багацці, ворагам прынесеныя, герой сабе забраў!

І як быццам сумеўся гаваркі вандроўнік, як не знайшоў, што прамовіць... А вось цікаўны не змаўчаў:

— І была гэта не апошняя іх сустрэча. Адрадзілі чары камень. Паклікалі дзівосы лепшага. А мабыць, шчасцейка-дзяўчына застацца без яго на белым свеце не пажадала...

— Не пажадала, не змагла... — лёгка паўтарае вандроўнік, як нешта пакутліва зразумеўшы.

— За што ж яна гэтак з героем? — у здзіўленні прамаўляе хтосьці.

— Не з героем... Са змеем, — апярэджвае вандроўніка самы цікаўны. — Яму не падаравала ані кахання, ані волі. За чаканне няспраўджанае, за боль...

— За чаканне. За боль, — ціха прамаўляе вандроўнік ды вядзе гамонку далей. — Удаўся змей прыгожым малойцам ды з'явіўся да той дзяўчыны. Не пазнала яго...

— *Што сумуеш, яблынька мая ясная? Чым цябе ўсцешыць-развесяліць?*

— *Сумна-маркотна мне, і нічым ты не дапаможаш... А вось каб вясёлка радасная над маім домам кожны дзень з раніцы аж да ночы зіхцела-пералівалася, то і я б з таго павесялела.*

— *Будзе табе вясёлка...*

*Заіскрылася з раніцы аж да ночы кожны дзень пералівістая вясёлка, толькі не ўсміхнулася дзяўчына.*

— *Няхай кожнае ночачкі вятры прылятуць, мяне закалышуць, песні праспяваюць, няхай усяму свету славяць маю прыгажосць...*

*Прылятали-калыхалі, толькі не ўпадабала дзяўчына песні вятроў.*

— *Вольная воля табе, яблынька мая залатая. І чары найвялікшыя. І сэрца маё... Чаго ж табе не цешыцца?*

— *Не трэба мне ўсяго гэтага, — капрызліва адказала названая яблынькай. — І смяяцца-весяліцца я не буду! Я іншага чакала, не цябе.*

— *Як сабе хочаш... Не да твару весялосць — будзе табе смутак. Адно выканай маё жаданне.*

— І яна выканала змеева жаданне? — тояць дыханне ўсе цікаўныя.

— Адкуль жа мне ведаць? — прыжмурвае вандроўны, як сапраўдны кот, глыбокія мудрыя вочы. — Але ж нездарма кажуць, што змей той быў спакуснікам...

Глядзіць чакальна на самага цікаўнага, каб пачуць нецярплівае, нязгоднае слова. Але самы цікаўны-дасціпны маўчыць... Хутка мінаецца нязручная цішыня:

— А што з тою дзяўчынай было далей?

— А што ж магло, як не хацела быць абранніцай? — сумна ўздыхае вандроўнік. — Паляцела шэрай зязюлькай, куваешукае свайго сына.

— Змей чакаў-прычакаў ды знёс яе сына за горы высокія, за долы шырокія, за лясы глухія... Скраў героева сына, — не хаваюць праўды ўсе неабыякавыя. — Ведаем, чулі...

— Не героева, — глядзіць вандроўнік у вочы самаму-самаму. — Не чапаў той змей нічога чужога...

— Яблыкамі пахне зямля, — адказвае самы-самы. — Там, за гарамі высокімі, за доламі шырокімі, за лясамі глухімі яблыкамі пахне зямля. Трэба адолець, перамагчы, прайсці... Там маркотна, там цяжка.

— Адкуль жа ты ведаеш? Хіба гэта цябе змей скраў-знёс у цёмную няволю? — здзівіўся нехта.

— Гэта не мяне. Зусім не! — адказвае ўсім ды ўсміхаецца вандроўніку самы цікаўны.

— Вось каб даведацца, што там, на залатой горцы, за гарамі, за доламі, за лясамі... — мройна ўздыхаюць прагныя да нязведанага. — Вось каб паглядзець...

— А што там? — не маўчыць самы-самы. — Страты чалавечыя...

— А там прыкуты жалезнымі ланцугамі змей за справы свае цёмныя. Прыкуты да самай чорнай гары, — ціха азываецца вандроўнік. — Учынілася так, як астатні раз перастрэліся яны з героем. Змагаліся-біліся, ды перамог герой, як належыць герою... А зваяванага хітрага ворага пакараў! Ды абяцаў да скону помсціць яму ды ўсяму змеевому роду.

— Чаму ж не зніклі цуды-дзівы з усяго чыста свету?! — не пытаецца, разважае хтосьці. — Не мінуліся?..

— Чаму ж даўно-даўно ніхто на вочы не бачыў героя? — ізноў не маўчыць нейкі цікаўны. — Як быццам знік зусім, пайшоў і не вярнуўся...

— А ці знойдзе пуцявіну той, знесены за свет, далёка-далёка? Выпрабоўвае яго змей...

— Не выпрабоўвае — вучыць...

— Не вучыць — прыўлашчвае...

— Ды як жа ўсё тое, калі да цёмнай гары прыкуты?! Забірае ж яна змееву чарадзейную сілу...

— Точыць ён гару. Чакае таго, хто вызваліць. Ланцуг жалезны перасячэ. Мабыць, што і цябе чакае, — проста мовіць вандроўны, ухіліва паглядаючы на самага-самага. — Вярнуцца трэба, успомніць, што была некалі цёмная гара залатою. Адпусціць на волю прыкутага да вялікай гары.

— І расла на гары залатая яблынька, — усміхаецца самы-самы. — Ці не хопіць ужо? Супыніся.

— Чаго ты?! — пакрыўджана азіраюцца іншыя. — Цікавая дзіва-показка...

— Цікавая, — лёгка-хутка згаджаецца вандроўнік. — Яшчэ якая. Да таго ж пакуль не скончаная...

— Думаеш, змей вернецца-вырвецца? Прычакае свайго збаўцу? — гамоняць цікаўныя.

— Не думаю. Проста ведаю гэта, як сонца яснае ведае свет, — шчыра глядзіць вандроўнік.

— Навошта? — пытаецца самы-самы. — Змей усім адпомсціў, усіх пакараў.

— Ды не помсціў ён, не караў. Проста не дазволіў узяць чужы яблык. Скрасці маладзільны яблычак... — нехта расчаравана ўздыхнуў.

— А што гэта за яблычак маладзільны? Мабыць, чарадзейны? Мары-лятункі здзяйсняе?.. — мовяць між сабою цікаўныя.

— Мабыць, просты, непрыкметны, але той, хто ўтрымае яго ў руках, будзе заўсёды шчаслівым, — глядзіць вандроўнік на самага цікаўнага. — Ты ўважна мяне слухаў. Гэта хацеў уведаць? Не падасца залаты яблык залатым...

Пакутліва маўчыць самы цікаўны, але радасна абуджаюцца іншыя:

— Растуць яблыкі маладзільныя на залатой яблыньцы. Трэба адно знайсці-сарваць…

— Як прыйдуць у сэрца суладдзе і спакой, то здаецца, што яблынька каля маёй хаты ўся як аблітая. Так бы і глядзеў…

— А ці ёсць такая зусім? Ладная показка, адно ці праўда тое…

— А кажуць, — як рашаецца самы-самы на нешта важнае, — не змей прыкуты да цёмнай гары, а герой. Змей жа стаіўся сярод людзей, ходзіць-вандруе…

Ды не слухае яго ніхто. Рагочуць-цешацца з такой мудрасці.

— Ходзіць, свайго сына шукае, — смяецца вандроўнік разам з усімі. — А той нечага хаваецца, як быццам ад самога сябе можна схавацца. Нязгодны з бацькавай воляй, бо азываецца ў ім чалавечая слабасць. Але змей усё роўна ўчыніць, каб усё было правільна. Ды што пра гэта казаць. Бачыш, ніхто не верыць у змееву дабрыню…

І далей мовіць ціха, засяроджана:

— Вы не ўчуеце, як моцна пахне яблыкамі зямля. Цягне з іх сакавіты водар ды маладую сілу. Забірае так хутка, хоць амаль нябачна. А вы тым болей падаеце, множаце сваю спакусу. Як покатам пакаціліся некуды — першы, другі, трэці… Мабыць, што і залатыя. Ды няўжо думаеце, што ніколі не будзе канца?.. Што сказаць яшчэ? Шчыра жадаю ўсім прагнымпрагавітым знайсці свой маладзільны яблычак! Той, што ад залатой яблынькі… Якая на высокай горцы… За вадою глыбокай, за лясамі цёмнымі. І там вас чакае нехта, які ведае навылёт усе вашыя думкі, — пазірае вандроўнік на ўсіх цікаўных з хітрынкай. — Скруціўся, нібы кот, вуркоча ды чары множыць. Не прабачае, карае, бо яблыкамі пахне зямля. Зямля яблыкамі пахне…

# ЯГІНЯ

*Казачнае*

Лес цягнуўся зубчатым грэбнем, як кінутым невядомай чарадзейнаю рукою. Падымаўся глухой сцяною, цягнуўся ўгору, як жадаў дакрануцца да неба галінамі-рукамі. Вялікія, разлапістыя, моцныя ды калючыя. Яны варушыліся і ўдаваліся жывымі. Мабыць, з гэтага адчування прыйшла думка, што там, на зямлі, скрозь былі яліны. Чаму там? Я ляцела над імі, я сніла іх, а мы ўсе лётаем у снах. Над дрымучымі лясамі, над высокімі гарамі, па-над зорным светам...

Зорак не было, іх схавала цёмная ноч. І гор анідзе не відно, толькі лясныя нетры. Яловыя, густыя, калматыя. І ў сне пасапраўднаму думалася, што ў яловым лесе паміраць... Ці нараджацца, бо там, у іншасвеце, адзіны пачатак. Чаго? Не ўспомню. Але было адчуванне страху і раскайнасці, толькі я не ведала, з-за чаго... Вось успомню і прачнуся. Успомню... Прачнуся...

— Мур-няў! — мякка скочыла чорная котка, як падгадала час мяне пабудзіць. — Мур-няў!!! — так настойліва, што па-кацінаму значыла: уставай, хопіць спаць. І каб я ведала, што ў сваім намеры яна, Варкотка, сур'ёзная, ткнулася мне ў шчаку мокрымі вусамі. Мне адразу прыгадалася пакінутая звечара смятана...

Дзякую за клопат. Нехта ўжо даўно прачнуўся, паспеў з'есці чужы сняданак, а я ўсё сплю.

— Мышыну хоць злавіла?

— Мур-няў! Я тут не пры чым! — Варкотка ўвішна скокнула на падлогу і абачліва схавалася пад лаўку. — Калі знікае смятана, то я заўсёды невінаватая. А мышэй я не знайшла. Ты, гаспадыня, лепш паглядзі, што там злыдні нарабілі.

Чарадзейная котка, умее размаўляць, угадваць думкі-жаданні. Насылае сваім вуркатаннем прыемныя сны. Не ловіць мышэй, крадзе смятану. Але без яе чарадзейная хатка — не хатка... Тут цікаўным вочкам з-пад печкі дамавічок пазірае.

З падваконняў кветкі па-змоўніцку падміргваюць, а з надворку ліпіна прыветнай галінкай махае. На кухні моцна бразгае посуд. Зачараваныя міскі-талеркі. Самі мыюцца. І самі б'юцца!

Імгненна падхопліваюся ды бягу. Каціна-сабачыя стварэнні ў дзіравых ботах на задніх лапах напоўніцу злыднічаюць. Морды сабачыя, а лапы каціныя, поўсць на спіне калматая, невядома якая... Скачуць гэтыя з падлогі на стол, брудныя, у попеле выкачаныя. На міскі палююць, каб лапамі ды за іх учапіцца. А тыя, не былі б чарадзейнымі, плешчуць лыжкамі, нібы рукамі, трапляючы лоўка па нейкім носе. Піск-віск, мяўканне-гаўканне. Чорная падлога і абрус на стале. З вуліцы цікаўна зазірае ў акно, дзівіцца на ўсё гэта лясная сава, маўляў, пагляджу, што рабіць будзеш. А ты, шэрая, чаго сюды прыляцела? І днём табе ў дупле не сядзіцца. Прыляцела і прыляцела, цябе не спытала, як зіркнулі лупатыя савіныя вочы.

Добра, што ёсць чарадзейная мятла. Зараз будзе згода, цішыня і парадак.

— Так іх! Так! — маленькі рухавы дамавік заўзята прыскоквае на прыпечку. — Будуць ведаць, як сюды з вёскі прыбівацца. А там яны па хатах добра прайшліся, многа збанкоў пабілі, у кашу пяску панасыпалі, у малако вады паналівалі... Вось-вось!

Шкодныя аж занадта. Пушчаная па хаце мятла пярэсціць каго па баках, каго па спіне, і піскуча-віскучы клубок плаўна выкочваецца на вуліцу. Тут, радасныя і задаволеныя, злыдні лёгка знікаюць, што значыць, мы схаваліся, паспрабуй цяпер нас знайдзі. Мятла вяртаецца мне ў рукі, а сава пазірае з невыказным дакорам, як пытаецца, калі такое бязладдзе скончыцца, кожнае раніцы адно і тое ж... А я адкуль ведаю? Пацікаўся ты чым іншым. У адказ лясная, злосна лопаючы крыламі, знікае ў блізкім яловым гушчары.

— І чаго яна да нас прычапілася? — Варкотка ніколі ляснай госці не радавалася. — Прылятае, зыркае-лупае. Падумаеш, разы са два як не ўсю поліўкай абліла. Дык сама ж і вінаватая. Трэба лятаць шпарчэй ды пад міску не падстаўляцца.

Ну, можа, не два разы, а болей… Але тут я з Варкоткай была згодная. Шэрая гаспадыня лесу рухалася марудна, цяжка. З ходу чаплялася за драбіну, што месцілася каля ганка, і рабіла так, ведама ж, дарэмна. Часам услед за шкоднымі злыднямі з адчыненых дзвярэй вылятаў і асабліва прагны да помсты чарадзейны посуд. Напэўна, ёсць і такі… Сама доўга не верыла, пакуль усё як ёсць не пабачыла. Вылятае міска — і ўчарашняя пракіслая поліўка ладна плюхаецца на сцяну, драбіну і савінае пер'е. З пакрыўджаным "ку-га" ўжо не зусім шэрая намагаецца стукнуць вострым клювам такі шкодны цуд. Міска ўраз хаваецца ў хаце…

— Глядзіце на яе! Чаго яна дзяўбецца? — галосіць на ўвесь свет птушкападобны паветнік. Драбіна стаіць якраз пад паветцю, дзе ляжаць дровы і сякое-такое гаспадарскае начынне. — А яшчэ кажуць, што совы надта мудрыя!

— А ты не сумнявайся ў савінай мудрасці! — асцярожна выглядае з-за дзвярэй дамавічок, які гатовы заўсёды паказаць надворнаму суседу, што гэта ён, хатні, галоўны. — Бачыш, колькі на ёй капусты? Гэта табе не простае шчаўе… Не жарты, вось!

— Сам ты капуста!

— А ты шчаўе!

— Цьху, нячыстая сіла! — паветнік спрытна кідае паленца дроў за парог. З дамавічком ён не сябруе.

— Сам нячыстая сіла! — паленца дроў ляціць назад, ледзьве не скідваючы саву з драбіны.

Шэрая на дзіва хутка ўзлятае, імкнучы да лесу.

— Глядзі ты, ёсць і з мудрасці выгада. Вось! — дамавічок лапкай чухае патыліцу.

— Канешне! А то б акно пабілі! — паветнік крыльцам прыкрывае дзюбу. — Гэта ж не ў набытак гаспадарцы…

Не ў набытак былі і сваркі з шэрай гаспадыняй лесу. Чарадзейная хатка стаяла ў глыбокіх нетрах, як схаваная ад усяго свету за непраходнымі таемнымі сцежкамі. Лясныя чары

выпрабоўвалі мяне, сачылі-наглядалі. Вось чаму кожнае раніцы ў хаце невядомым чынам з'яўляліся шкодныя злыдні. А з цёмнага зубчатага далягляду нязменна прылятала яна, мабыць, што і мудрасць. Вочы лесу, яго душа. І мне ўвесь час здавалася, што трошкі чалавечая.

— Мур-няў! — Варкотка ласкава папрасілася на рукі.

Чуйная, увішная, не як звычайная коцейка. І ты ў мяне асаблівая, і хатка, і нават нашая нечаканая-някліканая шэрая госця. Толькі я, самая звычайная чарадзейка, не магу ўсяму гэтаму даць рады. Ты ці ведаеш, што рабіць?

Варкотка заскакала, як маленькае кацяня, хочучы злавіць свой жа хвост. Дамавічок завоськаў ды хутчэй кінуўся прыбіраць кухню. Паветнік клапатліва грымеў паленцамі, перакідваючы іх з месца на месца. Толькі я заставалася без справы...

Пагуляю па лесе, але не пайду далёка. А лес быццам кліча пайсці, пабегчы далей і далей. Закружыцца-заблудзіцца. Высокія яловыя шаты, пад імі крыніцы з жывою вадою. У высокай траве стаілася спуджанае зайчаня, сочыць за мной пільным позіркам. Мяккі зялёны мох робіць нячутнымі крокі. Тут мала сонца нават днём, і, мабыць, таму, нябачныя, хаваюцца чары. Я адчуваю іх кожнай крывінкай. Зараслая, даўно няходжаная сцежка раптоўна выбягае мне насустрач. Адкуль бяжыш? Чамусьці бачыла цябе ў сваіх снах. Нічога не адказала вузенькая, ніцая, нібыта схавала палахлівыя цені даўнішніх слядоў. Але як закружылася па лесе ўжо далёка, лясны голас-пошум мяне дагнаў:

— Здалёку бягу, а знайсці не магу! Чакаю-шукаю ў цемры начэй, а што ж на свеце за ўсё саладчэй?

І знік ціхі шэпт, як не было яго. Лес стаіўся, замаўчаў. Не ведаў. Не азываліся чары, мабыць, гэта яны чакалі-шукалі. А мне ж як знайсці? Пытаюся ў самай звонкай жывой крыніцы, толькі і яна пра тое не сказала. Азіраюся на шэрыя хмаркі, адно і яны нічога не мовілі. Дык што ж яно? Што?..

— Малако! Чаго тут думаць! — Варкотка настойліва варушыла пушыстым хвастом. — Цёпленькае, салодзенькае. Мур-няў!

— Сама ты малако! Вось! — дамавічок аж прыскокнуў на прыпечку. — Ведама ж усім, што самая салодкая на свеце ежа — гэта мёд. А ліпавы люблю найболей!

— Коткі мёд не ядуць! Вось-восік ты нездагадлівы!

— А ты хітрая, увішная, шкодная! Заўсёды з'ясі гаспадынiну смятану!

— Не з'ем, а трошкі пакаштую!

— Ага, пакаштуеш. Нічога ў місцы не застанецца!

Вечарам, як і раніцай, весела ў чарадзейнай хатцы, усе паважаюць ды шануюць адно аднаго. Але не надта зважаю на Воськіна-Варкоткіна сяброўства. Прыгадваю ціхі шэпт пра самае салодкае і засынаю. Доўга сню...

У цемры ночы глуха стагналі яліны. Як жаліліся, як плакалі. Як хацелі сказаць нешта важнае, пакуль неперажытае... Мною. Але я не разумела іх, проста зноў ляцела над імі. Так лёгка. Такі лёгкі сон. Клічуць чары суладжана, несупынна.

Гэта я паслала чарадзейства ў свет. Наказала, каб азывалася мне кожнае ночы. Каб лавіць і караць. Усіх тых, хто не слухаецца, хто пагарджае цішынёй ды спакоем. Не спіць сам ды не дае заснуць іншым. Я чарадзейка і ведаю, што так трэба. Пазбаўлю іх самага-самага...

Яны, дурасліўцы, хочуць схавацца, уцячы. Просяцца, кажуць, што болей не будуць. Злоўленыя, сядзяць у вялізнай берасцяной сівалцы ціха-ціха... Што, ужо шкадуеце пра свае дарэмныя жарты, неслухі? Ці тое яшчэ будзе... Зараз з вамі паляцім далёка-далёка. За высокія горы, за цёмныя лясы. Плачцеплачце, але вярнуцца дадому не спадзявайцеся! Уга, злая, страшная! А вы бацькам непатрэбныя... Надакучвалі аж занадта, вось і аддалі вас мне. Папрасілі, каб забрала. Што, не верыце? Адкуль жа вам уведаць, як хочацца цішыні і спакою... І салодкага сну. Вось што на свеце за ўсё саладчэй.

Разганяю мятлой хмары, пазначаю на зямлі сцежку праз яловы лес. І ён, цёмны, не пазбаўлены спагады... Як вырасцеце, тады шукайце на той сцежцы шлях да сябе. Можа быць, што і знойдзеце. А можа, заблукаеце, заблукаеце... Мне ж з таго будзе толькі весялей. Замаўчыце, хопіць плакаць. А то зараз вас з'ем!

— Не еш нас! Мы ўжо не плачам!

І плакалі ўголас пра нешта яшчэ...

— Не еш маёй смятаны! — мяне пабудзіла звыклае бразганне посуду, бо Восік і Варкотка стала гаспадарылі на кухні.

— Не чапаў тваёй смятаны! Толькі з'еў сваю яешню!

— Дамавікі заўсёды ядуць яешню!

— А каты заўсёды крадуць смятану!

Злыдняў чамусьці не было чуваць. Не было відаць. Што, зусім няма? Гэта дзіва дзіўнае і прымусіла мяне ўстрывожана падхапіцца.

— З'елі яешню?! — пытаюся адразу, як убягаю на кухню.

— З'елі... Усю.

Дамавічок з коткай трохі спалохаліся маёй гаспадарскай цікавасці.

— А смятану?

— З'елі ўсю...

— Дык малайцы! А дзе ж гэта злыднікі нашыя падзеліся? Няўжо зніклі-заблукалі? Ці паверыце?

— Яны знікнуць! Яны заблукаюць! — адзін толькі напамін пра злыдняў прымусіў Варкотку раздражнёна зафырчэць.

— Ды што ты, гаспадыня! — дамавічок махнуў лапкай. — Яны не пасаромеюцца. Гэта ж твая сіла чарадзейная іх ад хаты прагнала...

— Мая сіла?

— А то! Ноччу тут гуляла-спявала ўсё... — Восік паважліва замаўчаў.

— Ды што ж гуляла-спявала?

Варкотка звыкла прылашчылася ды зазірнула мне ў вочы.

— Мур-няў! А ты не памятаеш? Як сапраўдная чарадзейка, знікла раптоўна. З мятлою разам. Лес цёмны табе адазваўся, загаманіў-заспяваў...

Як знянацку прыгадаўся пабачаны сон. І мною забраныя-паланёныя... Пустая берасцяная сівалка ціха стаяла ў кутку. Не на сваім месцы. Вось і злыдні не з'явіліся. Па-ранейшаму за сцяною задуменна шумеў яловы лес. Не казаў сваіх вачэй. Так азываецца не сон, а ява-праўда...

— Мур-няў! Што такое? Што? — замітусілася Варкотка, спачуваючы і шкадуючы.

А што я табе адкажу? Няма чаго мяне шкадаваць. Я ж іх не пашкадавала... Чаму? Не памятаю. Не глядзіць ужо дакорліва шэрая лясная гаспадыня, не стукае злосна ў акно, мабыць, яна мною задаволеная. Як усё проста. Ладна. Згодна. Толькі я не хачу быць такою... Чуеце вы ўсе?! Не хачу!!!

Покрывам спавівае лясная ціша. Іду праз калючыя гушчары адна. Прадзіраюся некуды, каб жа далей адсюль. Куды? Не ведаю. У маіх снах толькі лес, цёмны, неаглядны. У маёй яве толькі шэрыя нетры. Вялікія, бясконцыя. У снах лётаю. Магла б і цяпер паляцець... Не ляціцца, сумна, цяжка. Нават чары хочуць заплакаць...

— Радуешся, выкрадальніца дзяцей? — далятае нечы гнеўны голас. Незнаёмы, але як дзесьці чуты.

Паказваецца і хаваецца чужы цёмнаму лесу. Як і я, з немалымі чарамі. Як і я, з цёмным мроівам у сэрцы. Толькі не церпіць лесу, не жадае яму радасці. Праклінае вечна зялёную ялугу. Вечна трывожную, вечна жывую. Абяцае вялікія пакуты, немінучае гора.

— Ягіня! — адгукаецца і боль, і пагарда. — Звяду цябе са свету! Нікога болей у бацькі ды маці не скрадзеш...

І ляціць на яго шэрая гаспадыня, лопае крыламі, кугакае пагрозліва, жадаючы прагнаць. Вочы цёмным агнём свецяцца. Смяецца ды ў момант знікае невядомы. Доўга яшчэ не

змаўкае смех, доўга чары не зловяць яго следу. Тады сцепануліся, нібы жывыя, вечныя яліны. Зашапацелі ўстрывожана:

— Звысоку глядзім, а рады не дадзім! А як жа тое нам адшукаці, што мілей за бацьку, што мілей за маці?!

Я не вінаватая. Не думала нікога красці, нікому чыніці крыўды. Не жадала і сабе горкіх палыноў... Як жа гэта ўсё сталася, лясы-ялугі? Маўчыце, не дазваляеце пайсці. Кружаце-водзіце ды вяртаеце назад, да чарадзейнай хаткі. А ці скажаце, хто наймілей? Што наймілей? Чамусьці мне здаецца, што ведаеце...

— Вярнулася... — чарадзейная котка чакала мяне з трывогай і надзеяй. Баялася, што я пайду...

І Восік тут як тут, выцірае ражком хустачкі вочкі:

— Куды ж мы без цябе? Хатка ж адна не ўтрымаецца. Знікну-прападу. А Варкотка ў лесе згіне.

— А я ж нікуды ад вас... Не пускае мяне чарадзейны лес. Не адпусціць ніколі. Будзе пошумам насылаць ведныя сны. Будзе тварыць яву...

Бачу ў сне сваю берасцяную сівалку. Толькі не трымаю яе лёгка-спрытна, як звычайна. Робіцца яна такой вялізнай, цяжкай, як сапраўдная хатка. Быццам знутры лічу шурпатыя шчылінкі ў берасцяной кары, ваджу пальцамі па хітрых узорыстых спляценнях. Збіваюся, зноў пачынаю. Як ліпнёвыя карункі... А ліпіна за маім акном цёплая, добрая. І таму я не баюся сівалкі, я не баюся глухой бяросты. Яна закрывае мне зоркі, што свецяцца ў такім блізкім небе... Вызірнуць, вызірнуць... Зоркі лёгка ды згодна плывуць насустрач. А ўнізе лес цягнецца зубчатым грэбнем. Цёмна-зялёнае вецце пагойдваецца ледзьве прыкметна, але я бачу. І лячу. Над дрымучымі лясамі, над высокімі гарамі.

— Чарадзейнае дзіця... — глухі раздражнёны голас. — Сядзі ціха, неслухмянае...

Пыхкаюць цёмным агнём вочы. Страшна. Як жа можна такога ды не паслухацца? Хаваюся назад. Знікае радасць, як загарнуліся зоркі ў чорныя хмары. Дзе ж вы, дзе? Хачу вас пабачыць-адшукаць, бо агартае пачуццё раскайнасці. Вялікае, балючае. Я і не ведала, што можа быць такое... Збегла ад мамы, схавалася, не адазвалася на яе голас. Шкада... Мне шкада, чуеш? Толькі не хапае сілы, каб закрычаць. Маўчу. Засцяць свет неаглядныя ялугі, плыве па-над імі берасцяная сівалка.

Толькі цяпер і ўбачыла, што сядзіць побач са мною маленькі хлопчык. Не падымае вачэй, заходзіцца-плача...

— Ты чаго румзаеш? — штурхаю яго.

— Не слухаўся мамы, — хліпае ўголас. — А цяпер злая-цёмная мяне забрала, і я ніколі не пабачу сваю матулю.

— Пабачыш! Знойдзеш! Хіба можна так, каб ніколі не сустрэцца... — кажу ды сама сумняваюся. А раптам гэтая злая-цёмная нас ніколі не адпусціць? А што тады?

— Ты не плач! — супакойваю. — Мая мама часам кажа, што як-небудзь яно будзе...

— І ты яе ніколі не пабачыш. Слухай, а давай збяжым! — хлопчык нечакана збіраецца з духам. — Уцячом ад злой ды цёмнай. Яна ж старая, нас не дагоніць. Галоўнае насмеліцца.

— Яно так...

— Толькі ты маўчы, каб цёмная не падслухала, не здагадалася.

І маўчым. Сядзім ды чакаем, калі ж лацвей уцякаць. Стукнулася-страсянулася нашая сівалка, як пастаўленая на зямлю. Нічога болей не робіцца. Можна вызірнуць. Можна вылезці. І пабачыць шэранькага зайчыка, асцярожна-цікаўнага, добрага, спагадлівага. Амаль як той, сонечны, што скакаў у веццях маёй ліпіны, баяў казкі ды пакідаў зайцаў хлеб... Падбег да мяне шэранькі, стукнуў лапкай, маўляў, давай пагуляем.

Стукнуў, і я прачнулася.

— Мур-няў! Не плач! — Варкотка скакала па ложку, раз-пораз мацаючы мяне лапай. І ўзрадавалася, калі ўбачыла, што я прачнулася:

— Ты плакала ў сне. То я цябе будзіла.

Дзякую за клопат. А раніца была ціхай, трошкі сумнай. Ноччу дажджы як след абмылі зямлю, убралі хмарамі неба. Як цягнулі да сябе позірк асмужаныя дажджыстымі слязьмі калматыя яліны. Ахіналі вакольны абшар, блізка падступалі да маёй чарадзейнай хаткі. Шапталіся, выглядалі нешта сваё. Засцілі свет, трымалі чары, але я бачыла... Праз лясныя нетры, у якіх хаваліся маленькія ды цікаўныя. Вялікія ды ганарыстыя. Жвавыя-рухавыя. Паважныя-самавітыя. Яны то спадзяваліся і радаваліся, то, як я, сумавалі... А там, далёка за лясамі, быў вялікі свет. Мне хацелася ў яго пайсці, але, мабыць, я павінна была застацца. Бо тут быў добры мітуслівы Восік, была ўвішная спагадлівая Варкотка. Па злыднях я б не жалілася. Між іншым, а куды ж яны падзеліся? Зноў іх няма.

Я стаяла пад ліпінай на двары. Дзівосна высокая, яна раптоўна трасянула ўсім сваім лісцем, як скаланулася ад камля да самай верхняй галінкі. І зноў аціхла-застыла. Ліпавы дождж, цёплы і салодкі, вымыў мне твар. Нечакана падумалася, што я заўжды памятала ліпіну такою... Не ўзгадаю, як яна расла, як станавілася магутным дрэвам. Бачыла такою вячыстай, нібы паўсталай з маіх сноў...

— Восік! А скажы ты мне, дамавенькі, ці гэта з чараў зашумела ліпіна? А бачыў яе раней малою?

Пакліканы Восік асцярожна высунуўся за парог.

— Чары твае трымаюць наш свет... І хатку, і мяне. І яе, ліпіну высокую, такою стварылі.

— Як гэта, Воська?

— Хіба ж я ведаю?.. Ты адгадай тое, пра што табе шапацеў лес. Яно не лішнім будзе.

— Што ж мілей за бацьку? Што ж мілей за маці?

— Так... — дамавічок па-сяброўску махнуў лапкай паветніку і паважна мовіў: — Чары твае мацнеюць. Часу мала... Хутка ўсё станецца...

— Што ж станецца?

Але нічога болей не адказваў хатнік, хаваўся ў свой падпечак. Дзіўна зашыўшыся пад паленцамі дроў, палахліва зіркаў на мяне паветнік. Варкотка бесклапотна скакала па двары. Весяліла-смяшыла, ловячы, як гарэзлівае кацяня, уласны хвост. А я толькі цяпер зразумела, што яны наўмысна праганялі шэрую лясную гаспадыню…

Шэрая, лупатая. Агнёвыя вочы. Яе цень на маёй лясной сцежцы. Шэры зай у хмызняках. Як толькі я ў лес, то ён ужо тут. Ніколі не палохаўся, ніколі не ўцякаў ад мяне. А я так многа хадзіла па лесе. І цяпер хаджу. Чакаю-шукаю. Таямніцу, мілейшую за цэлы свет. За бацьку, за маці. Гукаю рэха, толькі вяртаецца яно ні з чым. Вяртаецца, і цягнуцца да маіх рук цёмныя лапіны ялін. Такія калючыя, бахматыя. Азываюцца на голас шумлівыя летнія дажджы. Глядзяць мне ў вочы шэрыя хмары. Глядзяць-патанаюць, адбіваюцца ў маіх вачах…

— Зямля цябе слухаецца. Вада цябе слухаецца, Ягіня! — з'яўляецца з-за сініх лясоў той, незнаёмы, няклíканы-нечаканы. Едзе верхам на шэрым ваўку. Як той воўк, выскаляецца злосна.

— Што з усімі, каго скрала, учыніла? Ці памятаеш?

— І з чаго ты такою маладой ды прыгожай стала?

— А ведаеш, як жа я цябе са свету зжыву?

Лёгка ўхіляецца ад крылаў шэрай гаспадыні, знікае ды зноў паўстае за колькі крокаў наперадзе. Дражніцца-зневажае. Чары моцныя пасылае, з такімі не ўраз справіцца. Таемнымі, нязведанымі шляхамі хутка імчыць праз лес хіжы воўк…

— У-у-у! Знайду-даганю!!!

Але не ўцякаю. Хоць цягне лапкамі за крысо шэрае зайчаня, хоча, каб я хавалася. Глядзіць пранікліва. І ты ўжо тут? Няўжо не баішся ваўчыных зубоў? Я вось жахаюся. Ашчэраная вялікая пашча. Страшна, як і тады…

Гэта ж пострах вяртае мне ўспамін… Бачу маленькага хлопчыка, які баіцца. Памалу вылезшы з сівалкі, выцер слёзы ды асцярожна сунецца назад. Шуміць вялікі лес. Асенні, тры-

вожны. Куды ж бегчы? Як шукаць дарогу дадому? Блукаем у яловых нетрах. Такія высокія зараснікі-хмызнякі. Мацнее кволае спадзяванне, бо можна ў іх добра схавацца...

Не, ад яе не схаваешся! Стогн па лесе ідзе. Дрэвы высозныя валяцца. Вятры халодныя гудуць-равуць. Зёлкі чарадзейныя долу хіляцца. Гэта ж яна ідзе, шлях праз лес пракладае...

— Знайду-даганю!!! У-у-у!

Спалоханым зайчанём бяжыць прэч хлопчык. Яго хапае доўгая кашчавая рука. Але я не ўцякаю. Вялікімі таемнымі вачыма глядзіць яловы гушчар. Агнямі гараць так блізка страшныя лупатыя вочы...

— Чарадзейнае дзіця! — той самы раздражнёны голас. — Забудзеш гэта ж усё да пары да часу...

Забуду, не ўспомню. Скажу лютаму ваўку, пагляджу на таго, хто на ім сядзіць. Моўлю, як адчарую:

— Вочы мілей за бацьку. Вочы мілей за маці. Гэта ў іх адбіваецца свет.

Часам можа падацца, што ён гарыць агнём. Толькі гэта няпраўда... І ўспамінае мяне той, хто знікне з прыцемненым раннім золкам. Пойдзе ўслед за ноччу. Вернецца на змярканні. Пакліча самы вялікі страх. Самую глыбокую раскайнасць...

— Мы сустрэліся ў цёмнай ялузе... Мабыць, не так сабе. Але ж хіба гэта на добрае? — паглядзіць на мяне з надзеяй.

Не ведаю. Толькі зноў шэпчуць самыя цёмныя на свеце лясы, мовяць таемна ды пранікліва, як хочуць пра нешта важнае згадаць:

— Вечна шукаем і зіму, і лета, а што ж цвіце без самога цвету?

Мабыць, пра гэта можна ўспомніць, калі прачнешся. Яно прыходзіць у трывожных неспадзяваных снах. Чакае да пары да часу. Нябачнае, няўлоўнае. І ўжо не цёмная самая непраглядзь... Што ж гэта? Што? Цяжка ўбачыць, бо цвіце без цвету там, дзе твая хата, дзе ходжаны і няходжаны шлях, які чакаў і чакае...

— Мур-няў! — Варкотка смачна аблізвае вусы. — А ведаеш, што ў нас зноў учынілася?

# ПАЎНОЧНІК

*Міфалагічнае*

Зоркі як хлебныя крошкі, густа раскіданыя па небе. Мабыць, смачныя, аднак жа доўга іх збіраць… Вунь які вялізны гэты нябесны стол! А я ж маленькі, хоць і рухавенькі-хуценькі. І люблю апаўночны час. Спяць усе моцна. Стаіліся-загарнуліся і людзі, і птушкі. Баяцца цемры, баяцца ночы. Спяць, чакаюць светлае раніцы. Толькі я не сплю… Крадком сунуся паўз сядзібы. Ціха. Спрытна. Нябачна. Выглядаю-віжую, што і дзе, што і як робіцца. Вось я зараз…

— Пых-пых!!!

— Авой… Напалохаў, лядашчы! — каб схаваць сваю разгубленасць, прытупнуў на худое нягеглае стварэнне, што стаілася ў ценю сухастоіны на скрыжаванні дарог. — Каб цябе!

— Ціха! Чаго ты? — не зразумеў майго нецярпення лядашчык. Гэта быў дапраўды ён. — Можна падумаць, што я цябе першы раз пужаю. Ты сам чаго тут шнырыш?

— Не шныру, а гляджу, што ды як.

— І чаго нагледзіў?

— Пакуль нічога. Але ж ноч толькі пачалася, то я і не бядую.

— І ў мяне нічога. Пых-пых! Аднае тае радасці, што цябе спужаць. А карысці з таго? Ды на цябе ж ніякай хваробы не пачэпіш.

— Дык цікуй чалавека, што табе я…

— Ат! Буду высільвацца. Я ж худзенькі, слабенькі, — лядашчык цяжка ўздыхнуў, як просячы спачування.

Што слабенькім ён не быў, ведаў пэўна і спагадаць не спяшаўся. А то прычэпіцца худое, будзе хадзіць ззаду ды скавытаць. Вялікая асалода. Але бавіцца надта не выпадае, хоць ноч толькі пачалася, трэба…

— Толькі-толькі начніцы прабеглі, — лядашчы мовіў як самому сабе ды паглядзеў выпрабавальна, зацікаўлюся ці як… А пра тое, што начніц я ніколькі не прывячаў, ведаў аж занадта.

— Куды ж? Ці не да вёскі? — зрабіў выгляд, што пытаюся проста так.

— Ат! Мабыць, што і да вёскі, — гаспадар хвароб знешне застаўся абыякавым, але сам як падабраўся. Зараз будзе прасіцца.

— Ну, няхай і да вёскі, — я завярнуўся ды пайшоў прэч. Не тая ноч для лядашчых просьбаў. А з начніцамі я і сам упраўлюся.

Не люблю іх, калматых, страшных. Лезуць у вокны як не ў сабе. Плач несціханы наводзяць на тых, хто спіць у калысках, хто яшчэ невінаваты. Адно баяцца дзіцячых лялек, што сядзяць на падваконнях ды глядзяць… Вось падыду блізенька, закрычу-падману. Абудзяцца ў хаце ды на вокны паглядзяць, лялькі пашукаюць ды прыткнуць іх паспяшаюцца. Як добра, што магу ўдаваць рознымі галасамі. І клікаць на дапамогу, і плакаць, як малое, і прасіцца… А калі хто выходзіць з хаты, то бачыць толькі пустую ноч. Азораную, шчымлівую. Сцепанецца чалавеча ад трывожных прадчуванняў ды назад, у цяплоспакой. І як жа можна зноў так хутка заснуць, калі прыцягальна свеціць поўня? Ну не разумею!

Учыніўшы ўсё як след, кірую далей. Звыкла прыглядаюся-віжую. Сям-там заўважаю цікаўных шэшачак. А вы ж ніколі не спіце. Водзіце кацінымі насамі. І ў хату скачаце праз рукі, удаўшыся ласкавай коткай. Грахі людскія трэба выведваць, яно так. Каб трохі баяліся рабіць нягожа. Але што гэта я, калі сам заўсёды ў шкоду лезу. Дзіўлюся сабе, дзіўлюся.

Іду ад вёскі да лесу, і поўня выглядае з-за хмар. Круглая, жоўтая, нібы кавалак свежага масла. Мякенькага, смачненькага… Ахвоці мне, не да ежы цяпер. Апасля што-небудзь ядомае сцягну. Вох, як не ўсяго скаланае далёкае ваўкалачае выццё.

Недзе там бегае тое страхалюдзіла. Хаваецца ў лесе, шукае дарогі да людскога жытла. Дарэмна шукае, адно пакутуе і не знаходзіць. Скура воўчая, а сэрца ж чалавечае. Белая пасмачка на шыі, не як ва ўсіх ваўкоў. Нават было б шкада, каб не прагавітая лютасць. Не скажу, звярыная ці чалавечая. За намарныя пошукі, за нечалавечыя пакуты. Адно ведаю: лепей з такім не сустракацца. Ад яго чым далей, тым спакайней. Нездарма ж такому вось закрыты чарамі шлях да вёскі.

І яшчэ раз адазвалася выццё, запаланіла скаргаю свет, стужкай спавіла вакольныя лясы і як знікла ў бяздонні блакітных азёрных вачэй. Авой... Вось цяпер да дрыжыкаў сцюдзёна. Іду ж праз лес. Збочваю ў глухія нетры, шыюся далёка-глыбока. Ляшчына, ракіта. Алешыны, алешыны. Яліны. Зараснікі папаратніку. Прабіраюся, хоць не надта і прабрацца. Недзе ж было...

— Вох-вох!!!

— А ты ўжо чаго вохчыш? Як не ўсе грошы здабыў-загарнуў, і ўсё табе мала?! — з гэтым, са скарбнікам, ніяк іначай. Маленькі, злосны...

Срэбраная світка з залатым поясам, бліскучы, відаць, з літога золата капялюшык. Срэбраныя запыленыя лапці і доўгі шчарбаты кій. Што, і ён не просты? Мабыць. Толькі мне да гэтага ўсяго якая справа? Сам увесь схуднелы. І можна ж, валодаючы незлічонымі багаццямі, амаль заўсёды заставацца галодным.

— Чаго сюды прыцёгся? — вычварыўся на ўвесь голас. І скуль такі віск узняўся? Ведама ж, нікога не прывячае. За скарбы свае дрыжыць-баіцца. Думае, што кожны — злодзей, што абавязкова нешта скрадзе.

— А сцягнуць што-небудзь хачу. Табе ж усяго многа. Вось і пакумекаў, што добра было б пазычыць...

— Я ж табе пазычу! Што пазычаць болей ніколі не будзеш! — і стаў раздзьмухацца, аж адзенне срэбрана-залатое на ім трашчыць. Значыць, ужо чарадзеіць. За кій хапаецца...

— Ды аціхні ты! І не называй дарагое-бліскучае скарбам.

— Чаму гэта? — занепакоіўся-сумеўся ды чараваць пакінуў.

— Таму што гэта няпраўда!

— Ой, не скажы, паўночнічак, не скажы. Ты не ведаеш, і ніхто не ведае, а ёсць тут нешта, даражэйшае за ўсё золата-срэбра на свеце...

— Ды няўжо? Мусіць, дыяменты-смарагды — шчасцейка твае найвялікшае?

— Вось-вось. Найвялікшае. Яно! — скарбнік пыхліва надзьмуўся.

— Бачу, бачу твае шчасцейка, а як жа! Ані драбінкі залатой не кранеш, з голаду пухнеш!

— А што ж! Калі патроху браць, то і любое багацце сыдзе. Але не гэтае, не шчасце, не яно.

— Ды пра якое шчасце ты чаўпеш? Глядзець на бліскучае, не табою сабранае, ды гэтага не кранацца? Адно вартаваць. А дзеля каго — невядома...

— Табе невядома. А я вось усё пэўна ведаю, паўночнічак. Той, хто на скарбы спакусіўся, душу запрадаў. З нячыстым пасябраваў. Так яны, вясковыя, гавораць...

Так дапраўды казалі. Зноў, як і заўсёды, стоена ўсміхаўся такім думам. Яны ж, вясковыя, наіўныя-дзіваватыя. Скажуць пра цябе такое, ад чаго сам аслупянееш. Ніколі б да такога не даўмеўся... Ажно даўно ўсё перагаворана і як праўда найчыстая прынята.

— Яно так, гавораць. А чаго ж ты хацеў, скарбнічак? У лесе хаваешся, нікому не папусціш ані крануцца заклятага багацця... Чакай, яшчэ і не тое скажуць.

— А можа, я і ёсць нячысты? Самы чорны, самы злосны, — лясны ахоўнік золата-срэбра прыскокнуў ды пакрыўджана замаўчаў.

— Ды чаго ты? Не надта зважай. Пра мяне, ведаеш, што гавораць? — спрабую супакоіць небараку. І нялёгка ж табе прыходзіцца.

— Ды мне што... Няхай злосны, няхай і чорны, — зноў узбурыўся скарбнічак. — Я, ці ведаеш, самую чарадзейную рэч вартую!

— Адкуль мне ведаць? Ці ж мала іх на свеце?

— Не, паслухай, такі чарадзейны рог усяго адзін.

— Чарадзейны рог? Той самы?

— Той! — скарбнічак заўзята прытупнуў, але тут жа спахапіўся. — Я табе прызнаўся, бо ты не самы сквапны. А болей не дзейкай нікому! А то...

І страшна закруціў вачыма. Што тут скажаш...

— Баюся цябе, баюся. Ды ты не клапаціся... Ад мяне ж не пойдзе.

— То слухай, — палагаднеў залаты-срэбраны. — Можа спраўдзіць чарадзейны рог любое чалавечае летуценне... Вось ты чаго б жадаў?

— А чаго б я жадаў? Чаго тут думаць! Смачна паесці!

— То чакай! — скарбнічак хуценька праваліўся пад зямлю і вынырнуў з тым самым рогам у руках, які іскрыўся, як срэбная луска, і бліпчэў, нібы само сонца. Ды як жа чарамі ад яго патыхала нечуванымі! Я нават сумеўся.

— Чарадзейны...

— А ты не хацеў даць веры! — лясны багацей па-заліхвацку прытупнуў. — Зараз мы ў яго папросім ці лепей загадаем... пітва ды ежы, — падзьмуў у рог, патрос, зноў падзьмуў вартаўнік-гаспадар.

Нічога не надарылася. Ані пітва, ані ежы мы так і не пабачылі. Дзіўна...

— Ты, можа, слаба дзьмеш? — я перахапіў чарадзейную рэч. — То я ж магу мацней. Вось так.

І дзьмухнуў, як кажуць людцы, ад усёй душы. Ці ж дарма магу выводзіць рознымі галасамі? Як моцны паўночны вецер, што нясе з сабою трывогу і непагадзь. Маю чарадзейныя сілы азывацца посвістам у самай моцнай улеўнай навальніцы.

Клікаць, будзіць, палохаць. Нездарма ж нават лядашчы мяне паважае. Дзьмухнуў яшчэ і чакаю, што ж будзе. Анічога! Ды не веру ў такое, не веру...

Задрыжэў срэбрана-залаты рог, аж зрабілася трывожна. Спалохана адхінуўся ад мяне скарбнік, замахаў рукамі.

— Ці ведаеш, што зараз учыніцца, паўночнічак?

— Адкуль? Хіба ж гэта я вартаўнік-ахоўнік?

— І я не ведаю... Не бачыў такога ніколі.

А я наогул гэты чарадзейны рог першы раз бачу. Скаланаецца-іскрыцца, бліщчыць месікам, зіхаціць сонцам. Як быццам пытаецца ў мяне, чаго ў ім болей. Канешне ж, ночы, не быў бы я тым, хто ёсць! Ноч спагадлівая і таемная, як самая чаканая казка. Хто сказаў, што яна страшная? Хто сказаў, што яна цёмная? Той не зведаў яе... Прымае рог мой выбар, і чутна мне, як засцяць свет ваўкалачы люты плач, дзікі рогат начніц ды ўсё тое, пра што б не хацелася ўспамінаць. Галасы таемнае ночы. Знікае некуды цёмны лясны гушчар, не бачу і ашчаднага скарбніка.

Затое бачу блізка-блізенька вялікага ваўкалачага караля. Пашча, якая можа глынуць нябесную поўню. Водбліскі зорак у бяздонных вачах і... холад самай пранізлівай сцюжы. Мне падалося, што чорная поўсць падобная да непраглядных лясных нетраў, калі неспадзявана пачуў:

— Ну, будзь здароў, чалавеча!

— Хто ты? — маё самае намарнае пытанне, але пра гэта б не змаўчаў чалавек.

— Я валадар таго рога, які патрапіў табе ў рукі.

Які мяне сюды прынёс? Што мне на гэта адказаць? Узяў той рог, думаючы пра ядомае... Нават не пра багацце. І аднекуль узнікае пэўнасць, што такога ты не зразумееш. І калі гэта я апошні раз цвяліў ваўкалака? Не памятаю штосьці, не памятаю...

— Не бойся мяне. Ты не пакваліўся на золата-срэбра, хоць і не збаяўся да яго пайсці. Заўсёды паважаў такіх. І цяпер, пабачыўшы многіх, як ты, спытаю: дзеля чаго ты жывеш? Ці ёсць у твайго кароткага чалавечага жыцця мэта?

Ды чаго там, была... Начніц ад хат адводзіць, бавіцца ды трошкі палохаць каго сустрэну. На тое ж я і паўночнік. Але вось цябе не напалохаеш, то, адчуваю, з'явіцца ў мяне вялікая мэта, зараз жа і з'явіцца. Так сам сабе думаю, а ваўкалаку ж моўлю:

— Ат, якая мэта. Грошай паболей прыдбаць. Смачна паесці. Вось і ўсё... А пра жыццё я ніколі і не задумваўся!

Зіркае на мяне падазрона, але далей па-свойму цягне ды ўсё прыглядаецца:

— Тое добра, што грошы. Маю ж і я багацці вялікія-незлічоныя, але хіба ў іх шчасце? Дык чаго ты, чалавеча, золата напоўніцу не хапаў, а за рэч небяспечную схапіўся?

— Прыгожы ражок, залаценькі.

— Тое добра, што залаценькі. І я ж залатое люблю. А чары табе ў залаценькім ражку не прымроіліся?

— А як жа! Вось, думаю, навошта ж мне золата? Няхай дасць мне залаты рог трохі ежы. От маё і ўсё!

І шчэрыць пашчу ваўкалак. Па-ваўчынаму заходзіцца ад смеху.

— Ежы? Гэты рог здольны даць і багацце, і славу, і шчасце. Ды ці мала яшчэ чаго, пра што ты нават і не чуў!.. А ты просіш ежы?!

— Капусты з хлебам! Не, як той рог такі магутны, то з салам! Ды сала каб абавязкова з кмінам. От смаката! Не верыш? Я з табой падзялюся...

— Тое добра, што падзелішся, — цягнецца да мяне носам страхалюдная пашча. — Але ж ты сам такі маленькі, смачненькі, як той кавалачак сала...

І аблізваецца ад вуха да вуха. Маўляў, з'ем цябе зараз, з'ем. Глыну — і ўсё тут... А я ж яшчэ і шкоды найлепшай учыніці не паспеў. То хоць цяпер пастараюся. Чаго б такога прыемнага пажадаць?

— Ды я нямыты, брыдкі. Жывот табе падвядзе. З'еш лепей свой хвост, ваўкалача!

— Чаго? — за доўгія стагоддзі чарадзейства такая думка не прыходзіла ваўкалачаму каралю. — Зноў блюзнерыш? За тое, што табе не належыць, схапіўся. У свет мой прыйшоў. Ды яшчэ на карысную справу цябе ніяк не ўгаварыць. Што ж з табою зрабіць?

Здзівіў. На гэта я заўсёды адкажу пэўна:

— Клапаціцца. Карміць. Забаўляць. І шанаваць!

І пазіраю на ваўкалака з такой шчырасцю ды любоўю, на якія рэдка калі быў здольны. Ах, шкада, як заўсёды болей здатны да кпінаў… Не быў бы паўночнікам!

— А з табою не засумуеш. Даўно я так не бавіўся. Ну, павесялі мяне, пасмяшы яшчэ! — вялізная пашча чакальна лягла на ваўчыныя лапы.

— От гэта я зараз! Ты ж сам такі смешны! Валадар вялікага рога, а касматы і няшчасны… І шукаеш спагаднай чалавечай душы. Чары ў цябе вялікія, багацці незлічоныя, але такой ты не знаходзіш…

І змаўкаю. От зараз будзе гнеўнае гірчэнне. А можа, ураз праглыне. Чакаю. Трэба ж, не дачакаўся таго. Хоча падацца лепшым? Ці дапраўды лепшы?

— Ведаеш, нячысцік, я некалі быў чалавекам. Ты павінен гэта зразумець, бо сам навучыўся ў людзей адчуваць і спагадаць… Я прыйшоў водным шляхам з далёкай сцюдзёнай зямлі, дзе многа зімы, а мала лета. Спаткаў, нібыта наканаваны лёс, летнюю прыгожую зямлю, і азёрную, і лясную. Прынёс найвялікшыя чары і быў шчаслівым, як толькі можа быць смяротны. Мінуліся гады, і скончыўся мой шлях. Надарыліся разам і гнеў, і жальба. І мне шкада, бо я сам не стаў зямлёю. Сышліся чары з чарамі, і стала мая душа вартаваць найвялікшы цуд, чакаць і шукаць спадкаемца…

— Ты стаміўся і знябыўся. І сам мала памятаеш усё тое, пра што радаваўся, пра што сумаваў… Вартуеш болей, чым багацце, але не жадаеш таго. Знаходзіў і абраных, і ведных, з

самымі чыстымі чалавечымі сэрцамі. Ішлі за табою і станавіліся ваўкалакамі. Толькі ніякія чары не змаглі стаіца мацнейшымі за вас. За цябе...

Цепаюць ваўкалачыя вочы, бліскае нябесная поўня, суладная з імі. Я не ведаю гэтакіх чараў. І я ніколі не спазнаю, дзе сыходзяцца чалавечая зацятасць і звярыная лютасць. Цяпер, так блізка ад ваўкалачай пашчы, мне здаецца, што няма ж тут нічога звярынага... Ніколі не спачуваў ваўкалакам. А іх кароль не маўчыць:

— Тое добра, нячысцік, як зразумееў ты, што чалавечая душа не мінаецца.

— От, зноў ты назваў мяне нячысцікам... А спачатку клікаў чалавекам.

— У людзей мала такой спагады і пранікліваесці. Доўгія зімы-леты я спазнаваў гэта, толькі не мог прыняць. Як там, у чалавечым свеце?

— Весела. Прыгодна.

Радасна смяецца ваўкалачы кароль. Лёгка, як не мае невыноснага чарадзейнага цяжару. Гулліва іскрацца зоркі, ахінаюць сваімі водбліскамі начны свет. Дрымушчых лясоў, заснулых, таемных, дзе вольны толькі той, хто мае шпаркія ногі. Сініх азёр, у якія, нібы ў мінулае, падае прызыўнае і адчайнае выццё.

— Я мог бы стаць ваўкалакам...

Разбіваецца нябесная поўня на блішчастыя кавалкі. Застаецца ў небе самотны веташок. Вечнае ваўчынае сонца. Смяецца ваўкалачы кароль. Кліча не таемныя шолахі сініх лясоў, не спрадвечныя чары зямлі і памяці. Кліча маё памятлівае сэрца, якое заўсёды было і будзе жывым. Чалавечым.

— Не бойся ваўкалакаў, нячысцік. Дзе б нас не сустрэў-ў-ў!

Чаго вас баяцца?.. Дрыжыць жоўты ветах, плача прызыўна, як трубны рог, што дагэтуль трымаю ў руках. Трымціць, як дапраўды жывы. Быццам хвалюецца-непакоіцца. Чаго тры-

маю? Ды проста не выпусціў, хоць і баяўся, кпіў, шкоднічаў. Не згубіў чужога скарбу, не адно ж блюзнерыць!

— Як мне цябе ратаваць, ваўкалача? Кажы! Ты мудры і ведаеш.

Пытаюся гэтак ды спрабую памацаць чорны вялізны нос, аж бачу побач з сабою спалоханага блішчаста-залатога скарбнічка. Няма ваўкалачага караля. Ані веташка, ані загадкавых лясоў, ані прыгожых азёр. Дзе яно ўсё? Дзе? Хачу назад, у свет чараў-цудаў!

— Ды што ж з табою, паўночнічак? Як узяў рог у рукі, то задрыжэў увесь чыста ды бразнуўся вобзем... Ляжыш, як нежывы, — уздыхае цяжанька лясны хавальнік грошай. — Ці апрытомнеў хоць? Думаў ужо за жывой вадой бегчы, каб табе палепшала...

— Палепшала... Ды мне пагоршала! Ці дасі веры, што бачыў я самога ваўкалачага караля? Сапраўднага, жывога. Ён такі... дзіўны!

— Вай-вай! Мусіць, ты яшчэ не ў сабе, бедачына. Ніхто ніколі не бачыў ваўкалачага караля. Зусім, кажу, няма такога. З чаго б табе яго бачыць? З чаго?

— Як з чаго? Ты ж скарб найвялікшы — рог чарадзейны — беражэш-хаваеш. Таму і бачыў!

— І што? Думаеш, ваўкалак на золата-срэбра ды на рог гэты пакваціцца? — скарбнік устрывожана падхапіўся. Даў кругоў колькі вакол мяне ды бліжэйшых ялін.

— Ды што тут думаць!.. — кажу гэтаму палахліваму багацею. — Як на добры роздум, то чаго ваўкалаку кваціцца на сваё ж!

— Што значыць на сваё? Трызні-трызні, але меру ведай! Гэты рог толькі мой!

— Не твой! Ён ведаў нараджэнне чараў. Чарадзействы ж і сабраў. Мусіць, яшчэ за тваім дзедам.

— І што? Гэта спадчынны скарб! А ты, як не хочаш з тым гадзіцца, ідзі адсюль прэч!

У мяне з усіх бакоў спрытна паляцелі яловыя шышкі. Што тут паробіш? Трэба ратавацца...

— Ідзі-ідзі! А то вавёркі цябе шышкамі заб'юць! А ўжо і ваверчаняты такія вялікія! — гневу ляснога вартавальніка не было мяжы.

Бягу-ўцякаю. Куды б падацца? Чамусьці зусім не цягне вяртацца ў вёску. Зноў начніцы, адны клопаты з імі ды прыкрасці. Яно, канешне ж, добра начніц ад хат адводзіць. Няцяжкая справа і, галоўнае, звыклая...

— Адкуль жа ты, скарбнічак, уведаў, што ёсць ваўкалачы кароль, як ніхто і ніколі не бачыў яго? — запытаўся ў высокага навакольнага лесу, бо скарбніка ўжо побач не было. — З чаго так затурбаваўся?

“Як з чаго?! — трэба ж, сам з сабою гаварыць пачаў. Моцнымі чарамі мяне рог прыклаў, нікому яны не мінаюцца. — Золатам-срэбрам не хоча дзяліцца. Сквапны, сквапны багацей”.

“Ды які ён багацей?! Заходзіцца з голаду. У выпадковага падарожнага скарынку хлеба жабруе”.

“Чаго ж узбурыўся? Як хутчэй мяне прагнаў. Вой, таямніцы-здагадкі! Сустрэць бы зараз якога ваўкалака, усё ў яго распытаць...”

Начны лес удаваўся прыціхлым і ўстрывожаным. Прабіраюся праз яго без сцяжынкі-дарогі. Куды? Сам не ведаю. Хоць некуды. Ісці ў вёску не хацелася, там ужо і начніц няма. Адзін раз адвядзеш іх, то яны ў роспачы і збягаюць. А мне ад сваіх дум куды збегчы? Маркотна, хоць плач. Зароў бы ўголас, адно што часу няма. Трэба ваўкалачую таямніцу раскрыць...

Поўня белая, халодная. На яе журботна нават глядзець. А ўжо быць з ёю звязаным чарамі... Болей, чым проста звязаным... Глядзець на зямлю яе круглым вокам. Шукаць сабе спагаднае стварэнне. Хоць не чалавека, хоць нячысціка. Тыя, з цёплых сонных хацін, не зразумеюць лютага, кплівага. Чу-

жога. А мы, нячысцікі, болей любім ноч. А мы болей шукаем прыгод. А мы знаходзім спачуванне і прачуласць там, дзе не знойдзе ніхто...

Азываецца таемным пошумам лес, як кажа, што разумее і спагадае. Выходзіць без дарогі мне насустрач самотны, брыдкі. Худы, змізарнелы. Гнеў у вачах. Пэўнасць, што і я спалохаюся, пабягу. А я не баюся, з месца не кранаюся. А яшчэ запытаюся, як і ў прывіднага ваўкалачага караля, неяк проста:

— Будзь здароў, ваўкалача! Каго сабе шукаеш? Куды цябе прывесці? Пра што табе расказаць?

А ты не адкажаш. Гнеў стане здзіўленнем і знікне, як галасны плач у бяздонным азёрным прадонні. Мне падасца, што я бачу чалавека ў тваіх вачах. Ты зведаў... Што? Куды мяне клічаш? Іду за табою. Спрытна бяжыш, пераскокваеш цераз паваленае бервяно. Бягу за табою. Пачакай, я зусім не хачу ехаць на тваёй спіне. Не трэба мяне туды закідваць. І так хутка імчацца... Пачакай, я звалюся... Заб'юся... Ваййвай!!!

Дзе мы? Не ведаю. Мільгаюць цені. Сядзяць начлежнікі ля зыркага вогнішча. Хаваемся паціху ў густой траве ды слухаем, як баюць нешта цікавае:

— Ці дасі веры, што кажу чыстую праўду? Было гэта тады, калі бацька мой яшчэ не нарадзіўся. Жыў я разам з дзедам. А як дома не было чаго рабіць, то аддаў ён мяне служыць. І загадаў мой гаспадар пчол пасвіць. Нялёгкая надарылася праца. Трэба кожнае раніцы пчолак на пашу выгнаць, цалюткі дзянёк за імі наглядаць, а ўвечары пералічыць ды ў вуллі пазаганяць. Дзе б з такім без чараў справіцца? Нядрэнна, як магу зрабіць залом! Хоць на пожні, хоць у жыце...

Дзейкае так адзін языкаты, відаць, як і я, шкодны, а ваўкалак глядзіць на мяне сумна-сумна... Цяжка, як не можаш мовіць слова. Але ж не так сабе ты мяне сюды прынёс. Нешта хочаш сказаць. Ці не пра цябе зараз гамонка?

— Ат! Пчол пасвіў, як твой бацька яшчэ не нарадзіўся... Ты мані, ды ведай меру! — сумняваецца дружбак таго хвалько.

— Не верыш мне? Свайму лепшаму сябру і чарадзею? Глядзі, пакрыўджуся, зачарую. Не цябе першага мне зваўкалачыць... Адно слова дай, што ты мне сябра.

— Ты ведаеш, што я табе сябра, што паважаю і веру... Ды не кажы...

— То слухай! Аднаго разу прыгнаў я пчолак дахаты, пералічыў — нямашака самай маленькай! Бяда будзе! Гаспадар мне строга наказаў: згубіш хоць адну — не заплачу за цэлы год. Пабег хутчэй шукаць. Бягу, гляджу, аж сем ваўкоў маю пчалу душаць.

— Сем? А не дзевяць? — смяецца сябра-начлежнік. — А то, мабыць, і болей...

— Калі кажу сем, значыць, сем. Ці не думаеш ты, што я манюка? Гэта ж самая вялікая крыўда. Не дарую!

Лагодзяцца і далей найшчырыя-праўдзівыя, ваўкалак нечага самотна чакае. Як ведае, што ўчыніцца. Здагадаўся і я. Не быў бы паўночнікам. Ды чаго доўга глядзець! Удамся невялікага росту чалавечкам, падыду, павітаюся, папрашуся каля цяпельца пагрэцца...

— Ты грэйся, добры чалавеча. Хіба мы цябе прагонім? Адно ведай, што тут не любяць хлуслівых. Ні тых, хто чаўпе абы-што, ні тых, хто гэта паважна слухае... А так мы ўсе сябры!

Тое добра, што сябры. І я ж люблю сябравітых. Сядаю ды слухаю паважна абы-што... Чаўпе гэты чарадзей, як на неба ўзлез па вяроўцы, як хусцінкі ў зорак-дзяўчатак пакраў, як з хмаркі на хмарку пераскокваў, уцякаючы ладна. Каб грымакоў не дастаць... Ці гэта яшчэ будзе! Распавёў так усё ды пытаецца, ці паверыў яму... Я ж у адказ:

— Не паверу ў тое, што аніякімі чарамі не дастанеш!

— Крыўды не дарую! Ваўкалакам па свеце пушчу! Слова мовіць не зможаш, і быць табе такім, пакуль нехта цябе не зразумее! — рагоча задаволена. — А цябе ніхто не зразумее...

І чары насылае. Знікае ад іх маё чалавечае аблічча. З'яўляецца сапраўднае. Паўночнікавае. А ці ведае хто, як выглядае паўночнік? Спужаўся слаўны хвалько, на чары свае забыўся. Што і сказаць, розуму не прыкладзе...

— Тое добра, што ваўкалакам. Толькі чаму ж я ім не раблюся? Так хвацка языком мелеш, няўжо слова чарадзейнае праглынуў?

Маўчыць нямко. А да нас падыходзіць той ваўкалак, што мяне сюды прывёз. Чалавекам робіцца. Кажа, як збочыў, збіўшыся з дарогі, на ясны агеньчык. Прывітаўся, сагрэўся, а пасля абярнуўся... Не схацеў гульнямі такімі бавіцца.

— Не здабыць бы мне свайго аблічча, каб не ты, паўночнік. Чым можа аддзячыць табе слабы чалавек?

Так і ведаў, што ты пра гэта спытаеш. І я, праніклівы паўночнік, табе адкажу:

— Ідзі ў свой свет, будзь вясёлым і добрым. І раскажы ўсім пра ваўкалачага караля. Не лютага, не страшнага, не хцівага...

Толькі мне вядома якога... Не гарэць болей падманліваму начлежнаму агню. Паўночнік любіць ноч, знікае ў таемна-загадкавым змроку. Ніхто не паверыць, што ў цемры стаілася спагада. Лясы, глухія лясы. Заснулая аціхлая вёска...

І даносіць мне ўвішная ласкавая шэшачка, як пасварыліся сусед з суседам. Да крыўды, да бойкі. Вырашыў адзін папомсціцца. Рогі з галля сабе пачапіў, рыла парасячае змайстраваў, кажух вывернуты апрануў ды чакае поцемкам, дзе дарогі сыходзяцца. Доўга не ішоў другі сусед — як адчуваў, што напалохаюць. Спудзіўся аж да дрыжыкаў. Гэта ж трэба, грэблю недалёка ад яго хаты чэрці аблюбавалі. А той, найхітры, радуецца...

— Тое добра, што радуешся! А цяпер, сваяк, пойдзем са мною ў пекла. Як хацеў быць разам з намі, будзеш там смалу вазіць! — з'яўляюся найхітраму, удаўшыся сапраўдным чортам.

— Эх, смалу дык смалу! І так цяжкая нашая сялянская жытка. Адно грошай з паўмеха мне дай, каб дзеці мае з голаду не памерлі, — і кідае мне дзіравы мяшок. Колькі ні сып у такі — не насыпеш.

І што ж, насіць мне грошы ў дзіравы мех? А як не зраблю таго, то здагадаецца, што ніколі і блізка не быў чортам. Людскіх хітрыкаў рагатыя-хвастатыя не разумеюць, і таму досыць кемлівыя часцяком абуваюць іх, пякельнікаў, у лапці.

— Тое добра, што грошы. А скажы ты мне, чалавеча, — спрабую ўдацца ўсяведным і жахлівым, — што ты ведаеш пра ваўкалачага караля?

Ніякавее кемлівы ды хітры. Цяжка ўздыхнуўшы, мовіць як ёсць, змірыўшыся, што давядзецца ісці ў пекла:

— Спрабаваў перакінуцца... Нажы ў зямлю ўвагнаў ды цераз іх куляўся. Не ўдалося мне таго, нячысцік. Відаць, не кожнаму ваўкалакам стацца. Не кожнага прыме ваўкалачы кароль...

— Не кожнаму стацца. Не кожнаму назад абярнуцца. Навошта такое чыніў, як шкадуеш сваіх дзяцей? — пытаюся строга.

— Падлавіў ты мяне, падлавіў. Добра чужыя грахі ведаеш. Маркотна мне, цяжка. Хочацца свет чараў адкрыць-спазнаць. Ноччу ў хаце не спіцца. Сэрцайка пад зоркамі хадзіць-блукаць просіцца. А пра ваўкалачага караля мне яшчэ прадзед казаў... Кожны, хто яго пабачыць, будзе шчаслівым. Чары моцныя спазнае. Палахлівы зробіцца смелым, а смелы застанецца ў вяках... Застаўся ў людской памяці і ён сам, валадар рога.

— Як жа гэта ўчынілася? — зрабіў выгляд, што пытаюся проста так.

— Выпрабоўваеш мяне? Няхай! Вось што ведаю... У далёкай зімняй краіне жыў вялізны воўк Фенрыр. Не было нікому ратавання ад яго крыважэрнай пашчы ды вострых кіпцю-

роў. Многія выходзілі з ім змагацца, адно ён забіваў усіх. Ажно пакуль не знайшоўся адзін, які перамог не сілай, а розумам.

"Не еш мяне, воўча! — сказаў той, калі ўжо ляжаў на зямлі, прыціснуты моцнай ваўчынай лапай. — Я табе на лепшае спатрэблюся..."

"Навошта ты мне, як не для ежы?" — прагірчэў Фенрыр.

"Адпусці мяне цяпер, а калі прыйдзе час, сам да цябе вярнуся... Ты ж, мусіць, хочаш ведаць, як жывуць людзі? Чаго так пнуцца звесці цябе са свету? — сказаў так, угадаўшы таемную воўчую думу. Было Фенрыру вельмі сумна, бо, маючы незвычайную сілу, заставаўся зусім адзін. — Усё табе раскажу, застануся з табою, буду вартаваць твае скарбы!"

"Яны без патрэбы мне! Ідзі ў далёкі край... Чуў я, што ёсць цудоўная летняя зямля... Хачу яе зведаць, паглядзець тваімі вачыма! Дам табе чары, і будзеш ты валадарыць рогам, станеш слаўным сярод людзей..."

— Так прыйшоў да нашай зямлі князь Рагвалод, заснаваў горад, стаўшы дапраўды слаўным, — вядзе далей разумны селянін сваю showказку. — Ні ён сам, ні воўк Фенрыр не думалі не гадалі, што надарацца гнеў і боль, загрыміць зброя, ахінецца пажарам і дымам летняя прыгожая зямля. Ты ведаеш, што ўчынілася?.. Не змог Рагвалод выканаць свайго абяцання. Так з'явіліся ў нашым краі ваўкалакі — спараджэнне халодных чараў. Чакаюць яны спагаднай чалавечай душы, пакутуюць, шукаюць і не знаходзяць...

Рагвалод. Валадар рога, няспраўджаны ваўкалачы кароль... Усіх тых, хто не змог выканаць свайго абяцання. Але я змагу, змагу... Вось ужо разумею, што павінен зрабіць, не быў бы паўночнікам:

— Ты казаў, што палахлівы зробіцца смелым, — пытаюся з хітрым прышчурам. — Але тое чалавек. А калі нячысцік пабачыць ваўкалачага караля?

— Пра гэта мой прадзед нічога не казаў. Падлавіў ты мяне, падлавіў… Чаго ўжо, цягні ў пекла!

Не дачакаешся! Знікаю на момант, апасля вяртаюся ды сыплю ў шапку дасціпнаму баю жменю смарагдаў. Радасці ж яго няма мяжы!.. І зусім не ведае бедачына, што, як толькі падмане некага, перавернуцца тыя смарагды на лясныя зёлкі. Адкуль жа ў мяне, паўночніка, грошы-скарбы? Праўда, зёлкі тыя незвычайныя. Можа, і здагадаецца. Павінен, як ведае пра Фенрыра.

Але мне зусім не час за тым назіраць. Маю вялікі клопат. Ноч хутка скончыцца, а паўночнікі не бегаюць пад яснай заранкай. Спяць у адной хаце салодкім сном трое малых хлапчукоў. Як жа іх завуць? Прабягаю каля хаты ўвішнай коткай. Што? Ян Вячорак, Ян Паўночнік і Ян Заравы. Гэта ж трэба, маім імем дзіцятка назвалі! Хто ж мяне будзе апасля такога баяцца?

Чакае сваёй часіны замова над калыскай у Вячорка — блаславенне зямлі і вады. І яшчэ нечага, моцнага, як жыццё, чаго нават мне, паўночніку, не выведаць… Сонца свой першы промень працягне Заравому, павядзе за сабою ў несамотны шлях. І толькі Паўночнік застаўся без чараў… Няхай і ён будзе адораным! Будуць яго любіць зоркі, будзе яму свяціць поўня, будзе ён спадкаемцам самых вялікіх скарбаў. Стану яго ценем, буду заўсёды побач!

Цень ценем, а на суку сухой прыдарожнай ігрушыны павесіўся лядашчы. Гайдаецца ды скуголіць:

— За ноч увесь выбегаўся, ніякай паважнай шкоды не ўчыніў, які ты паўночнік! Цьху на цябе! — ды скок на зямлю.

Зараз я табе "цьху"! Будзеш ведаць, страшыдла лядашчае! Ды ўпыліў за ім па дарозе.

— Ратуйце, ратуйце, паўночнік зноўку б'ецца! Ну, можа, не зноўку, а першы раз. Але ж б'ецца. І адкуль такія чары сцягнуў, што мяне, лядашчага, заганяе? Як сіла ў ім з'явілася чалавечая! Шэшкі, касны, ератнікі, на дапамогу!!!

# НЕДАРЭКА

*Казачнае*

Зоркі млява зіхцелі, варушыліся ў высокіх-высокіх галінах старога дуба. Пра штосьці маўчалі. Нешта варажылі. Іскрыста прасвятлялі цёмную ноч. Паважна ўздыхаў каржакаваты прысадзісты волат. Упіраўся ў зямлю, цягнуўся да неба, пранікліва сузіраў бясконцы свет. Думаў, каб усім было добра... А вавёркі, якія мітусіліся на яго галінах, ні пра што не думалі. Проста завіхаліся, не спалі. Цягнулі жалуды ў цёплае дупло.

Пад разлапістымі галінамі зманьваў пахучым водарам стог свежага сена. Мабыць, таксама глядзеў на зоркі. Толькі таго і чакаў, што заіскрацца яны, сальюцца адзіным мільгатлівым колам, і з неба збяжыць нібы прасветлая рака... Зацокае яна па зямлі капытамі, кранецца шаўковай залатой грывай высокай травы і ўхопіць ладны ахапак. Пасля абляціць увесь свет тройчы і зноўку рассыпіцца ў вышыні таемнымі зоркамі. Зачаравана прашапаціць лістамі адвечны, і стане, як было, ціха-ціха... Адны вавёркі не звернуць на ўсё тое ўвагі, збіраючы свае жалудовыя багацці. Ды чаго ім, спагадлівым, маленькім, нудзіцца, калі ўсім добра. Ім самім добра...

А зоркі мігцелі ад змяркання да золку, абяцалі нябачанае-нечуванае дзіва. Пра яго загадкава маўчалі. Ці не дзеля яго цягнуўся да неба высокі, моцны? Сонна пазяхала, мабыць, яго ж сніла чарадзейная ноч... Пакуль аднойчы невядома адкуль не зваліўся ў мяккі стог, адразу ўблытаўшыся ў сена, нейкі дзіўны недарэка. Пацягнуўся да нізкай дубовай галіны, напяўся, каб на яе пераскочыць, і з'ехаў па слізкім сене на зямлю.

— А што ж цяпер рабіці? — сам сабе забедаваў, пазіраючы на дубовае вецце. — Так проста на дуб не ўзлезеш. І трэба ж мне быць такім неслухмяным!

Зажурыўся, агледзеўся. Так сабе і на стог не ўзлезеш! А з чаго быў неслухмяным, пра тое думаць-разважаць не хацеў. Як і думаць зусім... З разбегу памкнуўся кульнуцца на стог — і мякнуўся аб зямлю. З разбегу паспрабаваў даскочыць да самай нізкай дубовай галіны — і ўляцеў галавой у стог. З разбегу кінуўся не ведаючы куды... І ўскочыў на спіну залатагрывага дзіва, якое нячутна-нябачна прыцокала за сваім ахапкам. Спынілася яно, выгнула шыю, паглядзела бяздонна-цёмным вокам на чалавечка.

— Ты мяне да галінкі якой падняст! — ласкава просіць той. — Мне б хоць як патрапіць вярнуцца. Не пакінь у бядзе, цуд найцудадзейны! Ты як быццам злоўленая мара.

Бліснула зманліва цёмнае цудадзейнае вока. Як мара чаканая, жаданая. І паімчаў недарэка над зямлёй. Першы раз — над бяздоннымі звонкімі крыніцамі, мяккімі сцежкамі, духмянымі паплавамі, другі раз — над азёрамі ды палеткамі, асмужанымі лясамі, а ў трэці раз паляцеў між зорак...

— Спыніся! Я хачу назад! Я звалюся!

Толькі цуд не ўмеў спыняцца. Узвіўся высока-высока і рассыпаўся па небе іскрыстымі мільгатлівымі ззяннямі.

— А-а-а!!! — загаласіў той, хто хацеў назад. Не маючы за што трымацца, падаў з неба, як цяжкі камень.

Не зваліўся. Паймала яго дубовая галіна. А моцны скалануўся як не ўвесь... Мабыць, з неспадзяванкі. Зашумеў, быццам прачнуўшыся, засмяяўся з недарэкі. Так зорная ноч змянілася сонечнай раніцай...

Цёпла. Згодна. Птушкі радуюцца сонцу, спяваюць на ўсе галасы. І недарэка радуецца, хоць і не спявае, а рукамі туды-сюды махае, дубовая ж галіна ўчэпіста трымае яго за каўнер. Вавёркі пагрозліва на яго цокаюць, з галінкі прэч гоняць. За свае назбіраныя багацці дужа непакояцца...

Трымала галінка недарэку, трымала, але трэснула-зламалася. З таго нецярплівы апынуўся на зямлі. Азірнуўся туды-сюды, мабыць, шукаючы цудаў. Не знайшоў... Засмуціўся з таго ды паплёўся па звілістай дарозе некуды... Куды вочы глядзяць.

Ці доўга, ці мала ішоў, аж даганяюць яго, грукочачы па дарозе, калёсы. Дзяўчына коніка паганяе, а на возе пані паняю сядзіць нейкая, ці то старая, ці то маладая. Як паглядзець левым вокам, то вусны пукатыя, бровы касматыя, а калі ўсміхнецца, то страх бярэ... Як паглядзець правым вокам, то бровы гнуткія, вусны танюткія, а калі ўсміхнецца, то радасць сэрца агартае...

— А што гэта за яна такая? Цябе ў сне ўбачыш — гаворку забудзеш... — не змог стрымацца, ведама ж, недарэка. Як падумае, так і скажа. А з чаго забудзеш — ці з радасці, ці са страху — не падумаў.

— Мой жа ты залаценькі! — азываецца тая. — Няма чаго ногі дарэмна біць, сядай, падвязём!

Прымасціўся недарэка на возе. Чаму ж не, як ласкава просяць... Сам туды-сюды азіраецца, а на спадарожніц сваіх не зважае.

— Ты каго ж гэтак, мой залаценькі, выглядаеш? — пытаецца ў яго нібыта пані. — Ніхто тут не ідзе, не едзе. Адно лясы глухія, дарогі цяжкія, чары дзівосныя. А болей нікога няма...

— А ведзьмы злосныя? — як быццам няўзнак паглядае на пані надарэка.

— Ат! Якія тут ведзьмы! — хуценька мовіць тая. — Браты-асілкі па свеце хадзілі, усю нечысць звялі, то і ведзьмаў папалілі.

— Адну так сабе пакінулі! — і зноў па баках азіраецца, як быццам чакае некага.

— А каго ж ты, мой залаценькі, шукаеш? — трывожыцца пані і сама вачыма водзіць.

— Ды так... Братоў сваіх родных. Можа, мяне сустрэнуць, — маніць недарэка, не казаць жа, што так сабе галавой круціць.

— Дык і я ж сваіх браточкаў шукаю, — узрадавалася пані. — А якія твае браты?

— З крыламі, з кіпцюрамі! Па зямлі не ходзяць, па небе лётаюць. Ведама ж, крэўныя...

Пачуўшы такое, трывожна глянула на недарэку дзяўчына, па-ранейшаму слова не сказала, а той сваё вядзе:

— А як жа любяць мяне! Дзе б ні быў — знойдуць! Прылятуць! Дапамогуць!

— То ж і мае браты — сама дабрыня! — сказала пані і аж скрывілася. — Шукаю іх, шукаю...

— То давай табе дапамагу! Разам яно весялей...

— І тое праўда!

Едуць сабе і едуць. Тарахцяць калёсы, мінаюць лясы ды палеткі. А лясы на шлях зноўку вяртаюцца. А палеткі лёгка наперад выбягаюць. Адно дзяўчына палахліва на недарэку пазірае ды ў чараў таемных пытаецца, на якую дарогу кіраваць, дзе братоў родных шукаць. Дарога ж ніяк не скончыцца. І братоў нідзе не відно.

— Глядзі ты! — хоча паказаць сябе недарэка. — Усе сваіх братоў шукаюць. Гэта ж як знойдуцца, столькі радасці будзе!

Пані і дзяўчына раздражнёна пераглянуліся. Радасці ў іх не было ані каліва.

— Ды слухай ты яе! — бурчыць пані. — Не яе братоў шукаем, а маіх! Так нечага да мяне прыбілася. То ж я добрая, няхай кабылку паганяе...

— А твае браты якія?

— Гожыя, маладыя. Ніколі іх не бачыла, адно ведаю, што пайшлі ў свет, калі я не нарадзілася яшчэ.

— То, мабыць, яны маладыя, — згодна заківаў недарэка. — А і мае ж браты гожыя-прыгожыя. Як усміхнуцца, то вобзем падаюць...

— Хто? Яны? — падае голас пані.

— Чаго ж яны!.. Тыя, каму ўсміхнуцца!

— А што ж такое з імі робіцца? — ціхенька пытаецца дзяўчына.

— Дык нібы ў тумане плаваюць, нічога не бачаць, то і падаюць!

— Адкуль жа туман вакол іх бярэцца? — зноў азіраецца дзяўчына.

— Ат! — махнуў рукой недарэка. — Ведама ж, дым нібы туман, а туман як дым.

— А дым адкуль? — і пані, і дзяўчына несябравіта пыхнулі.

— Ат! — весяліцца недарэка. — Як пашчы адкрываюцца, то пара з іх валіць. Шэрая, нібы дым, і густая, як туман!

— А пашча адкуль узялася? — нецярпліва сцепануліся пані з дзяўчынай.

— Якія няцямлівыя! Браты мае з пашчамі. І з крыламі. І з кіпцюрамі, — недарэка, седзячы на возе, закінуў нагу за нагу.

Дзяўчына непрыемна скрывілася, пані сярдзіта надзьмулася.

— А што, у вас браты не такія? Га? Маўчыце? Як сабе хочаце. А я маўчаць не буду!

Стаў на возе ды рукамі махае, нібы крыламі лопае. Гэта значыць братоў сваіх удае.

— От жа дурань! — не вытрымала пані. — І скуль толькі такі ўзяўся. А ты едзь хутчэй, чаго глядзіш! — прыкрыкнула на дзяўчыну. — Едзем-едзем, а ўсё ніяк не прыедзем.

— І не кажы! — азваўся недарэка. — Вось і я ляту-ляту, а ўсё ніяк не пры ляту.

— А каб ты зусім зляцеў! — буркнула пані ды пачала нешта сама сабе шаптаць.

Зрабіла выгляд, што мае вялікі клопат, а дзяўчына ад спадарожнікаў сваіх адвярнулася. Сумна стала недарэку. Ніхто на яго не зважае.

— А ведаеце, я ж лятаў! Праўда-праўда. Над палямі. Над лясамі! Аж пакуль з неба не зваліўся...

— Шкада, як не забіўся! — пані зноў нешта дзейкае сабе пад нос.

— Чары мяне ж не возьмуць, не пніся! — недарэка спачувальна пакланіўся пані. — Стараешся, бедная, а дарэмна!

— Адкуль ты ведаеш, чаго я стараюся? — палахліва глянула пані і шаптаць перастала.

— А што тут ведаць? У кузюрку мяне ператварыць хочаш. Не ўдасца! — недарэка шырока раскінуў рукі. — Глядзі, які вялікі...

— Яна цябе ў вялікую кузюрку ператварыць хацела, — азвалася дзяўчына.

— Адкуль жа ты ведаеш? Ці яна цябе ператварала? — недарэка зрабіў выгляд, што пані зусім не бачыць.

— Не ператварала! Зачаравала...

— А! Дык гэта ты пра тое, што яна, злая, прыгажуняй удалася і едзе тваіх братоў шукаць, як сваіх?

— Ды не...

— Пра тое, што яна хоча тваіх братоў падмануць, назваўшыся іх сястрою?

— Не.

— Пра тое, што хоча тваіх братоў-асілкаў са свету звесці?

— Не!

— Дык пра што? Хіба пра тое, што ты, добрая, прыгожая, шлях зачаравала, ехаць цяпер па ім ехаць і ніколі не прыехаць?

Паглядае спалохана ды каб слова недарэку. Затое пані сварыцца:

— Дык вось чаго мы так доўга едзем! — страпянулася-ўсхапілася. — Гэта калі ж ты шлях зачараваць паспела?

— А пакуль ты, калода старая, на возе прымасцілася!

— Ты ці разумееш, што нарабіла?

— Разумею! Братоў сваіх выратавала. Ты ж іх са свету звесці хацела!

— Хацела! Бо маіх братоў тваe браты звялі!

— Гэта якіх братоў? З пашчамі, з крыламі, з кіпцюрамі?

— А што? Мы сабе родзічаў не выбіраем, — асцярожна мовіў слоўца недарэка.

— А ты маўчы! — накінуліся на яго і пані, і дзяўчына. — Усё праз цябе...

— Вінаваты! — прызнаўся недарэка, бо, ведама ж, яму скажуць, ён і прызнаецца.

— А ты шлях адчаруй! — пані грозна зыркнула на дзяўчыну.

— Сама адчаруй!

— Дык не я ж учыніла кола! Табе і разбіць яго!

— Не магу! Ужо спрабавала!

— Ну! Значыць, мы адсюль не выйдзем! — падаў голас недарэка.

Дарэмна гэта зрабіў. Прычапіліся да яго абедзьве, не адстаюць. Маўляў, ты з чарамі знаешся, усё чуеш, усё бачыш, дапамагай нам. Адмаўляўся ён, адмаўляўся — не дапамагае... Што тут паробіш? Саскочыў з воза ды пабег па дарозе. Бяжыць што сілы, бяжыць, а за ім калёсы імчаць! Дзяўчына сіўку паганяе, пані на дзяўчыну сварыцца, сіўка недарэку даганяе. А той усім у адказ:

— Выйду з зачараванага шляху! Уцяку, а вас тут пакіну!

— А мы тут не застанёмся! — гэта дзяўчына.

— А я вас усіх жамярой параблю! Як толькі выберамся... — гэта пані.

— Ты не ў той бок бяжыш! Зусім недарэка! — гэта сіўка.

— Якая табе справа? Бяжы за ім ды ўсё! — злуюцца пані з дзяўчынай адна на адну. — Бач! Разгаварылася.

— Я разгаварылася? Маўчала ж! — прызнаецца пані.

— І я ні слова не казала! — праявіла сціпласць дзяўчына. — Няўжо сіўка гаворыць?

— Не! Гэта калёсы гавораць! — тлумачыць ім недарэка. — А што сварацца, тое ад вас навучыліся...

— І разумныя ж у нас калёсы! — здзівілася дзяўчына.

— Чаму гэта калёсы? Мы разумныя! Я — самая разумная! — пыхліва надзьмулася пані.

— Канешне ж, разумная! На разумных калёсах едзеш, толькі пра гэта не ведаеш! — выгукнуў недарэка, збочыўшы з дарогі ў калдобіну.

Сіўка паспяшалася за ім. Калёсы пакаціліся за сіўкай.

— Я ведаю, што еду! Ведаю! — ганарыста ўскінулася пані і звалілася з воза. Разумныя калёсы забеглі ў калдобіну. Перакуліліся...

— Ат! — супыніўся недарэка. — Беглі-беглі, натаміліся, дык няхай адпачнуць, хоць на адным баку паляжаць...

— Паляжаць? Думаеш, яны самі ўстануць? — зазлавала дзяўчына. — І адкуль жа ты такі ўзяўся?

— З неба зваліўся! — шчыра паглядзеў недарэка. Маніць ён не ўмеў...

— Гэта ты вінаватая! — сказала дзяўчына сіўцы, выпрагаючы яе з перакуленых калёс.

— Гэта ты вінаватая! — сказала пані дзяўчыне, выкараскаўшыся з-пад воза.

— А я цябе ехаць са мной не прасіла, ведзьма! Трэба ж, у прыгажуню зачаравалася і едзе, нібы пані!

— А я зусім невінаватая! — узрадавалася сіўка, адчуўшы волю. — Вы мне казалі за гэтым недарэчным бегчы, то я і бегла!

— Вось хто вінаваты! — пані, дзяўчына і сіўка паглядзелі на хлопца. Той бездапаможна азірнуўся...

Да чаго быў недарэкам, але ж зразумеў, што трэба ўцякаць. Падхапіўся, нібы зай, з усіх ног! А за ім — сіўка, а за сіўкай — дзяўчына, а за дзяўчынай — пані. І кожная крычыць адна адной: “Лаві яго! Лаві!”

Толькі не ловіцца недарэка. У адзін бок кінуўся, паўкруг даў і ў другі бок паўкруг. Скочыў, заваліўся, за пень зачапіўся. Але падхапіўся ды невядома як апынуўся проста перад асілкамі. Трыма шуканымі братамі...

— Ты ад каго так уцякаеш? — спыталі ў яго. — Ці не ад нечысці?

Чаго ж ад недарэкі чакаць? Ведама, разгубіўся. Сказаць да ладу не патрапіць:

— Мабыць, ад нечысці... Удалася ў чужым аблiччы і мяне даганяе.

Браты-асілкі стоена ўсміхнуліся.

— Паглядзім, што за нечысць, — сказалі. Ды чакаюць, калі хто прыбяжыць.

Аж як хутчэй прыбягае сіўка. І адразу да недарэкі:

— Глядзіце! Глядзіце! — лемантуе той. — Рук не мае, а зубамі мяне за каўнер хапае! Гэта ж дзе бачылі, каб коні людзей крыўдзілі!

— Які ты чалавек! — фыркае сіўка. — Толькі клопаты з табой!

— Вось! Сапраўдная нечысць, мяне за чалавека не трымае!

Смяюцца з недарэкі браты-асілкі. Маўляў, якая ж гэта нечысць, гэта ж сіўка! А той сваё даводзіць! Не сіўка, кажа, і ўсё тут!

Пакуль тое ды другое, прыспелі пані з дзяўчынай. Адштурхнулі сіўку, прыкрыкнулі на недарэку і за сваё ўзяліся:

— Я ваша сястра, а гэта — ведзьма! — кажа пані.

— Не, гэта я ваша сястра, а гэта — ведзьма! — кажа дзяўчына.

— А я не ваша сястра і не ведзьма! — падае голас і сіўка. — А ты, недарэка, чаго маўчыш?

Усе замаўчалі і паглядзелі на гэтага дзіваватага, звыкшыся, што той заўсёды чаўпе абы-што.

— Ат! Чаго ўжо хаваць! Я ваш брат, асілкі! І я вядзьмар! — махнуў рукой недарэка. — І казаў жа, што ад нечысці ўцякаю, ад нечысці! А вы мне верыць не хацелі...

— Лепш бы ты хоць як знаўся з нячысцікамі! Тады б цябе звесці са свету было можна, — засумавалі асілкі. — А не верылі мы дарма...

— Ды не! Я ж просты вядзьмар! З нячысцікамі не знаюся. Яны самі да мяне абы-чаго сунуцца, — прызнаўся новы брат-асілак.

— Вось і мы пра тое ж! І што нам рабіць з табою, розуму не прыкладзём! Ад вас-то мы ўцячом ды схаваемся! — паглядзелі асілкі на пані, дзяўчыну і сіўку.

Відаць, ніводную з іх за сястру не прызналі.

— Навошта ж вам уцякаць? — здзівілася дзяўчына.

— Навошта ўцякаць ды хавацца? — здзівілася пані.

— Навошта ж вам хавацца? — здзівілася сіўка. — Можна проста ўцякаць...

Сіўцы прыйшлося даспадобы даганяць недарэку. Гэта і лягчэй, і весялей, чым цягнуць воз.

— А на тое, залаценькія-даражэнькія, што вы нам без патрэбы! — аж падскочыў недарэка, зняважліва глянуўшы на сіўку.

— Чаго?! А я? — не сцярпела дзяўчына.

— Пры чым тут ты! А як жа я? — грамчэй за дзяўчыну пыхнула пані.

— Што, і я вам не спатрэблюся? — пакрыўдзілася сіўка. — Тады цягніце калёсы самі...

— Ды згодныя яны цягнуць калёсы, згодныя! — адказаў за асілкаў недарэка. — Толькі яны пакуль не ведаюць, што давядзецца цягнуць.

— Яшчэ чаго не хапала! — надзьмуліся браты-асілкі. — Вам трэба, вы і цягніце! А мы ад вас пойдзем...

— Куды? — глянула цікаўным вокам дзяўчына.

— Куды? — засердавала пані. — Я вам пайду!

— А я за вамі збягу, куды б вы ні пайшлі! — узрадавалася кемлівая сіўка.

— А мы цябе з сабой не возьмем! — скоса паглядзелі браты-асілкі.

— Ясна табе, сіўка? — аж прыскокнуў недарэка. — Ніхто цябе з сабой не возьме! Ні яны, ні я! Хоць пакуль нікуды і не збіраюся.

— А ты, недарэчны, пойдзеш з намі! — асілкі паціху пераглянуліся.

— Навошта? Каб мяне ўся нечысць палохалася? Разбягалася як хутчэй?..

— Не.

— Каб я нечысці палохаўся, уцякаў? А вы б яе хутчэй лавілі ды білі?

— Не.

— Дык чаго ж? Хіба, каб ніхто не дазнаўся, што вы нечысць лавіць-біць і не думалі, а так сабе па свету хадзілі, людзей весялілі?

Трое братоў здзівіліся, зноў пераглянуліся і як знямелі. Самі спалохаліся... Дзіўна, але аказаўся недарэка надзвычай здагадлівым. З нявыкруткі прызналі як ёсць роднымі сёстрамі і дзяўчыну, і пані, і асабліва сіўку! Ледзьве з ёю, даўгагрывай, не цалуюцца. З дарагімі сёстрамі сваімі вядуць зычлівую гамонку:

— Завядзём вас у цёмны лес і там пакінем!

— А мы вас у карузлікаў зачаруем!

— А мы вас чарцям прададзім!

— А мы і вас, і чартоў слугаваць прымусім!

— А мы вас будзем крыўдзіць!

— А мы вас — падманваць!

— А я зусім ад вас пайду! — грамчэй за ўсіх крычыць недарэка. — Біцеся-падманвайцеся, але без мяне!

Ды, завярнуўшыся, пайшоў. Маўляў, глядзіце, не жартую. Усе паглядзелі ўслед і сварку супынілі. Сіўка ж паглядзела на дзяўчыну, на пані, на братоў-асілкаў і рушыла за недарэкам. Дзяўчына паглядзела на пані, на братоў-асілкаў і пайшла за сваёй сіўкай. Пані паглядзела на братоў-асілкаў і па-

крочыла за дзяўчынай. Слаўныя асілкі зладжана пераглянуліся і патупалі за пані. І ніхто не крычыць, не сварыцца, не крыўдзіць, не падманвае! Адзін недарэчны балбоча сабе ды балбоча:

— Выправілася дзяўчына братоў шукаць у няблізкую дарогу! Запрэгла сіўку ды і паехала, — глядзіць то на дзяўчыну з сіўкай, то на сіўку з дзяўчынай.

— Не! — пярэчыць яму сіўка. — Гэта я сама запрэглася...

— А я нікуды ехаць не збіралася! — гэта дзяўчына.

— Хай будзе так! — радасна пагаджаецца недарэка. — Ехалі сабе дзень, ехалі другі, а на трэці з дарогі збіліся, у глушэчу патрапілі, добрую старую сустрэлі! — і глядзіць то на пані з дзяўчынай, то на дзяўчыну з пані.

— Не! — злуе дзяўчына. — Гэта я наўмысна ведзьміну хату знайшла!

— А я ніякіх чараў наводзіць і не думала! — гэта пані. — Ні маладой удавацца, ні панаватай рабіцца, ні братоў чужых шукаць, сваіх не маючы...

— Няхай так, — зноў не спрачаецца вясёлы. — Абярнулася ведзьма важнай пані, дзяўчыну слугаваць змусіла. І ўсё для таго, каб вас адшукаць, — глядзіць на першага, другога і трэцяга брата. На трэцяга, другога і першага... На другога, першага і трэцяга...

— А ведаеце, слаўныя, што зараз будзе?

— Не! — гавораць браты. — І ведаць не хочам...

— А я думаю, што хочаце ведаць усё як след! — аж пляскае ў ладкі недарэка.

— Чаму гэта? — не вераць яму браты.

— А таму, што вы, залаценькія, сёстрам сваім узрадуецеся, дадому разам пойдзеце і сварыцца болей не будзеце... Я вас на такое зачарую!

— Як ты нас зачаруеш? — засмяяліся асілкі. — Не бяруць нас ніякія чары...

— Нічога, — не сунімаецца дзіўнаваты. — Мае чары вас як-небудзь ды возьмуць!

І сказаў таемнае слова... Азваўся таемным шолахам вецер, паляцеў імкліва, вярнуўся назад, як прыгадаў адзінокі шлях, што зачараваным колам круціцца, а ніяк скончыцца не можа. Абудзіў смутак у сэрцы. І на прымройлівым даляглядзе паўстаў коннік, як сатканы з просіні, журбою ў вочы паглядзеў і знік, быццам не было яго ніколі. Адно журбу сваю пакінуў...

— Я рады бачыць цябе, брат! — паклікаў яго дзіўнаваты. — Я ведаю, што ты заўсёды ідзеш за мною.

І яшчэ мовіць дзіўны... Хмарамі неба зацягнулася, цёмнымі вачамі на зямлю паглядзела. Трывогай людзей агарнула. Як з хмар саткаліся прыгожыя халодныя абрысы. Гневам пыхнулі, адчай на людзей кінулі ды зніклі гэтак жа хутка, як з'явіліся. Адчай у сэрцах застаўся...

— Я рады бачыць цябе, брат! — азваўся дзіўнаваты. — Я ведаю, што ты заўсёды ідзеш за мною.

І зноў не маўчыць той, каго зразумець цяжка. Дажджы з неба паліліся, слязьмі ўвесь вялікі свет загарнулі. Ды выплыла з дажджоў на імгненне велічная постаць. Нягоды абяцала ды хутка растала. Нядобрае прадчуванне пакінула...

— Я рады бачыць цябе, брат! — зноў кажа дзіўны, а болей нічога мовіць не здолее...

Аціх вецер, паплылі некуды хмары, суняліся халодныя дажджы. Спачувальна глядзяць на недарэку сіўка, дзяўчына, пані, нават браты-асілкі спагадаюць.

— Дык вось якія твае браты! А ты ж казаў, што з пашчамі, з крыламі, з кіпцюрамі...

— А і з пашчамі, і з крыламі, і з кіпцюрамі! Мае вострыя кіпцюры смутак. На крылах ляціць гнеў. Разяўляе пашчу дрэннае прадчуванне...

— Вось чаму ты зусім недарэчны! Не быць іншым з такімі братамі!

— А вы, як не маеце гэтакіх родных, не сварыцеся. Навошта вам падманваць? Трэба рабіць як найлепей, забыўшы пагарду. І тады кожны зможа стаць такім, якім іншага бачыць жадае. І ўсім будзе добра!

— То, мабыць, так. Не будзем вас крыўдзіць! — кажуць браты-асілкі.

— Не будзем вас падманваць! — радасна пераглядваюцца пані з дзяўчынай. І сіўка згодна галавой махае.

— Не будзем вас чарцям прадаваць!

— А мы вас у карузлікаў чараваць!

Пачуўшы такое, усміхнуўся недарэчны і зрабіўся як ёсць прыгожым. Вочы глыбокія, позірк шчыры. Адкрыта свету радуецца. Ды адзін не застаецца. Паскакалі да яго па зямлі тры велічных вершнікі. Як белымі аблокамі спавіўся адзін, і ведны, і праніклівы. Гаворыць, што рады бачыць брата, пытаецца, чым жа дапамагчы роднаму. Як імклівымі вятрамі падхоплены, паўстаў другі, і настойлівы, і смелы. Не хавае, што рады бачыць брата, жадае дапамагчы роднаму. Як дажджамі светлымі вымыты, з'явіўся трэці, і спагадлівы, і адданы. Проста пытаецца, чым дапамагчы роднаму брату... Самаму дасціпнаму.

Знямеўшы, не зводзяць вачэй з чарадзейных братоў сіўка, дзяўчына, пані, трое шуканых хлопцаў. А той, каго яны называлі недарэкам, гаворыць, што хоча хадзіць па свеце, ратаваць людзей... І абяцаюць дапамагаць яму браты. Плёну жадаюць ды знікаюць.

Зніклі. Быццам той цуд самы жаданы... Выглядаюць іх сіўка, дзяўчына, пані ды трое зухаватых, выглядаюць, а не бачаць. Як былі, ды ўжо няма!

— Трэба і вам такімі зрабіцца! — кажа дзяўчына братам-асілкам.

— Табе трэба, ты і рабіся! — яны ў адказ. — А мы нас шукаць не прасілі.

— Ды вас жа ведзьма злая зачараваць хацела! А я вас ратавала.

— Ды навошта мне гэтыя? — паважна мовіць пані. — Я лепей тых, велічных, зачарую! Будзе мне пашана... — прымройліва ўздыхнула.

— А ці ўдасца табе гэтакіх падмануць? — з недаверам глянулі хлопцы.

— А чаму не? Яны ж зусім не вы! — ганарыста надзьмулася ў адказ.

— А ты гэтак добра ведаеш, што яны зусім не мы! — пакрыўдзіліся асілкі. — Вядзьмарка няўдалая!

— Ды хто б казаў! — прытупнула панаватая. — Набрыдзь вы, а не асілкі!

— Эх! Каб жа гэтых велічных ды за каўнер ухапіць! — летуценна фыркнула сіўка.

— Маўчала б, страхоцце! Нават зачаравацца ў прыгожую не можаш!

— А вы зусім нічога не ўмееце! Нават нечысць злавіць!

— Эх! Каб жа гэтых велічных ды змусіць цягнуць калёсы!

— А мы нечысць лавіць зусім і не жадаем! Проста вандравалі сабе...

— А чаго вы жадаеце? Смачна есці-піць ды нічога не рабіць?

— Шкодзіна!

— Злыдні!

— Ведзьма!

— Недарэкі!

— А што ж? Няхай сабе і недарэкамі пабудзем! — асілкі згодна пераглянуліся. — Вось прылятуць да нас такія... з крыламі, з пашчамі, з кіпцюрамі, а мы іх пераможам!

— Вы лепей калёсы прыцягніце, гультаюгі! — зняважліва глянула сіўка.

— А чаго іх цягнуць? Няхай самі коцяцца! А калі прылятуць такія, то мы не разгубімся... Ужо не!

І далей баяць, як усё будзе:

— Калі таемным шолахам прабяжыць вецер, прыляціць адзін, і разбуральны, і грозны. А мы ж яго прагонім, выратуем усіх!

Не схацела слухаць братоў вядзьмарка-пані, завярнулася ды пайшла прэч.

— Калі хмарамі неба ўсё зацягнецца, з'явіцца адзін, і цёмны, і жахлівы. А мы зноў пераможам! Напалохаем яго самога!

Не схацелі слухаць далей дзяўчына з сіўкай. Пайшлі сабе прэч.

— Калі сцюдзёныя дажджы зальюць свет, прыйдзе адзін, і помслівы, і спавядальны. І ўжо яго мы пераможам! Не дазволім справядліва пытацца за справы людскія! А ты чаго ж прэч не ідзеш? — дзівяцца браты.

— А куды ж мне ад вас пайсці? — усміхаецца недарэка. — Глядзіце, як плача пад ветрам вунь тая вербалозіна. Гайдаецца-калышацца, у вадзе тоне, да зямлі цягнецца. Дапамажыце ёй, беднай...

Пераглянуліся браты ды патупалі да ракі, дзе вярбіна расла. А далей што зрабіць, таго не ведаюць... Адзін кажа, што трэба яе адсюль выцягнуць ды вышэй на беразе пасадзіць. Другі хоча зямлі болей прынесці. А трэці намаўляе братоў каўшом ваду з ракі выліваць, каб сушэй было. І ніяк да ладу не дойдуць!

Пачула тое вярбінка, лісцем на братоў замахала, засварылася. Маўляў, ідзіце прэч, а я буду сама неяк з вадой змагацца, да зямлі цягнуцца. А вы мне без патрэбы.

Нічога не паробіш, давялося братам тупаць назад. Да недарэкі вярнуліся, а той ім ды загадвае:

— Ідзіце зноў да той самай ракі. Пачуў я, што скардзіцца свету, горка плачучы, рак-вусач. Бядуе, што пад вадою ды пад зямлёю хады рые, а сонейка не бачыць ніколі. І ад таго цяжэй за ўсіх яму жыць на свеце. Дык вы хоць як-небудзь яму дапамажыце!

Пераглянуліся хлопцы ды як хутчэй заспяшаліся да ракі. Па водмелі хадзілі, рака-вусача злавілі. Пытаюцца ў яго, чаго ж для лепшага жыцця трэба.

А рак у адказ:

— Сонца мне вочкі слепіць, нічагуцькі не бачу. Назад мяне ў нару пасадзіце. Буду там спаць, назбіраныя бурштынавыя скарбы хаваць...

Нічога не зробіш. Адпусцілі браты вусача ды бягом да недарэкі.

— Ты, — кажуць яму,— наўмысна гэтак дзееш, што мы нікому не дапамагаем, адно туды-сюды дарэмна ходзім. Каб з нас болей не жартаваў, паб'ём цябе за гэта!

Як толькі пачуў недарэка, што асілкі хочуць біцца, болей ні пра што не запытаў, нічога не сказаў, а з усіх ног ды наўцёкі. Чаго ж яшчэ чакаць ад недарэкі?

Як бег, так і бег. За пень зачапіўся, у яміну ўваліўся, паляцеў-паляцеў... Аж бачыць, ён зноў на дубовай галіне вісіць, моцна за каўнер зачэплены. Ноч таемная, зорная, а цуд залатагрывы тут як тут, свой ахапак сена скубе. Ні пра што не дбае...

— Ты лаві яго, лаві! — скачуць высока ў галінах увішныя ваверкі. — Мы б самі злавілі, але маленькія. Гэта ж цуд! Жаданні твае выканае. Ды і нам няхай паболей арэхаў начаруе.

— Авой! Якія ж шкодныя ваверкі! — гучна абурыўся недарэка. — Цуд паймаць жадаюць!

Тое, названае цудам-дзівам, пачула моўленае, азірнулася, узвілася да неба і растала... А ваверкі агулам узяліся за важную справу — сапхнуць недарэку з галіны.

— Спыніцеся! Я не хачу! Я звалюся!

І мякка кульнуўся ў стог, адчэплены ад галіны працавітымі лапамі. Спалохаўся. Азірнуўся. Ды кажа самому сабе:

— Шкодныя ж якія ваверкі! Авой!

# ЛЕСАВІК, ВАДЗЯНІК, ПАЛЯВІК

*Міфалагічны трыпціх*

## *Лесавік*

Задумаў аднойчы стары пушчанскі лясун-лесавік стаць зычлівым, ласкавым, добрым. З людзьмі пасябраваць. Вырашыў так. Разважыў усё як след, па сцежках зглушэлых прайшоўся. Зайцам, вавёркам строгі наказ даў:

— Людзей не крыўдзіць, капусту ды моркаўку з град не цягнуць, шышкамі не кідацца…

Здзівіліся зайцы і вавёркі. Нічога ж яны з гэтага і так не рабілі, сумленна жылі з таго, што даваў ім лес.

— Ну і што? — сказаў паважна лесавік. — Не рабілі, а раптам уздумаеце? Дык я вам наперад сказаў, што не трэба так…

Пакланіліся зайцы ды вавёркі лесуну, пайшлі па сваіх справах: траўкай салодкай ласавацца, грыбы ды шышкі збіраць. А лесавік той прысеў на замшэлы пень ды ўзяўся думаць думу:

— Гэта праўда, зайцоў ды вавёрак я папярэдзіў. Але ж у маім лесе яшчэ процьма іншых звяроў… Ці ж пагодзяцца лісы не красці з вёсак курэй? А каб які воўк ды не сцягнуў з чарады ягня? Ды і мядзведзі ў зладжаныя чалавечай рукой вулейкі за мёдам лезуць… Як жа мне так зрабіць, каб і гэтых усіх не зачапіць, але ж і добрым, спагадлівым да вясковых стацца?..

Засяродзіўся лесавік, толькі адно ў галаве і трымае. Упадабаў вясёлыя перагукванні, калі збіраюць дзяўчаты грыбы, ягады. Адно шкада, як хутка збягаюць з лесу, напалоханыя рэхам, што ён, лясун, ад душы цягне-выводзіць… Палахлівыя яны, навошта ж так. А якая любата цікаваць за паважнымі ціхімі зялейніцамі, што прыходзяць з тых жа вёсак па лекавую травіцу. І хаваць, удаючы адну кветку іншай… І чаго ж

турбавацца-скардзіцца? Дарма ўсё гэта. А калі зімой звонкая сякера валіць сухастоіну?! От ужо задавальненне! Зладзіць увішны працаўнік добры воз, а з лесу выехаць не можа. Ён, лясун, дражніцца, па лесе водзіць-кружляе. Учуе чалавеча лясны подых, падхопіцца, схамянецца. А вясёлы лесавічок, так падкраўшыся, яшчэ і лясной птушкай прывітанне пракрычыць:

— Як добра я цябе напалохаў! Ды працуй, працуй, не бойся. Слухай, а давай сябраваць!

Але нічога не адкажа яму чалавеча, яшчэ і ўздыхне цяжкацяжка, як быццам не разумеючы яго, лесунову, мару-спадзяванне... Дык якое ж тут вясёлае сяброўства? Скруха адна. А вось каб з людзьмі ды пагадзіцца... Каб не крыўдзіліся яны, калі лесавік-лесавічок будзе палохаць. Ён жа як на тое любіць гульні. А звяры гульняў не разумеюць, дык і нецікава з імі.

Думаў-разважаў так лесавік і вырашыў парадзіцца з суседам-вадзянікам. Пайшоў у госці...

## *Вадзянік*

Вадзянік задаволена драмаў у ціне і бачыў прыемныя сны. Плёхаліся непадалёку зялёнавалосыя русалкі, ленаваліся збіраць водарасці, скарыстаўшы тое, што засталіся без прынукі. Вадзянік жа не спяшаўся прачынацца. Бачыў у сне, што вялікім-вялікім зрабілася яго валадарства. Там, дзе раней былі нізкія агароды, плаваюць маленькія цікаўныя рыбкі. Людзі ходзяць па кладках, вітаюцца з ім, вадзянікам, дораць русалкам такія любімыя імі ручнікі, кланяюцца нізка. І такі вясёлы ва ўсіх настрой, які бывае толькі вясновай паводкай. Але ж не, зусім не вясна гэта. Цвітуць лілеі на вялікай вадзе, якая забралася і на ўскраек лесу, і на палявое ўзмежжа. Ды такое хараство навокал, што аж заліўся радаснымі слязьмі вадзянік і з таго прачнуўся.

Агледзеўся па баках. Прыкрыкнуў на русалак, якія, плёхнуўшы хвастамі па вадзе, кінуліся наўцёкі. Агледзеўся яшчэ раз і зніякавеў-засумаваў. Толькі сном была тая жаданая, такая прыгожая мара. А што зрабіць, каб жа абярнулася явай, ён, сівавусы, не ведае. А яго ж яшчэ і русалкі не слухаюцца. Бяда адна дый годзе...

— Што, братачка, зажурыўся? — раптам пачуў вадзянік і ўбачыў свайго даўняга сябрука-лесавіка. — Што за гора з табой прычынілася? Возера ў цябе ладнае. І ад лесу, і ад поля добра захоплівае. І вёску з яго ты бачыш. Ды не адну. Чаго табе смуткаваць?

— І нічога я не захопліваю. Падумаеш, тры яліны твае ў маё возера глядзяцца. Дык самі ж ваду маю і п'юць, — адказаў-прабурчэў вадзянік. Калі быў не ў гуморы, мог адно сварыцца ды папракаць. — Кажы, лесавы, п'еш маю ваду? Га?

— З цябе вып'еш! — зазлаваў адразу лясун. Хоць ён вадзяніка і меў за сябра, але ж быў пэўны, што розуму ў таго меней, чым у зайчаняці. — Сам шышкі ад тых ялін крадзеш!

— Дык ты ж у мяне тымі шышкамі кідаешся!

— Я не кідаюся, я баранюся. Бо ты ж злосны захопнік!

— Я? Я захопнік? — задыхнуўшыся ад абурэння, не адразу знайшоўся вадзянік.

— Ты! Ты захопнік!

— А ты?

— А я хто?

— А ты лясун!

— А я лясун!

— А я хто?

— А ты разумны, як прытопленае бервяно!

— Вось бачыш, сам кажаш, што я разумнік! — пераможна надзьмуўся вадзянік, запырскаў вадою з вусоў, горда прыўзняўшыся над азёрнай роўняддзю. Сядзеў так, ажно пакуль не пабачыў, як лесавік ціха заходзіцца ад смеху.

— Дык ты, братачка, з мяне злосна здзекуешся? — “ласкавенька” прашаптаў пакрыўджаны вадзянік, зачэрпнуў жвіру шырокай жменяй ды з усёй радасці шпурнуў у лесавіка-“братачку”.

Жвір ды глей мякка абляпілі замшэлага лесавічка. Той страсянуўся ад нечаканасці ды перастаў смяяцца. Мыцца ж цяпер не адмыцца...

— Ах ты ж, вадзяніла шкоднае!!! — загукаў лясун, прычарадзеіў сабе ладную дубоўню ды з усёй шчырасці плёхнуў па вадзе там, дзе толькі-толькі быў вадзянік.

— А я ўжо тут! А я ўжо тут! Не папаў, не папаў! Сам ты разумнік, як паваленае гнілое бервяно! — булькаў, падскокваючы, вадзянік.

Скасавурылася ўсё лясное валадарства. Пахмурна, як варожа, паглядаюць на возера цёмныя яліны. Пагрозліва-прытоена зашумелі, загулі магутныя дрэвы-волаты. Ды і возера ў адказ не маўчыць. Усхадзілася хвалямі, задрыжэла ад гневу. Вось-вось выплеснецца са сваіх берагоў!

Плешча лесавік па вадзе, кіпіць, злуецца. Ужо і вадзянік не бароніцца аднымі кпінамі. Зачэрпвае ў прыгаршчы тройчы болей, чым на вока здаецца, ды кідае-ліе проста ў твар лесавіку.

— Папаўся ты, вадзяніла!

— Не, лесавічок, гэта ты цяпер не ўцячэш!

— Будзеш ведаць, як да мяне сунуцца!

— Сам атрымаеш!

Ой, нарэшце вось-вось лес на возера! Не, не саступіць возера лесу! Будзе немалая бойка. Будзе бяда і лесу, і вадзе...

Ды толькі, знянацку ступіўшы нагою на водмель, паслізнуўся лесавічок, выпусціў з нечаканасці дубоўню, якая плюхнулася-такі проста на вадзяніка... Булькнуў азёрны валадар, спалохаўся, супыніўся. Не чакаў ад свайго сябра-суседа такога спрыту. Ды і лесавік, мокры да апошняй махавінкі, крыху аціх. Як

застаўся без дубоўні, так і страціў усялякую ахвоту біцца. Ды і вымыцца азёрнай вадой паспеў. А вадзянік, аказваецца, упарты...

— Слухай, суседзік, ну чаго мы? — асцярожна глянуў на лесавіка вадзянік. — Ці ж нам прастору мала?

— І праўда, суседзік! Што ж мы? Ад палевіка вунь колькі хочаш, столькі і захоплівай, — адразу знайшоўся лесавік.

— Але ж! — пагадзіўся ўражаны лесавіковай кемлівасцю вадзянік.

Сябры-суседзі згодна памаўчалі.

— Дык, можа, і захопім? — не пакінуў важнай гутаркі лесавік. — Я наперад пайду, а ты мяне вадою падтрымаеш. Лес жа добра ідзе, калі ёсць вада.

— А чаму гэта ты першым? — не пагадзіўся вадзянік. — Няхай вада ідзе наперад, а лес — за ёю. І вада добра ідзе, калі з лесам разам...

Сябры-суседзі нязгодна памаўчалі. Паглядзелі адзін на аднаго. Зноў памаўчалі. Зноў паглядзелі.

— Слухай, сябрына, — прамовіў гэтым разам вадзянік. — Такая хвацкая ў цябе дубоўня! Гахнуў, як булавой, аж іскры з вачэй! Падары мне яе!

— Бяры, сябрына, — пагадзіўся лесавік, усцешаны тым, што яго дубоўню ды булавой назвалі. — Толькі глядзі, каб пра такі падарунак мне шкадаваць не прыйшлося...

— Не, не, не! — аж затросся ўвесь вадзянік. — Хочаш, я табе за гэта адмыцца дапамагу?

І, не чакаючы згоды сябра-суседа, выліў на яго плюху вады.

— Досыць ужо! Досыць! — залямантаваў на ўвесь свет лесавічок. — І так усяго вымачыў. Тры дні цяпер сохнуць буду.

— Прабач, прабач, братачка, — адразу ж перапрасіў вадзянік. — Я ж хацеў як лепей. Ты мне вось што скажы...

— Што табе сказаць? — падазрона зірнуў лесавік.

— Ды не імшыся ты! Чаго да мяне прыходзіў? — лагодна мовіў вадзянік.

— А... Чаго? — прыціх лесавічок. — То паслухай...

І распавёў даўняму сябру, што хоча ён, лясун-лесавік, стаць і чулым, і добрым... Да людзей, канешне ж. Каб пасябраваць з імі. І з вадзянікам-суседам на такую справу навечна замірыцца... Надакучыла, маўляў, сварыцца ды біцца. А лепшым стаць даўно ўжо хацелася!

— Якая ж гэта дзіўная дума-знаходка, — прашаптаў усхваляваны вадзянік. — Сапраўды ты за мяне разумнейшы! Як жа я сам да такога не дакумекаў?!

Даўно ўжо была такая завядзёнка: тое, пра што марыў лесавік, жадаў займець і вадзянік. Тое ж, што было ў вадзяніка, не давала спакою і лесавіку. І пільна сябрукі адзін за адным цікавалі-сачылі...

— Ды што дзіўная-цудоўная... — цяжка ўздыхнуў лесавік. — Што цудоўная, я і без цябе ведаю. Але ж як гэта ды здзейсніць?

Паглядзелі сябры-суседзі адзін на аднаго. Падумалі. Яшчэ раз паглядзелі. Яшчэ раз падумалі... І раптам вадзянік ледзьве не выскачыў з возера.

— Чаго ты, вадзяніла, скачаш? — недаверліва хмыкнуў лясун. — Ці ўспомніў, што яшчэ аднаго залацістага карасіка можаш здабыць?..

Лесавік добра ведаў, як моцна падабалася ўсё бліскучае ды іскрыстае яго сябру.

— Ой, братачка! Хочаш — здзекуйся, хочаш — не, — аж задыхнуўся ад хвалявання азёрны валадар,— толькі ведаю пэўна, як нашую думу-мару ды спраўдзіць!

— Маю, маю думу! — паспрабаваў не саступіць лесавік.

— Не, нашую, нашую! Іначай не скажу!

— Ды кажы ж ты!

— А не скажу!

— Добра, добра, нашую! Толькі кажы ж хутчэй!

Надзьмуўся ад пыхі вадзянік ды мовіў:

— Трэба запытаць у палевіка.

— Ах ты ж, вадзяніла! А я думаў, ён што разумнае скажа! Прытопленае бервяно! — усхадзіўся лесавік ды ў хуткім часе супакоіўся, разважыў.

— А што ж! Палявік гэты ледзьве не па ўсім свеце лётае. Многа бачыць, шмат чуе. Ведама, малады, хуценькі.

Вадзянік ды лесавік згодна заківалі галовамі, заўсміхаліся. Палевіка яны абодва не любілі.

— Можа, і дарадзіць чаго... А калі што якое, дык мы ж яго заўсёды падманём!

Разважылі так вадзянік з лесавіком. Пайшлі да палевіка ў госці...

## *Палявік*

А палявік ні пра што не думаў, ні пра што не марыў, сядзеў сабе ў цені калючай ігрушыны, што адзінока глядзела на няблізкі лес, на далёкае возера. Такой цяжкай удавалася палевіку паўдзённая спякота. У яго ж няма ані шумлівай прахалоды лясоў, ані ласкавай сцюдзёнай вады. А лета ж выдалася гарачае. Апоўдні робіцца так млосна, што бачна, як дрыжыць паветра над узгоркамі. Цяжка яму, беднаму, цяжка... А пад вечар так стомішся сядзець ды ляжаць пад цяністай ігрушынай, што аж бакі забаляць. Ну і што гэта за валадарства такое, смех ды і толькі.

А тут яшчэ тая самая ігрушына шыпіць раздражнёна, злосна:

— Дождж пакліч, каб палеткі твае паліў. Выгарыць усё!

Не стрымаецца тут палявік:

— Каб ты кеміла так, як добра колішся сваім веццем! Не можа палявік клікаць дажджоў. Лепш цень старанна трымай, а то мне сонца ўжо вочы засціць...

— Ах ты ж ляноціна! Ценю табе мала, сонца табе вочы засціць! Плыве сонца — бяжыць цень! Ніяк яго не ўтрымаеш. Як горача, дык сам перапаўзай! — і смачна кідала ў палевіка кіслай дзічкай.

— Ох-вох! — уздыхаў палявік. — Каб ты ссохла!

Але памалу пераходзіў у цень. Сонца сапраўды засціла вочы.

— Я з табой і так дашчэнту высахла, — не маўчала ў адказ ігрушына. — І здарылася ж мне не ў лесе вырасці. Вось жа непашчасціла. А мо ля хат, ля калодзежаў у садзе... Вось любата была б!

— Ды каму ты патрэбная, дзічка?! — салодка пазяхаючы, азываўся палявік.

— А ты каму патрэбны? — аж скаланалася ігрушына ад камля да верхавіны. — Нічога не робіш, не ўмееш, адно спіш, каб ты не прачнуўся!

— Я цябе не слухаю! Не слухаю! Не чую!

— А вось я табе! — шпульнула ў палевіка цэлую жменю маленькіх дзічак.

Палявік ратаваўся ўцёкамі. Падхапіўшыся, бег дарогай і бездаражжу, ажно пыл з-пад ног курэў... Але нядоўга. Спякота і не думала адступаць, наадварот, даймала ўсё мацней. Валадар палёў спыняўся, сядаў дзе-небудзь пры дарозе і разважаў пакрыху-паціху:

— Ну і што, як няма дажджоў? Канешне ж, яно лепей, калі паліць. І жыта добра расце, і трава. Ат, што паробіш! Пайду заміруся. Няма ж анідзе болей ценю. Так горача, хоць плач!

Мяркуе так палявік, аж бачыць, як з узмежжаў сваіх валадарстваў яму вадзянік ды лесавік рукамі замахалі. Маўляў, падыдзі да нас.

— І чаго ім спатрэбілася? — незадаволена чмыхнуў палявік.

Так ужо павялося, што ні лесавіка, ні вадзяніка ён не надта каб прывячаў. Часцей сварыўся з абодвума ледзьве не да бойкі. То лясун які кавалак поля адбярэ ды лес там вырасціць... Хоць і прыгожа зробіць, слаўна, ды і палёў у валадарстве столькі, што і не злічыць, але ўсё роўна шкада. То вадзянік гэты вясной поймы залье, трава вырасце там густая, высокая. Прыйдуць людзі на сенакос, песні пяюць, аж заслухаешся. Пра зямлю, пра крыніцу. А яму, палевіку, крыўдна. Гэта ж не яго, а вадзяніка славяць. Крыўдна. І ўсё тут.

— Ну, чаго хацелі, суседзікі? — палявік зычліва ўсміхнуўся. — З чым прыйшлі?

— А прыйшлі мы з добрай думай, — сказаў першым вадзянік.

— Ага, з добрай, — захітаў галавой лесавік.

— Ніводнай лапіны поля вам не аддам, — рашуча махнуў рукой палявік. — І думаць тут няма чаго!

— Ды ты паслухай...

— І слухаць не буду! — зверху ўніз паглядзеў на лесавіка і вадзяніка. І павесялеў: што і казаць, тыя нібы прысадзісты пянёк ды мокрая лужына. — Ну, што за дума такая? Га?

— А задумалі мы, суседзік, думу вялікую...

— Ага, вялікую.

"Вялікія думы з лесу ды вады, — падазрона азірнуўся па баках палявік. — Тут трэба быць асцярожным".

— Задумалі мы, братачка, зрабіцца ласкавымі ды спагадлівымі.

— Чуйнымі і добрымі.

— А да каго? — асцярожна пацікавіўся палявік.

— Да ўсіх... — шчыра-шчыра мовіў вадзянік.

— Да ўсіх, — сумленна-сумленна прызнаўся лесавік.

"Тут нешта не тое, — упэўніўся палявік. — Ох, не проста ўсё гэта!.."

— Зрабіцца ўважлівымі, мілымі, чулымі, — гнуў сваё вадзянік.

— Па-чалавечы даравальнымі, — азваўся лесавік.

— Праніклівымі, — летуценна ўздыхнуў вадзянік.

— Хітрымі, — утрапёна прашаптаў лесавік.

— Чаго? — узбурыўся палявік. — Вы і так праніклівыя і хітрыя. Што адзін, што другі...

— Ой не! — схамянуліся сябры-суседзі. — Без гэтага. Але зрабіцца добрымі ды спагадлівымі сапраўды вельмі-вельмі хочам...

— Дык за чым жа справа?

— А парай ты нам, суседзік, ці ж няма на свеце такіх чараўцудаў, каб у адзін момант...

— Узяў ды зрабіўся добрым. І ўсё тут!

Пачухаў патыліцу палявы валадар. Як жа гэта, каб раптоўна ды паласкавець. Асабліва вадзяніку ды лесавіку. Што ж тады, і на палеткі яго сквапна пазіраць не будуць? Не можа так стацца. Але ж просяць, ледзьве не плачуць...

— Ты ж, палевічок, свет бачыш, усё ведаеш-чуеш. Дык ты ж нам падкажы. А мы ўжо ў даўгу не застанёмся...

Значыць, цвёрды ў іх намер. Дапамагчы ці што? Але як толькі падумаў пра дапамогу палявік, зрабілася яму крыўдна-крыўдна... Суседзікі-братачкі, ці бачаце, лепшымі хочуць быць, а ён што, за іх горшы? Не, зусім не горшы! Хоць і валадарства небагатае, ды такое вялікае.

— І я хачу зрабіцца добрым! Чаму гэта толькі вы? — паказаў сваю крыўду палявік.

— Чаму гэта ты? — не саступіў лесавік.

— А чаму ты? — насупіўся палявік на вадзяніка.

— А чаму я? Га? — перапытаў вадзянік у лесавіка.

— Таму што ты самы разумны, — не міргнуўшы, адказаў лесавік. — Каму ж, як не табе?

— А вы чаго да мяне прылаўчыліся? Думаеце, што я стану добрым, і вы за мною? — адчуў павагу да сябе вадзянік, тупнуў мокрай нагой, выбіўшы лужынку.

Яе адразу глынула перасохлае поле, як папрасіла яшчэ.

— Што ты гразі мне напускаеш! — не стрымаўся палявік.

— Якой такой гразі? Глеба стала, што камень. Дажджу просіць, — паважна адказаў вадзянік.

— Дык дажджу, а не вады! — фыркнуў катом палявік.

— Браточкі, суседзікі, — усхапіўся лесавік. — Навошта ж нам зноў сварыцца? Да таго ж вядома даўно, што дождж — гэта таксама вада...

— Але ж, вада, — упэўнена мовіў вадзянік. — Гэта я, вадзяны валадар, табе кажу.

— Ну, можа, і вада, — пагадзіўся палявік, ужо зразумеўшы, што трохі даў маху... Трэба было ў чым іншым вадзяніка звінаваціць. Ці лесавіка. Ці абодвух. А самому, пакуль тое ды сёе, зрабіцца добрым і шчырым. Ах, не дакумекаў! Шкада, шкада!

— Слухайце, браточкі-суседзікі, — вёў між тым далей лесавік. — А давайце ўсе трое зробімся і ласкавымі, і спагадлівымі. Так яно і лацвей, і цікавей...

"Ага, лацвей, — падумаў вадзянік. — Захапіць лесу палявое валадарства. Зашумяць сасёнкі з бярозкамі..."

"Ага, цікавей, — упэўніўся палявік. — Захапіць лесу вадзяное валадарства. Дачыста выпіць, а на тым месцы бярозы з сасёнкамі вырасціць".

— Не можа быць, каб мы на тры галавы ды такую справу не здужалі! — лесавік пляснуў у далоні.

— Ат, чаго там, здужаем, — плюхнуў і вадзянік мокрымі рукамі, апырскаўшы і палевіка, і лесавіка. — Ды толькі як?

— Як?

— Можа, так...

— Не!

— А можа...

— Не!

— І не думай!

— Ды я і не думаю!

— Вось і не думай!

— А я ведаю, ведаю!

— Не, не ведаеш!

— Не ведаеш!

— А вось жа ведаю! — аж падскочыў ад радасці палявік. — Нездарма ж я чаго толькі не бачыў, чаго толькі не чуў!

— Ну! Кажы!

— Кажы!

— Ходзіць-вандруе па белым свеце непрыкметны цёмны-цёмны чарадзей, — распачаў палявік, зручна ўладкаваўшыся ў высыхлай траве, а лесавік і вадзянік слухаюць, утаропіўшыся. — Але не злы, не помслівы.

— Цёмны чарадзей, вох.

— Цёмны-цёмны, буль-буль.

— Зоры ў ягоных вачах, — аж паказаў на неба палявік.

— Зоры ў вачах, вох.

— Зоры, буль-буль.

— Вецер у ягоным сэрцы, — шырока гайдануўся палявы валадар, як бы спрабуючы паказаць вецер, але толькі выцягся патыліцай аб зямлю. Праўда, тут жа падхапіўся.

— Вецер у сэрцы, вох-вох, — прыцмокнуў ад захаплення лесавік.

— Вецер, вецер, буль-буль-буль, — зачаравана ўсхадзіўся вадзянік.

— Анікім нязведаныя, анікім няходжаныя шляхі пад нагамі, — аж прыўстаў заўзяты бай.

— Нязведаныя шляхі, вох.

— Нязведаныя шляхі, буль.

— Прыходзіць цёмны чарадзей туды, дзе болей за ўсё патрэбны цуд-дзіва...

— Цуд, вох.

— Дзіва, буль.

— Нечакана з'яўляецца там, дзе плач, дзе гора.

— Плач, вох.

— Гора, буль.

— Зайграе той чарадзей на незвычайнай скрыпцы. Кажуць, дарунку самога вялікага Сварога.

— Скрыпка, вох.

— Дарунак, буль.

— Як толькі дакранецца да струн чарадзей, адразу станецца ўсё чыста гэтак, як ён захоча.

— Вох.

— Буль.

— Ну, чаго вы, боўдзілы, вочы прыжмурылі? Вось і ўвесь сказ, — жвавы палявік лёгка ўсхапіўся на ногі.

— Вох?

— Буль?

— Вох, буль, — перадражніў палявік. — Падумайце лепей, як нам гэтага чарадзея ды перастрэць...

— Ці злавіць, — прыемна ўсміхнуўся "вох".

— Ці змусіць нам служыць, — з веданнем справы пацёр рукі "буль". — Няхай на скрыпцы дзень і ноч іграе, робіць усё, як мы захочам...

— У палон узяць, — знайшоўся і красамоўны бай, які пакуль што пагаджаўся хоць бы дзеля таго, каб зрабіць усё па-свойму.

— Вох, — узрадаваўся лясун-лесавік. — Я ж ведаю, як...

— Буль, — як не пагадзіўся вадзянік. — А я ведаю?

— Ведаеш, ведаеш... Чаго тут ведаць! — рашуча махнуў рукой палявік. — Я дык пэўна ведаю. Але рабіць усё прыйдзецца вам...

— Чаго гэта нам? — азваўся лесавік.

— Чаму гэта мне? — прабурчэў вадзянік.

— Ну, тады я нічога не ведаю, — палявік сабраўся пайсці прэч, не азірнуўшыся.

— Стой! Куды? Добра ўжо, зробім, вох...

— Стой! Хай сабе, было б што рабіць, буль...

— Дык слухайце, — палагаднеў палявік ад такой суседскай згоды. — Валадарствы свае чынна ў руку заганіце, не спіце, не ешце, а каб усё сталася так: няхай лес не падорыць людзям ані грыбоў, ані ягад...

— Ані трэсачкі дроў, — задаволена ўсміхнуўся лесавік.

— Якія дровы летам? — здзівіўся вадзянік. — Дровы ж саннай дарогай возяць.

— А ты не лезь у тое, чаго не ведаеш! — лясун-лесавік звысоку зірнуў на нейкага там вадзянічка.

— Няхай возера не падорыць людзям ніводнай, нават самай маленькай, рыбінкі, — працягваў, як нічога не чуў, палявік.

— Ні аеру, ні ціны, — задаволена ўсміхнуўся вадзянік.

— Ды каму твой аер, твая ціна наогул патрэбныя? — знайшоўся лесавік. — Не чапаюць іх ні зімой, ні летам.

— Не суй носа ў чужое проса! — вадзянік пераможна зірнуў на лесуна. — Мне лепей ведаць справы свайго валадарства.

— Ды якое ў цябе, вадзяніла, проса? — аж засмяяўся лесавік. — Ці ты з вялікага розуму проса пасеяў?

— А што, можна? Вырасце проса ў возеры? — шчыра зацікавіўся вадзянік. — Вось зраблюся добрым, ласкавым, дык і проса ў мяне будзе, нібы ў полі, красавац...

Лясун, пагардліва зірнуўшы, гэтым разам нічога не сказаў, а палявік не суняўся:

— Але і проса. Грэчка, авёс, а галоўнае, жыта, жыта. І так я добра падсушыў.

— Бо не гаспадар, — прашаптаў лесавік.

— Не гаспадар, — аднымі вуснамі прамовіў вадзянік.

— А так, перакаці-поле.

— Ага, толькі б спаў.

— Лынды біў.

— Сказы-показкі непатрэбныя баяў, — вадзянік як забыўся, што толькі-толькі сам показку слухаў, за вушы не адцягнеш.

— Добра падсушыў, а цяпер пастараюся яшчэ болей… Прападзе ўсё дашчэнту! — палявік прытупнуў нагой. — Заплачуць людцы, забядуюць.

— З'явіцца да іх чарадзей, — весела падскочыў лесавік.

— А мы яго тут і схопім! — здагадаўся пра ўсё вадзянік.

— У палон возьмем! — не адступіўся ад сваёй задумы палявік.

— І прымусім зрабіць нас і добрымі, і спагадлівымі, — зацягнулі ў адзін голас лесавік і вадзянік.

— Слухайце, вы, "вох" ды "буль"… — раптоўна перамяніўся палявік.

— Чаго? — у непаразуменні лыпнулі вачыма тыя.

— Напачатку прымусім чарадзея зрабіць мяне добрым, спагадлівым, чулым. А пасля ўжо вас добрымі, спагадлівымі. Вось так!

— А чаму гэта цябе і добрым, і спагадлівым, і чулым, а нас толькі добрымі ды спагадлівымі? — перапытаў лесавік.

— Пакрыўдзіць мяне хочаш? — надзьмуўся вадзянік.

— А таму што вас, калода і лужына, чулымі не зробяць аніякія чарадзействы на ўсім белым свеце! — пераканана выгукнуў бай. — Тут і казаць няма чаго!

— Як? Вох.

— Чаму? Буль.

— Навошта ж так?

— А можа, дарадзіш чаго?

— Дараджу, дараджу. Толькі вунь той узлесачак няхай на маё поле цянёк кідае. І возера вады мне дае, колькі захачу.

— Згода, чаго там.

— Чаго там, згода.

— Ну, за справу! — зухавата падскочыў палявік. — Валадарствы — у руку!

Гопнулі лесавік, вадзянік, палявік ды пабеглі ладзіць парадак у сваіх валадарствах.

## *Лесавік, вадзянік, палявік*

І навялі добры лад сябры-суседзі. Моцнымі аказаліся ў іх рукі, доўгімі, учэпістымі. Пакаціўся глухі пошчак па лесе, пайшло высокімі хвалямі возера, гулам-водгуллем азваліся палі, напалохалі калючую ігрушыну, чаго раней не здаралася ніколі.

— Вох-вох-вох, — гнеўна стагнаў на ўвесь лес чарадзейны голас.

І беглі напалоханыя зайцы з вавёркамі збіраць ягады, грыбы. Усё, усё дачыста, абы людзям не пакінуць. А ваўкі шчыравалі, бы ў тую Піліпаўку, выганялі з лесу скаціну. Мядзведзі трушчылі пчаліныя вуллі. Але не плакалі, цярпелі, трымаліся вясковыя...

— А справа ў яго ідзе на добры лад, — зайздросна выглядаў-вынырваў з хваль вадзянік і стараўся яшчэ болей за суседа.

Схавалася ўся рыбка ў глыбокіх вірах. Паперакульвалі русалкі чаўны, распусцілі як не на ўсё возера свае доўгія зялёныя косы. І нават прыгожыя спадніцы з чырвонымі паяскамі, што дзяўчаты ў возеры мылі, з рук пахапалі. Засмуціліся-зажурыліся, але ўсё ж не заплакалі, сцярпелі людцы...

— А яны ж малайцы, — выглядаў з высокіх жытоў палявік. — Умеюць у сваіх валадарствах распарадзіцца як трэба... — і хуценька, каб не заўважылі, хаваўся назад. Так, павінна ўсё як найлепей атрымацца. Але гэтага ён ім не скажа, не. І так ганарыстыя "вох" ды "буль". А ён жа, палевічок-палявушка, зробіць яшчэ лацвей. Не быў бы самым-самым...

Стала чэзнуць высокае каласістае жыта. Змарнелі-змізарнелі грэчка, авёс, проса ды і ўсё поле. І гэтага няшчасця не вытрымалі людзі. Апусціліся ў іх рукі, адчайна забіліся сэрцы. Заплакалі, бедныя, уголас. Прызналі сваё гора...

— Ага! — радасна гопнулі лесавік, вадзянік, палявік. — Цяпер чакацьмем...

Галосяць вясковыя, жаляцца, не хаваюць сваёй скаргі ад свету. Чуе іх вялікі, але не спачувае, не адгукаецца. І тады, як ніхто ўжо не чакае, як усе паверылі, што знямеў белы зусім, вяртае да пакінутых у няшчасці сваё ратавальнае дыханне...

Ахінае зямлю цёмная-цёмная ноч. Бяжыць мройнымі прывідамі, пакідае нязгасныя сляды. Не знікае зусім перад ясным днём. Кінула на дол сваё покрыва з промняў зор, з таемнай цішы, з летуценных сноў. Скінулася покрыва, задрыжэла, растала. І паўстаў з яго, паляцеў драпежнай птушкай на золку, паімчаў белым аленем, стаўся чалавекам... нехта. Нехта.

— Цёмны чарадзей, вох!

— Цёмны чарадзей, буль!

— А хто ж яшчэ?! Ша! — пацягнуўся палявік, які хоць і сачыў за шляхамі-дарогамі, але паспеў добра прыжмурыць вока і цяпер не хацеў, каб сябры-суседзі тое заўважылі.

Ды лесавіка і вадзяніка займала іншае:

— Я пастку ў лесе зраблю... Вох!

— А я буду лавіць... Буль!

— Ды ты ў лес мой ніколі не хадзіў!

— Тады я пастку ў возеры зраблю.

— А я буду лавіць!

— Дык ты ж плаваць не ўмееш.

— Суседзікі, братачкі! — павёў рэй палявік. — Не такі гэты чарадзей і просты. Не так сабе пойдзе ў лес. А ў возера зусім не пойдзе, — тыцнуў сарванай валошкай проста вадзяніку ў нос. — І не думай...

— А я не думаю, буль!

— І я не думаю, вох!

— А я вось думаю, — абвёў позіркам суседзяў галоўны завадатар. — Лавіць чарадзея давядзецца разам...

— Разам, вох...

— Разам, буль...

— Разам! На межах нашых валадарстваў. Там ён будзе слабым. А мы колам станем і зробімся моцнымі-моцнымі...

— Моцнымі... Страшна, вох.

— Моцнымі... Боязна, буль.

— А вы не бойцеся! Ухопім яго, тут яму!

— І гамон! Вох!

— Гамон, буль!

— Які гамон? Палон, палон! — прытупнуў палявік. — Вы што, зусім з глузду з'ехалі?

— Палон, вох, прабач, палевічок.

— Палон, буль, не забуду, палевічок.

— Але давядзецца зрабіць тое-сёе, — палявік, лесавік, вадзянік па-змоўніцку пераглянуліся...

І адкрыліся лясныя нетры цёмнаму чарадзею. Паклікаў, загукаў яго лес, нібы свайго сябра. Не адазваўся лясам чарадзей... Усміхнулася-падміргнула сінім вокам самае прыгожае возера. Заплёхала прызыўна, звонка, нібы свайму брату. Не з'явіўся вадзе чарадзей... Шаўковай хусцінкаю раскінуліся палі ды палеткі. Васількі са званочкамі зашапацелі тоненька, прачула, адкрылі вечнае спеўнае лета. Толькі не спакусіўся на яго чарадзей...

Ледзьве сябры не адчаіліся, не адмовіліся ад свайго жадання зрабіцца добрымі ды ласкавымі. Амаль спынілі свае парыванні:

— Гора-гора нам, вох.

— Бяда-бяда мне, буль.

— Я ж розуму не прыкладу, ша...

Але ці то бяда-гора сама супынілася, пабаяўшыся дужацца з вернымі сябрамі, ці то чарадзей дапраўды прыходзіў туды, дзе быў патрэбным. Невядома... Адно з'явіўся там, дзе сыходзіліся і лес, і возера, і поле, цёмны. Нечакана, раптоўна, напалохаўшы ўсіх трох, якія не маглі нічагуцькі сабе дарадзіць...

Удаўся ціха і адразу аказаўся-азваўся:

— Шукалі мяне, лесавік, вадзянік, палявік? Прыйшоў я да вас, — і, атрымаўшы ў адказ здзіўленае маўчанне, працягнуў: — Пакіньце мучыць людзей. Хопіць вам ужо!

— Вох?

— Буль?

— Ша? — не сцярпеў і палявік, як абудзіўся ад зімовага сну.

— Пакіньце, кажу, здзекавацца з вясковых, — цярпліва даводзіў чарадзей. — Вы ж не злыя, не шкодныя.

— Не злыя, вох?

— Не шкодныя, буль?

— Але страшныя-страшныя, ша!

— Паймалі цябе, паймалі, вох!

— Узялі ў палон, буль!

— Якое паймалі-ўзялі? Ён жа сам прыйшоў, ша!

— Тым болей! — б'юць у ладкі вадзянік і лесавік. — Як у нас, дык не адпусцім ужо!

— Можа, і не адпусцім, — асцярожна зірнуў палявік у вочы чарадзею. — Табе ў нас лепей будзе. Што, не верыш?

Нічога не прамовіў чарадзей, адно чакае, што ж далей станецца. А было ўсё проста... Досыць нарадаваўшыся, лесавік, вадзянік, палявік згодна ўзяліся за рукі, паўсталі перад сваім палоннікам ды наказалі:

— Рабі нас, чарадзею, добрымі, ласкавымі, спагаднымі. Каб людзі шанавалі, сябраваць не баяліся. А іначай дрэнна табе будзе...

І засмяяўся з такога жадання-наказу чарадзей, лёгка, прачула, як скінуў з плячэй вялізны цяжар. Нібыта не зводзілі

далёка-далёка цяжкія дарогі. Не цвілі ў сэрцы горкімі палынамі расстанні. Не падалі зоры, не дазваляючы забыць пра страты, пра ўсіх тых, каго ён не збярог. Смяяўся чарадзей, як аніколі не бачыў на белым свеце няпраўды, крыўды, здрады. Як не рабіўся цёмным ад спазнанага. Смяяўся чарадзей...

— А ці не з нас ты, чарадзейка, рагочаш? — зрыхтаваў ладныя кулакі лясун.

— А ці не я ж такі смяхотны? — вадзянік звыкла азірнуўся, шукаючы, дзе б лепей чарпануць жвіру.

— А што смешнага мы сказалі? — неяк не падумаў пра бойку палявік. Гледзячы на яго, ахалануліся і сябры-суседзі.

Суняўся чарадзей. Адказаў і пэўна, і проста:

— Анічога, анічога смешнага. Але ж я так узрадаваўся таму, што вы хочаце стаць добрымі, ласкавымі...

— Спагадлівымі, не забудзь! — строга сказаў вадзянік.

— Стаць добрымі, ласкавымі, спагадлівымі, — паслухмяна згадзіўся чарадзей, — што не змог схаваць усцехі. Вялікай, а шчырай...

Палагаднелі вадзянік ды лясун, а палявік за ўсіх трох як папрасіў:

— Дык зрабі нас такімі, чарадзею. Зайграй на сваёй скрыпцы.

— Маю скрыпку. Незвычайную... — лёгка прызнаўся палоннік. — Ды ёсць за яе чары большыя, мацнейшыя, якраз патрэбныя для вашай справы.

— Большыя, вох.

— Мацнейшыя, буль.

— Давай іх сюды хутчэй! — скокнуў палявік.

— Чары тыя схаваны-затоены ў вас саміх, — як нічога не пачуўшы, працягнуў чарадзей.

— У нас саміх, вох?

— І ў ва мне, буль?

— Вы ж, валадары лясоў, азёр, палёў, самыя чарадзейныя. Магутныя, ведныя... Як вам не быць добрымі, не быць спачувальнымі? Дзівосныя таямніцы вашых валадарстваў... Верай ды спагадай адгукаюцца мне спеўна-шумлівыя лясы. Радасна свецяцца, сустракаючы, вочы вечна сініх азёр. Пра жыццё раскажа жыта ў палях, пагамоніць са мною аб пражытым, аб непражытым... Вы як цуд нам, смяротным, простым! Нашыя дзяды, бацькі, унукі доўжаць род. Дзівяцца на вас, лесуноў, вадзянікоў, палевікоў, вечных, як лясы, як азёры, як палі, без якіх аніяк не пражыць чалавеку. І шануюць вас, шануюць, нават калі змрачнее лес, патыхаюць гневам азёры, а чорнай нялітасцю — палі... Спыніце ж і цяпер сваю крыўду...

— Ды спынім, спынім, вох. Як ты прачула сказаў.

— Буль, у мяне аж слёзы пайшлі.

— Ша, яны ў цябе заўсёды сыплюцца з вачэй. Але будзе вясковым наша лагода. А пра тыя чары, што ў нас саміх, ты, чарадзею, не ўсё сказаў...

— Ды што ж яшчэ сказаць? Дабрыня, міласэрнасць, спагада бліжэй, чым здаецца. Дапамажыце таму, хто заблукаў у непраходнай пушчы. Няхай хутчэй знойдзе дарогу дамоў... Не пакіньце таго, хто вось-вось патоне ў глыбокім возеры. Няхай шчасліва выберацца на бераг... Дадайце сілы, калі нехта, стаміўшыся, жне ў полі высокае жыта. Няхай адужае свой палетак... І людзі прымуць вас як родных.

Толькі прамовіў так чарадзей, як лесавік, вадзянік і палявік кінуліся бегчы з усёй моцы. І пайшло ўсё згодным ладам...

Ішоў увечары адзін чалавеча праз лес, праставаў, добра ведаючы дарогу. Заблукаў-завадзіў яго лесавік, аж пакуль на досвітку не вывеў небараку проста да роднай хаткі. Здагадаўся той, у чым справа, выцер пот з ілба ды пажадаў, каб лесуна добра Пярун ляснуў...

Купаўся ў возеры чалавеча, заплыў далёка, ажно бераг стаў маленькім. Трэба неяк назад. Але ж за ногі нехта трымае,

плысці замінае. Ледзьве не ўтапіўся бядак, пакуль ля самага берага вада не штурхнула яго ў колкую асаку. Дапёк той, у чым справа, выкараскаўся на сухое ды пажадаў, каб вадзяніка добранька Пярун ляснуў...

Жалі людцы жыта, шчыравалі аж да поту. Хоць нешырокая была палоска, натаміліся так, што ледзьве на нагах трымаюцца. Спякотна ў полі, сон морыць, паваліліся ўсе ды моцна заснулі. Прачнуліся пад вечар ды бачаць: жыта ўсё пажатае, а снапы па ўсім полі як хто параскідаў. Здагадаліся, у чым справа, ды пажадалі шчыра, каб палевіка тройчы Пярун ляснуў...

Бягуць лесавік, вадзянік, палявік да чарадзея. Пылам дымяцца палеткі, хвалямі возера плешча, лесам рэха ідзе. Сварацца, злуюць на ўвесь свет, і кожны выпінаецца, як не лопне:

— Якая ж такая дабрыня ў тым, каб цябе Пярун ляснуў, вох?

— Мяне? — спакойна пытаецца чарадзей.

— Ды не цябе, мяне! Вох-вох-вох.

— Якая ж такая спагада ў тым, каб мяне Пярун ляснуў, буль?

— А мяне аж тройчы ляснуў. Пэўна, за дабрыню, спагаду і чуласць, — грамчэй за ўсіх жаліцца палявік.

— Ты ж болей за ўсіх хацеў! — азываюцца палевіку сябры-суседзі.

— Ды маўчыце вы! А ты, ты даставай сваю скрыпку ды грай, чуеш? — кінуўся палевічок да чарадзея.

— Чую, — азываецца той. — Ты не ціха гаворыш.

— Даставай сваю скрыпку, вох, а то я цябе дубоўняй!

— Дык ты ж дубоўню мне падарыў, буль!

— У мяне яшчэ адна ёсць. Большанькая...

— Даставай сваю скрыпку, буль, а то я цябе жвірам, жвірам ды ў возера.

— Чаго ўжо, ясна ўсё. Дастаю скрыпку, — па-ранейшаму заставаўся спакойным чарадзей.

Звыкла крануў смыком струны, пабудзіў-адкрыў весялосць белага свету. Паплыла яна па-над аблокамі, паслалася шызымі туманамі, паляцела з буйнымі вятрамі. І так міла стала ў кожнага на сэрцы, што забыліся ўсе нягоды. Так глядзеў бы ды цешыўся лясамі, ды азёрамі, ды палямі...

Звініць скочная музыка, удаецца чаканай марай, што толькі-толькі спраўдзілася. І ўспамінаюцца людзям радасныя хвіліны, прыгадваецца нечаканая, але такая патрэбная спагада. Не абмінулі тыя чары лесавіка, вадзяніка і палевіка. Прытупнулі яны зухавата ды пусціліся адбіваць у такт...

Так усхадзіўся ад радасці лесавік, што аж загулі векавыя пушчы, завылі-зараўлі ваўкі ды мядзведзі, як сабраліся глынуць увесь свет. Напалохаліся людзі, відаць, гневаецца лясун за іхнюю радасць. А тут яшчэ возера выйшла з берагоў, заліло нізіны-агароды, нарабіла бяды. Гэта, значыць, вадзянікова кара. Ды раптоўна, нібы на залом, паляглі нязжатыя грэчка, авёс, проса. Заплакалі людзі, не стрывалі палевікова свавольства.

Кленчамі-скаргамі агарнуліся вёскі. Нявесела, нярадасна... Лесавік, вадзянік ды палявік пагрозліва да чарадзея падступаюць:

— Ты, чарадзейка, вырашыў з намі пажартаваць, вох?

— Паздзекавацца, буль?

— Падмануць, ша? Не давялося з радасці нават паскакаць...

Стомлена трымае скрыпку чарадзей, не апраўдваецца, не баіцца. Лесавік жа, вадзянік ды палявік грознымі вачыма зыркаюць, апошні раз ужо зрабіць іх добрымі, ласкавымі, чулымі дазваляюць:

— Глядзі, калі гэтым разам не атрымаецца — не жыць табе, вох!

— Утаплю, буль!

— Заказычу, ша!

Зноў крануў чарадзей смыком струны, адкрыў журбу, пабудзіў страчаную надзею. Нібы страпянуліся-ажылі ўсе бя-

доты-зрыготы, паўсталі зноў ды плешчуць, нявечаць сэрца. Хочацца кожнаму ўдарыцца аб зямлю ды загаласіць на ўвесь свет, каб пазбыцца непамернага болю... Льюць слёзы людзі, не могуць выплакаць свайго гора. Ды не абмінулі тыя чары лесавіка, вадзяніка, палевіка. Успомнілі ўсё, што ўчынілі, і стала ім цяжка-цяжка...

Загаласіў, застагнаў лес, як прыгнецца скрозь да зямлі і ўвесь чыста згіне. Адчулі тое вясковыя, сталі ласкава прасіць лесуна пра літасць... Без пушчаў што ж рабіць? Заплёхала, забілася возера, скаланулася да самага дна, вось-вось пойдзе ў зямлю. Здагадаліся пра тое людзі, сталі шчыра прасіць вадзяніка пра спагаду... Без возера што ж рабіць? Пачарнелі, як глыбокай восенню, зажурыліся палі, як не спляжыцца на іх ўсё. Пабачылі тое працавітыя, сталі прасіць-маліць палевіка пра спачуванне. Без палёў жа нічога не будзе!

Зноў кленчы ў вёсках. Гора горам паганяе... Ды не зважаюць на людскія слёзы лесавік, вадзянік і палявік. На чарадзея тупаюць, сварацца аж на тры валадарствы:

— Ах ты ж, чарадзейка, што ўчыніў! Хіба ад просьбаў-галашэнняў станемся мы добрымі? Вох!

— Ах ты ж, чарадзейка! Хіба тыя слёзы зробяць мяне чулым? Буль!

— Трымайся, чарадзейка! Я ўжо так палі засушыў, што хай плачуць ці не плачуць, нічога не будзе... Прапала ўсё!

Доўга маўчаў чарадзей, слухаў гнеўныя папрокі ад лесавіка, вадзяніка, палевіка. А сябры-суседзі не адступаліся, патрабавалі, пагражалі.

— Добра, — урэшце пагадзіўся цёмны, — зайграю трэці раз. Бо зразумеў ужо, што па-добраму вы мяне не адпусціце. Толькі цяжка мне будзе: аддаў за першым, другім разам ледзьве не ўсю чарадзейную сілу. Дык вы чары-таямніцы ад лясоў, азёр, палёў збярыце, мне ў скрыпку ўкіньце, каб здолеў зайграць на ўвесь свет...

Ні пра што не запыталі болей лесавік, вадзянік, палявік, кінуліся збіраць чары. Мядзянай лістотай шугануў тыя чары ў скрыпку валадар пушчаў-гаёў. Срэбнай луской бліснуў-кінуў валадар азёр. Залатым зернем насыпаў як не поўную валадар палеткаў-абшараў. Учынілі так ды чакаюць, пакуль чарадзей зайграе.

Уздыхнула па-чалавечы чарадзейная скрыпка. Стала апяваць ясныя зоры, якія ў цемрадзі свецяцца ратавальнай надзеяй. Аддала пашану чарадзейнаму сэрцу, якое верыць і змагаецца ў самую цёмную хвіліну. Павяла ў зманлівую далеч нязведаных дарог... Можа, гэта там схавалася страчанае шчасце?.. Але не толькі пра гэта памяталі струны. Зазвінела мядзяная лістота ў іхнім голасе, і азваліся вячыстыя лясы, якія зведалі ўсё. І расказала скрыпка ўсяму свету пра самых мудрых. Нібы цымбалы, забіліся срэбныя лусачкі, і адгукнуліся незлічоныя азёры, якія ўсіх пояць вадою, якія берагуць жыццё. І расказала скрыпка ўсяму свету пра самых добрых... Загаманілі жніўнай песняй залатыя зернейкі, падняліголас палёў, якія аддаюць людзям свой плён. І расказала скрыпка ўсяму свету пра самых працавітых, цярплівых, спагадлівых людзей на зямлі...

Іграла скрыпка, як узнялася па-над белым светам. Радавалася, журылася, плакала, смяялася. Клікала да лясоў і палёў, на ўзбярэжжы азёр, каб спазнаць іх міласэрнасць і гнеў, каб выпрабаваць сябе на чалавечнасць... Аддаў цёмны скрыпцы ўсе свае чары. Да апошняй кроплі — дабрыню, да апошняй іскрынкі — спадзяванне-веру. І не шкадаваў пра тое... Ад таго гучала скрыпка і шырэй, і мацней, як заступаючы ўсе чыста гукі-зыкі... Клікала да літасці, да спагады, ронячы цёплыя пачуцці ў самыя халодныя сэрцы. Амаль зрабіла ласкавейшым белы свет...

І... знікла. Невядома куды, невядома як. Не, яна не разбілася за тое, што падняла невыносны цяжар. Яе ж мацавала самае чарадзейнае сэрца. А чарадзей... таксама знік. Разам

са сваёй незвычайнай скрыпкай. Можа стацца, што здолеў уцячы з палону. Лесавіковага. Вадзяніковага. Палевіковага. Толькі чамусьці болей нідзе не з'яўляўся. Нікуды не прыходзіў. Хоць не аднойчы быў такім патрэбным.

Як прапалі чарадзей ды скрыпка, спынілася дзівоснае гранне. Са шкадаваннем уздыхнуў пра тое белы свет. Зноў цяжка засумавалі людцы. Ачомаліся лесавік, вадзянік, палявік. Згледзілі, што няма анідзе чарадзея, хоць моцна трымалі яго і лес, і возера, і поле. Загаласілі ў роспачы, абняўшыся, як сапраўдныя браты. Такімі роднымі зрабіла іх нечаканае гора...

— Падмануў, вох!

— Падмануў, буль!

— Падмануў-падмануў, ша!

Заліліся слязьмі, запрасілі літасці ў белага свету:

— Як жа нам цяпер ды стацца добрымі? Хто ж нам цяпер дапаможа? Падмануў нас чарадзей, падмануў!..

А ў пошуме лясоў, у плёскаце азёрных хваль, у шэпце палёў можна і цяпер пачуць гранне самай чарадзейнай скрыпкі. Не знікла яна без следу. Пакінула зямлі сваю песню... Хочуць лесавік, вадзянік, палявік тую скрыпку знайсці. Як толькі ўчуюць — бягуць што сілы па сваіх валадарствах. Ды толькі, пакутуючы так, усё адно нічога не адшукалі. І тады зноў гучыць лясным рэхам, звонам азёрных хваль, палявым водгуллем:

— Падмануў... Падмануў... Падмануў...

А стомяцца сябрукі бегаць ды крычаць, тады сядаюць чынна, вядуць добрасуседскую размову:

— Некалі ж прыйдзе лепшы чарадзей ды знойдзе тую скрыпку.

— Чакае яна сваёй гадзіны.

— І вось тады мы ўжо не папусцім.

— Дацікуем, зловім.

— Скрыпку адбяром.

— І падмануць не дазволім!

## САПРАЎДНЫЯ АСІЛКІ!

*Казачнае*

Жыў ды быў на свеце ласкавы чарадзейны коцік. Баюн, весялун, сябрына! Вушка залатое, вушка срэбранае. Лапка залатая, лапка срэбраная. А вусы і хвост такія ж зіхатлівыя-іскрыстыя, што і невядома якія... Не верыце? То дарэмна. Свет вялікі, ці мала якой можа аказацца праўда. Ну, мабыць, не залатым-срэбраным быў той каток, а больш простым... Вушка шэрае, вушка белае. Лапка шэрая, лапка белая. Вусы цікаўныя: усюды паторкнуцца — куды просяць і не просяць. Хвост жвавы, увішны. Так і ходзіць у бакі. Гэта значыць чакайце, даражэнькія, шкоды-неспадзяванкі!

І любіў жа чарадзейны каток шкоды чыніць, як мышэй лавіць. "Ах, які ж ён дбайны, які старанны!" — скажаце ўсцешана. І гэта праўда... Хадзілі мышы па клеці, як па сваёй хаце. Зернейкі ў лапах насілі паважна. Злаваліся-сварыліся на тое гаспадары, але не самім жа на шэрых паляваць. Дык коцейка наш учыніў! Аж усе здзівіліся!

— Мышы-мышы! Слухайце мяне ды бойцеся, а то буду вас лавіць-хапаць!

— Слухаем цябе, слухаем! — запішчэлі ў адказ. Ніхто раней так ветла да іх не казаў. Адно праклінaлі-гразіліся...

— Зайдзіце ўсе ў пустую пуню. А я гаспадароў прывяду паказаць, колькі вас налавіў. А вы ўсе бойцеся, дрыжыце.

Зайшлі мышы ў пуню, сена там ані звання, а сцены — дзірка на дзірцы. Коцік тым часам хуценька прымкнуў дзверы на замок ды пабег гаспадароў клікаць... Вядзе неўзабаве іх, здзіўленых, адмыкае ды паказвае... На мышэй як ліхаманка напала. Паваліліся дагары і лапамі трасуць.

— А які ж у нас чарадзейны каток! Колькі жывём, такога ў гаспадарцы не мелі! — запляскалі ў ладкі ад радасці гаспадар з гаспадыняй.

— А то! — важна надзьмуўся кот. — А вы ж мне, бывае, малака шкадуеце. Ці маеце сумленне?

— Ты прабач нас, каток. Будзе ў цябе малака даволі.

— А смятаны? А масла?

— І смятаны! І масла! Адно шэрым шкоднікам спуску не давай.

— Гэта ўжо мой клопат, — і водзіць пушыстым хвастом. — Будуць мышы ў рад хадзіць і паклоны вам біць.

Ходзяць мышы строгім радам, б'юць паклоны, як загадана. Усё ў нашага коцейкі дзеецца чынна. Знікае бульба, буракі, моркаўка. Меншае жыта, пшаніцы, аўса. Нават сала, на дроце да бэлькі падвешанае, некуды падзелася. Прабяжыць наш увішны каля збанка са смятанай — і смятаны няма. Дацягнецца да міскі з маслам — і ні масла, ні міскі. Чары нейкія. А вы не верыце, што каток чарадзейны!

Гаспадароў павучае ды выхоўвае. Раніцай гаспадыня падоіць карову, прынясе малака ў хату, а там ужо лаянка:

— Куды ты малако ў столік паставіла? Ды яшчэ на самы верх! Ці ведаеш, як цяжка туды ўзлезці!

— Куды ты ставіш малако на падлогу? Брудная яна ў цябе, як заўсёды. Хіба я не магу за сталом паесці? Зусім не чалавек?!

— Што ты мне ліеш поснага малака! Кажаш, малако не поснае? Маўчы лепей ды нясі з клеці вяндліны.

— З апошняга кубельца бяры! Там самае смачнае! А іншае ешце самі.

— Чаго ты мне даеш бульбіну з агурком? Ці зусім ужо? Гэтага каты не ядуць!

Шчаслівыя гаспадары з такім катом. Нездарма ж кажуць, што кот у хату радасць прыносіць. Дык радасці той поўны мех. Аж не ведаюць, куды ад яе падзецца з раніцы да вечара. А што мышы па хаце ўжо пайшлі, тое нічога... Таксама, мусіць, чарадзейныя, бо не хаваюцца ды кажуць адкрыта:

— Мы так сабе ходзім, нічога шкоднага не робім.

Ці яшчэ лепей прыдумаюць:

— То ж нам кот дазволіў! Мы не самі. У яго і пытайцеся.

Думалі-думалі гаспадар з гаспадыняй, што з такім чарадзейным катком рабіць. І здагадайцеся, да чаго даўмеліся? Так, самога аддаць на выхаванне. А каб коцейка і ў гасцях свайго не ўздзеяў, то хату выбралі найбяднейшую.

Зажурыўся кот з такой несправядлівасці, але нічога не паробіш. Наказаў мышам нікуды не сыходзіць, напакаваў сабе ядомага цэлую торбу, каб па дарозе з голаду не памерці, ды пайшоў да новага гаспадара. Выскачыў за парог, перабег двор, перайшоў цераз дарогу, перабег новы двор ды скок за парог! Цягне сваю торбу што сілы па хаце.

Натаміўся, сеў за стол ды палуднуе. Пабачыў тое новы гаспадар. А быў ён хоць і зычлівы, і вясёлы, ды сам галодны, то вырашыў з катка пажартаваць.

— А няхай, — кажа, — пакуль ты ў мяне, будзе, як быццам ты за гаспадара, а я за парабка.

— Няхай так! — адразу пагадзіўся коцік, бо вельмі ж яму карцела пабыць самым галоўным.

— Ну, гаспадар, кармі мяне! — ды цоп за кацінную торбу. Глынуў ядомае, як цмок дыхнуў.

— Мяў! — адно паспеў сказаць каток, як чалавечую гаворку забыўся.

— Ты не мяўкай, гаспадар! — кажа ўяўны парабак. — А лепей думай, што нам далей рабіць. Няма ў мяне ні каня, ні каровы. Ды і зямлі зусім мала. Што паробіш, як самы бедны ў вёсцы. Цяпер твой клопат мяне карміць!

— А як не буду цябе карміць?

— Самога з'ем!

— Ах ты, прожар! Як жа мне, маленькаму, цябе, такога вялікага, накарміць?

— А я і не кажу, што гэта лёгкая справа! Але ты гаспадар! Вось і дбай.

І стала катку цяжка жыць у новай хаце. Прынясе ён малака, а гаспадар тое глык ды выпіў.

— А дзе ж малака табе набрацца? — бядуе шэранька-беленькі.

Прынясе каток смятаны, толькі ступіць у дзверы, а гаспадар ужо тут, збанок з лапак хапае.

— А дзе ж смятаны табе набрацца? — сумуе чарадзейны.

Прынясе каток кавалак масла. Цішком крадзецца, каб прыхаваць. Але гаспадар тую хованку знойдзе ды, ці ведаеце, усё з'есць.

— А дзе ж масла? — лямантуе на ўвесь свет пушысты.

А масла няма. І не шукай. Насіць-насіць каток дадому што-небудзь з ядомага, а ці то парабак, ці то гаспадар грабе ўсё сабе ды пасмейваецца. Што ж тут будзеш рабіці? І ўздумаў котка не аддаваць свайго панаватага парабка на выхаванне. Не! Сам яго будзе перавыхоўваць. Але ж так атрымалася, што сышліся два роўныя...

Вось і павялося ў хаце: гаспадар патрабуе з ката, а кот — з гаспадара. Гаспадар за лыжку, а кот за міску. Кот за малако, а гаспадар за кіўбасы. Гаспадар бярэ коўдру, а кот яе адбірае. Кот лезе на печ, а гаспадар яго спіхвае на прыпе-

чак. Гаспадар шукае сваю світку, а кот яе ўжо апрануў. Кот недзе скраў сабе новыя боты, а гаспадар іх абуў. І кожны крычыць-выпінаецца:

— Я за цябе дужэйшы!

— А я за цябе лаўчэйшы!

— Я за цябе смялейшы!

— А я за цябе разумнейшы!

Сварыліся так, сварыліся кот з гаспадаром ды ўзяліся біцца. Гаспадар шпурляе ў ката лыжкай, а кот у гаспадара — міскай. Кот ліе за каршэнь гаспадару малако, а гаспадар пярэсціць ката кіўбасамі. Гаспадар ловіць ката коўдрай, нібы сеткай, а кот гаспадара самога ў тую сетку ўблытвае. Кот першым ускочыць на печ, а гаспадар з прыпечка дастае яго качаргою. Гаспадар памые сваю світку, а кот яе знарок у гразь укачае. Кот начысціць сабе боты, а гаспадар іх выкіне за плот. І кожны крычыць на ўсю галаву:

— Я самы дужы!

— А я самы лоўкі!

— Я самы смелы!

— А я самы разумны!

Думаеце вы, і ўсё тут? Зусім не, на гэтым яшчэ не скончыцца. Выбегуць кот з гаспадаром з хаты ды гойсаюць па суседскіх градах, сваіх не маючы. Кот лапамі дзярэ цыбулю, а гаспадар яе ў кішэні хавае. Гаспадар шпурне ў ката качан капусты, а кот яго падхопіць ды ў торбу. Кот ублытаецца ў гарох, а гаспадар на яго сварыцца:

— Навошта нам гарох? Толькі цялёпайся-вылушчвай, а наедку з яго. Лепей у буракі заскоч!

Заскочыць кот у буракі, і гаспадар не адстане. Цягнуць буракі разам з бацвіннем, кот у дзвюх лапах, а гаспадар у дзвюх руках. Цераз баразну скок-паскок, наперадзе каток, а

за ім гаспадарок. Прыбягуць суседзі свае грады бараніць, дык усё дзеецца ладна.

— Ах ты ж злодзей вусаты-паласаты! Хапайце яго! — крычыць гаспадар на ката ды першым кідаецца яго лавіць.

— Ах ты ж злодзей бязвусы ды беспалосы! Злавіў цябе! Злавіў! — крычыць кот на гаспадара ды спрытна сядае яму на карак.

І абодва знікаюць, не забыўшыся прыхапіць здабытае. Радуюцца, як вялікаму святу. Хваляць сябе не нахваляцца:

— А ты ж зух!

— А ты ж харобры!

— А ты ж самы-самы!

Ці доўга ці мала пакідалі кот з гаспадаром здратаваныя грады, а чарадзейны забываўся нават, што не есць той здабычы. Ды ці ў гэтым справа... "А ў чым?" — спытаеце вы. І нездарма. А ў тым, што ў адзін добры ці не дужа дзянёк пакрыўджаныя суседзі прыхапілі хто кій, хто хварасціну ды пайшлі вучыць самых-самых... Чужую працу шанаваць, грады не таптаць, тое, што не тваё, не браць. Самых дужых, самых лоўкіх, самых смелых, самых разумных!

— Авой! Уцякай, каток!

— Авой! Хавайся, гаспадарок!

Гаспадар шусь у акно, кот шмыг, нібы мышына, пад дзверы. Ды лятуць рыссю, уцякаюць што сілы. Выскачылі з хаты, перабеглі дарогу, за гумнамі схаваліся. Страшна, а як знойдуць? Азірнуліся па баках, нікога не пабачылі ды бегма бягуць за вёску, каб як далей... От ужо і сенажаці, стаяць немаленькія стагі сена. Ушыліся туды. Кот у адзін стог, гаспадар у другі. Страшна, а як знойдуць? Азірнуліся па баках, нікога не пабачылі ды за сенажаці, у лес, каб як далей...

— Слухай, каток, а чаго мы ўцякаем? Нас жа ніхто не даганяе! — гадзіны праз тры азваўся гаспадар.

— Ды ніхто! Я ўцякаю, бо ты бяжыш!

— А я бягу, бо ты ўцякаеш!

Кот з гаспадаром прыпыніліся, аддыхаліся. Самі сабе пабедавалі. Варочацца да дому адзін не хацеў, а другі і думкі такой не меў. Ды і няма ў вёсцы чаго рабіць: усе грады скрозь пабітыя. Трэба дзе яшчэ прытулку шукаць. Але хіба ж яны, самыя-самыя, не знойдуць? Ды быць таго не можа! Вось у яго, у чарадзейнага, у вусатага-паласатага, ужо ёсць задумка:

— Скажам, што мы асілкі, мяў-мяў! Па свеце падарожнічаем. Дык будзе нам усюды і хлеб, і масла!

— І тое праўда! Такіх вандроўнікаў нямала, сам бачыў. Ідуць праз вёску ды ідуць. А чым жа мы горшыя туды-сюды хадзіць ды лынды біць?!

Пакуль сёе-тое, дык сонейка ўжо хаваецца за небакрай. Вёска далекавата, а ісці ж некуды трэба. Лес сцяной стаіць, шапаціць глуха, як страху наганяе. То нашыя змоўшчыкі, каб не самотна было, зацягнулі песню на ўвесь голас ды праступоюць куды вочы глядзяць:

— Мы асілкі самавіты!
Гоп! Гоп! Гоп!
Мы на нечысць усю сярдзіты!
Гоп! Гоп! Гоп!

Пачуў тую песню праніклівы лясун, які ўвесь лес наскрозь бачыць, ды сумеўся. Што такія за асілкі тупаюць па яго лесе, як па сваім? Ды яшчэ нешта пагрозліва пяюць, нібы дражняцца. А трэба сказаць, што была такая завядзёнка: асілкі заўсёды біліся-дужаліся з нечысцю. Як толькі з'явіцца дзе-небудзь адзін такі, дужы ды разумны, адразу некага на бойку выклікае. Добра, як цуды-юды былі, адно даўно ўжо

звяліся. А можа, быў упэўнены лясун, схаваліся ў якой непраходнай глушэчы, каб з дужымі ды разумнымі не сустракацца. То выклікаюць біцца, а не мірыцца гаёўнікаў ды пушчавікоў, вірнікаў ды баламутняў, багнікаў, лознікаў, купнікаў, нават чамусьці хатнікам дастаецца. Хоць тыя і кормяць гэтых задзірыстых смажанай яешняй. Нясмачна робяць ці што? І праўда, усе яны як пачуюць грамавіты асілкаў голас, то хуценька хаваюцца хто куды... А пасля адзін аднаму ў вочы не глядзяць...

Разважае так лясун ды цікуе за чарадзейным катом і яго гаспадаром. А тыя шыбуюць наўпрост ды яшчэ мацней заводзяць:

— Мы асілкі самы варты!
Гоп! Гоп! Гоп!
Звядзём нечысць не на жарты!
Гоп! Гоп! Гоп!

— Слухай, каток, а нашто нам тая нечысць здалася? Можа, абыдземся як і без яе? — між тым пацiху кажа гаспадар сваймy чарадзейнаму.

— Ды не трэба яна нам зусім! Адно так у песні пяецца, што сапраўдныя асілкі гарланяць. А мы ж самыя сапраўдныя! То сваю песню трэба скласці. Заводзьма далей, што само просіцца!

— Мы асілкі, мы зычлівы! Гоп! Гоп! Гоп! — зацягнуў гаспадар.

— Згонім нечысць у крапіву! Гоп! Гоп! Гоп! — падхапіў за ім кот.

“У крапіву!” — прашаптаў сам сабе лясун і спалохаўся. Казытлівы крапіўнік-жыгучнік хаваўся пры сядзібах і заўсёды некага высочваў. А каго паліць-стракаць — ці то нячысціка, ці то чалавека — яму было ўсё адно. Не дзіва, што дарэмна сустракацца з ім нікому не хацелася. “Але ж якіх шкодных

асілкаў нячыстая сіла прынесла! Ды цьху, нячыстая сіла — гэта ж і я, лясун! А я нікога не прыносіў... Пабіць-зваяваць абяцаюць, гэта хай сабе, але як пагражаюць крапівой... — злосна падумаў лясны валадар. — І ведаюць жа, чым пагразіцца. Нічога не паробіш, трэба сваякоў да чорнага каменя склікаць ды радзіцца".

І кінуў кліч лясун гулкім рэхам. Першымі прыбеглі лёгканогія гаёўкі-дзяўчаты, за імі прыспеў вясёлы гаёвы дзед. Пушчавік удаўся сямівекавым дубам ды паплыў па-над лесам марудна-паважна, ішоў карэннямі, нібыта нагамі. Мядзведзь-бацюхна прышкандыбаў, абапіраючыся на вялікі сук. Незаўважна ўзнік-з'явіўся хіжы шэры воўк з агнёвым позіркам, ціха лёг у высокую траву. Апошнім аказаўся, цяжка ўздыхаючы, карузлы Ох-Вох.

— Ты чаго такі сумны? — спачувальна пацікавіўся ў яго лясун.

— Ох! Не пытайся. Ломяцца праз лес двое. Не ведаю, хто. Песні гарлапаняць на ўсю галаву! Ніяк іх не напалохаеш. Якімі толькі галасамі не ўдаваў. І роў нема, і лісцем шумеў, а ім усё адно.

— І мы гэтакіх бачылі! — хорам зацягнулі гаёўкі. — Кветкі-краскі нашыя патапталі. Галінкі паламалі! Гора-гора!

— Хараства не бачаць! Прыгажосць нішчаць! — не змаўчаў і гаёвы дзед за сваімі ўнучкамі.

— Каб жа да мядку майго не дабраліся! — рыкнуў мядзведзь. — Зацягнуў-схаваў яго высока на дрэве цёмным, аднаму мне вядомым. Але ўсё ж...

— Ды пачакай ты са сваім мядком! — пушчавік таргануў рукой-галінай мядзвежы сук. — Я самы стары з вас усіх ды разумею, што цяпер нешта важнае дзеецца...

— Раскажы, пушчавічок! — ласкава папрасіў яго лясун, а за ім і ўсе астатнія.

— То слухайце! — паважна крэкнуў пушчавы дух. — Як быў я зусім маладым, стаялі скрозь непраходныя пушчы. Нечысці ў іх вялося столькі, што і не злічыць. Адных чарцей цэлая плойма! Панавалі мы, не знаючы бяды. Але знайшоўся адзін чарадзей, які паклаў канец нашай цудоўнай казцы.

— Што ж ён зрабіў? Ох!

— А падараваў людзям чарадзейны агонь! Сталі людзі дужымі, не збаяліся дрэўцы секчы, пянькі карчаваць ды ляда паліць! Лес змагаўся, лес не здаваўся! Ды агонь! Агонь! Ён змусіў нас адступіць! Так пайшла нячыстая сіла ў глухія нетры, не змагла біцца... Там і цяпер сядзімо!

Здрыгануўся вячысты дуб, чары памяці пабудзіў, ды ўсе як на свае вочы пабачылі маладога ды прыгожага здрадніка, які ў зямлі, у вады, у лясоў узяў ды людзям аддаў. І зямлю, і ваду, і лясы пакрыўдзіў. І сталася так, што мусіла нечысць уцякаць-хавацца...

— Як жа я хацеў яго дацікаваць! Злавіць! — прытупнуў магутны дуб. — І злавіў бы яшчэ тройчы! І ці ведаеце, што далей было?

Уражаныя пушчавіковым гневам, усе маўкліва чакалі сказу пра тое, што ж далей было. Дык ніхто і не згледзеў, як бліснулі агнём у шэрага ваўка злыя вочы.

— Злавіла яго нечысць, злавіла! А я сказаў адразу: "Памятаю, сваімі чарамі цябе блаславіў. А цяпер табе канец прыйшоў!". А ён мне ў адказ: "Я не памру. Яшчэ прадказваю, што прыйдуць дванаццаць асілкаў. Рукі да локцяў срэбраныя, ногі да кален у золаце, над брывамі зоркі гараць... Яны пакладуць канец вашай нячыстай сваволі!"

— А смелы ж! — рыкнуў касалапы. — Гэтак сказаць... Я табе нязгоднага слова мовіць не здолею!

— І смелы, і лоўкі! — як са шкадобай уздыхнуў пушчавік. — Узяў ды хуценька нячысцікам скінуўся, то і згубілі мы яго! Не знайшлі! Не змаглі пакараць!

— Цяжка табе! — раптам азваўся шэры. — І ты ніколі не зможаш яму дараваць?

Усе здзіўлена паглядзелі на шэрага-хіжага. Рэдка прамаўляў ён слова, а тым болей пра нейкае там дараванне... Як прачнуліся ад пушчавіковага сказу.

— Вось што, сваякі! Трэба, каб прадказанне таго чарадзея, што некалі жыў на свеце, ніколі не спраўдзілася! — павёў рэй лясун.

— Не спраўдзілася! Не спраўдзілася! — зладжаным хорам падхапілі гаёвыя.

— Чуеце? — абвёў усіх грозным позіркам валадар лясоў.

Па-над начным лесам неслася звонкае, хоць і не надта суладнае:

— Мы асілкі, і нямалы!
Гоп! Гоп! Гоп!
Будзе нечысць біць у цымбалы!
Гоп! Гоп! Гоп!

— Ох! Гэта ж яны пра цябе, касалапы! Кажуць, што будуць цябе на вяроўцы вадзіць, а ты будзеш у цымбалы біць, людзей весяліць! — запішчэў каруздік мядзведзю.

— Я не люблю весяліць! А толькі палохаць ды мёд найсаладзейшы красці! Гыррр! А вяроўку я з іх саміх саўю!

— Сваячкі даражэнькія! Будзем радзіцца як след! — запыніў тую гамонку лясун. — Нездарма ведае чорны камень змовы нашыя цёмныя. Будзьма і цяпер рабіць усё ладна! Трэба не сілай, але хітрасцю...

Ды толькі ён так мовіў, як над лесам яшчэ грамчэй разнеслася:

— Мы асілкі людскай волі!

Гоп! Гоп! Гоп!

Будзе нечысць скакаць у полі!

Гоп! Гоп! Гоп!

— Гэта ўжо пра нас! — крэкнуў гаёвы. — Маўляў, прасторныя гаі высечам, будзеце скакаць у чыстым полі ды пад нашу дудку! — а ў дудках ён быў вялікі мастак.

— Жах! Жах! — запішчэлі гаёўкі. — Не хочам у полі! Там не так прыгожа! І там халодна!

— Ды пачакайце вы! — не сцярпеў такой валтузні шэры. — У сказе тым вяшчунства пра дванаццаць асілкаў, дванаццаць зорных хлопцаў. А тут толькі двое, ды другі нейкі нялюдскі: вусаты-паласаты ды, як і я, хвастаты.

Усе лесуновы сваякі ці то няўважліва слухалі, ці то недачулі, але напалохаліся яшчэ болей.

— Ох! Хвастаты! — загаласіў карузлік. — Цяжка нам прыйдзецца...

Хіжага ў лесе не любілі ды баяліся. І ніхто не хацеў сустракацца з такім, як ён. Хай сабе падобныя яны былі адно шэрымі пушыстымі хвастамі.

І ўжо зусім недалёка ад чорнага каменя:

— Мы асілкі знакаміты!

Гоп! Гоп! Гоп!

Будзе нечысць сеяць жыта!

Гоп! Гоп! Гоп!

— Гэта яны! Яны! — уздыхнуў пушчавік. — Я не сказаў вам, чаго яшчэ напрадказваў чарадзей... Тыя, зорныя, змусяць нечысць служыць людзям. Я не ведаю, што ды як. Але добра памятаю: у тое імгненне здраднік смяяўся!

— Можа, таму, што проста быў у гуморы? — глянуў на пушчавіка шэры.

— А ты сёння занадта гаваркі, — кінуў шэраму лясун. — Звычайна слоўца не скажаш, а тут...

— А тут не жарты, трэба і пагаварыць, — цвёрда мовіў шэры.

— І тое праўда! — лясун заўзята пляснуў замшэлымі далонямі. — Ну, пагаварылі і вось што вырашылі. Ты, шэры, у нас самы дужы на ногі. Цікуй за гэтымі... ці то зорнымі, ці то не... А мы іх на злом паспрабуем! Як сапраўдныя асілкі, то і нечуванае-нябачанае раней зробяць!

— Чаго б такога прыдумаць? — усе чакальна паглядзелі на пушчавіка, ды першым азваўся бацюхна-касалапы.

— А вось што... Гыррр!

Тым часам зрабілася ўжо відна, дык чарадзейны кот і яго гаспадар, праспяваўшы як не ўсю ночку, пакладаліся пад кустом спаць. Сонейка цёпла грэла бакі, трава пад ракітай была шаўковаю, таму адпачывалася ім яшчэ лепей, чым у сваёй хаце. Толькі нядоўга сябрам-змоўшчыкам сніліся салодкія сны. Халодная крынічная вада намачыла аднаму поўсць, а другому адзенне.

— Мяў! Утапілі! — знянацку падскочыў кот ды зачапіўся пярэднімі лапамі за самую нізкую ракітавую галіну.

— Каравул! Забілі!!! — падскочыў і гаспадар, але да галля не дастаў.

— А чаму тады я цябе бачу? Мяў!

— І на небе ад цябе не пазбавішся!

— Дык, можа, ты ў пекла патрапіў, то і бачыш мяне! Сумленне тваё ці зварухнулася? Катка свайго, мяне, значыць, не шанаваў, не карміў!

— А ты чаго не кормлены, не шанаваны ў пекла патрапіў? Га?

— Не, я ж на небе! Вось бачыш! — паматляў кот у паветры заднімі лапамі, пярэднімі ўсё яшчэ трымаючыся за галіну.

— То зараз я цябе, нябеснага, за хвост ды на зямлю! Праз цябе мы саслізнулі ў крыніцу!

— Пачакай! — кот сам гопнуўся долу. — Тут памеркаваць трэба. Спалі-спалі ды саслізнулі ў крыніцу, хоць яе самой ані блізка. Нешта я раней не чуў пра такое...

— Сапраўды, трэба крыніцу адшукаць! Схавалася ад нас! — адумаўся і гаспадар.

Сталі шукаць крыніцу, шлындуючы туды-сюды каля ракіты. Халоднае не знайшлі, але кот заўважыў нейкую дзіўнаватую бабулю, якая і не хавалася. З белай хусцінкі вытыркаецца мядзвежы нос... Спадніца, андарак. Ды відаць мядзвежыя лапы. Кошык трымае, з якім па ягады ходзяць, адно ягад там няма. Прыкульгвае, сваё балбоча:

— Вы мае саколікі ясныя! Бачу, ляжаць ужо нежывыя пад ракітай. Няхай маладзенькія ўстануць! Ды паліла жывою вадою. Як добра, што з сабою мела. То вы і прачнуліся, як з магілы ўсталі.

— Дзякуем табе, старэнькая, за дабрыню! — прачуліўся катоў гаспадар. — Так і спалі б далей, каб не ты...

— Вось-вось, спалі. А не сушылі б цяпер адзенне, — кот быў зусім не такі ўдзячны.

— Якое такое адзенне, каток? — удаў ласку гаспадар. — Ты ж яго не маеш! — і прытупнуў на няветлівага вусатага.

— Дзякуй, бабулька, што ты нас ажывіла, хоць мы і так былі жывыя! — кот нізка пакланіўся. — А ты часам не хворая? Зусім, гляджу, змядзведзілася...

— А мой ты саколік! Па лесе мядзвежым хадзіла, ягады збірала і з таго сама, як мядзведзіха, стала...

— Вось жа бяда прыдарылася! — шчыра паспачуваў катоў гаспадар.

— А ты ліні той жывой вады на сябе! — парадзіў кот. — Калі жывым зрабіць можа, то ж і ачалавечыць...

— А мне ўжо, старой, і так добра.

— Ну, добра дык добра! — быццам пагадзіўся кот, а сам з бабулі вачэй не зводзіць.

А тая ж — сама дабрыня. Мядком іх частуе, пра здароўечка пытаецца, а найболей — куды шлях трымаюць ды што рабіць мусяць. Кот памоўквае, а вось гаспадар пагаварыць рады… І што асілкі яны слаўныя, цудаў-юдаў зваявалі — не злічыць… І што ідуць яны так сабе, адно дзе нечысць пабачаць, там яе і б'юць. Якім чарцям рогі не зламалі, тым яшчэ зломяць!

Сцепанулася бабулька ад такіх страшных паказак.

— Вы ешце мядок, ешце. Праўда, хлебца ў мяне няма… А так, дзякаваць, многа і не з'ясі! Гыррр! Каб вам горка было! Вось што, саколікі! Вы нечысць б'яце голымі рукамі, вы і чарадзейнага вепрука злавіць здолееце!

— А што за вяпрук? — адразу спахапіўся катоў гаспадар.

— А лычом скародзіць, нагамі барануе, вушамі сее і вее! Дзе ён прабяжыць — хлеб гарою ляжыць. Толькі злавіць яго цяжка…

— А чаго ж! — не спалохаўся катоў гаспадар. — Злавіць яго — справа! Будуць людзі з хлебам. Кажы, бабулька, што ды як…

А тая ж толькі гэтага і чакала! Давай баяць, як па зорам глядзець, праз чортаў мост перабрацца, у дрыгве не застацца… Сказаўшы ўсё чынна, зараўла сапраўдным мядзведзем ды пабегла ў лес.

— І дзіўная ж нейкая! Але добрая… — здзівіўся катоў гаспадар.

— Дурань ты! — зазлаваў кот. — Гэта не бабуля, а мядзведзь сапраўдны. Не трэба нам таго вепрука лавіць! Няхай і далей за чортавым мостам бегае.

Ды гаспадар як зацяўся. Пайшлі лавіць — і ўсё тут! Колькі яго кот ні прасіў — не дапамагло.

— Ну, добра! — нарэшце пагадзіўся каток. — Аднаго цябе я не кіну, бо прападзеш. Пойдзем разам!

А чаго ім доўга марудзіць? Узялі ды пайшлі. Надта не спяшаюцца, ежу сабе здабываюць, стомяцца — адпачываюць. Ці доўга ці мала ішлі, ды стаў лес такім высокім, густым, што і сонейка не відаць. Адны зоркі свецяцца. І ноччу, і днём. Гэтакая глушэча. Кот насцярожана вусамі водзіць, а гаспадар яго радуецца, маўляў, правільным шляхам ідзём...

Совы вухаюць, ценямі пад зорамі мільгаюць. Галіны калючыя, нібы жывыя, да падарожнікаў цягнуцца-цягнуцца... Нешта галёкае, крычыць, варушыцца ў непраглядных хмызняках. Хто? Што? Каб жа ведаць! А тыя крочаць сабе дый годзе... Наперадзе кот, а за ім гаспадар.

— Глядзі, каток! Якія зоркі высокія, як быццам сінія! — не можа наглядзецца на неба чалавеча.

— Гляджу, гляджу, — адказвае, азіраючыся па баках, кот.

— Мроіва ад іх чарадзейнае па зямлі сцеліцца, як нам сцяжынку значыць. Прыгажосць якая!..

— Прыгажосць, прыгажосць, — а сам то наперад крутанецца, то назад азірнецца.

— Ах! Якое дзіва, каток! Дзве зоркі жоўценькія з неба ўпалі і як быццам да нас па зямлі бягуць!

— Дзе жоўценькія зоркі? Што? Як? Навошта? — кот спалохана ўскочыў гаспадару на рукі ды абшчапіў лапамі за шыю. — Уцякайма што сілы!

Як загадаў кот, то гаспадар і пабег. Праз дрэвы паваленыя скача, а дзве зоркі міргаюць і за ім коцяцца. У калючае кустоўе ўбіўся, але выкараскаўся ўтрая хутчэй, як шыбаваў дагэтуль, а дзве зоркі наспяваюць... З гары пакаціўся, у канаву ўваліўся. Тут дзве зоркі і зніклі.

— Вылазьма хутчэй! — крычыць кот.

Торкнуліся яны туды, торкнуліся сюды — вылезці ніяк не могуць. Адно гаспадар нейкую кладку ў канавіне намацаў.

Ад няма чаго рабіць папаўзлі па гэтай кладцы: наперадзе гаспадар, а за ім кот. Слізгаліся-слізгаліся ды на нейкія купіны ўзбіліся. Азірнуўся чалавеча вакол — як ёсць балота! Адно зоркі сінія свецяцца над галавою... Узрадаваўся дый кажа:

— Слухай, каток! Правільным шляхам ідзём. Вось праз чортаў мост кульнуліся ды ў балоце апынуліся... Чуеш?

Але гэтым разам коцік не адазваўся. Напалохаўся гаспадар, стаў клікаць:

— Каток! Браток! Ты дзе падзеўся, паласаты? А каб цябе!

Нешта слізкае, выкачанае ў твані абшчапіла яго лапамі за шыю. "Ну! Капец мой прыйшоў! — падумаў катоў гаспадар. — Гэта ж ужо чэрці са мной братаюцца, перш чым у дрыгву зацягнуць... Нездарма ж за чортавым мостам пачынаецца чортава балота. Вось і катка майго паймалі. Дарэмна яго не паслухаў!". Уздыхнуў чалавеча ды чакае смяротнай хвіліны...

— Мяў! — мяккія лапкі тузанулі гаспадара за каршэнь. — Як перабраліся праз чортаў мост, то пойдзем далей, гаспадарок! Па балоце яшчэ ісці няблізка.

— А ты ж мой вусаценькі! А ты ж мой паласаценькі!

— А што, гаспадар, як выберамся адсюль, ці будзеш мяне карміць-паіць і за мяне мышэй лавіць?

— А каб цябе, вусатага-паласатага, чэрці сцягнулі! Каб я ды цябе карміў-паіў ды яшчэ мышэй за цябе лавіў?!

— То ж я ў тваёй дабрыні не сумняваўся!

— Каток!

— Што, гаспадарок?

— А чаму мы пабеглі?

— А мы ад ваўка ўцякалі!

— То ж мы сапраўдныя-сапраўдныя асілкі! І ад ваўка уцяклі! І чортаў мост знайшлі! А казалі, што яго ніяк нельга ўбачыць. А тут усё проста!

— Дзіва, што проста! — пачухаў лапай патыліцу кот.

Пагаманілі так ды пайшлі далей. З купіны на купіну пераскокваюць, дрыгвяныя вокны абыходзяць. А з тых акон пара белая валіць, гусцейшая за малако. У руку саўецца ды заграбучай жменяй цягнецца. Няпрошаных вандроўнікаў злавіць хоча. Тое ж не дзіва: пад чортавым балотам як ёсць пекла, дзе нячыстыя смалу варацць, самую з балота цягаючы. Вынырне з прорвы каторы, набярэ смалянога карчоўя, а пасля бултых назад. Яшчэ і падражніцца: маўляў, пачакайце, госцейкі дарагія, і вас паймаем, зацягнем! У смале зварым! Але не падаюць выгляду кот з гаспадаром, ідуць як ішлі... Наперадзе кот, а за ім гаспадар.

Ужо такая багна пад нагамі прыдарылася, што і ступіць цяжка. Месца сухога няма! Але не здаюцца вандроўнікі: кот вусамі водзіць, а гаспадар проста туды-сюды азіраецца, вепрука таго выглядае. Вось-вось, чакаюць, сярод балота з'явіцца неабсяжны жытнёвы палетак, а на ім жыта сцяной стаіць, вяпрук у жыце ляжыць. Задаволена рохкае... Але не відаць нешта ні таго вепрука, ні жыта, ні хоць бы якога прасвету ў балотнай чарнаце...

— Слухай, каток! — гаворыць досыць стомлены гаспадар. — То мы, мабыць, не там шукаем... Чортаў мост быў пад зямлёй, то і вяпрук ці не ў нары якой хаваецца...

— Слухай, гаспадарок! Пад намі пекла! Думаеш, вяпрук там? Быць таго не можа! Каб чэрці яго злавілі, яны б хлеб людскі са свету зжылі! А хай сабе і так... Я ў пекла ані лапай!

— Слухай, каток! Ну чаго ты адразу? Пойдзем у пекла: чарцей зваюем, вепрука выратуем. Сам кажаш: за ім вядзецца людскі хлеб на свеце!

— Я табе, гаспадарок, і на зямлі сапраўднае пекла ўчыню! Сказаў жа! Ані хвастом у пекла! А каб цябе!

Прасіў-прасіў гаспадар, ды кот як зацяўся. Не пайду ў пекла — і ўсё тут! Чаго толькі не абяцаў, нават мышэй за катка лавіць, — не дапамагло. Узлаваўся гаспадар, а кот яшчэ болей. "Я цябе, — кажа, — за валасы!" — "А я ж цябе за вусы!" — "Я цябе ў каршэнь!" — "А я цябе ў кішэнь!" — "Я табе нос абдзяру!" — "А я з цябе суп звару!"

Перагукваюцца так "зычліва" кот з гаспадаром, адзін другому жадаюць "найлепшага", аж вынырвае з балотнага прадоння вялікі-вялікі чорт.

— Хто тут непакоіць маё валадарства? — гукнуў, аж рэха панеслася. — У пекла таго зацягну!

— Я трывожу тваё валадарства, — падскочыў катоў гаспадар. — Даўно хачу патрапіць да цябе ў пекла! Забяры мяне туды, забяры!

А кот жа тут як тут:

— Не слухай, чорцейка, гэтага манюку! Гэтакім дурнем прыкінуўся, а сам вяльможны асілак! На зямлі як не ўсю нечысць звёў, дык у пекла хоча патрапіць, каб тое самае чыніць...

Чорт хоць і хітры, але разгубіўся:

— Нешта я не заўважаў, каб на белым свеце нечысці стала меней!

А кот яму ў адказ:

— А ці здаралася калі, каб чортаў мост знаходзілі ды пераходзілі?

— Не, ніколі такога не было!

— А каб па чортавым балоце, як па сваім, хадзілі?

— І такога не было!

— То думай, рагаты-хвастаты! Рогі не шапку насіць!

Памацаў чорт рогі. І праўда, для чаго яны? Шапкі ж ён ніколі і не насіў. Горача ў пекле хадзіць у шапцы. Мабыць, для таго, каб палохаць... Дык гэтыя не надта і баяцца. Адзін зусім прычапіўся, што невядома, як ад яго адкаснуцца:

— А чорцейка! А мой залаценькі! Забяры ж мяне ў пекла, забяры! Збрыдзіў людскі свет, то пад зямлёю пабыць хачу! Буду там з катлоў смалу выліваць і вас, чартоў, за хвасты хапаць-вязаць. Падлічу, колькі тузінаў набярэцца.

— Трынаццаць! Тут і лічыць няма чаго! — вохнуў чорт. Гэта ж трэба дадумацца: іх, чартоў, за хвасты вязаць! Ну ўжо не, не патрэбны такі ў пекле. — А смалу з катлоў выліваць нельга...

— А раз нельга, то ён дацікуе і вылье! — махнуў кот лапай. — І да вядзьмаркі не хадзі!

— І чаго вы такія на маё балота прыцёгліся? — занепакоіўся рагаты-хвастаты.

— А цягаемся ўсюды так сабе, хаты не маючы, — цяжка ўздыхнуў каток. — Вось і падумалі вас, чартоў, выгнаць з пекла, а самім там жыць! У вас жа, мусіць, цёпла?

— Ды чаго думаць? Не халодна! — адказаў за чорта катоў гаспадар.

— Хочаш, каля катла паляжы, — аж пацягнуўся ад задавальнення кот.

— А хочаш, вынырні на балота, ягад якіх назбірай, — летуценна прамовіў катоў гаспадар.

— У гэтым балоце ніякіх ягад няма! — уткнуў сваё чорт.

— Нічога, будуць! — кот прытупнуў лапай. — Зваюем вас, дык будзеце не смалу варыць, а ягаднік, нібы кветкі, садзіць...

— А хочаш, вынырні на балота, спеў птушыны паслухай, — зноў марыць катоў гаспадар.

— На гэтым балоце птушкі не пяюць! Няма іх! — асцярожна павёў сваё чорт.

— Нічога, будуць аж залівацца! — кот прыскокнуў на месцы. — Зваюем вас, чарцей, дык і птушкі на балота вернуцца... Будзеце ім гнёзды віць!

— А яшчэ, — замілавана ўздыхнуў чалавеча, — будзем па балоце хадзіць, песні спяваць, людзей склікаць!

— Ды не было тут ніколі людзей! — зніякавеў чорт. — Тут жа пекла блізка!

— Будуць, будуць людцы, — кот па-заліхвацку ўскочыў на нейкі корч-вываранень. — Будуць хаты будаваць, будуць песні спяваць, а вы, чэрці, будзеце ім слугаваць! — ды лапамі ў бакі разводзіць, маўляў, уяві сабе, калі зможаш.

— Слухайце, вандроўнічкі! — сабраўся чорт на гаворку. — Дамо вам золата, адно ідзіце адсюль!

— А многа золата? — заблішчэлі вочы ў ката.

— Ды цэлую торбу! За меней вы адсюль не пойдзеце, — сумна прамовіў чорт ды нырнуў у балота.

Неўзабаве цягне торбу золата. Бярыце, кажа, адно каб я вас тут болей не бачыў. Падхапіў кот чортаву торбу, а гаспадар:

— Так сабе не пайду! Вось гэты вываранень, на вепруковую галаву падобны, забраць хачу!

А чорту што? На яго балоце карчоў процьма. Бяры, кажа, ды ідзі.

Ды катоў гаспадар зноў сваё. Напярод, кажа, слова чартоўскае дай, што гэтага карча ў мяне назад не папросіш. Надакучыла чорту гэтакая цягамоціна. Ды ёсць табе маё чартоўскае слова, аж крычыць. Адно пакінь мяне ды маё балота ў спакоі.

То чалавеча падхапіў пад паху свой корч, а кот торбу закінуў за плечы ды рушылі назад. Ці многа ці мала ішлі, але мінулі балота, перайшлі цераз мост, вось і зорны лес за спінаю застаўся. Неяк сумна зрабілася катову гаспадару…

— Слухай, каток! Што мы ўсё маўчым? Хоць слоўцам перакіньмася!

— Мне з табой, з пякельнікам, гаварыць няма пра што. Радуйся, што жывым вяртаешся!

— Я і радуюся! А ты, каток, першы з дурняў!

— Чаму гэта?

— А золата цягнеш!

— А ты, гаспадарок, першы з разумнікаў!

— Чаму гэта?

— А гнілы корч цягнеш!

— Пачакай, пачакай яшчэ крыху! — смяецца чалавеча. — Да якой вёскі выйдзем, пабачым, чый будзе здабытак!

І што вы думаеце? Як толькі выйшлі кот з гаспадаром з лесу, то чортава золата ўсё ў гнілушкі і перакінулася...

— Мяў! Гора мне, вусатаму, гора... Цягнуў гэтакую цяжкую торбіну. І дарэмна ўсё! — загаласіў каток.

— Рохк! Не тужы, коце! — стаіць перад катом ды яго гаспадаром сапраўдны вяпрук, ад гнілога карча — ані звання. — Я па свеце бегаў, ад нячыстай сілы ў яе ж хаце хаваўся, а праз кемлівасць твайго гаспадара цяпер выбаўлены...

— Яно! Чортава слова! — аж падскочыў коцейка. — Гэтага карча — цьху, вепрука — не папросяць назад!

— Цяпер я нячыстых не баюся! Буду па свеце свабодна пахаджваць, людзям хлеб ды радасць падладжваць! А вы што будзеце рабіць?

— І мы яшчэ па свеце паходзім! — адказаў каткоў гаспадар. — Ну што, вусаты, чый здабытак большы?

— Ды твой ужо! Твой, — лагодна адказвае каток.

Пабег вяпрук сваёй дарогай, а коцік з гаспадаром рушылі сваёй. Ізноў ім выпаў лясны шлях, бо, ведама ж, лясоў у нас вядзецца багата. Ды толькі яны з першымі дрэвамі параўняліся, а лясун тут як тут, з-за елкі выглядае, да зямлі прыпадае, нежаданых гасцей прагнаць хоча. Зіркнуў раз-другі ды з усіх ног да чорнага каменя, сваякоў сваіх зноў кліча.

— Ну і што, родненькія, будзем рабіці? Ходзяць тыя асілкі па зямлі, як хадзілі... — зажурыўся лясун.

— Ох! Мабыць, яны сапраўдныя. Трэба нам хутчэй уцякаць! Ай! Чаго б'ешся, бацюхна-касалапы?

— Я табе ўцяку! Забыўся, што мне бегаць цяжка?

— А мне што? Бяжы, як хочаш! Хоць на чатырох лапах куляйся!

— На чатырох толькі звяры бегаюць! — зароў бацюхна. — А я табе не абы хто! Я шанаваны! Найстарэйшы мядзведзь!

— А нам лёгка ды спрытна бегаць! — запішчэлі гаёўкі. — Толькі мы не хочам уцякаць! Мы яшчэ кветкі-краскі не ўсе сабралі!

— А мне няма калі бегаць! — клапатліва ўздыхнуў гаёвы дзед. — Я смык новы да скрыпкі майструю. Як прыйдзе вясна, тады зайграю, ад таго зашуміць маладое лісцейка так спеўна, як ніколі!

— А мне ёсць калі бегаць і ёсць куды! — паважна мовіў пушчавік. — Ад цёмнай пушчы праз поле ды праз вёску да найцямнейшай пушчы!

— Ты лясамі ідзі! Так цябе людзі не згледзяць. А то ходзіць вячысты дуб, нібы жывы... Яшчэ напалохаюцца, — знайшоўся лясун.

— Не! Праз поле ды вёску мне карацей. А што напалохаюцца, тое нічога. Хоць песню якую пра мяне складуць.

— А тых, што пра цябе ўжо пяюць, няўжо мала? — не змаўчаў гаёвы дзед, які меў на пушчавіка крыўду за тое, што пушчы шануюць болей, чым яго гаі.

— Што маўчыш, шэранькі? — звярнуўся лясун да шэрагахіжага як да апошняй спадзяванкі. — Ты за асілкамі тымі следам хадзіў, можа, уведаў чаго?

— Хадзіў след у след! Перайшлі яны чортаў мост, што дагэтуль не ўдавалася нікому. Вепрука чарадзейнага выбавілі, чарцей добра напалохалі, з чортавага балота жывымі вярнуліся. Што ж мне сказаць? Паважаю! — спакойна азваўся шэры.

— І я паважаю... — слабенька гыркнуў мядзведзь-бацюхна. — Хоць і баюся...

— А я не баюся! Ох! Ох! Ох! — заскакаў задаволены карузлік, выхваляючыся, забыўся, што толькі-толькі хацеў уцякаць. — Магу рабіцца нябачным, то і не баюся...

— Што ж нам рабіць? — кумекаў так і сяк лясун. — Калі не баішся, то гэтак напалохай, каб яны пра тое, што асілкі, забыліся!

— А і напалохаю! — радасна падскочыў Ох-Вох. — Такая справа мне за гонар! Я хоць і маленькі, але ўчыню ўсё лепей за вялікіх! Не толькі на яве палохаць магу, але і сны страшныя насылаць. Такую жудасць начарую, не тое што некаторыя... У хусцінку ўкруціліся і чакаюць нечага!

І зневажальна паглядзеў у бок мядзведзя.

Пакуль лясун са сваякамі радзіўся, ішлі сабе далей кот з гаспадаром. Клопату не маючы, нічога не ведаючы і не дбаючы. Сонейка летняе за край зямлі закацілася, то і асілкі нашы самыя сапраўдныя стаміліся ды паляглі спаць. Адразу ж гаспадар моцна захроп, а кот сам сабе ціхенька завуркатаў.

Спяць ды бачаць самы чарадзейны сон... Бачаць, як быццам да самага краю зямлі дайшлі-дабраліся. Праз лясы ды горы. А там само сонейка сваю брычку майструе, у якой цэлы дзень па-над зямлёй ездзіць. Колы падбівае, завіхаецца. Выглядае нішто сабе: світка залатая, боты бліскучыя. Вось адхінулася сонейка некуды, а гаспадар ды кажа катку:

— Што мы тут дарэмна сядзім? Хоць бы ад сонцавай брычкі адно кола сцягнуць...

— Ды што гэта ты! — замахаў лапкамі каток. — Сонейка высока ходзіць, усё бачыць, злодзеяў ураз знойдзе!

— А вось і не, вусаты-хвастаты! Высока ездзіць яно ў сваёй брычцы! А тая на трох колах не пабяжыць, то і сонейка не паедзе, не ўбачыць, не знойдзе!

— Ды навошта табе адно кола, бязвусы-бясхвосты? Ці ты сабраўся сесці на яго ды паехаць? Ці далёка хоць?

— А як давядзецца...

— А давядзецца проста з гары ды ў калдобіну! Як сабе хочаш, а я зладзеяватай думкі не папушчу! Вось зараз сонейка паклічу, няхай яно цябе пабачыць! — ды спрытна ўскочыў на медны плот, пад якім каля сонцавай сядзібы і хаваліся яны, сябры-змоўшчыкі. — Ну што, паклікаць? — пайшоў кот па плоце.

— Ах ты, злодзей вусаты! — пацягнуў гаспадар руку з-пад плота да кацінага хваста ды атрымаў кагцістай лапай. — Я табе паклічу! Ды ты яшчэ і драпацца ўздумаў?!

— Што ты, гаспадарок! — аж прыўстаў на заднія лапкі кот. — Гэта ж я цябе ад чорных думак лекую!

— Зараз і я цябе! Ад чорных думак...

Чалавеча зноў пацягнуўся да кацінага хваста, перакаціўся на спіне, хваста не паймаўшы, але затое патрапіў у крапіву. Да таго ж аказалася яна высокай. Відаць, занятае важнымі справамі, сонейка не мела часу яе скасіць...

— Усё роўна цябе дастану! Дастану! Дастану-у-у! У-у-у! — зароў нема няспраўджаны злодзей.

Кот лёгка заскакаў па плоце, з кожным прыскокам прыгаворваючы:

— А як добра! А як прыемна! А як смачна! Так! Так! Так!

Гаспадар шоргаўся ў крапіве, баючыся ўстаць, бо сонца дапраўды магло яго заўважыць ды ўраз здагадацца пра не самыя сумленныя жаданні-летуценні...

— Ну, каток, быць табе, дзе і хацеў, — на небе!

— Гэта мы яшчэ пабачым! — скокнуў вусаты гаспадару на плечы, ад таго абодва прачнуліся.

Расплюшчылі вочы — няма ні сонцавай хаткі, ні брычкі, ні кола. Ноч стаіць, лес шуміць, а кот у гаспадара на грудзях спіць, скруціўшыся.

— А ты ж цяжкі, як камень! — сцепануўся гаспадар. — Чаго свае вусы мне за вушы закладаеш?

— Мяў! А так цяплей! — не хацеў пакідаць нагрэтага месца кот.

— Прэч пайшоў! — не схацеў песціць ката гаспадар. — Ад твайго вуркатання толькі сны дзіўныя сняцца… Нібыта я хацеў ад сонцавай брычкі кола сцягнуць. Гэта ж трэба, злодзеем мог зрабіцца… Ды нешта скура ўся свярбіць, як быццам па крапіве добра пакачаўся.

Перакінуліся так слоўцам ды зноў паснулі. Ноччу ж што рабіць? Спяць ды зноўку бачаць сонцаву хатку. Само сонейка каля яе ходзіць, брычку сваю майструе. Стараецца-завіхаецца…

— Вось зараз сонейка пойдзе ў хату! — кажа сам сабе каток.

І праўда, за нейкаю патрэбаю сонейка патупала туды, а каток угаворвае гаспадара:

— Чаго нам так сабе пад плотам сядзець? Добра было б ад сонцавай брычкі аглобліну сцягнуць…

— Ды што ты! — ускінуўся гаспадар. — Сонейка высока ходзіць, усё бачыць, яно злодзеяў ураз пазнае!

— А вось і не! — пляскае ў лапкі вусаты. — Сонейка на брычцы з адной аглоблінай не паедзе! І не ўбачыць! І не пазнае!

— Ды навошта табе аглобліна? Ты ж яе адзін і не пацягнеш, — не можа дайсці да розуму гаспадар.

— А ты дапаможаш!

— Дапамагу, каток, дапамагу! — ды гоп на плот.

— Ты чаго? На плоце сядзець… — спужаўся каток. — Па плоце толькі каты ходзяць.

— А сонейка хачу паклікаць! Няхай яно пабачыць цябе ды тваю злосную задуму ўведае!

— Я табе паклічу! — кот з-пад плота паспрабаваў дастаць гаспадара лапай. Не ўдалося...

— А чаго б мне і не сядзець? — між тым радуецца свайму спрыту катоў гаспадар. — Я і хадзіць па плоце магу! Лепей, чым ты...

Узяў ды пайшоў. А кот як можа цягне да гаспадара лапы... Вось дацягнуўся, драпануў злёгку, праз сябе перакуліўся ды ў крапіву ўваліўся.

— Авой! Пячэ! — загаласіў каток. — Ды не, зусім не пячэ. У мяне ж поўсць густая. Заўсёды хадзіў па крапіве, нібы па дарозе. Чаго я гэта?

Гаспадар, пабачыўшы катка ў крапіве, заспяваў:

— А як добра! А як смачна! А як соладка! — ды паспрабаваў прыскокнуць. Не ўтрымаўся на плоце, бо, ведама ж, чалавек не кот, ды ўляцеў з галавой у крапіву...

— Салодка-а-а! А-а-а! А-а-а!

— Мяў! Задушыў! Забіў! У зямлю ўвагнаў! — пачулася пляскание каціных лап аб нечую ці то спіну, ці то патыліцу. — Пайшоў прэч, а то стану лапай табе на вуха!

— А як жа вы мне ўсё тут паламалі! — маленькі злосны жыгучнік удаўся вялізнай крапівінай ды прыторкнуўся проста да гаспадарскага носа. — Няма ад вас спакою!

— Ды і не кажы! — спачувальна пагадзіўся каток. — Ходзіць абы-хто па плоце!

Катоў гаспадар нешта мэкнуў у адказ. Выкараскацца з крапівы ніяк не ўдавалася.

— Вось ты яго зразумеў? — як паскардзіўся каток жыгучніку. — Робіць абы-што! Слова сказаць не ўмее! Бяда ды і толькі!

— А я ніколі не бачыў, каб чалавек так упарта шыўся як бліжэй да мяне! — адно сказаў жыгучнік. — Відаць, сапраўдны асілак!

— Ды асілак, асілак! — каток цяжка ўздыхнуў і звярнуўся ўжо да названага асілкам. — Застаешся тут ці як?

Катоў гаспадар мармытаў нешта зусім няпэўнае.

— Не, тут вам нельга заставацца! — прагучаў ціхі спеўны голас, і кот са здзіўленнем убачыў, што сонейка стаіць зусім побач.

Усміхаецца ласкава:

— Гэта не ява, а сон. У сне ж нельга заставацца доўга. То хутка я вас пабуджу, малойцы. Нечысць вас у зман хацела ўвесці, але не ўдалося таго. Раскажу, што ды як зрабіць, каб перамога была вашай. Слухай, каток! Дапаможаш свайму гаспадару, бо ён, бачу, пакуль што і не чуе мяне…

І з першымі сонечнымі промнямі каток прачнуўся. Пазяхнуў, пацягнуўся, пра сонейкаў наказ успомніў. Аж бачыць, гаспадар яго сядзіць, вачыма лыпае, нічога зразумець не можа. Увесь у пульхірах — жах. Аж лісцікі крапіўныя з-за вушэй тырчаць.

— Слухай, вусаты, што такога ноччу ўчынілася? Нічога нешта не памятаю.

— Як што? Я не спаў, цябе ўсю ноч крапівой стракаў.

— Ах ты ж злыдзень! — гаспадар нядобра паглядзеў на коціка. — І за што ты гэтак са мною?

— А проста так! Проста так!

— Зараз цябе за хвост і аб вугал!

— А дзе ты, гаспадар, у лесе вуглы знойдзеш? Га? Нават малое кацянятка ведае, што ў лесе вуглоў не бывае. Мяў! А вось біцца нельга! А ты ўсё роўна… Ратуйцеся! Уцякайце! Слаўны асілак зусім з глузду з'ехаў! Б'е ўсіх направа і налева! Мяў! — ды бягом праз лес.

Спяшаецца каток як хутчэй, праз пянькі ды калоды пераскоквае, за дрэвы там і тут хаваецца, а раззлаваны гаспадар за ім паспявае. Грозіцца, сварыцца, але дагнаць спрытнага вусатага не можа.

— Ах ты нечысць! Звяду цябе са свету, звяду! — раве як не на ўвесь лес.

"Ну, усё! Не ўдалося Оху-Воху... — толькі і падумаў лясун, а ўжо бег да чорнага каменя. — Трэба ўсім хавацца. Ды надзейна".

— Хавайцеся! Уцякайце! Мяў!

— Уцякаю! Хаваюся! Гыррр!

— Уцякаю-ўцякаю! Ох!

— Навошта? Ты ж можаш рабіцца нябачным! Наперад такім зрабіся! — прагукаў лясун.

— А я спачатку ўцяку ды схаваюся, а пасля нябачным стану! Ох!

— Глядзі, уведае асілак, што гэта ж ты яму сны дрэнныя насылаў, то і нябачнага цябе знойдзе! — пішчаць гаёўкі.

— А я скажу, што гэта вы! Ох!

— Куды вы ў кустоўе зашыліся? — тупае на гаёвак дзед.— Хуценька кветкамі скінуліся. Кветак жа процьма! Не здагадаецца слаўны асілак, дзе вы ёсць...

— Злаўлю! Знайду! Са свету звяду! — не сунімаецца слаўны.

— А ты, шэры, чаго не бяжыш хавацца? — пытаецца лясун, а шэры-хіжы спакойна ляжыць каля чорнага каменя.

— А я гляджу! Гляджу, як слаўны асілак і наш пушчавік...

— Узяліся біцца?! — спалохаўся лясун.

— Не! Тройчы адзін каля аднаго прабеглі, але не спыніліся... Ці то асілак бачыў нямала дрэў, якія ходзяць сваімі нагамі, ці то пушчавік чалавека не пазнаў, але паскакалі далей кожны сабе!

— Жудасць якая! — уразіўся лясун.

— І не кажы! — цепануў агнёвымі вачыма шэры. — Вось ляжу ды баюся. Таму і не бягу.

— Дык і я не пабягу! — лясун паважна сеў на чорны камень. — Калі ўжо такая невясёлая справа, што, відаць, канец усяму блізіцца, то куды ўжо бегчы... — маркотна ўздыхнуў.

Ды нядоўга давялося пасядзець-паўздыхаць, туды-сюды сумна паазірацца... Каток жа кульком ляціць, а за ім слаўны асілак шыбуе. Не зважае на гаёвак, якія, ці то не паспеўшы, ці то не схацеўшы скінуцца кветкамі, проста разбягаюцца куды каторая. Нават не глядзіць, што Ох-Вох сеў верхам на касалапага, дык жа сварацца яны на тры вярсты:

— Адпусці вуха! Задушу! Гыррр!

— Ох! Ты бяжы хутчэй, дык і вуха балець не будзе!

— Адпусці, кажу! Чаго ты ўчапіўся?

— Дык як на тваёй спіне ўтрымацца?! Тут жа можна згубіцца!

— А ты зусім на ёй не трымайся! Пайшоў прэч!

— Нікуды я не пайду! А ты, кажу, уцякай хутчэй! А то зловіць нас асілак, то не будзе ні мяне, ні цябе, ні твайго вуха!

Дабег каток да чорнага каменя ды гоп праз шэрага. І далей уцякае. Дабег да шэрага і слаўны асілак ды таксама хацеў гопнуць. Але быў збіты на зямлю шэрай лапай. Дык бразнуўся, страсянуўся, сеў і па баках азіраецца, нічога не можа ўцяміць...

— Чаго ты, чалавеча, праз мяне скачаш? Я ж табе не калода! — з пагрозай мовіць шэра-хіжы. — Як прыйшоў біцца, то будзем біцца! А як не, то давай мірыцца! Дарэмнага вэрхалу не падымай!

Глядзіць слаўны асілак, аж велізарны мядзведзь на яго адно вуха натапырыў. За другое нейкі карузлік трымаецца, цяжка охае-ўздыхае, то паявіцца, то знікне, ажно страх бярэ... З-за дрэў няйначай лясныя русалкі выглядаюць, усміхаюцца-

зманьваюць. Пайдзі за такімі — у момант цябе заказычуць. Якісьці кавалак моху на чорным камені ляжыць, варушыцца, каб яго... Воўк агнёвымі вачыма цепае. Лютасць у іх, хоць і разважае, нібы чалавек... А над усім гэтым дуб узвышаецца, як неба падпірае, рукамі-галінамі водзіць, тудысюды пахаджвае. І з гэтымі ўсімі ён павінен біцца? Ну ўжо не! Вось і каток яго некуды падзеўся. Адзін ён застаўся...

Боязь бярэ слаўнага асілка, але ж выгляду не падае:

— Не для таго я ішоў на край свету...

— Які табе край свету? Ох! Мы ж у лесе! Край свету за лясамі, за гарамі...

— Не для таго я ішоў на край свету, каб з вамі, паганымі, што рабіць?

— Гыррр! Не зарыцца. Зараз скажа, што не для таго, каб мірыцца, а для таго, каб пабіцца!

— Ды цішэй ты! — буркнуў лясун. — Ён яшчэ і сам не ведае, што рабіць...

— Не для таго я ішоў на край свету, каб з вамі, паганымі, біцца, а для таго, каб мірыцца!

— Ведаем, чулі! — зашумеў пушчавік. — Зараз будзе некага выклікаць. Нямала і я пабіўся, ды старым ужо стаў! Ты, шэры, ці пойдзеш біцца?

— Я-то пайду! Ды слаўны асілак хацеў мірыцца, а не біцца. Ці так? — чмыхнуў носам хіжы.

— Мірыцца? — прашаптаў лясун, не верачы ў такое шчасце.

— Мірыцца? Гыррр! — развёў ад радасці пярэднімі лапамі мядзведзь.

— Мірыцца? Ох! — карузлік ад здзіўлення ўсё ж бразнуўся з мядзвежай спіны. — Ох! Пабіўся! Ох!

— Мірыцца... — слабым голасам паўтарыў слаўны асілак.

— Мірыцца, — пакрыўджана мяўкнуў каток, які з'явіўся невядома адкуль, па-заліхвацку натапырыўшы вусы. — Я вам заміруся! Сам усіх паб'ю: і цябе, асілак, і вас, нячысцікі!

— А што ж нам перашкаджае замірыцца? — разважліва мовіў лясун. — Ні мы, нячысцікі, ні асілак слаўны нічога такога не зрабілі, каб смуткаваць ды шкадаваць…

— І тое праўда! — зарыпеў пушчавік. — Выпрабаванні нашыя вам адно на карысць пайшлі. Асілак жа слаўны нікога пакуль са свету не зжыў. То, мабыць, і ёсць самы сапраўдны.

Мядзведзь з Охам-Вохам зладжана пераглянуліся:

— А мы такога, сапраўднага, даўно чакалі! Ох! Гыррр!

— Так яно, так! — ужо лагадней мовіў коцік. — Але ж ты, пушчавік, забыўся пра адно.

— Пра што гэта я забыўся? — пушчавік хуценька зрабіў колькі крокаў назад і азірнуўся ў бок найцямнейшай пушчы. — Ты, шэры, не ведаеш, пра што я мог забыцца?

— А я не ведаю, пра што ты мог забыцца, — паглядзеў лясун на мядзведзя-бацюхну.

— Пра тое, на якім дрэве схаваў найсаладзейшы мядок? — паглядзеў касалапы на Оха-Воха. — Не, пра гэта я памятаю.

— А ты не ведаеш, пра што я мог забыцца? — паглядзеў Ох-Вох на лесуна.

— Пра тое, чаго ты не памятаеш! — лясун цокнуў, як вавёрка. — Ты ж як удашся нябачным, то пра ўсё і забудзеш адразу!

— А я ведаю, пра што пушчавік забыўся! — пыхнуў шэры агнёвымі вачыма. — Пра тое, як дванаццаць зорных асілкаў у дрэвы абярнуў, у найцямнейшай пушчы схаваўшы!

— Адзінаццаць, — пушчавік паглядзеў на катка. — Дванаццаты ад мяне ўцёк!

— Дык ты ж казаў… — гопнуўся лясун з каменя на зямлю.

— Ды ці мала чаго я казаў... — паглядзеў на аблокі пушчавік. — Нешта нічога не памятаю...

— І чарадзея-здрадніка шукаў! Ох!

— А што яго шукаць? — пушчавік паглядзеў на шэрага. — Ляжыць вось сабе ў ваўчынай адзежыне. Асілкам гэтым нямытым дапамагаў, за намі цікаваў!

— А што за вамі цікаваць? — павёў хвастом шэры. — Як прычакаеш такіх, што не захочуць біцца, а стануць мірыцца, то адразу ўсіх і адчаруеш.

— Ды ўжо ж адчарую! — і пайшоў сабе па лесе. Дзе стукнуў, дзе грукнуў, аж паўсталі з адзінаццаці явараў адзінаццаць асілкаў.

Рукі да локцяў срэбраныя, ногі да кален у золаце, над брывамі зоркі гараць... Пакланіліся яны пушчавіку, сказалі ўдзячнае слова за ягоную мудрасць. Зарок далі, што не будуць на свеце адно бойкі шукаць, а будуць дапамагаць.

А найслаўнейшы асілак, каткоў гаспадар, між тым і кажа свайму катку:

— Ну што, мурзаты, пайшлі да хаты? Гэтыя хлопцы — сапраўдныя асілкі, а нам адно ў запечку сядзець. Чаго ж мы болей вартыя? Вялікія справы не для нас!

— Мяў! — загаласіў хвастаты. — Выхоўваў цябе, выхоўваў! Нават крапівой пярэсціў! Па карчы вепруковым скакаў, адно каб ты яго ў рукі ўзяў! І цяпер жа як мог шчыраваў, цябе па лесе ганяў! Ідзі з імі дванаццатым! Які табе запечак?!

Скача каток вакол гаспадара, сварыцца, лапкамі махае, а пушчавік на гэта глядзіць. А вусаты не супімаецца:

— Я цябе, ці ведаеш, з печкі сцягну ды аб зямлю! Каб чалавекам быў. Адно б гуркі краў ды грады дратаваў! То гэта ж я тады суседзяў паклікаў! Вось зараз я цябе лапай!

І спрытна цягне да гаспадара лапу. Аж замест лапы — рука, да локця срэбраная... І хваста няма, і вусоў. І ногі да кален у золаце.

— Авой! — спужаўся каток. Ці ўжо не каток, а чалавек. — Як жа я цяпер буду скакаць ды лапамі ўсё хапаць?

— А не давядзецца болей шкоды чыніць! — пушчавік весела заварушыў галінамі. — У людской хаце цябе чары мае дагналі, то ў катка абярнулі, сілы на што іншае не маючы... А так бы дрэвам стаяў-сумаваў! Што ж, наймалодшы брат, будзеш трынаццатым! Будзеце ўсе разам па свеце хадзіць, каго сустрэнеце — здзіўляць, а справядлівасць — шанаваць!

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**Навасельцава** Ганна Віктараўна

**І ЧАРАМ СНІЦЦА ЧАЛАВЕК...**
Міфалагічныя апавяданні

Рэдактар А.С. Казлоў
Тэхнічны рэдактар А.А. Ралавец
Дызайн С.С. Лапавухавай
Вёрстка С.А. Уцінавай
Карэктар І.У. Марчанка

Падпісана да друку 15.03.2016. Фармат 62x84 $^{1}/_{16}$.
Папера афсетная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 15,81. Ул.-выд. арк. 12,11.
Тыраж 100 экз. Заказ 7497.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
унітарнае паліграфічнае прадпрыемства “Віцебская абласная друкарня”.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вырабніка,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў:
№ 1/101 ад 2.12.2013, № 2/19 ад 26.11.2013.
Вул. Шчарбакова-Набярэжная, 4, 210015, г. Віцебск.
E-mail: vt@vitebsk.by



Навасельцава Ганна Віктараўна нарадзілася 11 мая 1983 года ў Віцебску. Скончыла факультэт беларускай філалогіі і культуры Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава (2006) і аспірантуру пры ім (2009). Кандыдат філалагічных навук, працуе на кафедры літаратуры ВДУ імя П.М. Машэрава.

Аўтар міфалагічнай аповесці "Святло зямлі Неўрыда" (2011), друкавалася ў абласных перыядычных выданнях, часопісах "Маладосць", "Полымя", штотыднёвіку "ЛіМ", калектыўных зборніках.

9 789855 340981



Ганна Навасельцава • І чарам сніцца чалавек...